**Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
**Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў**

**В.І.САІТАВА**

# ГІСТОРЫЯ КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ

**Вучэбны дапаможнік**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мінск 2009**

УДК 908(476)(075.8)
ББК 26.890(4Беі)гя73
С 149

**Рэцэнзенты**

*С.В.Зыгмантовіч,* кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў;

*А.В.Прадзеіна,* кандыдат педагагічных навук, загадчык навукова-бібліяграфічнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі;

*Г.В.Раманішка,* галоўны бібліятэкар Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С.Пушкіна

**Рэкамендаваны да выдання** прэзідыумам навукова-метадычнага савета Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў і навукова-метадычным саветам па культуры, бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі Вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых навучальных установаў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**Саітава, В.І.**

**С149** Гісторыя краязнаўства Беларусі: вучэб. дапам. / В.І.Саітава. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 203 с.

ISBN 978-985-6798-59-0.

Дапаможнік падрыхтаваны ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай дысцыпліны. Паказаны асноўныя этапы краязнаўства Беларусі, арганізацыя краязнаўчага руху на кожным з іх, уклад выдатных дзеячаў і вядучых установаў, асноўныя вынікі краязнаўчых даследаванняў, асаблівасці тэарэтычнага асэнсавання краязнаўства.

Для студэнтаў, якія атрымліваюць вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю ў галіне бібліятэказнаўства і бібліяграфіі і іншых прафесій, звязаных з вывучэннем гісторыі краязнаўства.

ББК 26.890(4Беі)гя73

ISBN 978-985-6798-59-0

© В.І.Саітава, 2009

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ

**Прадмова** ........................................................ 6

**Р а з д з е л  I. Краязнаўства як навука і грамадская дзейнасць** ........................................................ 10

Глава 1. Тэарэтычныя і метадалагічныя пытанні краязнаўства ........................................................ 10

Глава 2. Рэгіянальная структура Беларусі па розных прыметах як аснова айчыннага краязнаўства ............ 15

Пытанні і заданні ........................................................ 24

Тэст ........................................................ 24

**Р а з д з е л  II. Узнікненне краязнаўчых даследаванняў беларускіх зямель у Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай (да 1794 г.)** ........................................ 27

Глава 1. Патрыятызм як рыса народнай свядомасці беларусаў і светапоглядная аснова краязнаўчага руху.... 27

Глава 2. Узнікненне гісторыка-краязнаўчых апісанняў і даследаванняў ........................................ 29

Глава 3. Узнікненне рэгіянальных геаграфічных і прыродазнаўчых апісанняў і даследаванняў ............ 37

Глава 4. Узнікненне бібліяграфічнага краязнаўства .. 44

Пытанні і заданні ........................................ 47

Тэст ........................................................ 47

**Р а з д з е л  III. Краязнаўства на беларускіх землях у перыяд Расійскай імперыі (1795–1917)**........ 49

Глава 1. Развіццё краязнаўчага руху ў 1795–1864 гг.. 49

*1.1. Арганізацыйныя аспекты краязнаўства і асноўныя кірунікі вывучэння рэгіёнаў* ........................ 49

*1.1.1. Грамадскі краязнаўчы рух* ........................ 50

*1.1.2. Краязнаўчыя даследаванні грамадскіх арганізацый*........................................................ 61

*1.1.3. Дзяржаўнае і школьнае краязнаўства* .......... 67

*1.1.4. Краязнаўства ў перыядычным друку* ............ 71

*1.1.5. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства* ..... 73

Глава 2. Развіццё краязнаўчага руху ў 1865–1917 гг... 74
*2.1. Арганізацыйныя аспекты краязнаўчага руху і асноўныя кірункі вывучэння рэгіёнаў* ………………. 74
*2.1.1. Грамадскі краязнаўчы рух* ……………….…. 75
*2.1.2. Дзяржаўнае краязнаўства* ………………..…. 87
*2.1.3. Краязнаўства ў перыядычным друку* ………… 90
*2.1.4. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства* ….. 92

Пытанні і заданні …………………………….….. 96
Тэст ………………………………………..………. 97

**Раздзел IV. Краязнаўчая дзейнасць у Беларусі (1918–1945)** …………………………………………… 102
Глава 1. Развіццё краязнаўства ў БССР, страты ў гады Вялікай Айчыннай вайны ………………………… 102
*1.1. Грамадскі краязнаўчы рух. Дзейнасць Цэнтральнага бюро краязнаўства* ……………………………… 102
*1.2. Дзяржаўнае краязнаўства* ………..………….. 118
*1.3. Школьнае краязнаўства* ……………………… 128
*1.4. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства* …… 130

Глава 2. Краязнаўства ў Заходняй Беларусі (1921–1939) ……..………………………………………… 132
*2.1. Грамадскі краязнаўчы рух, дзяржаўнае і школьнае краязнаўства* ………………………………….. 132
*2.2. Краязнаўчая дзейнасць беларускіх нацыянальна-культурных і навуковых арганізацый*…………………… 140
*2.3. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства* ….… 143

Пытанні і заданні ……………………………….... 148
Тэст ……………………………………………….. 149

**Раздзел V. Краязнаўчая дзейнасць у Беларусі ў 1946–1980-я гг**……………………………………. 153
Глава 1. Аднаўленне краязнаўчага руху і развіццё школьнага краязнаўства ……………………………… 153

Глава 2. Развіццё дзяржаўнага краязнаўства ……..... 157
*2.1. Краязнаўства ў вышэйшых навучальных установах* ………………………………………………… 157
*2.2. Музейнае краязнаўства* ……………………..…… 160

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Глава 3. Краязнаўчая дзейнасць добраахвотных арганізацый. Стварэнне Беларускага краязнаўчага таварыства …………………………………………………….. 162

Глава 4. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства … 167

Пытанні і заданні ……………………………..…. 170
Тэст ……………………………………………………….. 171

**Р а з д з е л VI. Развіццё краязнаўства ў Рэспубліцы Беларусь (1991–2000)** ……………………………… 174
Глава 1. Грамадскі краязнаўчы рух. Дзейнасць Беларускага краязнаўчага таварыства ……………………… 174

Глава 2. Школьнае краязнаўства …………………..… 181

Глава 3. Дзяржаўнае краязнаўства ………………….. 185
*3.1. Развіццё краязнаўчай дзейнасці навуковых устаноў* ……………………………………………….. 186
*3.2. Развіццё краязнаўства ва універсітэтах* ……..… 189

Глава 4. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства … 192

Пытанні і заданні ………………………………...… 196
Тэст ……………………………………………………….. 196
**Літаратура** ……………………………………………. 199

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАДМОВА

Краязнаўства з’яўляецца адным з важнейшых кірункаў дзейнасці бібліятэк усіх тыпаў і відаў на сучасным этапе. Паспяхова развіваюцца краязнаўчыя бібліятэчна-бібліяграфічная практыка і навука. Падрыхтоўка да краязнаўчай дзейнасці з’яўляецца запатрабаваным кампанентам прафесійнай бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі. Будучыя бібліятэкары-бібліёграфы ўсіх спецыялізацый вывучаюць дысцыпліну “Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства”. Найбольш грунтоўна авалодваюць гэтым прадметам студэнты спецыялізацыі “бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства”. “Гісторыя краязнаўства Беларусі” з’яўляецца адной з дысцыплін названай спецыялізацыі. Згодна з вучэбным планам яна вывучаецца студэнтамі ФЗН і ФБІС спецыялізацыі “бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства” на IV і V курсах.

Асноўнымі мэтамі дадзенай дысцыпліны з’яўляюцца вывучэнне беларускага краязнаўства як гісторыка-культурнага феномена, асэнсаванне яго як грамадскай з’явы. У працэсе вывучэння курса студэнты набываюць веды аб развіцці краязнаўчага руху ў Беларусі, яго арганізацыі і формах у розныя гістарычныя перыяды, выніках даследаванняў, знакамітых краязнаўцах. Тым самым дысцыпліна дапамагае звязаць веды, набытыя ў галіне бібліятэчна-бібліяграфічнай краязнаўчай дзейнасці, з дасягненнямі айчыннага краязнаўства як навукі і практычнай дзейнасці.

Краязнаўства ў гістарычным аспекце выкладаецца ва універсітэтах пераважна для студэнтаў гісторыкаў, географаў, філолагаў. У вучэбных дапаможніках “Географическое краеведение” (1986, 2002, аўтар Я.М.Мяшэчка), “Историческое краеведение” (1980) і іншых асобныя главы прысвечаны развіццю краязнаўства ў Беларусі. Гісторыка-краязнаўчы матэрыял у гэтых дапаможніках пададзены з улікам будучай галіны дзейнасці спецыялістаў. Яго паўната і паслядоўнасць залежаць ад сфарміраваных у розныя гістарычныя перыяды ўяўленнях аб гістарычным мінулым Беларусі, аб прыналежнасці да суб’ектаў айчыннай культуры пэўных асоб, арганізацый і ўстаноў. Гісторыка-краязнаўчыя веды займаюць пэўнае месца і ў шматлікіх праграмах вучэбных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дысцыплін краязнаўчага зместу, выкладаемых у ВНУ[1]. Аднак асобнага вучэбнага выдання па гэтай дысцыпліне, у якім бы абагульняліся вынікі развіцця айчыннага краязнаўства на ўсіх гістарычных этапах, яшчэ не было. Дадзены вучэбны дапаможнік з'яўляецца першым такога роду выданнем.

Спецыфіка адлюстравання гісторыка-краязнаўчых ведаў для студэнтаў бібліятэкараў-бібліёграфаў заключаецца ў больш шырокім, не абмежаваным пэўнай галіной краязнаўства, падыходзе. Дасягненні краязнаўчага руху па кожнай галіне ўяўляюць цікавасць для гэтых спецыялістаў, што вынікае з інфармацыйнага, культурнага і адукацыйнага характару бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці. У вучэбным дапаможніку з улікам бібліятэчнай прафесіі зроблены акцэнт і на выніках дакументавання краязнаўчых ведаў, краязнаўчых інфармацыйных рэсурсах.

Вучэбны дапаможнік "Гісторыя краязнаўства Беларусі" напісаны на падставе вучэбнай праграмы дысцыпліны і ахоплівае асноўныя падзеі, з'явы, тэндэнцыі айчыннага краязнаўства ад пачатку яго ўзнікнення да сучаснасці.

Матэрыял размеркаваны па буйнейшых гістарычных перыядах развіцця краязнаўства, асобна адлюстраваны пытанні агульнай характарыстыкі краязнаўства і прыметы тэрытарыяльнага падзелу краіны. У аснову перыядызацыі краязнаўства пакладзена перыядызацыя гісторыі Беларусі. Матэрыял, пададзены ў дапаможніку, адабраны з улікам значнасці фактаў і з'яў для таго, каб адлюстраваць шляхі развіцця краязнаўства, яго грамадскую ролю, сувязі з іншымі сферамі і галінамі. Важнае месца адведзена суб'ектам краязнаўчай дзейнасці: асобам, арганізацыям і ўстановам. Колькасць іх вялікая, таму пры адборы імён і арганізацый улічваліся значнасць укладу ў краязнаўчую дзейнасць, удзел у стварэнні і дакументаванні краязнаўчых ведаў, развіцці інфармацыйнай інфраструктуры краязнаўства. Перавага аддавалася тым асобам, якія жылі і працавалі ў Беларусі, арганізацыям і ўстановам, што дзейнічалі на яе тэрыторыі. Але ўлічваючы значнасць укладу некаторых небеларускіх даследчыкаў, падарожнікаў, адміністрацыйных чыноўнікаў, вайскоўцаў, а таксама ўстаноў і арганізацый, у на-

[1] Матэрыялы па курсу "Краязнаўства Беларусі": праграма // Беларусь: история, краеведение, этнология в контексте мировых цивилизаций : учеб.-метод. пособие. – Мн.: Веды, 2003. – С.75–78.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вуковыя інтарэсы, прафесійныя і службовыя абавязкі якіх уваходзіла вывучэнне беларускіх рэгіёнаў, асвятляецца і іх дзейнасць. Гэта паказвае складанасць краязнаўчага руху як грамадскай з'явы, яго шырокія знешнія сувязі, тлумачыць у пэўнай ступені прасторавую і галіновую распаўсюджанасць краязнаўчых ведаў. Вывучэнне "Гісторыі краязнаўства Беларусі" дапаможа ў фарміраванні прафесіянальнай свядомасці будучых спецыялістаў, інфармацыйна-рэгіянальнага стылю іх мыслення.

Мэтавая накіраванасць дысцыпліны вызначае кола задач, скіраваных на фарміраванне ў студэнтаў адпаведных ведаў і ўменняў, а менавіта:

– вызначыць асноўныя перыяды развіцця краязнаўства ў Беларусі, паказаць значэнне рэгіёнаў і іх насельніцтва як аб'ектаў і суб'ектаў гістарычнага працэсу;

– раскрыць станаўленне асобных арганізацыйных формаў краязнаўства: грамадскага, дзяржаўнага, школьнага; іх дасягненні, асаблівасці і ўзаемасувязі, мэты і метады дзейнасці;

– прааналізаваць кірункі краязнаўчых даследаванняў на кожным гістарычным этапе і рэалізацыю іх галоўных вынікаў у дакументальнай форме, што ўяўляе асаблівую значнасць для бібліятэчных работнікаў;

– паказаць фарміраванне напрамку бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

У выніку засваення курса студэнты павінны ведаць:

– арганізацыю і агульны стан краязнаўчай дзейнасці ў асобныя гістарычныя перыяды;

– выдатных краязнаўцаў і арганізацыі, якія ўнеслі значны ўклад у даследаванне асобных рэгіёнаў і папулярызацыю краязнаўчых ведаў;

– змястоўныя кірункі краязнаўчых даследаванняў у асобныя перыяды і асноўныя краязнаўчыя крыніцы;

– бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства як элемент краязнаўчага руху ў асобныя гістарычныя перыяды.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны ўмець:

– выкарыстоўваць гістарычныя веды па краязнаўстве як кампанент прафесіянальнай падрыхтоўкі для бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;

– ужываць вядомыя факты пры разглядзе прычынна-выніковых сувязей гісторыі краязнаўства;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выяўляць суб’ектаў розных формаў краязнаўства, пазнавальнай і асветніцкай дзейнасці па вывучэнні рэгіёнаў у асобныя гістарычныя перыяды;

– аналізаваць дакументальную спадчыну гісторыка-краязнаўчага вывучэння рэгіёнаў.

Для вывучэння “Гісторыі краязнаўства Беларусі” неабходна засваенне шэрага дысцыплін, у тым ліку “Гісторыі Беларусі”, “Гісторыі кнігі”, “Бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства”, дысцыплін па вывучэнні матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў.

Асноўныя віды заняткаў па дысцыпліне: лекцыі, семінары, практычныя работы; праводзіцца кантроль за самастойнай працай студэнтаў. Вывучэнне курса студэнтамі завяршаецца экзаменам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел I. КРАЯЗНАЎСТВА ЯК НАВУКА І ГРАМАДСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

## Глава 1. Тэарэтычныя і метадалагічныя пытанні краязнаўства

Ведаць свой край, дзе чалавек нарадзіўся ці жыве, жадае кожны. Для адных – гэта праца і абавязак, для іншых – захапленне, турыстычная прыемнасць, але для ўсіх – замілаванасць і любоў да малой радзімы. Магутным поклічам прызываюць нашчадкаў помнікі мінуўшчыны, цудоўныя краявіды, постаці змагароў за свабоду, дзеячаў мастацтва, навукі, культуры, адукацыі. Усведамленне вялікай мінуўшчыны з'яўляецца моцным стымулам да пабудовы будучыні. Высакародныя пачуцці падштурхоўваюць людзей набываць веды, даследаваць родны край, працаваць на карысць яго развіцця, ушаноўваць гістарычныя сімвалы. Такая дзейнасць людзей мае даўнія карані.

Краязнаўства – гэта ўсебаковае вывучэнне асобнага рэгіёну ці населенага пункта мясцовым насельніцтвам, а таксама спецыялістамі навуковых устаноў[2]. Важна ўсведамляць, што тэрмін "краязнаўства" разглядаецца як комплекс навуковых дысцыплін і ўсебаковае вывучэнне краю мясцовымі жыхарамі, а таксама як грамадскі рух, які аб'ядноўвае мясцовае насельніцтва. Аб'ектам пазнання ў краязнаўстве з'яўляецца тэрыторыя, мясцовасць, што вызначаецца паняццем "край" ці "рэгіён". Край – канкрэтная частка тэрыторыі дзяржавы, якая звычайна супадае з адзінкамі сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення і вызначаецца з улікам змяненняў гістарычных меж, а таксама фізіка-геаграфічных, прыродна-кліматычных, геалагічных, эканамічных і іншых крытэрыяў раяніравання. Паняцце "край"[3] працяглы час выкарыстоўваецца ў айчыннай навуцы, у тым ліку ў бібліятэказнаўстве і бібліяграфазнаўстве. У пачатку 60-х гг. XX ст. у эканамічнай навуцы пачынае выкарыстоўвацца тэрмін "рэгіён". Тэрмін "рэгіён" абазначае буйное тэрытарыяльнае аб'яднанне як

[2] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн.: БелЭн, 1997. – Т. 4.– С.257.

[3] Першапачаткова пад ім разумеліся ўскраінныя землі краіны. У канстытуцыях (пастановах) вальных сеймаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, апублікаваных у "Volumina legum", так называюцца некаторыя этнічныя беларускія тэрыторыі ўздоўж мяжы з Маскоўскай дзяржавай.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

унутры краіны, так і свету ў цэлым, для якога характэрны агульныя кліматычныя і геаграфічныя ўмовы, развітыя эканамічныя, палітычныя, культурныя, этнічныя і іншыя сувязі. Выкарыстанне паняцця і вытворных ад яго хутка пашыралася. Гэтым тэрмінам зараз называюць і адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі. Напрыклад, статыстычныя даведнікі “Регионы Республики Беларусь” і “Регион Минск” комплексна раскрываюць развіццё абласцей і сталіцы[4].

На сучасным этапе паняцці “край” і “рэгіён” выкарыстоўваюцца для абазначэння сферы бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці, што вылучаецца па тэрытарыяльна-зместавай прымеце. Спробы бібліятэказнаўцаў і бібліяграфазнаўцаў дакладна размежаваць паняцці “край” і “рэгіён” мелі дыскусійны характар і не прывялі да прыняцця адзінай пазіцыі[5]. Некаторыя спецыялісты прапануюць выкарыстоўваць гэтыя тэрміны як сінонімы, напрыклад А.В.Прадзеіна. Яна падкрэслівае цёплую эмацыянальную афарбоўку паняцця “край” і шырокае распаўсюджанне паняцця “рэгіён”. У бліжэйшай перспектыве бібліятэчнага краязнаўства прагназуецца далейшае выкарыстанне абодвух тэрмінаў.

Дзейнасць краязнаўцаў накіравана на вывучэнне асобных тэрыторый у межах краіны. Краязнаўцы сцвярджаюць, што непаўторныя ў часе комплексы з’яў, іх істотныя рысы самі сабой утвараюць у свядомасці краязнаўца-даследчыка прасторавыя межы рэгіёну[6]. Лічыцца, што вельмі малая тэрыторыя – дом, вуліца, якія не адлюстроўваюць з неабходнай паўнатой пералічаных сукупнасцей і сувязяй, не могуць называцца краем, аднак з’яўляюцца аб’ектамі краязнаўчага вывучэння. На тэрыторыі краю аб’ектамі вывучэння з'яўляюцца розныя з’явы, працэсы, канкрэтныя людзі, помнікі, прадпрыемствы і інш. Таму ў краязнаўстве сфарміраваліся розныя прадметныя сферы вывучэння вызначанай мясцовасці: яе прыроды, эканомікі, дэмаграфіі, гісторыі, мовы, культуры, мастацтва. На іх аснове сфарміраваліся галіны краязнаўства. Галіновае краязнаўства паглыблена вывучае асобныя кірункі:

[4] Выпускаюцца як электронны рэсурс і ў друкаваным выглядзе з 2001г., напрыклад, “Регионы Республики Беларусь” (2008) і інш.

[5] Дыскусія па дадзенай праблеме адлюстравана І.І. Міхлінай у працы “Основные понятия краеведческой библиографии” (М., 2002).

[6] *Большаков, А.М.* Введение в краеведение / А.М.Большаков. – Л.: Прибой, 1929. – С.11.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычны, геаграфічны, этнаграфічны, літаратурны, тапанімічны, мемарыяльны, ахову помнікаў і інш.[7] Сярод шматлікіх галін развіваецца і бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства. Развіваецца і комплекснае краязнаўства, якое разглядае ўсе звесткі ва ўзаемасувязі.

Краязнаўчае вывучэнне мясцовасці мае пэўную спецыфіку. У чым яна? Можна паставіць пытанне: ці патрэбна жыхару Вілейшчыны, які жадае апісаць яе лясы, вывучаць адрозненне сасны ад ёлкі, хвойных ад ліставых? Ці краязнаўцу, які вывучае фізічны тып насельніцтва Палесся, трэба ведаць функцыі шматлікіх органаў чалавека? Вядома, што не. Краязнавец зыходзіць з непаўторных і адметных рыс краю ў часе і прасторы, як бы індывідуальнасці краю, і імкнецца выявіць яго вобраз. Менавіта ў краязнаўчым вывучэнні і даследаваннях засяроджваюцца на тых прадметах, з'явах і працэсах, якія ўплываюць на дасягненне той непаўторнасці, таго вобліку і адметнасці, якую мае край. Такім чынам, існуе краязнаўчы падыход, які ўяўляецца абгрунтаваным пры вывучэнні краю як асобнай, непаўторнай у прасторы і часе адметнасці. Краязнаўчы падыход – гэта асноўны метад краязнаўства. У краязнаўстве таксама выкарыстоўваюцца метады вывучэння дакументальных крыніц, даследавання прадметаў матэрыяльнай культуры, палявыя даследаванні і назіранні, анкетаванне, картаграфаванне, бібліяграфічныя і іншыя метады.

Высокую каштоўнасць маюць комплексныя даследаванні рэгіёнаў і населеных пунктаў, якія рознабакова адлюстроўваюць мінулае і сучаснасць. У пэўныя гістарычныя перыяды вылучаюцца галоўныя тэмы, задачы, вакол якіх канцэнтруюцца даследаванні краю. Напрыклад, у савецкі час асабліва вывучаліся гісторыя рэвалюцыйнага і партызанскага руху, падзеі Вялікай Айчыннай вайны, развіццё сацыялістычнай эканомікі, на сучасным этапе – даследаванні гістарычнага мінулага, традыцый, звычаяў, сямейна-радавой гісторыі.

Задачы краязнаўства спецыфічна праяўляюцца ў розных грамадскіх сферах. Краязнаўцам-даследчыкам неабходна арганізаваць збор матэрыялу для навуковых даследаванняў, правесці поўную яго апрацоўку і вывучэнне. Рэкамендуецца забяспечыць рэпрэзентацыйнасць матэрыялу, інакш вывучэнне можа быць прыблізным ці нават скажоным. Важна

[7] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн.: БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 257.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прасачыць тэрытарыяльнае распаўсюджанне аб'ектаў, з'яў. Гэта значыць, што недастаткова зафіксаваць у межах рэгіёну наяўнасць вывучаемага, але трэба адзначыць і іншыя пункты яго існавання; класіфікаваць аб'екты па групах.

Краязнаўства стымулюе развіццё многіх навук, узаемадзейнічае з імі. Краязнаўцы збіраюць і апрацоўваюць фактычны матэрыял, патрэбны для развіцця этнаграфіі, фалькларыстыкі, геаграфіі, мовазнаўства, генеалогіі, тапанімікі і іншых навук.

У папулярызацыі ведаў у сферы культуры галоўнымі задачамі краязнаўства з'яўляюцца выхаванне патрыятызму, інфармацыйна-рэгіянальнага стылю мыслення, сацыяльнай актыўнасці, рацыянальных паводзін у навакольнай прыроднай і сацыяльнай сферах, засваенне культурных здабыткаў рэгіянальнай супольнасці. Яго сацыяльная дамінанта – фарміраванне патрыятызму, любві да "малой" радзімы і краіны, каштоўных ідэйна-маральных арыенціраў асобы, накіраваных на разумнае выкарыстанне разнастайных мясцовых рэсурсаў, заклапочанай у захаванні, распаўсюджанні і перадачы назапашаных культурных каштоўнасцей. Краязнаўства з'яўляецца надзейным падмуркам грамадзянскага выхавання і засваення дзяржаўнай ідэалогіі.

У галіне адукацыі краязнаўства на працягу многіх дзесяцігоддзяў займае важнае месца ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ўсіх узроўняў сістэмы адукацыі ў Беларусі. Гэта з'ява мае месца і ў адукацыі замежных краін. Краязнаўчыя веды разглядаюцца як кампанент ведаў і фарміравання светапогляду сучаснага адукаванага чалавека і спецыяліста.

Краязнаўства садзейнічае сацыяльна-эканамічнаму і культурнаму развіццю розных сфер і галін асобных мясцовасцей і населеных пунктаў, зберажэнню і рацыянальнаму выкарыстанню мясцовых прыродных рэсурсаў, экалагічнаму выхаванню.

Па формах арганізацыі краязнаўства падзяляецца на дзяржаўнае (навуковае), грамадскае і школьнае. У дзяржаўным краязнаўстве вывучэннем краю займаюцца ўстановы навукова-даследчага профілю: навукова-даследчыя інстытуты, музеі, бібліятэкі, ВНУ. У грамадскім краязнаўстве ўдзельнічаюць краязнаўцы-аматары і грамадскія арганізацыі. Школьнае краязнаўства развіваецца школамі і іншымі вучэб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на-выхаваўчымі ўстановамі, якія арганізуюць вучэбную, пазашкольную і іншую дзейнасць вучняў па краязнаўстве. Адпаведна далейшай дыферэнцыяцыі сацыяльных інстытутаў грамадства, занятых краязнаўствам, магчыма вылучаць бібліятэчна-бібліяграфічнае, музейнае і іншыя формы краязнаўства.

Суб'ектамі краязнаўства з'яўляюцца асобы, якія прафесіянальна і як аматары займаюцца гэтай дзейнасцю: праводзяць краязнаўчыя даследаванні, папулярызуюць краязнаўчыя веды, выкладаюць краязнаўчыя дысцыпліны. Вывучэнне краю – абавязак спецыялістаў-краязнаўцаў. Гэта супрацоўнікі краязнаўчых музеяў, архіваў, экскурсаводы, бібліятэкары, выкладчыкі, вучоныя і інш. Вялікую колькасць складаюць і непрафесіянальныя краязнаўцы – людзі розных прафесій, узроўню адукацыі, узросту – ад школьнікаў да пенсіянераў. Прафесіянальных краязнаўцаў і аматараў вызначаюць такія інтэлектуальныя, псіхалагічныя і грамадзянскія рысы, як імкненне пастаянна паглыбляць веды аб краі, высокі інтэлектуальны ўзровень, начытанасць, развітая гістарычная свядомасць, адчуванне інфармацыйнай сувязі з папярэднімі пакаленнямі, з дадзенай тэрыторыяй, высокі ўзровень кантактнасці, ініцыятыўнасць, энергічнасць, здольнасць пераадольваць перашкоды, высокая самаацэнка, упэўненасць у сваіх сілах, пачуццё ўласнай годнасці.

У цэлым самаасэнсаванне гэтых людзей часцей за ўсё зыходзіць з дзейснага пачатку – з імкнення пераадолець недахопы мясцовага жыцця і актыўна ўдзельнічаць у развіцці краю.

У сваёй дзейнасці краязнаўцы выкарыстоўваюць вялікае кола крыніц. Да краязнаўчых крыніц адносяцца крыніцы ўсіх відаў, якія заключаюць інфармацыю, звесткі аб тым ці іншым краі. Крыніцы падзяляюцца на рэчавыя, пісьмовыя, аўдыёвізуальныя і машыначытальныя.

Рэчавыя крыніцы – гэта любыя аб'екты матэрыяльнай культуры: вынікі археалагічных раскопак (старажытныя прадметы, забудаванні або пахаванні, тое, што захавалася на зямной паверхні, пад зямлёй і пад вадой), этнаграфічных экспедыцый (вопратка, гаспадарчыя рэчы і інш.), прыродных даследаванняў (узоры мінералаў), розныя вырабы: прадукты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вытворчасці (хлеб), прылады працы, бытавыя рэчы, упрыгожванні і інш.

Пісьмовыя – гэта рукапісныя, друкаваныя і машыначытальныя тэксты. Пісьмовыя крыніцы падзяляюцца на две асноўныя групы: актавага (дакументальнага) і літаратурнага (апавядальнага) характару. Да крыніц актавага характару адносяць заканадаўчыя матэрыялы, юрыдычныя дакументы, афіцыйную перапіску, статыстычныя даныя. Да крыніц літаратурнага характару – летапісы, хронікі, мемуары, запісы, дзённікі, прыватныя пісьмы і інш. Пісьмовыя крыніцы ствараюцца чалавекам, таму адлюстроўваюць рэчаіснасць і суб'ектыўны светапогляд чалавека (пісьменніка, вучонага, падарожніка). Пісьмовыя крыніцы – гэта прадукты гістарычнай рэчаіснасці пэўнага часу. Яны і частка той рэчаіснасці, і вобраз яе адначасова. Рэальнасць праз уяўленне чалавека своеасабліва і шматпланава адлюстроўваецца ў іх з такой паўнатой і разнастайнасцю, што стварае магчымасць больш позным даследчыкам пазнаваць гэту назаўсёды адышоўшую, непаўторную рэчаіснасць.

Друкаваныя крыніцы маюць разнастайны характар і падзяляюцца па відах (кнігі, брашуры, лістоўкі, газеты, часопісы, ноты і інш.).

Аўдыёвізуальныя крыніцы – гуказапісы ўдзельнікаў важных падзей у краі, знакамітых ураджэнцаў, творы выяўленчага мастацтва, кінафотафонадакументы, прысвечаныя краю.

Машыначытальныя крыніцы – інфармацыя на CD-ROM, DVD-ROM, у аддаленым доступе. Створаны шматлікія сайты адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, населеных пунктаў, прысвечаныя знакамітым людзям і іншыя, колькасць і інфармацыйная насычанасць якіх бесперапынна павялічваюцца.

## Глава 2. Рэгіянальная структура Беларусі па розных прыметах як аснова айчыннага краязнаўства

Пры даследаванні любой тэмы краязнавец павінен вырашыць праблему тэрытарыяльных меж краю. Для дакладнага выбару меж краю выкарыстоўваюць прыметы падзелу тэрыторыі краіны, які здзяйсняецца ў разнастайных мэтах дзяржаўнага кіравання, гаспадарчай, прыродаахоўнай і іншай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзейнасці. Існуе многа прымет, паводле якіх праводзіцца падзел на часткі тэрыторыі краіны. Яны носяць пераважна штучны або натуральны характар, гэта значыць створаны людзьмі або сфарміраваны прыродай, часам гістарычнага развіцця. Асноўныя прыметы (ці прынцыпы) падзелу наступныя:

– адміністрацыйна-тэрытарыяльная, паводле якой органы ўлады праводзяць адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, неабходны для дзяржаўнага кіравання, упраўлення ўсімі галінамі і сферамі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел – гэта падзел на часткі – адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі (акругі, вобласці, губерні, землі, правінцыі, штаты, раёны, дэпартаменты і інш.), на аснове якіх ствараюцца і дзейнічаюць органы дзяржаўнай улады, кіравання і самакіравання. Асноўная мэта такога падзелу – стварыць аптымальныя ўмовы эфектыўнай арганізацыі і дзеяння ўсяго дзяржаўнага механізму. Ажыццяўляецца ён з улікам прыродна-гістарычных, эканамічных і геаграфічных умоў, нацыянальных асаблівасцей, сацыяльна-культурных, палітычных і іншых фактараў. Раяніраванне па гэтай прымеце адлюстроўвае законы, згодна якіх краіна дзеліцца на сістэму вялікіх і дробных цэласных адзінак і ў той жа час жыве ў гэтых адзінках як дзяржаўнае цэлае. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел з'яўляецца пераважна штучным і пры неабходнасці мяняецца;

– прыродная (фізіка-геаграфічная), заснаваная на еднасці прыродна-геаграфічных характарыстык. На яе аснове вучонымі абгрунтоўваецца прыродна-геаграфічнае раяніраванне. Прыродныя раёны фарміруюцца пад уплывам прыродных фактараў, яны існуюць доўгія гістарычныя перыяды. Напрыклад, Белавежская пушча, Палессе і інш.;

– эканамічная, на аснове якой вылучаюцца эканамічныя раёны. Эканамічнае раяніраванне выкарыстоўваецца для фарміравання аптымальнай эканамічнай сістэмы з улікам традыцый гаспадарчай дзейнасці. Эканамічнае раяніраванне цесна звязана з адміністрацыйна-тэрытарыяльнай структурай краіны;

– этнічная. На яе аснове ўлічваюцца асаблівасці этнічнага рассеяння мясцовага насельніцтва, асаблівасці этнічнай структуры. Улічваецца ў кіраванні дэмаграфічнымі і эканамічнымі працэсамі, пры вывучэнні гістарычнага мінулага. Так, у міжваенны перыяд у БССР былі нацыянальныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сельскія саветы і калгасы. У сучасных мультыэтнічных краінах краязнаўцы пераважна даследуюць этнічны фактар як адзін з элементаў фарміравання мясцовага насельніцтва;

– канфесіянальная, адлюстроўвае склад насельніцтва па веравызнаннях. Праводзіцца вышэйшымі канфесіянальнымі органамі.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел з’яўляецца асноўным у краязнаўстве. Ён найбольш выкарыстоўваецца ў бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве, часам у спалучэнні з некаторымі іншымі прыметамі вылучэння тэрыторый. Пры падрыхтоўцы інфармацыйнай прадукцыі, бібліяграфічным абслугоўванні карыстальнікаў, у дзейнасці па папулярызацыі краязнаўчых ведаў неабходна зыходзіць з дакладна акрэсленых меж тэрыторыі. Напрыклад, пры падрыхтоўцы бібліяграфічнага дапаможніка аб раёне выяўляюцца дакументы, прысвечаныя асобным населеным пунктам, прыродным, гаспадарчым і іншым аб’ектам, якія знаходзяцца ў яго граніцах, а пры напаўненні гістарычнага раздзела дапаможніка ўзнікае неабходнасць вывучыць дадаткова адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць краю, яго эканамічныя, рэлігійныя, грамадскія сувязі з суседнімі тэрыторыямі ў розныя гістарычныя перыяды.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел беларускіх зямель пачаў фарміравацца ў перыяд ВКЛ. Ужо пры вялікім князі Вітаўце краіна падзялялася на судова-адміністрацыйныя акругі: княствы, намесніцтвы, межы якіх склаліся ў мінулым, але не былі вызначаны заканадаўча[8]. Княствы і намесніцтвы з'яўляліся асноўнымі адміністрацыйнымі адзінкамі і, у сваю чаргу, падзяляліся на больш дробныя – воласці, якія існавалі ў XIII–XVI стст. У валасцях жылі даннікі, якія ўтваралі абшчыну. Тэрыторыі валасцей часта станавіліся аб’ектам узнагароды шляхты за службу Айчыне і вялікаму князю, таму паступова

[8] Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя. – Мн.: БелЭн, 2005. – Т. 1. – С.35.

Польскі даследчык сцвярджае, што ў XIII ст. тэрыторыя ВКЛ падзялялася на дзве часткі. Цэнтральная (галоўная) складала палітычнае ядро дзяржавы. Гэта былі княствы: Ашмянскае, Браслаўскае, Берасцейскае, Віленскае, Вілкамірскае, Ваўкавыскае, Гарадзенскае, Клецкае, Кобрынскае, Копыльскае, Лідскае, Мінскае, Мсціслаўскае, Нясвіжскае, Навагрудскае, Пінскае, Рэчыцкае, Слонімскае, Слуцкае, Трокскае, – а таксама Тураўская і Упіцкая землі. Яны мелі саманазву “Літва”. Другая частка – землі, якія “прыслухоўваліся”, – Віцебская, Валынская, Жмудская (сучасная Літва), Кіеўская, Падляшша, Падольская, Полацкая, Смаленская, Чарнігава-Северская і некаторыя інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распадаліся ў працэсе феадальных зямельных адносін. Воласці, якія не былі перададзены ў прыватную ўласнасць, атрымалі назвы “старастваў”, ці “дзяржаў”.

Па прыкладу Польскага каралеўства ў XV ст. намесніцтвы пачалі называцца паветамі.

У канцы XVI ст. з дзяржаўных земляў выдзелілі адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі – эканоміі, прызначаныя для задавальнення патрэб караля (вялікага князя) і прыдворнай казны. Існавалі Брэсцкая, Гродзенская, Кобрынская, Магілёўская, Лідская, Пінская і Слонімская эканоміі. Эканоміі мелі ўласнае адміністрацыйна-гаспадарчае кіраванне.

У 1413 г. былі ўтвораны першыя вялікія адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі – Віленскае і Трокскае ваяводствы, куды ўваходзілі каля 20 беларускіх княстваў і намесніцтваў. З пачатку XVI ст. статус ваяводстваў атрымалі Полацкае, Навагрудскае, Віцебскае і Смаленскае намесніцтвы.

У 1565–1566 гг. у ВКЛ была праведзена буйная адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа: усю тэрыторыю падзялілі на 30 паветаў. Паветы былі замацаваны Статутам 1588 г. Тэрыторыя Беларусі (поўнасцю ці часткова) уваходзіла ў 16 паветаў і 9 ваяводстваў. Гэта ваяводствы: Брэсцкае, Віленскае, Віцебскае, Мінскае, Мсціслаўскае, Навагрудскае, Полацкае, Падляшскае (цэнтр – Драгічын), Трокскае. Так, у Трокскім ваяводстве былі не толькі ўласна літоўскія землі, як Каўнас, але і заходнія тэрыторыі сучаснай Гродзеншчыны і Беласточчыны, напрыклад, Гродна, Масты, Лунна, Скідзель, Сувалкі і інш. Пасля Люблінскай уніі 1569 г. Мазырскі павет і Падляшскае ваяводства адышлі да Польскага каралеўства. У 1618–1654 гг. да Беларусі адносілася Смаленскае ваяводства са Старадубскім паветам. Самымі буйнымі былі Віленскае і Мінскае ваяводствы, найменшым – Мсціслаўскае.

Паводле Канстытуцыі 1791 г. былі створаны яшчэ пяць паветаў: Завілейскі (цэнтр – Паставы), Эйшышскі, Случарэцкі, Кобрынскі і Пінска-Зарэчны (з 1792 г. – Запінскі, цэнтр – Столін).

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная структура ВКЛ была больш дасканалай, чым у Польскім каралеўстве, другім суб'екце Рэчы Паспалітай.

У маі 1772 г. усходнія беларускія землі ў выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай увайшлі ў склад Расійскай імперыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Насельніцтва было прыведзена да прысягі імператрыцы Кацярыне ІІ, пачаліся мерапрыемствы па апісанні тэрыторыі і рэвізіі насельніцтва, неабходныя для ўвядзення новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу і падаткаабкладання. На працягу некалькіх гадоў (па меры захопу новых беларускіх зямель) расійскі ўрад мяняў структуру іх адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу: ствараліся то намесніцтвы, то губерні, мяняліся іх назвы і межы. Папярэдні адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, што існаваў у ВКЛ, быў праігнараваны. Напрыклад, пасля першага падзелу ў 1772 г. усходнія беларускія землі былі ўключаны ў склад Магілёўскай і Пскоўскай губерняў і падзелены спачатку на правінцыі, затым на паветы. Самі губерні былі пераўтвораны ў намесніцтвы, а з зямель Пскоўскай вылучылі Полацкую губерню (у 1778–1796 гг. – намесніцтва) у складзе 11 паветаў.

У 1796 г. Магілёўскае і Полацкае намесніцтвы былі ліквідаваны, а паветы ўвайшлі ў склад новай, Беларускай губерні з цэнтрам у г.Віцебску[9]. Упершыню тэрмін “беларускі” быў выкарыстаны ў якасці назвы адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі на гістарычна-этнічнай тэрыторыі Беларусі. У 1802 г. Беларуская губерня была ліквідавана, а яе тэрыторыя падзелена на Віцебскую і Магілёўскую губерні.

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі адышла цэнтральная частка Беларусі. У 1793 г. была створана Мінская губерня (у 1795–1796 гг. – намесніцтва) з цэнтрам у Мінску, якая складалася з 13 паветаў.

Пасля трэцяга падзелу былі ўтвораны Слонімская і Віленская губерні, якія ў 1797 г. увайшлі ў Літоўскую губерню[10]. Указам Аляксандра І ад 19 верасня 1801 г. гэта губерня была падзелена на Віленскую і Гродзенскую.

У 1802–1917 гг. на тэрыторыі Беларусі існавалі пяць губерняў: Віленская, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская. Часткова беларускія землі ўваходзілі ў Ковенскую губерню. Беларускія землі ўваходзілі і ў склад Беластоцкай вобласці (чатыры паветы), пасля скасавання якой яе землі адышлі да Гродзенскай губерні.

[9] Беларуская губерня ахоплівала 16 паветаў: Беліцкі, Віцебскі, Гарадоцкі, Магілёўскі, Мсціслаўскі, Аршанскі, Полацкі, Рагачоўскі, Сенненскі, Чавускі і інш.

[10] Літоўская губерня мела 19 паветаў, у тым ліку Ашмянскі, Слонімскі, Навагрудскі, Гродзенскі, Ваўкавыскі, Лідскі, Брэсцкі, Кобрынскі, Пружанскі. Губернскім горадам была Вільня.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З адменай Статута ВКЛ (1840) паветы былі скасаваны, але сам тэрмін захаваўся ў беларускай мове як адпаведнік "уезду" ў рускай мове.

З 1797 г. былі ўведзены воласці як састаўная частка павета, але ў 1830 – 1850 гг. яны былі скасаваны.

Паветы і воласці зноў былі адноўлены падчас рэформаў Аляксандра II. У 1861 г. паветы падзялілі на воласці. Воласці былі ўведзены для былых памешчыцкіх і дзяржаўных сялян як вышэйшая адзінка саслоўнага сялянскага самакіравання (існавалі валаснoе праўленне, суд, сход). Воласці былі скасаваны ў 1925 г. у БССР.

У перыяд праўлення Часовага ўрада Віленская, Віцебская, Магілёўская і Мінская губерні атрымалі назву "Заходняя вобласць" з цэнтрам у Мінску[11], якая ў верасні 1918 г. была перайменавана ў Заходнюю камуну і праіснавала да абвяшчэння 1 студзеня 1919 г. Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР).

Стварэнне БССР мела велізарнае значэнне для нацыянальна-дзяржаўнага развіцця беларусаў. У рэспубліцы быў праведзены адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Аднак ва ўмовах польскага наступлення ў лютым 1919 г. Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні былі ўключаны ў склад РСФСР, а замест Магілёўскай губерні была ўтворана Гомельская. Не занятая палякамі частка БССР увайшла ў Літоўска-Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку, якая пасля ўступлення польскіх войскаў у Мінск спыніла сваё існаванне.

Паводле Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. значная частка беларускіх зямель адышла да Польшчы. У складзе БССР засталіся толькі шэсць паветаў: Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, Мінскі і Слуцкі былой Мінскай губерні. У гэтых межах 30 снежня 1922 г. БССР увайшла ў склад СССР. У выніку двух тэрытарыяльных узбуйненняў рэспублікі ў 1924 і 1927 гг. з РСФСР былі вернуты ўсходнія беларускія землі, што было адной з прычын змен адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Заменены былі назвы адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак дарэвалюцыйнага перыяду. Замест губерняў, паветаў і валасцей з'явіліся акругі, раёны і

[11] З-за пагрозы нямецкага наступлення цэнтр перанесены ў Смаленск (люты 1918 г.).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сельскія саветы. Паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу 17 ліпеня 1927 г. былі створаны 10 акруг, 100 раёнаў і 1202 сельскія саветы. Запланаванае на пачатак 1930 г. трэцяе ўзбуйненне тэрыторыі БССР не адбылося і частка яе ўсходніх зямель засталася ў складзе РСФСР. Да 1930 г. акругі ў БССР былі скасаваныя, але захаваўся падзел на раёны, колькасць якіх паменшылася да 90 за кошт узбуйнення. У 1935 г. адноўлены чатыры акругі на граніцы з Польшчай: Лепельская, Мазырская, Полацкая і Слуцкая.

У студзені – лютым 1938 г. былі ўтвораны пяць абласцей: Віцебская, Гомельская, Магілёўская, Мінская і Палеская.

Тэрыторыя Заходняй Беларусі з 1921 г. па 1939 г. знаходзілася ў складзе Польшчы, дзе мела неафіцыйную назву "крэсы всходне" (ускраінныя ўсходнія землі). У БССР для гэтага рэгіёну выкарыстоўвалі геаграфічную назву "Заходняя Беларусь", вядомую значна раней, чым быў заключаны Рыжскі мірны дагавор[12]. На землях Заходняй Беларусі былі ўтвораны чатыры ваяводствы – Віленскае, Навагрудскае, Беластоцкае і Палескае (ваяводскі цэнтр – г.Брэст-над-Бугам) і 26 паветаў. Ва ўсіх паветах Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў пераважала беларускае насельніцтва; у Беластоцкім ваяводстве было восем беларускіх паветаў (Аўгустоўскі, Беластоцкі, Бельскі, Ваўкавыскі, Гродзенскі, Саколкаўскі, Сувалкаўскі і частка Высока-Мазавецкага). У Палескім ваяводстве беларусы не складалі большасці толькі ў двух паветах. Паветы падзяляліся на гміны.

17 верасня 1939 г. Заходняя Беларусь была ўключана ў склад БССР. На яе тэрыторыі стварылі новыя вобласці: Баранавіцкую, Беластоцкую, Вілейскую і Пінскую.

Напярэдадні Другой сусветнай вайны, частка беларускіх зямель была перададзена Прыбалтыйскім рэспублікам, у тым ліку Віленскі край, сельскае насельніцтва якога пераважна было беларускім.

У час нямецка-фашысцкай акупацыі ў 1941–1944 гг. заходняя частка беларускіх зямель пад назвай акругі "Беларусь" была ўключана ва Усходнюю Прусію, паўднёвыя землі – у рэйхскамісарыят "Украіна", а ўсходнія – у зону тылу. Астатняя частка, прыкладна 1/3, была названа генеральнай ак-

[12] *Міхнюк, У.М.* Заходняя Беларусь: граніцы, тэрыторыя і насельніцтва: (гістарыягр. нататкі) / У.М.Міхнюк // Бел. гіст. часопіс. – 2004. – № 11. – С. 14–21.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ругай “Беларусь” з цэнтрам у Мінску рэйхскамісарыята “Остланд”. Сельсаветы былі перайменаваны ў воласці.

У пасляваеннай БССР неаднаразова адбываліся змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні. Пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкай акупацыі 17 раёнаў Беластоцкай і 3 раёны Брэсцкай абласцей былі перададзены Польшчы, ліквідавана Беластоцкая вобласць. 20 верасня 1944 г. створаны новыя вобласці: Бабруйская, Гродзенская і Полацкая, а Вілейская рэарганізавана ў Маладзечанскую. У 1954 г. адбылося скарачэнне абласцей і іх узбуйненне. Былі ліквідаваны Бабруйская, Баранавіцкая, Палеская, Пінская і Полацкая вобласці, а ў 1960 г. – Маладзечанская.

У 1964 г. былі праведзены даволі значныя змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні на раённым узроўні, а таксама адбылася шырокая кампанія па змене назваў населеных пунктаў, што было зроблена без уліку важнасці захоўвання гістарычных назваў. У далейшым колькасць раёнаў і сельскіх саветаў мянялася, павялічваўся лік гарадоў, устойліва памяншалася колькасць сельскіх пасяленняў.

На 1.01.2009 г. у Рэспубліцы Беларусь налічвалася 6 абласцей, 118 раёнаў, 112 гарадоў, 94 пасёлкаў гарадскога тыпу, 1347 сельскіх саветаў, 23 551 сельскі населены пункт. Горад Мінск мае статус самастойнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Існуюць 24 гарадскія раёны: на раёны падзяляюцца Мінск, абласныя гарады і Бабруйск[13].

Раяніраванне па прыметах прыроды належыць да найбольш складаных, таму што будуецца на шматлікіх прыметах і па кожнай навукоўцамі адпаведных прыродазнаўчых галін створана пэўная рэгіянальная структура. Гэта прыметы: тэктанічная (структура зямной паверхні на тэрыторыі Беларусі); кліматычная (колькасць ападкаў, тэмпература паветра, кірункі ветра і інш.); геамарфалагічная (раяніраванне далін рэк, камавых масіваў і інш.); феналагічная (назіранні за сокарухам, наступленнем цвіцення, калашэння, воскавай спеласці раслін); гідралагічная; глебавая; забруджання радыёнуклідамі; ландшафтная і інш. Кожная з іх выклікае ўвагу краязнаўцаў. Напрыклад, рэкі і азёры, якіх у Беларусі 30 тыс., з’яўляюцца не толькі аб’ектам навуковых даследаванняў,

[13] Регионы Республики Беларусь, 2009: стат. сб. – Мн.: Национальный статистический комитет Республики Беларусь, 2009. – С.28.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гаспадарчай дзейнасці, адпачынку, але і аказваюць вялікі ўплыў на фарміраванне свядомасці і выхаванне патрыятычных пачуццяў, любві да малой радзімы і да краіны. Прыкладаў таму безліч: А.Міцкевіч і возера Свіцязь, Э.Ажэшка, Я.Колас і Нёман, У.Караткевіч і Днепр… .

У рэгіянальных структурах, створаных па шматлікіх прыметах прыроды, шмат цікавых з'яў. Напрыклад, па прымеце колькасці ападкаў Рэчыца, што знаходзіцца ў Гомельскай вобласці, не ўваходзіць у Гомельскую зону, таму што большая частка вобласці мае 600–650 *мм* ападкаў у год, а ў Рэчыцы іх 650–700 *мм* у год.

Рэгіянальныя прыродныя структуры, створаныя паводле спецыяльных прымет, як правіла, выкарыстоўваюцца ў спецыяльных бібліятэках для падрыхтоўкі бібліяграфічнай прадукцыі і выканання запытаў спецыялістаў. У краязнаўчай дзейнасці бібліятэкараў публічных бібліятэк вялікае значэнне мае веданне буйнейшых прыродна-геаграфічных правінцый, выдзеленых па сукупнасці прыродных прымет. На тэрыторыі Беларусі такіх правінцый пяць – гэта Беларускае Паазер'е, Беларуская ўзвышанасць, Перадпалессе, Прыдняпроўе (Усходне-Беларуская правінцыя), Беларускае Палессе.

Адметнымі тэрытарыяльнымі аб'ектамі з'яўляюцца прыродныя запаведнікі і заказнікі. Дзяржаўны запаведны фонд Рэспублікі Беларусь ахоплівае 1580 *млн га*. На гэтай тэрыторыі ёсць запаведныя зоны, якія з'яўляюцца не толькі нацыянальным гонарам беларусаў, але належаць да каштоўнейшых мясцін у свеце. Гэта Бярэзінскі біясферны запаведнік, запаведнік “Белавежская пушча”, Прыпяцкі запаведнік, Нарачанскі запаведнік, запаведнік “Браслаўскія азёры”. У запаведны фонд уваходзяць 94 заказнікі рэспубліканскага і 458 заказнікаў мясцовага значэння, 333 помнікі прыроды рэспубліканскага значэння.

У дзейнасці бібліятэкара-краязнаўца, як правіла, узнікае неабходнасць спалучаць прыметы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага і прыродна-геаграфічнага падзелу. Падрабязныя геаграфічныя і прыродныя апісанні правінцый і іншых аб'ектаў падаюцца ў навуковай літаратуры, шматлікіх даведачных выданнях, адлюстраваны на картах. Асобна варта звярнуць увагу на вучэбныя дапаможнікі, выдадзеныя ва універсітэтах краіны (“Геаграфія Віцебскай вобласці” і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сучасным этапе эканамічнае раяніраванне праводзіцца часцей за ўсё на аснове адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Але ў межах адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу створаны падрабязныя гаспадарчыя карты і апісанні. Са спецыяльнымі мэтамі эканамічнага стымулявання створаны свабодныя эканамічныя зоны ў Мінску, Гомелі, Гродна і іншых буйных прамысловых цэнтрах.

У мінулым таксама існавалі пэўныя эканамічныя тэрытарыяльныя адзінкі. Эканамічныя адзінкі ў ВКЛ – староствы і эканоміі – служылі для забеспячэння патрэб двара караля (вялікага князя), цэнтральных кіруючых органаў.

Самастойнымі эканамічнымі адзінкамі ў краязнаўчых даследаваннях і апісаннях з'яўляюцца прамысловыя, сельскагаспадарчыя і іншыя прадпрыемствы.

## Пытанні і заданні

1. Дайце азначэнне краязнаўства, раскрыйце яго ролю і задачы.
2. Назавіце арганізацыйныя формы краязнаўства.
3. Дайце характарыстыку краязнаўства па прымеце суб'екта.
4. Ахарактарызуйце крыніцы і метады краязнаўства.
5. Пералічыце прыметы, па якіх вядзецца падзел тэрыторыі краіны на часткі.
6. Па якой прымеце падзел краіны на часткі лічыцца пераважна штучным?
7. Ахарактарызуйце падзел Беларусі па адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прымеце ў розныя гістарычныя перыяды.
8. Ахарактарызуйце рэгіянальнае раяніраванне Беларусі па прыродна-геаграфічнай і эканамічнай прыметах.

## Тэст

I. Дайце азначэнне

*Заданне 1.* Краязнаўства – гэта ________________________

____________________________________________________

____________________________________________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заданне 2.* Край – гэта ______________________________
______________________________________________________
______________________________________________________

*Заданне 3.* Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел – гэта
______________________________________________________
______________________________________________________
______________________________________________________

II. Прадоўжыце лагічны рад

*Заданне 4.* Дзяржаўнае краязнаўства, __________________,
______________________________________________________
______________________________________________________

*Заданне 5.* Беларускае Паазер'е, ______________________,
_______________, __________________, __________________

*Заданне 6.* Рэчавыя крыніцы, __________________________,
______________________, ______________________________

III. Дапоўніце сказы

*Заданне 7.* Паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1565–1566 гг. ВКЛ была падзелена на _____________

*Заданне 8.* Беларускія землі ў перыяд ВКЛ уваходзілі ў ваяводствы: __________________________________________

*Заданне 9.* Упершыню тэрмін "беларускі" быў выкарыстаны ў якасці назвы адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі
______________________________________________________

IV. Адзначце правільны (ыя) адказ (ы)

*Заданне 10.* Воласці ў БССР былі створаны ў:

а) 1924 г.,
б) 1930 г.,
в) 1938 г.,
г) 1940 г.

*Заданне 11.* У 1954 г. былі ліквідаваны вобласці:

а) Бабруйская,
б) Баранавіцкая,
в) Палеская,
г) Маладзечанская,
д) Пінская,
е) Полацкая,
ж) Беластоцкая.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## V. Суаднясіце

*Заданне 12.* Удзельнікаў краязнаўчага руху з формамі краязнаўства:

| | |
|---|---|
| 1. Мінскі абласны краязнаўчы музей (г.Маладзечна) | а) Дзяржаўнае краязнаўства |
| 2. ЦБ імя Я. Купалы г.Мінска | б) Грамадскае краязнаўства |
| 3. Прадпрымальнік, кіраўнік юрыдычнай фірмы, краязнавец А.Атнагулаў, даследчык Убарцкага Палесся (Гомельшчына) | в) Школьнае краязнаўства |
| 4. Гістарычна-краязнаўчы музей Радуньскай СШ Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці | |
| 5. Кафедра методыкі выкладання беларускай літаратуры і краязнаўства ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С.Пушкіна | |

*Заданне 13.* Адзінкі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу з гістарычнымі перыядамі, у якія яны існавалі:

| | |
|---|---|
| 1. Ваяводствы | а) ВКЛ |
| 2. Губерні | б) Расійская імперыя |
| 3. Вобласці | в) БССР |
| 4. Раёны | г) Заходняя Беларусь (1921–1939) |
| 5. Паветы | д) Рэспубліка Беларусь |

## VI. Ці згодны Вы са сцвярджэннем? (Так/Не)

*Заданне 14.* “Свабодныя эканамічныя зоны” існавалі ў БССР.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел II. УЗНІКНЕННЕ КРАЯЗНАЎЧЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (да 1794 г.)

## Глава 1. Патрыятызм як рыса народнай свядомасці беларусаў і светапоглядная аснова краязнаўчага руху

Узнікненню краязнаўства як грамадскага руху і краязнаўчых даследаванняў беларускіх зямель папярэднічалі складаныя працэсы фарміравання беларускага этнасу і яго тэрыторыі. Значны ўплыў аказалі канкрэтна-гістарычныя ўмовы дзяржаў, у межы якіх уваходзілі ў пэўныя перыяды беларускія землі.

У XVI–XVIII стст. у Вялікім княстве Літоўскім, у тым ліку на беларускіх землях, склаліся іерархічная адміністрацыйна-тэрытарыяльная структура і сістэма рэгіянальнага кіравання, а таксама сістэма тэрытарыяльна-канфесіянальнай, судовай і адукацыйнай арганізацыі. Землі Беларусі забудоўваліся гарадамі, мястэчкамі, вёскамі і іншымі населенымі пунктамі, гаспадарчымі і абароннымі аб'ектамі. Сяляне і рамеснікі, якія любілі і шанавалі сваю працу, зямлю, дом, сям'ю, баранілі іх у час войнаў, а ў мірны час з пакалення ў пакаленне перадавалі вопыт, тэхналогію, бытавыя і рэлігійныя традыцыі, свае адносіны да наваколля выражалі ў вуснапаэтычнай, песеннай і іншых этнаграфічных формах. Людзі адукаваныя, пабываўшыя ў розных кутках краіны і Еўропы з мэтамі набыцця прафесійнай адукацыі, усталявання рэлігійных і гандлёвых сувязей, і вайскоўцы, удзельнікі шматлікіх войнаў, імкнуліся выразіць любоў да родных мясцін у пісьмовых тэкстах. Бессмяротнымі словамі грамадзянін і патрыёт Ф.Скарына ў прадмове да кнігі "Юдзіф" выразіў агульную для людзей і так адметную для беларусаў каштоўнасць малой радзімы: "Як ад нараджэння звяры, што ходзяць у пустыні, ведаюць ямы свае; птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць па моры і рэках, чуюць віры свае; пчолы і падобныя ім бароняць вуллі свае, – гэтак і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормлены… да таго месца вялікую ласку маюць"[14]. Прыгажосць і магутнасць радзімы ўславіў

[14] Гл. прадмову да кнігі "Юдзіф".

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

Мікола Гусоўскі ў “Паэме пра зубра”. Тэксты таго часу сведчаць, што ў светапоглядзе літвінаў-беларусаў родныя мясціны, родны дом займалі выключнае месца. Родны дом, родны кут жывілі пачуцці патрыятызму, беражлівых і паважлівых адносін да людзей і прыроды, – тых каштоўных рыс беларусаў, што вызначылі фарміраванне асаблівасцей нацыянальнага менталітэту.

У 1569 г. была адкрыта Віленская езуіцкая акадэмія – адзіная ВНУ на этнічнай тэрыторыі Беларусі. Стварэнне ВНУ станоўча паўплывала на паглыбленне навуковых інтарэсаў і патрыятычных настрояў моладзі. Многа выхадцаў з беларускіх зямель накіроўваліся на вучобу ва універсітэты Еўропы. Універсітэцкая адукацыя дазволіла беларускім шляхціцам і гараджанам прыняць актыўны ўдзел у фарміраванні палітычнага курса, развіцці нарматыўна-прававой базы дзяржаўнага і рэгіянальнага ўзроўняў кіравання, авалодаць прыкладнымі спецыяльнасцямі.

Выхаванне, сямейная традыцыя і адукацыя таго часу прывівалі шляхецкай моладзі рысы годнасці і гонару за свой род, продкаў, абавязковымі былі веды асабістай і мясцовай генеалогіі. Адукаванасці, фарміраванню духоўных, маральна-этычных і светапоглядных рыс асобы вельмі спрыялі кнігі, чытанне і бібліятэкі, якія шанаваліся беларусамі-літвінамі і былі адметным элементам культуры на беларускіх землях.

Сістэма школьнай адукацыі стваралася і ўпраўлялася царкоўнымі брацтвамі, хрысціянскімі царкоўнымі ордэнамі, сярод якіх асабліва спаборнічалі езуіты і піяры. У школах, створаных у гарадах і мястэчках, разам з комплексам тэалагічных дысцыплін дзеці вывучалі гісторыю, логіку, этыку, беларускую, польскую і іншыя замежныя мовы. Школьная рэформа, праведзеная ў сярэдзіне XVIII ст., была накіравана на ўмацаванне свецкага элемента адукацыі ў школах каталіцкіх ордэнаў. Улічваючы патрабаванні часу, уздым эканамічнага і культурнага жыцця ў краіне, быў паменшаны час на вывучэнне латыні і тэалагічных дысцыплін. Важнае значэнне надавалася патрыятычнаму і грамадзянскаму выхаванню вучняў. Для гэтага шырока ўводзіліся польская мова, айчынная гісторыя, прыродазнаўчыя і грамадскія навукі. Вывучэнне гісторыі сваёй дзяржавы, палітыкі, дзе адбывалася азнаямленне не толькі з творамі па палітычных пытаннях, але

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і “мясцовымі законамі і правамі”, польскай мовы, якая, на жаль, у сярэдзіне XVIII ст. займала ў свядомасці і зносінах адукаваных літвінаў-беларусаў месца беларускай, сталі магутнымі фактарамі патрыятычнага і грамадзянскага выхавання.

У 1773 г. пасля скасавання ордэна езуітаў была ўтворана Адукацыйная камісія, якая ўзначаліла дзяржаўнае кіраўніцтва асветай. Кірункі дзейнасці Адукацыйнай камісіі ахапілі школьную сістэму і бібліятэчную справу краіны і разглядаліся як непарыўна звязаныя элементы адукацыі і грамадзянскага выхавання. Віленская езуіцкая акадэмія была рэфарміравана ў Галоўную школу ВКЛ. Выпускнікі калегіумаў і Галоўнай школы ВКЛ вызначаліся высокай грамадзянскай свядомасцю, патрыятычнасцю, унеслі адметны ўклад у правядзенне рэформаў 80–90-х гадоў XVIII ст. у Рэчы Паспалітай.

У другой палове XVIII ст. у Рэчы Паспалітай, у тым ліку на Беларусі, пачала функцыянаваць адна з першых у свеце сетак дзяржаўных публічных бібліятэк, даступных усім жадаючым, на базе бібліятэк навучальных устаноў. Адукацыйная камісія ў сваёй дзейнасці рэалізавала клопаты дзяржавы аб асвеце народа без розніцы саслоўяў і маёмаснага стану. Усё гэта ў сувязі са значнымі дасягненнямі ВКЛ і Рэчы Паспалітай у галіне дзяржаўнага кіравання, навукі і адукацыі, літаратуры, кніжнай і бібліятэчнай справы, эканамічных і культурных сувязей з замежнымі краінамі спрыяла ўзнікненню краязнаўства.

## Глава 2. Узнікненне гісторыка-краязнаўчых апісанняў і даследаванняў

Краязнаўчая дзейнасць, для якой і сёння ўласціва асабістая ініцыятыва таленавітых даследчыкаў, узнікала павольна і праявілася ў імкненні асобных адукаваных людзей адлюстраваць, зафіксаваць на паперы і тым самым зберагчы і перадаць наступным пакаленням звесткі аб мінулым і сучаснасці свайго краю, роду, сям’і і аб сваім жыцці. Назапашаны чалавекам аб’ём ведаў аб краі і сваіх продках, засваенне ім мясцовых традыцый і звычаяў складалі асабістыя краязнаўчыя веды чалавека, якія ў той ці іншай ступені ў мінулым і сёння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўласцівы кожнаму. Але ў ВКЛ узнікла і дакументаванне гэтых ведаў, якому натуральна спадарожнічаюць іх лагічная апрацоўка, наданне ім зручнай і цікавай формы. Веды, пададзеныя ў рукапісах і друкаваных кнігах, станавіліся здабыткам сацыяльнай супольнасці рэгіёну, краіны. Менавіта дакументаванне ведаў аб рэгіёнах стала пачаткам грамадскага (аматарскага) і навуковага краязнаўства.

Сярод прадвеснікаў краязнаўчага руху былі летапісцы. Звесткі краязнаўчага характару знайшлі адлюстраванне ў напісаных імі хроніках і летапісах, прысвечаных ВКЛ, Рэчы Паспалітай, а таксама ў рэгіянальных летапісах. Летапісы і хронікі належаць да гістарычных першакрыніц і захоўваюць вялікую каштоўнасць ў гісторыка-краязнаўчых даследаваннях. Яны з'яўляюцца крыніцай фактаў і звестак, якія часам нельга атрымаць па іншых крыніцах. Звесткі з хронік краязнаўцы-даследчыкі імкнуцца супаставіць з данымі, атрыманымі з іншых крыніц, каб упэўніцца ў іх дакладнасці. Бібліятэкары выкарыстоўваюць гэтыя творы ў дзейнасці па папулярызацыі краязнаўчых ведаў, пры выкананні фактаграфічных даведак і падрыхтоўцы фактаграфічных і бібліяграфічных картатэк ці БД.

Летапісы і хронікі ствараліся адукаванымі людзьмі, для якіх падзеі ў краіне і родных мясцінах уяўляўліся гістарычна значнымі, узнікала жаданне зафіксаваць іх і гэтым захаваць для нашчадкаў. У летапісах і хроніках у той ці іншай ступені праяўляюцца суб'ектыўныя рысы творцы: палітычныя сімпатыі, рэлігійнасць, этнічная прыналежнасць і іншыя, хаця ў цэлым пераважала характэрная для сярэдзіны мінулага тысячагоддзя стрыманасць у адлюстраванні асабістага "я". Летапісы і хронікі пісаліся па памяці ці з выкарыстаннем дзённікавых запісаў, што надае ім рысы мемуараў. Аўтары шэрага хронік вывучалі разнастайныя гістарычныя дакументы, што набліжае іх творы да гістарычных даследаванняў. Разам з дакладнымі фактамі ў летапісах па розных прычынах маюцца і памылковыя звесткі.

Мясцовае летапісанне зарадзілася на беларускіх землях у XII–XIV стст., але матэрыялы яго амаль не дайшлі да нашага часу[15]. У перыяд росквіту летапісання на Беларусі (і ў ВКЛ наогул) – XV–XVI стст. – былі створаны агульнадзяржаўныя

[15] Выклікае спрэчкі існаванне Полацкага летапісу XII ст.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хронікі і летапісы на беларускай мове (“Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”, “Хроніка Быхаўца”). На іх старонках адлюстраваны звесткі аб многіх беларускіх населеных пунктах, асабліва Вільні, Полацку, Навагрудку, падзеях, прыродзе, аб насельніцтве і адметных асобах.

Рэгіянальныя летапісы, напісаныя мясцовымі дзеячамі, не толькі змяшчаюць звесткі аб важных грамадска-палітычных і ваенных падзеях у краіне і свеце, але і дакладна перадаюць мясцовыя звесткі, раскрываюць асаблівасці ладу жыцця, адносін паміж людзьмі, прыродныя з’явы. Дайшлі да нашага часу хронікі і летапісы сяла Баркулабава, гарадоў Віцебска і Магілёва. Так, у “Баркулабаўскай хроніцы”[16] адлюстраваны падзеі канца XVI – пачатку XVII ст. пераважна на Магілёўшчыне, у сяле Баркулабаве, якое існуе сёння і з’яўляецца цэнтрам сельскага савета, а таксама ў Быхаве, Магілёве, Віцебску, Полацку і іншых мясцовасцях Беларусі. Ёсць звесткі аб палітычных падзеях у Масковіі. Аўтарам хронікі лічыцца мясцовы праваслаўны святар Фёдар Філіповіч. Пачынаецца хроніка са звестак аб засяленні г. Магілёва прышлымі людзьмі з розных сёл, аб пабудове ў горадзе замка, аб заснаванні ў 1564 г. панам Баркулабам Корсакам замка і сяла Баркулабава, пра важнейшыя падзеі, якія адбываліся ў сяле і яго наваколлі. “У год 1580 … маскоўцы, Сярэбраны з вялікім войскам, спалілі Магілёў, славуты горад. У тым жа краі Шклоў, Копысь і вёскі былі вельмі спустошанымі, а таксама і каля Магілёва”[17]. Непаўторныя сцэны мясцовага жыцця летапісец перадае праз апісанні вясковых падзей: хрышчэнне яўрэйскай дзяўчыны Сціркі, роспач, праклёны і чары яе маці, неўраджаі, жахлівыя галодныя гады, грозныя з’явы прыроды і інш.

На зыходзе летапісання ў XVIII ст. былі створаны гарадскія хронікі. Найбольш вядомыя “Магілёўская хроніка ” і “Віцебскі летапіс”. Асабліва каштоўнымі ў іх з’яўляюцца сціслыя звесткі аб гарадскім жыцці ў канцы XVII–XVIII ст. У “Магілёўскай хроніцы” адлюстраваны не толькі падзеі, але выразна прасочваюцца патрыятычныя настроі гараджан. З гонарам гучаць словы храніста: “Не ўступае горад Магілёў, з

[16] Баркулабаўская хроніка // Беларускія летапісы і хронікі. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1997. – С. 218–256.
[17] Там жа, с. 221.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ласкі Маткі Божай, Кіеву …”[18]. Між іншым выдатнае ўражанне ад наведвання Магілёва апісалі і замежныя госці. “Город Магилев велик… многим болши Смоленска… улицы вымощены диким камнем. Рядов в Магилеве много, в которых зело много для продавания всяких товаров изрядных; в рядах лавки каменные”, – такія і іншыя цікавыя звесткі занатаваў рускі стольнік П.А.Талстой[19].

“Віцебскі летапіс” меншы па аб’ёме і бяднейшы па змесце. Звесткі падаюцца без ацэнкі і выяўлення асабістых меркаванняў храністаў. Прыкладам афармлення звестак можа быць паведамленне аб трагічнай падзеі вялікага гарадского пажару: “У год 1707. У месяцы маі ў Віцебску каля рынку згарэла 45 дамоў”[20].

Сярод храністаў у XVI ст. з’явіліся дзеячы, для якіх збіранне звестак, іх апрацоўка, упарадкаванне і публікацыя набылі сэнс прафесійнай дзейнасці. Для Аляксандра Гваньіні, Мацея Стрыйкоўскага вывучэнне гістарычнага мінулага беларуска-літоўскіх зямель, апісанне сучасных з’яў і падзей, высвятленне адметных рыс мясцовага насельніцтва стала сапраўдным захапленнем, прыцягнула іх да вывучэння гістарычных дакументаў і матэрыяльных аб’ектаў, зносін са знаўцамі мінуўшчыны, назіранняў за побытам і звычаямі людзей. Але галоўнае, што набытыя і асэнсаваныя веды былі адлюстраваны імі ў кнігах – першых апісаннях, выкананых на ўзроўні тагачаснай метадалогіі гістарычнай навукі[21].

Складана сёння дакладна вызначыць, што выклікала ў гэтых маладых чужаземцаў незвычайны інтарэс да новых мясцін, людзей, імкненне праз стагоддзі разглядзець гістарычныя шляхі мужнага народа, які са зброяй адстойваў сваю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[18] Магілёўская хроніка // Беларускія летапісы і хронікі. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1997. – С. 285.

[19] Путешествие стольника П.А.Толстого по Европе, 1697–1699 / подгот. А.А.Ольшевская, С.Н.Травников. – М.: Наука, 1992. – С. 11.

[20] Віцебскі летапіс // Беларускія летапісы і хронікі. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1997. – С. 269.

[21] Гістарычныя звесткі аб беларускіх тэрыторыях да XVI ст. адлюстраваны ў творах замежных гісторыкаў. Знакаміты польскі гісторык Ян Длугаш у “Corogrhaphie Regni Poloniae” (Хроніках) змясціў шэраг звестак аб падзеях у беларускіх рэгіёнах. Напрыклад, ён паведамляе, што ў 1411 г. кароль Уладзіслаў гасцяваў у Вітаўта і княгіні Ганны ў Полацку, Віцебску, Смаленску, Крычаве і Заслаўі, а свята Божага нараджэння 1412 г. сустрэў у Гродне.

незалежнасць. Напэўна, уражанні былі моцнымі, таму што ні па абранай ваеннай прафесіі, ні па адукацыі (ні А.Гваньіні, ні М.Стрыйкоўскі не закончылі універсітэт) яны наўрад да пэўнага часу звязвалі сваю будучыню з навуковай і літаратурнай дзейнасцю. Але абставіны і захапленні, таленавітасць і здольнасць да даследчай працы пераўтварылі іх ва ўважлівых і дапытлівых гісторыкаў-краязнаўцаў.

Лёс наканаваў сустрэчу ў Віцебску А.Гваньіні (1534–1614) і М.Стрыйкоўскага (1547–1593), дзе яны неслі вайсковую службу. Захапленні мінулым краю, праца над гістарычнымі кнігамі рабілі іх зацікаўленымі суразмоўцамі. Камендант Віцебска ротмістр Гваньіні навучыў Стрыйкоўскага рабіць планы і малюнкі замкаў і фартэцый (крэпасцей). У баявых паходах яны знаходзілі магчымасць збіраць матэрыялы для будучых прац, наведваць руіны замкаў, палі бітваў, курганы, з вялікім інтарэсам вывучалі хронікі і летапісы. Дарэчы, М.Стрыйкоўскі тройчы пазбегнуў маскоўскага палону, але атрымаў траўму, з-за якой пачаў заікацца, што перашкаджала ў зносінах, Гваньіні быў паранены і толькі па шчаслівым выпадку вызвалены з палону.

А.Гваньіні ў 1578 г. выдаў у Польшчы на лацінскай мове “Хроніку еўрапейскай Сарматыі”. Кніга шмат разоў перавыдавалася на польскай і іншых еўрапейскіх мовах. Асаблівую ўвагу Гваньіні надаў адлюстраванню звычаяў і абрадаў, матэрыяльнай і духоўнай культуры жыхароў Верхняга Падняпроўя. Гваньіні апісаў адметныя беларускія краявіды, крэпасці, мястэчкі і гарады. Доўгі час панавала меркаванне, што кніга “Хроніка еўрапейскай Сарматыі” на самай справе напісана М.Стрыйкоўскім, але была апублікавана Гваньіні пад уласным імем. У наш час прафесар А.П. Грыцкевіч адзначыў, што разам з запазычаннем з прац Стрыйкоўскага матэрыялу Гваньіні падае і арыгінальныя гістарычныя звесткі[22].

Першым вялікім даследаваннем М.Стрыйкоўскага стаў твор “Аб пачатках, паходжанні, справах рыцарскіх і дамовых слаўнага народа літоўскага, жамойцкага і рускага ...”[23], са старонак якога паўстала мінулае многіх мясцін Беларусі. А праца даследчыка “Хроніка Польская, Літоўская, Жамойцкая

[22] Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн.: БелЭн, 1994. – Т. 2. – С. 500.
[23] Апублікаваны на беларускай мове ў 1978 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і ўсёй Русі” (1582) стала класічным гістарычным творам. У “Хроніцы …” многа апісанняў разнастайных падзей з жыцця беларускіх рэгіёнаў, у тым ліку спусташальных набегаў пад кіраўніцтвам Махмета Кірэя ў 1506 г.

Малады даследчык шукаў мецэнатаў, таму што гэта быў адзіны шлях доступу да радавых магнацкіх архіваў. Эрудыцыя і вядомасць лепшага знаўцы мясцовай гісторыі прыцягнулі да М.Стрыйкоўскага ўвагу Хадкевічаў, Алелькавічаў, Гедройцаў, у дамах якіх ён знаходзіў каштоўныя гістарычныя крыніцы, карыстаўся выдатнымі бібліятэчнымі зборамі. Асвятляючы мінулае ВКЛ, ён зрабіў каля 300 спасылак на летапісы, якія “па-руску пісаны”, паведаміў, што 12–14 летапісаў здабыў сам “з вялікімі стратамі працы і сродкаў”, адзін з самых лепшых атрымаў ад князёў Заслаўскіх[24]. Няўрымслівы гісторык, паэт і мастак М.Стрыйкоўскі, стварыў грунтоўную аснову вывучэння мінулага асобных мясцін нашай радзімы. Звесткі, здабытыя краязнаўцам, трывала ўвайшлі ў гістарычную навуку і гістарычную памяць народа. Гэта можна асэнсаваць нават на невялікіх прыкладах. Так, М.Стрыйкоўскі ўказаў 1065 г. як дату паходу літоўскіх князёў Кернуса і Гімбуса на паўночна-ўсходнія землі Беларусі – на Браслаў і Полацк. Гэты год і стаў лічыцца датай заснавання Браслава. Між іншым Браслаў упершыню быў названы ў агульнадзяржаўнай “Хроніцы Быхаўца” менавіта ў сувязі з гэтай ваеннай падзеяй, але без даты.

Кальвініст Ян Ласіцкі (1534–1599) атрымаў добрую адукацыю ў краінах Еўропы, падарожнічаў, паступіў на службу выхавацелем дзяцей да мінскага кашталяна Я.Я. Глябовіча. Ласіцкага цікавілі тыя асаблівасці жыцця народа, якія пазней пачалі вывучацца этнографамі. У 1582 г. ён выдаў у Шпееры (Германія) зборнік прац розных аўтараў пад назвай “Пра рэлігію, ахвярапрынашэнне, вясельныя і пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў і татар”, у які ўвайшоў і яго твор. Я.Ласіцкі апісаў народнае адзенне, стравы, абрады беларусаў, архітэктуру Вільні, Полацка, выгляд беларускіх вёсак.

Дзякуючы беларускім летапісцам, імёны якіх нават не заўсёды вядомыя, апантанасці і эрудыцыі першых даследчыкаў беларускіх зямель М.Стрыйкоўскага, А.Гваньіні,

[24] *Улашчык, М.М.* Выбранае / М.М.Улашчык; уклад. А.Каўкі і А.Улашчыка. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2001. – С. 169–170.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я.Ласіцкага, якія ўласныя назіранні спалучылі з вывучэннем гістарычных крыніц, у канцы XVI ст. зараджаюцца першапачатковыя гістарычныя формы грамадскага і навуковага краязнаўства ў Беларусі. Яно выражалася ў прыватнай ініцыятыве па зборы, сістэматызацыі, апісанні і тлумачэнні гістарычных фактаў і падзей.

Гістарычныя звесткі аб беларускіх тэрыторыях да XVI ст. адлюстраваны ў творах замежных аўтараў, якія не бывалі ў ВКЛ, напрыклад, у "Хроніках" польскага гісторыка Я.Длугаша.

У XVII–XVIII стст. кола даследчыкаў беларускіх рэгіёнаў пашырылася, з'явіліся творы гісторыкаў беларускага паходжання. Вялікую зацікаўленасць у рэгіянальных гістарычных даследаваннях праявілі езуіты і базыльяне. У 1608 г. у Таварыстве езуітаў, дзе вельмі шанавалі гісторыю, была прынята інструкцыя аб стварэнні кожным прадстаўніцтвам уласнай хронікі. Наколькі выкананы быў праект, установіць пакуль што не ўдалося.

Вядомы гісторык Літвы ў XVII ст., прафесар і рэктар Віленскай акадэміі В.В.Каяловіч быў таленавітым вучоным, ініцыятыўным кіраўніком, яркай індывідуальнасцю. Ён распрацоўваў многія тэмы, у тым ліку звязаныя з развіццём асобных тэрыторый, быў выдатным генеолагам. Адметным укладам у развіццё гісторыі і краязнаўства з'яўляюцца напісаныя ім два гербоўнікі шляхты ВКЛ (вялікі на лацінскай мове[25] і скарочаны на польскай мове "Кампендыум"), генеалагічнае даследаванне роду Радзівілаў (1653), даследаванне рэлігійнага і навуковага жыцця Літвы ("Місцелланеа", 1650) і інш. Важнейшая яго праца "Гісторыя Літвы" мела вялікі поспех.

Беларускія землі ў сярэдзіне XVIII ст. вывучалі А.Нарушэвіч і І.Сцябельскі. Адам Тадэвуш Нарушэвіч (1733–1796), ураджэнец Піншчыны, езуіт, біскуп Смаленскі і Луцкі, пісар ВКЛ, быў вядомым пісьменнікам і вучоным. Яго паважаў кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, сам вялікі прыхільнік навук і мастацтваў. Галоўнай задачай, пастаўленай каралём, было напісанне грунтоўнай гісторыі Польшчы. А.Нарушэвіч лічыў неабходнай умовай гістарычнага даследавання дасканалае вывучэнне крыніц. Хронікі, гербоўнікі, гісторыі сем'яў, прывілеі, канстытуцыі і іншыя дакументы шукалі і капіравалі

[25] Не выдадзены, аўтограф захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў ВКЛ, Польшчы, Італіі, Швецыі. Даследчыкі імкнуліся ўстанавіць аўтэнтычнасць шэрага дакументаў. З сабраных матэрыялаў узніклі так званыя "тэкі Нарушэвіча" (папкі) у 231 томе, якія маюць вялікае значэнне[26]. У выпушчаных тамах аб беларускіх тэрыторыях маюцца невялікія фрагменты, у якіх адлюстраваны ранні гістарычны перыяд развіцця Польшчы да абрання на польскі трон Ягайлы, калі цесныя кантакты з літоўска-беларускімі землямі былі менш інтэнсіўныя. На жаль, падрыхтоўка выдання спынілася ў сувязі са скасаваннем Рэчы Паспалітай і смерцю вучонага. А.Нарушэвіч напісаў таксама біяграфію Яна Караля Хадкевіча, збіраў матэрыялы пра Льва Сапегу. Падарожжа разам са Станіславам Аўгустам на сейм у Гродна ў 1784 г. адлюстраваў у дыяруюшы (дзённіку).

Відавочна, што большасць даследчыкаў збіралі матэрыялы і пісалі пра многія беларускія землі, але з'яўляліся і самастойныя даследаванні, прысвечаныя асобным тэрыторыям. Базыльянскі манах Ігнат Сцябельскі (? – 1805 або 1808) вывучаў гісторыю уніяцкай царквы і свайго ордэна ў ВКЛ. Асобнае месца займала ў яго даследаваннях узнікненне хрысціянства на Полацкай зямлі, дзейнасць ігуменняў Ефрасінні Полацкай і Параскевы. Гэтым служыцельніцам хрысціянства ён прысвяціў працу "Два вялікія светачы на гарызонце Полацкім…" (т. 1–3, 1781–1783). Кнігі змяшчаюць багатыя бібліяграфічныя і фактаграфічныя матэрыялы, якія не страцілі значэнне да сённяшняга часу. Ігнат Сцябельскі таксама належыць да першых вядомых беларускіх гісторыкаў-краязнаўцаў.

Унікальныя звесткі аб рэгіёнах адзначаліся і ў мемуарнай літаратуры, якая пашырылася ў XVII–XVIII стст. Ураджэнцы Беларусі вайсковец Фёдар Еўлашоўскі, віцебскі ваявода Ян Храпавіцкі, брэсцкі кашталян Марцін Матушэвіч, мінскі ваявода Крыштаф Завішша і іншыя апісалі ва ўспамінах і дзённіках бягучыя падзеі ў краіне і сваёй мясцовасці, сямейныя, гаспадарчыя і судовыя справы, адносіны паміж людзьмі, святы, звычаі, канфесійнае жыццё і іншыя рысы, з якіх паўстаюць непаўторныя вобразы мінуўшчыны. У мемуарах найбольш прасочваюцца і эмацыянальныя асаблівасці літвінаў-беларусаў, успрыманне імі дзяржаўных, рэгіянальных і асабістых праблем.

[26] Большасць "тэк Нарушэвіча" зберагаецца ў Нацыянальным музеі ў Кракаве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Глава 3. Узнікненне рэгіянальных геаграфічных і прыродазнаўчых апісанняў і даследаванняў

У часы ВКЛ узніклі не толькі гісторыка-краязнаўчыя апісанні і даследаванні, але і прыродазнаўчыя. Іх кірункамі было картаграфаванне беларускіх зямель, вывучэнне і апісанне.

Картаграфаванне з’яўляецца адным з важных інструментаў краязнаўчых даследаванняў, а карты належаць да найбольш дакладных крыніц. Першыя беларускія геаграфічныя назвы захаваліся на старажытных картах, якія ствараліся ў замежных краінах, але дакладных звестак там мала. У наш час гісторыкі, асабліва Л.Р. Казлоў, выявілі шматлікія гістарычныя карты і даследавалі адлюстраванне на іх вядомых у мінулым геаграфічных аб’ектаў на тэрыторыі Беларусі. На старажытных картах адзначаліся г. Полацк, рэкі Нёман і Заходняя Дзвіна. З-за недастатковасці звестак і недасканаласці картаграфавання старажытныя карты былі няпоўнымі і недакладнымі. У XV–XVI стст. з’явіліся карты, на якіх былі пазначаны некалькі беларускіх гарадоў і рэк, паказаны назвы “Белая Русь” і “Чорная Русь”. У XVI ст. “бацька” польскай картаграфіі Б. Вапоўскі адлюстраваў на карце многа новых населеных пунктаў на землях Беларусі, лясоў і іншых аб’ектаў, выдатна паправіў сетку рэчак. Гэта карта была надрукавана ў выданні “Геаграфія” (1507, 1508) і шмат разоў перавыдавалася.

У канцы XVI ст. вялікага поспеху дасягнула картаграфічная дзейнасць у Беларусі. Мікалай Крыштаф Радзівіл Сіротка, разумеючы недасканаласць картаграфіі ВКЛ, выдзеліў сродкі для састаўлення новай вялікай карты краю. Галоўным аўтарам карты быў вядомы гравёр Тамаш Макоўскі. Для яе стварэння былі выкарыстаны навейшыя метады картаграфавання. Лічыцца, што ў састаўленні карты прымалі ўдзел езуіты, іх калегіум М.К.Радзівіл залажыў у Нясвіжы. У 1597 г. праца была закончана, але першае выданне карты (каля 1603 г.) не захавалася. У 1613 г. у Амстэрдаме пад назвай “Magni Ducatus Lithuaniae…” была выдадзена першая вялікая карта княства маштабам 1:1300 000. Карта адлюстравала фізіка-геаграфічную структуру беларускіх зямель, фактычна ўсе населеныя пункты. Гэта карта была апошнім словам картаграфіі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

да паловы XVIII ст. Высокую яе даставернасць пацвердзіла праведзенае ў 90-я гады XX ст. навуковым калектывам Беларускага дзяржаўнага і Маскоўскага універсітэтаў вывучэнне дакладнасці і паўнаты нанесеных аб'ектаў з дапамогай метаду зверкі іх з аб'ектамі, выяўленымі па цэлым комплексе пісьмовых крыніц. Не знайшлі сучасныя вучоныя толькі пяць населеных пунктаў, якія былі адзначаны на карце. Такім чынам, сярод мясцовага насельніцтва ў XVI–XVIII стст. з'явіліся спецыялісты, якія дасканала ведалі тагачасную геаграфічную структуру беларускіх зямель і рэгіянальную тапаніміку.

Апісанні прыроды беларускага краю пакінулі замежныя падарожнікі і айчынныя храністы і летапісцы. Вобразы беларускіх краявідаў пададзены ў "Трактаце аб дзвюх Сарматыях" (1517) рэктара Кракаўскага універсітэта Мацея Мяхоўскага, сачыненні "Аб норавах татараў, літоўцаў, масквіцян" (каля 1550) аўтара пад псеўданімам Міхалон Літвін, апісанні пасла Свяшчэннай Рымскай імперыі славака С.Герберштэйна, рускага стольніка П.А.Талстога і інш. Літоўска-беларускія землі ўяўляліся ім раўнінным краем з вялікімі лясамі і балотамі, мноствам рэк, з вельмі багатым жывёльным светам. У XV ст. звесткі аб фауне асобных мясцін Беларусі падаў Я.Длугаш у "Corogrhaphie Regni Poloniae", дзе ёсць раздзел, прысвечаны фауне. Ён падрабязна апісаў розныя віды і групы звяроў, птушак і рыб, адзначаючы іх шматлікасць, пералічыў віды рыб у асобных азёрах.

Мацей Мяхоўскі аб прыродзе беларускіх зямель паведамляў: "Дзікіх звяроў там больш, чым ва ўсім хрысціянскім свеце". Ён пералічыў найбольш буйных: "…буйвалы і лясныя быкі, якіх яны на сваёй мове называюць турамі або зубрамі, дзікія аслы і лясныя коні, алені, лані, газелі, козы, дзікі, мядзведзі, куніцы, вавёркі, расамахі…"[27] і інш. Таямнічасць магутных зуброў выклікала асаблівую зацікаўленасць. Прыгожы гімн гэтаму сімвалічнаму для Беларусі зверу склаў Мікола Гусоўскі ў "Песні пра зубра". Здзіўляліся замежнікі, як лёгка прыручаліся мядзведзі, што сустракаліся нават у дамах. Уважлівы П.А.Талстой адзначыў каля горада Міра вялікае месца, акружанае сасновым гаем, – звярынец

[27] *Грыцкевіч, В*. Шляхі вялі праз Беларусь: нарыс / В.Грыцкевіч, А.Мальдзіс. – Мн.: Маст. літ., 1980. – С.28.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Радзівіла. У звярынцы было шмат аленяў, ласёў, сайгакаў і іншых звяроў[28]. У рэках і азёрах Беларусі ў той час было багата рыбы. Міхалон Літвін часта быў сведкам лоўлі рыбы ў Прыпяці і яе прытоках паблізу Мазыра. Вось фрагмент з яго апісанняў: "…реки кишат невероятным количеством мальков и разной крупной рыбы, поднимающейся из моря вверх, в пресные воды. Некоторые из них называются золотыми, прежде всего Припять"[29]. Далей ён называе месца каля Мазыра, якое штогод у сакавіку напаўняецца такой колькасцю рыбы, што кінутае ў яе кап'ё затрымліваецца і стаіць старчаком, нібы ўторкнутае ў зямлю. Чужаземныя купцы ў гэты час напаўнялі рыбай да тысячы вазоў у дзень, што назіраў і сам аўтар.

Прырода ўплывала на стан сельскай гаспадаркі. Некаторыя іншаземныя аўтары прызнавалі, што зямля ў Беларусі даволі ўрадлівая. Гэта засведчылі С.Герберштэйн у апісаннях Гродзеншчыны і Р.Гейдэнштэйн – Полацкага ваяводства. А.Гваньіні апісаў апрацоўку глебы пад ворыва. Вось паданыя ім звесткі аб тэхналогіі вырошчвання добрага ўраджаю збожжа, якая прымянялася на Віцебшчыне і ў іншых месцах: з дзвюма часткамі ячменю змешвалі частку жыта і высявалі вясной. У першае лета жалі толькі ячмень. Жыта ж буйна кусцілася і пакідалася на зіму. На наступны год яно разрасталася так густа, што з яго ледзь віднеўся чалавек, які сядзеў на кані. З аднаго зернейка вырастала да 30 высокіх каласоў.

У апошняй чвэрці XVIII ст. у Гродна і Вільні пачаліся краязнаўчыя навуковыя даследаванні беларускай прыроды, якая звязаны з імёнамі вучоных Ж.Э.Жылібера і С.Б.Юндзіла.

Па запрашэнні А.Тызенгаўза, кіраўніка каралеўскіх эканомій і старасты, у Гродна прыбыў вядомы французскі ўрач Жан Эмануэль Жылібер (1741–1814). Таленавіты арганізатар, пачынальнік многіх выдатных спраў, А.Тызенгаўз бачыў неабходнасць палепшыць гарадскую інфраструктуру: развіваць медыцынскае абслугоўванне, навуку, адукацыю, падняць эканоміку. У 1775 г. Жілібер пачаў працаваць у прыгарадзе Гродна – Гарадніцы. Ён арганізаваў у горадзе медыцынскую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[28] Путешествие стольника П.А.Толстого по Европе, 1697–1699 / подгот. А.А.Ольшевская, С.Н.Травников. – М.: Наука, 1992. – С.20.

[29] *Литвин Михалон*. О нравах татар, литовцев и москвитян / Михалон Литвин; пер. В.И.Матузовой. – М.: Изд-во МГУ, 1994. – С.97.

акадэмію (школу), планаваў адкрыць сельскагаспадарчую і ветэрынарную школы і Акадэмію навук, стварыў каралеўскі батанічны сад, дзе размясціў 1500 відаў экзатычных і мясцовых раслін.

Дапытлівы Жылібер зацікавіўся наваколлем: рэльефам, глебамі, расліннасцю, карыснымі выкапнямі, жывёльным светам. На Гродзеншчыне вучоны быў першым, хто сістэматычна апісваў расліны, укладаў гербарый, а жывыя расліны пераносіў у батанічны сад. Разам са студэнтамі ён пачаў праводзіць экскурсіі ў прыроду з мэтай збору розных відаў раслін. Гэта былі першыя краязнаўчыя экскурсіі, вядомыя на Беларусі. Яны сведчаць аб далучэнні студэнтаў да краязнаўчых даследаванняў.

Характарызуючы геаграфічнае палажэнне ВКЛ, Жылібер адзначыў вышэйшыя кропкі каля Вільні, Гродна і Навагрудка, а таксама багатыя залежы торфу ў басейне Нёмана, выказаў гіпотэзу яго ўзнікнення. Жылібер і іншыя вучоныя, вывучаючы глебы Панямоння, знаходзілі ў ваколіцах Гродна, Навагрудка і Нясвіжа напаўкаштоўныя камяні, якія карысталіся ў той час вялікім попытам. У пясчаных пластах каля Гродна трапляліся агаты і сердалікі, асабліва многа было бурштынаў. Аднойчы Жылібер знайшоў бурштын жоўта-апельсінавага колеру велічынёй з кулак. Французскі даследчык здзіўляўся мноству нябачнага раней крэмнію, звонку пакрытага белай карой, а ўнутры чорнага, бліскучага і цвёрдага. У некаторых мясцінах Жылібер і яго вучні адкопвалі каменныя глыбы цёмна-сіняга і крывянога колеру, пры паліроўцы якіх атрымліваліся пліты, па цвёрдасці роўныя яшме. У наваколлі Гродна вучоны са студэнтамі збіраў таксама акамянеласці рыб, птушак, звяроў, раслін; старанна вывучаў іх паходжанне і прыметы.

Жылібер уважліва сачыў і за кліматам Панямоння. Яго даныя фіксуюць пацяпленне клімату ў параўнанні з апісаннямі XV–XVI стст. “Клімат у Літве халодны, – адзначаў ён, але не настолькі, як уяўляюць. Я старанна прымячаў на працягу сямі гадоў найвышэйшыя ступені празмернага холаду і магу ўпэўнена сказаць, што ў кожны год ледзь набярэцца 10 або 12 дзён, калі б тэрмометр паказваў 20 або 25 градусаў холаду. На працягу ж астатняй часткі зімы, г. зн. з 15 кастрычніка па 15 красавіка, тэрмометр увесь час апускаецца ніжэй або



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паднімаецца вышэй за нуль градусаў. Я прымячаў нават цэлыя месяцы, на працягу якіх стаяла цёплае надвор'е, як, напрыклад, у студзені 1782 г., калі наступіла поўная адліга. Іншы раз холад даволі цвёрда трымаецца на працягу лістапада, снежня, студзеня, лютага і сакавіка, і тады снег ужо не сыходзіць з зямлі ўсю зіму; тэрмометр тады часцей за ўсё паказвае ад 5 да 10 градусаў ніжэй нуля; калі ж ртутны слупок апусціцца значна ніжэй, то жорсткі холад не працягнецца болей двух – трох дзён… Цалкам зямля ачышчаецца ад снегу звычайна толькі ў маі"[30] . З апісанняў Жылібера відаць, што зіма ўсё ж была значна даўжэйшай, чым у наш час. Прыметна халадней было тады на поўначы і ўсходзе Беларусі. На Падзвінні, некалькі пазней адзначаў рускі падарожнік А.К.Башняк, маразы пачыналіся іншы раз з першых дзён жніўня і заканчваліся толькі ў канцы мая ці ў пачатку чэрвеня.

А.Тызенгаўз не шкадаваў сродкаў для набыцця найлепшага абсталявання для Гродзенскай медыцынскай акадэміі. Жылібер прызнаваў, што Тызенгаўз стварыў яму такія ўмовы для працы, што за чатыры гады ён зрабіў столькі, сколькі не зрабіў бы ў Францыі за 20 гадоў. Аднак ажыццявіць усе планы не ўдалося. А.Тызенгаўза змясцілі з пасады гродзенскага старасты, а к гэтаму часу адносіны паміж ім і Жыліберам з вельмі прыязных сталі варожымі. Жылібер атрымаў ад канцлера ВКЛ І.Храптовіча і рэктара Галоўнай школы ВКЛ М.Пачобут-Адляніцкага прапанову на працу. Разам са студэнтамі і ўсім абсталяваннем Гродзенскай медыцынскай акадэміі Жылібер пераехаў у Вільню і арганізаваў на гэтай базе медыцынскі факультэт у Галоўнай школе ВКЛ. З Гродна ён перавёз калекцыю мінералаў – 10 000 штук, рэдкую па каштоўнасці бібліятэку – 3000 тамоў, медыцынскі і фізічны інструмент, прыборы. Калекцыю раслін даставілі водным шляхам па Нёмане і Віліі. (Тызенгаўз беспаспяхова пагражаў судовым працэсам Храптовічу, спасылаючыся на тое, што кабінет натуральнай гісторыі, бібліятэка і інструменты, рэчы з батанічнага саду набыты за яго сродкі, і прафесар Жылібер самавольна вывез іх. Аднак кароль Станіслаў Аўгуст зрабіў усё пералічанае падарункам Галоўнай школе ВКЛ.)

[30] *Грыцкевіч, В.* Шляхі вялі праз Беларусь: нарыс / В.Грыцкевіч, А.Мальдзіс. – Мн.: Маст. літ, 1980. – С.102.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жылібер у Галоўнай школе ВКЛ узначаліў кафедру натуральнай гісторыі і батанікі (а гэта былі новыя навукі), заснаваў кабінет прыродазнаўства, заклаў пры школе батанічны сад і вывучаў расліны Віленшчыны.

Асноўнай працай, якая адлюстроўвае вынікі даследаванняў расліннасці Гродзеншчыны і Віленшчыны, з'яўляецца пяцітомнае выданне "Флора Літвы" (Гродна, т. 1–2, 1781; Вільня, т. 3–5, 1781–1782). Гэта праца, нягледзячы на некаторыя памылкі і недахопы, з'яўляецца важнейшай крыніцай аб раслінным свеце беларускіх земель.

Працаваць у Галоўнай школе ВКЛ, дарэчы, як і ў Гродне, Жыліберу было цяжка, у гэтай ВНУ ў апошняй чвэрці XVIII ст. панаваў тэалагічны ўхіл у навучанні і навуковых даследаваннях, тады як у еўрапейскіх універсітэтах развіваліся свецкія навукі. Прафесары-езуіты здзекліва ставіліся да прыродазнаўчых даследаванняў, адкрыта праяўлялі варожасць да таленавітага вучонага[31]. У 1783 г. Жылібер вярнуўся ў Ліён, удзельнічаў у рэвалюцыі, стаў мэрам горада, працягваў займацца навукай. У свайго сына Станіслава Аўгуста Антонія, народжанага ў Гродне і названага ў гонар караля і А.Тызенгаўза, выхаваў любоў і павагу да літоўска-беларускага краю. Дзесяткі беларускіх удзельнікаў паўстання 1830–1831 гг., якія эмігрыравалі ў Францыю, знайшлі прытулак і падтрымку ў яго доме, дзе іх прымалі вельмі цёпла.

Лёсавызначальным быў уплыў Ж.Э.Жылібера на навуковую дзейнасць нашага суайчынніка Станіслава Баніфацыя Юндзіла (1761–1847). Нарадзіўся ён у фальварку Ясынцы Лідскага павета ў небагатай сям'і. Вучыўся ў піярскіх школах і Віленскай езуіцкай акадэміі. Бацька марыў, каб сын стаў юрыстам, але Станіслаў Баніфацый прыняў манаства і пачаў выкладаць у піярскай школе. У гады вучобы ён захапіўся прыродазнаўчымі даследаваннямі і працамі Ж.Э.Жылібера. Сам пачаў збіраць і вывучаць птушак і насякомых (авадоў). Бліскучыя лекцыі Юндзіла ў піярскай школе ў Вільні пачалі наведваць студэнты акадэміі. Юндзіл публікаваў вынікі сваіх даследаванняў, пачаў працаваць у Галоўнай школе ВКЛ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[31] Зласліўцы – у Гродне князь К. Богуш, у Вільні ксёндз А.Стжэцкі – у акружэнні сабе падобных высмейвалі рэдкую працавітасць Жылібера. Кароль жа называў яго прыдворным медыкам, пісаў яму пісьмы, запрашаў на абеды, падараваў дзве брыльянтавыя манаграмы, узнагародзіў двума медалямі Merentibus, загадаў зрабіць мармуровы бюст.

У 1791 г. выйшла яго праца па батаніцы “Апісанне дзікарослых раслін у правінцыі Вялікага княства Літоўскага…”. Даследчыкі адзначаюць, што ў характарыстыцы раслiннага свету адчуваецца моцны ўплыў Жылібера. Кніга прызначалася моладзі, была напісана прыгожай мовай, абуджала пазнавальную цікавасць і любоў да роднай зямлі, таму аказала прыметны ўплыў на развіццё прыродазнаўчых даследаванняў. За гэтую працу Станіслаў Аўгуст узнагародзіў Юндзіла залатым медалём Merentibus. Аднак яго спадзяванні на атрыманне кафедры натуральнай гісторыі і батанікі ў 1792 г. не збыліся, тады ж не ўдалося Юндзілу атрымаць і пасаду бібліятэкара. Гэта былі балючыя расчараванні. Таленавітаму прыродазнаўцу нялёгка было рабіць кар’еру ў навучальнай установе, дзе прыродазнаўчыя заняткі выклікалі пагарду многіх прафесараў. Юндзіл працягваў вывучаць айчынныя землі: ён пачаў шукаць крыніцы солі. За кнігу па гэтай тэме ён атрымаў другі медаль Merentibus ад караля, ад акадэміі – пасаду віцэ-прафесара і працяглую замежную камандзіроўку “з мэтай удасканалення ў натуральнай гісторыі” – так было запісана ў рашэнні акадэміі. Юндзіл наведаў некалькі еўрапейскіх краін, вывучаў дасягненні прыродазнаўства, зацікавіўся поспехамі прамысловасці. У Вільню ён вярнуўся ў 1797 г. і прадоўжыў навукова-педагагічную дзейнасць у Расійскай імперыі.

Дзякуючы рэформам Адукацыйнай камісіі і дзейнасці такіх выдатных прыродазнаўцаў, якімі былі Ж.Э.Жылібер і С.Б.Юндзіл, узмацняўся свецкі характар вышэйшай адукацыі, у яе прадметным полі вызначыўся кірунак краязнаўчых даследаванняў прыроды. Гарады Гродна і Вільня вызначыліся як цэнтры вывучэння мясцовай прыроды. Інтарэс да прыродазнаўства абудзіўся ў высокаадукаваных і ўплывовых асоб. Так, канцлер ВКЛ Іахім Літавор Храптовіч, гетман Міхал Агінскі сталі першымі прыватнымі калекцыянерамі на Беларусі, прыродазнаўчыя зборы якіх дасягнулі навуковага ўзроўню. У іх калекцыі ўвайшлі расліны, мінералы, жывёлы і інш.

Паслядоўны падыход да краязнаўства як кампанента навукова-адукацыйнага комплексу ўпершыню прасочваецца ў дзейнасці Адукацыйнай камісіі. 11 мая 1783 г. М. Панятоўскі падпісаў рашэнне аб выплаце 3500 злотых доктару медыцы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ны, члену Таварыства падручнікаў Чэньпінскаму для падарожжа ў Літву, куды “з волі камісіі разам з мастаком адправіцца павінен”[32]. Верагоднай мэтай падарожжа было даследаванне вод і мінеральных багаццяў.

Таварыства падручнікаў пры Адукацыйнай камісіі прыйшло да высновы, што вучні школ недастаткова вывучаюць прыроду родных мясцін у параўнанні з ведамі, якія атрымлівалі па геаграфіі і прыродзе свету. Па прапанове І. Патоцкага Таварыства пастанавіла накіраваць кіраўнікам школ ліст, які б абавязваў апошніх арганізаваць у ваколіцах збор матэрыялу аб прыродзе. Аднак гэтая акцыя не дала чакаемых вынікаў. На месцах не было добра падрыхтаваных настаўнікаў для падобных даследаванняў. Таварыства таксама не паклапацілася аб распаўсюджанні інструкцый, таму не ўсе дасланыя адказы суправаджаліся рэчавымі матэрыяламі.

Прыродазнаўчыя звесткі рэгіянальнага зместу знайшлі адлюстраванне і ў атрымаўшых распаўсюджанне календарах. Календары рознага зместу здаўна былі вядомыя літвінам-беларусам, але менавіта ў другой палове XVIII ст. выходзілі календары, у якіх змяшчаліся карты ВКЛ (“Каляндар Віленьскі” на 1760 г.), прыродазнаўчыя і сельскагаспадарчыя звесткі. Тэмпература паветра, час цвіцення, прышчэпкі дрэў, усход і захад сонца (дакладна па гродзенскім мерыдыяне) пазначаліся ў “Гаспадарскіх календарах” (1776–1800).

У другой палове XVIII ст. друкавалася шмат літаратуры для паляпшэння сельскай гаспадаркі, прымянення новых тэхналогій. Асаблівымі прыхільнікамі навацый былі біскуп І.Масальскі і канцлер І.Храптовіч. Масальскі прапаноўваў стварыць сельскагаспадарчае таварыства, сярод задач якога была б падрыхтоўка для кожнага рэгіёну асобнага дасканалага календара.

## Глава 4. Узнікненне бібліяграфічнага краязнаўства

У XVIII ст. упершыню пачалі ствараецца краязнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы, прысвечаныя населеным пунктам, адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам, фізіка-геаграфічным аб’ектам Беларусі. Гэта былі несамастойныя фор-

[32] Protokoly posiedzeń KEN, 1773–1785. – Wrocław, Warszawa, Kraków, Gdańsk: Ossolineum, 1973. – S. 276.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мы бібліяграфічных матэрыялаў, змешчаныя ў навуковай, даведачнай літаратуры, зборніках заканадаўчых актаў: падрадковыя бібліяграфічныя заўвагі, унутрыкніжныя спісы, прадметныя паказальнікі да выданняў. У кантэкст новых ведаў, ствараемых аўтарам, з іх дапамогай інтэграваліся раней створаныя веды, што дазваляла карыстальнікам "аглядаць" распрацаванасць пытання і весці пошук тых ці іншых дакументаў або іх сукупнасцей. Складальнікамі іх былі вучоныя, якія паходзілі з літоўска-беларускіх зямель, а некаторыя з Польшчы.

Сярод даведачных выданняў шырокае распаўсюджанне атрымалі гербоўнікі шляхты. Так, у лепшым гербоўніку "Карона Польская пры залатой вольнасці…", які склаў манах езуіт Каспар Нясецкі, ёсць спісы літаратуры, прысвечаныя беларускім ваяводствам, уніяцкім і каталіцкім біскупствам на беларускіх землях, а таксама спісы біябібліяграфічнага характару аб ваяводах і кашталянах. Цікава, што ў бібліяграфічных апісаннях К.Нясецкі, як правіла, называў аўтара, артыкул заканадаўчага дакумента, але не заўжды прыводзіў назву. Напрыклад, называючы прозвішчы аўтараў, якія пісалі аб віцебскім ваяводзе Станіславе Кішку, і адзначаючы дакладныя старонкі, дзе былі змешчаны звесткі аб ім, складальнік не назваў творы. З аднаго боку, кола літаратурных крыніц у тыя часы было параўнальна вузкім і добра адукаваныя людзі ведалі ўсе асноўныя крыніцы. Такі метадычны прыём выкарыстоўваўся пэўны час і ў заходнееўрапейскай бібліяграфічнай практыцы. Але, з другога боку, К.Нясецкі на ўласным вопыце ацаніў, наколькі важнымі былі дакладнасць і паўната бібліяграфічных даных. Напрыклад, ён са шкадаваннем некалькі разоў адзначыў, што не запісаў у свой час звесткі аб творы, звязаным з асобай мсціслаўскага ваяводы Рыгора Друцкага-Горскага. К.Нясецкі адзначыў: "Аб ім дзесьці чытаў, але аўтара не запісаў"[33].

Краязнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы ўключаліся ў польскамоўныя выданні Статута 1588 г., якія выходзілі ў XVII–XVIII стст. У выданні 1619 г. у друкарні Мамонічаў па

---

[33] *Саітава, В.І.* Крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі перыяду Рэчы Паспалітай абодвух народаў аб краях Беларусі / В.І.Саітава // Матэрыялы Другіх кнігазнаўчых чытанняў "Кніжная культура Рэчы Паспалітай" (Мінск, 15–16 верасня 2000 г.). – Мн.: Красіка-Прынт, 2002. – С. 8–31.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

загаду канцлера Сапегі юрыст Гаўлавіцкі падзяліў артыкулы на параграфы і пад кожным артыкулам падаў звесткі аб соймавых канстытуцыях, а юрыст С.Галонскі склаў рэестры – прадметныя паказальнікі[34], якія ўключаліся ва ўсе наступныя польскамоўныя выданні Статута 1588 г. У гэтых паказальніках былі рубрыкі, прысвечаныя асобным тэрытарыяльным аб’ектам Беларусі.

Да рэдкіх краязнаўчых кніг з выдатным бібліяграфічным афармленнем належалі творы базыльянскага святара Ігната Сцябельскага, прысвечаныя гісторыі хрысціянства ў Полацку (“Два вялікія светачы на гарызонце Полацкім…”, “Храналогія…”) і інш. У першай з іх аўтар змясціў “апісанне значнейшых аўтараў і кніг іх”, ёмістыя падрадковыя і ўнутрытэкставыя бібліяграфічныя спасылкі, “рэгістр асоб і прадметаў”.

Несамастойныя бібліяграфічныя матэрыялы, прысвечаныя літоўска-беларускім землям, выкарыстоўваліся і іншымі аўтарамі навуковых прац. Звычайна яны ўключаліся ў даследаванні, дзе рэгіянальны матэрыял адлюстроўваўся разам з матэрыялам аб Рэчы Паспалітай. Гэтая асаблівасць паказвае, з аднаго боку, нешматлікасць твораў, прысвечаных ВКЛ і літоўска-беларускім тэрыторыям, з другога – глыбіню інтэграванасці абодвух дзяржаўных суб’ектаў Рэчы Паспалітай.

Бібліяграфічнае краязнаўства, якое спадарожнічала навуковай працы, у гэты перыяд яшчэ не пранікла ў сферу бібліятэк.

Зараджэнне і развіццё краязнаўства ў перыяд ВКЛ было заканамерным вынікам развіцця дзяржаўных і нацыянальных працэсаў, высокай маральнай каштоўнасці такіх паняццяў, як айчына, гонар, род, сям’я, шляхецтва. Развіццё адукацыі, навукі, бібліятэчнай справы стварыла ўмовы для даследчай краязнаўчай працы. Першапачатковы этап краязнаўства дазваляе выявіць зараджэнне аматарскага і навуковага краязнаўства, краязнаўства ў адукацыйнай сістэме. Краязнаўчыя звесткі і веды распаўсюджваліся вусна і пісьмова, прычым дакументаванне, стварэнне рукапісных і друкаваных матэрыялаў найперш спрыялі назапашанню і трансляцыі будучым пакаленням краязнаўчых ведаў.

[34] *Bieliński, J.* Uniwersitet Wileński (1579–1831) / J.Bieliński.– Kraków: druk.w. I.Anczyca i spótki, 1899–1900. – T. 2. – S. 494.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пытанні і заданні

1. Ахарактарызуйце гістарычныя і культурныя фактары, якія спрыялі ўзнікненню краязнаўства на беларускіх землях.

2. Назавіце даследчыкаў, якія першымі пачалі шырока выкарыстоўваць архіўныя і бібліятэчныя матэрыялы для вывучэння мінулага беларускіх зямель.

3. Хто вывучаў гісторыю хрысціянства на Полацкай зямлі? Ці можна лічыць гэтага даследчыка адным з буйнейшых пачынальнікаў беларускага краязнаўства?

4. Ахарактарызуйце краязнаўчыя даследаванні Ж.Э.Жылібера і С.Б.Юндзіла.

5. Хто стварыў лепшую карту ВКЛ, наколькі поўна адлюстраваны на ёй населеныя пункты на беларускіх землях?

6. Якія меры прымала Адукацыйная камісія для развіцця краязнаўства ў школах?

7. Ахарактарызуйце першыя бібліяграфічныя краязнаўчыя матэрыялы.

## Тэст

I. Дапоўніце сказы

*Заданне 1.* Гісторыю хрысціянства ў Полацкай зямлі ў XVIII ст. вывучаў (адказ даць па ўзоры: К.Нясецкі)_________

_______________________________________________

*Заданне 2.* Аўтарам даследавання "Флора Літвы" ў 5-ці тамах (Гродна–Вільня) быў ______________________________

*Заданне 3.* Першую навуковую калекцыю мінералаў і раслін Гродзеншчыны ў XVIII ст. сфарміраваў ____________

_______________________________________________

II. Адзначце правільны (ыя) адказ (ы)

*Заданне 4.* Хто з краязнаўцаў выкладаў у Віленскай езуіцкай акадэміі (Галоўнай школе ВКЛ)?

а) В.В.Каяловіч,

б) Ж.Э.Жылібер,

в) А.Нарушэвіч,

г) С.Б.Юндзіл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

III. Суаднясіце

*Заданне 5.* Краязнаўчыя творы і іх аўтараў

| | |
|---|---|
| 1. “Два вялікія светачы на гарызонце Полацкім…” | а) С.Б.Юндзіл |
| 2. “Флора Літвы” | б) І.Сцябельскі |
| 3. “Апісанне дзікарослых раслін у правінцыі Вялікага княства Літоўскага...” | в) Ж.Э.Жылібер |
| 4.“Magni Ducatus Lithuaniae…” | г) Я.Ласіцкі |
| | д) Т.Макоўскі |
| | е) М.Стрыйкоўскі |

IV. Размяркуйце ў храналагічнай паслядоўнасці дзейнасць краязнаўцаў

*Заданне 6.* М.Стрыйкоўскі, С.Б.Юндзіл, В.В.Каяловіч.

V. Ці згодны Вы са сцвярджэннем? (Так/Не)

*Заданне 7.* У перыяд ВКЛ дамінавала школьнае краязнаўства.

*Заданне 8.* Аўтарам “Хронікі еўрапейскай Сарматыі” быў А.Гваньіні.

*Заданне 9.* Адукацыйная камісія спрыяла пачатку краязнаўчай работы ў школах.

*Заданне 10.* Вучэбная дысцыпліна “Краязнаўства” выкладалася ў Галоўнай школе ВКЛ.

VI. Гістарычныя партрэты. Пазнайце імя краязнаўца

*Заданне 11.* Бедны малады чалавек, выхадзец з Мазоўша, ваенны найміт, служыў у Віцебску. Захапляўся мінулым беларускіх мясцін, шукаў мецэнатаў, каб атрымаць доступ да архіваў і бібліятэк беларускіх магнатаў. Спалучыў у краязнаўчых даследаваннях уласныя назіранні і вывучэнне гістарычных дакументаў. Аўтар апублікаваных хронік.

*Заданне 12.* Ураджэнец Ліёна, урач, арганізатар медыцынскай акадэміі ў Гродне, даследчык прыроды паўночна-заходніх і цэнтральных зямель Беларусі.

*Заданне 13.* Ураджэнец Лідскага павета, манах піярскага ордэна, вывучаў расліны, імкнуўся заняць пасаду бібліятэкара ў Галоўнай школе ВКЛ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел III. КРАЯЗНАЎСТВА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЛЯХ У ПЕРЫЯД РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (1795–1917)

## Глава 1. Развіццё краязнаўчага руху ў 1795–1864 гг.

### *1.1. Арганізацыйныя аспекты краязнаўства і асноўныя кірункі вывучэння рэгіёнаў*

У канцы XVIII ст. адбыліся палітычныя падзеі, якія карэнным чынам змянілі гістарычнае развіццё Беларусі. Пэўны лібералізм палітыкі Паўла I і Аляксандра I “на землях, от Польши отошедших”, пасеяў сярод часткі шляхты ілюзію, што магчыма захаваць у “значнай частцы тое, што нам Айчына давала…хаця і без Польшчы – мы ў Польшчы”. Такія настроі адлюстраваны ў запісках сучасніка[35]. Але ў сацыякультурных умовах Расіі непазбежна павінны былі трансфармавацца сацыяльна-культурныя, канфесійныя і іншыя асаблівасці яе новых падданых. Дзяржаўны курс быў накіраваны на выхаванне маладых пакаленняў у духу афіцыйнай ідэалогіі, на паслядоўную русіфікацыю. Разам з тым адміністрацыі неабходна была інфармацыя аб рэгіёнах, веданне іх палітычных, эканамічных, культурных, гістарычных умоў, што патрабавала вывучэння мясцовых асаблівасцей.

Гістарычная і сямейная (радавая) памяць пабуджала літвінаў-беларусаў не толькі са зброяй змагацца за адраджэнне Рэчы Паспалітай, але і вывучаць мінулае роднага краю, зберагаць крупінкі звестак аб падзеях мінулага. Многія маладыя людзі спрабавалі сябе ў літаратурнай і мастацкай творчасці, у якіх панавала эстэтыка рамантызму. Знакавыя для рамантызму праблемы разнароднасці культур, звычаяў, моў зліліся з грамадзянскімі патрыятычнымі настроямі і выклікалі незвычайны інтарэс да краязнаўчых даследаванняў. Упершыню загучалі заклікі вывучаць народную спадчыну і з’явіліся шматлікія даследчыкі фальклору, этнаграфіі, гісторыі. Іх ідэі выказаў знакаміты краязнавец Зарыян Даленга-Хадакоўскі (Адам Чарноцкі): “Трэба пайсці і схіліцца пад страху селяніна ў розных аддаленых старонках, трэба спяшацца на яго святы, забавы і розныя прыгоды. Там, у дыме,

---

[35] *Bieliński, J.* Uniwersitet Wileński (1579–1831) / J.Bieliński. – Kraków: druk.w. I.Anczyca i spółki, 1899–1900. – T. 2. – S. 246.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

які ўздымаецца над галовамі, снуюць яшчэ старыя абрады, спяваюцца даўнія спевы і ў плясках просталюдзінаў называюцца імёны забытых багоў"[36]. Паводле Даленгі-Хадакоўскага глыбінныя пласты праславянскай культуры жывілі народную культуру і захаваліся ў ёй насуперак часу, грамадскім і хрысціянскім уніфікуючым уплывам. Гэта абумовіла асаблівасці народных культур і іх рэгіянальных частак. Думкі Хадакоўскага падтрымалі многія збіральнікі, даследчыкі, творцы з розных грамадскіх слаёў, для якіх вывучэнне родных мясцін стала справай служэння айчыне і народу.

Выбух лістападаўскага паўстання 1830–1831 гг. і яго падаўленне найгоршым чынам адбіліся на грамадска-палітычнай і культурнай сітуацыі на Беларусі. Урадавая палітыка ў дачыненні да Беларусі рэзка змянілася – пачалася мэтанакіраваная русіфікацыя – знішчэнне ўсяго, што магло нагадаць пра Беларусь і Літву як асаблівыя нацыянальныя раёны. Прадбачлівыя расійскія ўлады разумелі, што адных рэпрэсій недастаткова, што неабходна змяніць палітычны і ідэалагічны курс, які б уключаў вынішчэнне так званага "польскага мяцежнага духу" праз супрацьпастаўленне праваслаўя каталіцызму, праз фарміраванне ў беларусаў непрыхільных адносін да ўсяго польскага і каталіцкага; укараненне ў свядомасць, што беларусы спрадвечна рускі і праваслаўны народ. Гэта палітыка мэтанакіравана і паслядоўна праводзілася ў сістэме адміністрацыйнага кіравання, адукацыі, у дзейнасці бібліятэк і інш.

Асноўнымі арганізацыйнымі формамі краязнаўства, якія складваліся ў гэты перыяд, былі грамадскае, дзяржаўнае і школьнае краязнаўства. Гэта структура краязнаўства фарміравалася пераважна дзякуючы ініцыятыве мясцовых даследчыкаў-патрыётаў, а таксама рэгіянальных улад. Склад суб'ектаў краязнаўчага руху быў даволі шырокім – гэта прафесары ВНУ, прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання на рэгіянальным узроўні, удзельнікі грамадскіх арганізацый, краязнаўцы-аматары і інш.

*1.1.1. Грамадскі краязнаўчы рух.* Грамадскае краязнаўства стала адметнай з'явай дадзенага перыяду. У асяроддзі памеш-

[36] *Даленга-Хадакоўскі, З.* Выбранае / З.Даленга-Хадакоўскі. – Мн.: Кнігазбор, 2007. – С. 45.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чыкаў, чыноўнікаў, вайскоўцаў з'явіліся аматары-краязнаўцы, кірункі захапленняў якіх выцякалі з асабістых інтарэсаў, глыбокай цікавасці да родных мясцін, да жыцця простага люду, да гістарычнага мінулага. Калі ў іх узнікла патрэбнасць у абмене думкамі, метадамі і вынікамі даследаванняў, то з'явіліся ідэі і аб сумесных праектах. Гэта прывяло да ўзнікнення першых грамадскіх краязнаўчых арганізацый.

Уладальнікі многіх маёнткаў валодалі багатымі бібліятэкамі, музейнымі зборамі, у складзе якіх былі мясцовыя дакументы і рэліквіі, выданні, прысвечаныя беларускім землям. Ландшафтны дызайн, паркі, водныя сістэмы, аранжарэі, звярынцы ў сядзібах выклікалі захапленне наведвальнікаў. Таленавітыя самавукі-даследчыкі пачалі вывучаць беларускія землі ў гістарычным, археалагічным, этнаграфічным, прыродазнаўчым аспектах. У свядомасці лепшых грамадзян стала ўяўляцца заганным няведанне гісторыі сваёй айчыны, яе мясцовай адметнасці, народных традыцый[37]. Інтарэс да гісторыі адлюстраваны і ў некаторых урадавых дакументах. У гэты перыяд найперш да гісторыка-краязнаўчай і этнаграфічнай тэматыкі звярнуліся многія ўраджэнцы Беларусі, а імёны некаторых з іх трывала ўвайшлі ў гісторыю краязнаўства і айчыннай навукі. Сярод іх былі З.Даленга-Хадакоўскі, І.Даніловіч, Т.Нарбут, Ю.Нямцэвіч, Я.Баршчэўскі, Р.Падбярэскі, А.Кіркор, А.Плятар, браты Канстанцін і Яўстах Тышкевічы, У.Сыракомля, П.Шпілеўскі і інш.

Ураджэнец Міншчыны Зарыян Даленга-Хадакоўскі (1784–1825) быў перакананы, што "ў бацькоўскім гняздзе" можна адшукаць зусім невядомыя звесткі і заклікаў сучаснікаў далучыцца да краязнаўчай працы: "Захаваем выпадковыя і даволі частыя адкрыцці з зямлі, тыя розныя малыя статуі, малюнкі і інструменты рудныя, посуд, гаршкі з попелам. Палічым і даследуем дакладным вымярэннем усе вялікія магілы, якія на чэсць адной асобы насыпаныя самотна прастаялі вякі. Абаронім ад знішчэння ў падземных пячорах выбітыя на скалах надпісы, нам большай часткаю невядомыя. Здымем планы са славутых старадаўніх месцаў для тлумачэння мінулага, не даючы ніводнаму ўрочышчу быць забы-

[37] Л.В.Аляксееў прывёў красамоўныя прыклады стаўлення да айчыннай гісторыі расійскіх саноўнікаў у пачатку XIX ст. у кнізе "Археология и краеведение Беларуси, XVI в. – 30-е годы XX в." (Мн.: Бел. навука, 1996. – С. 20).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тым. Пазнаем усе прозвішчы, якія люд вясковы чы яго лекаркі ў розных старонках даюць пры нараджэнні. Збяром, наколькі можна, старажытныя спевы і гербы, апішам выдатныя абрады”[38]. Даследчык выканаў велізарную працу па краязнаўстве Беларусі, Польшчы, Расіі, Украіны. Сабраў многа матэрыялаў: батанічных, заалагічных і астранамічных старажытных тэрмінаў; па дыялекталогіі, тапаніміцы, археалогіі. Упершыню склаў чатырохтомны “Слоўнік назваў гарадзішчаў і ўрочышчаў”, які апублікаваны часткова. Па звестках Г.Каханоўскага, сярод гэтых помнікаў каля 200 гарадзішчаў і ўрочышчаў на тэрыторыі Беларусі. Вялікую ролю адыграў у арганізацыі сеткі карэспандэнтаў па зборы разнастайных матэрыялаў на Беларусі, Польшчы, Расіі і Украіне. Дзякуючы яму некаторыя людзі адчулі інтарэс да краязнаўства і набылі навыкі краязнаўчай працы.

Фальклорна-краязнаўчымі даследаваннямі захапляўся Ян Чачот (1796–1847), са школьных гадоў сябар А.Міцкевіча, член Таварыства філаматаў у Віленскім універсітэце. Вярнуўшыся са ссылкі на Урале, вывучаў этнаграфію і фальклор роднага краю і выпусціў 6 зборнікаў фальклору “Сялянскія песні з-над Нёмана і Дзвіны” (1837–1846). Гэта была буйнейшая публікацыя мясцовай песеннай паэзіі. Па дзейнасці Я.Чачота відаць, як выпрацоўваліся метады збору краязнаўчага матэрыялу. Цікава адзначыць, што некаторы час даследчык звяртаўся за дапамогай да маладых шляхцянак, з якімі “занадта сціплыя і нясмелыя сялянкі” ахвотна ўступалі ў зносіны, тады як адмаўляліся “гаварыць свае песні мужчыне”[39]. Але неўзабаве Чачот прыйшоў да правільнай думкі, што песні трэба запісваць непасрэдна падчас іх выканання на святах і іншых падзеях.

У запісах песень Я.Чачот імкнуўся перадаць фанетычныя і марфалагічныя асаблівасці беларускай мовы пэўнага рэгіёну, але частку твораў ён пераклаў на польскую мову, што парушала іх аўтэнтычнасць. Займаўся складаннем слоўніка найбольш адметных слоў і выразаў Навагрудчыны. У артыкулах ён дэталёва аналізаваў беларускую мову, выявіў яе дыялекты.

[38] *Аксамітаў, А.С.* З душой славяніна: жыццё і дзейнасць З.Я.Даленгі-Хадакоўскага / А.С.Аксамітаў, Л.М.Малаш. – Мн.: Полымя, 1991. – С. 52–53.

[39] *Piosnki* wieśniacze znad Dźwiny. Ks. 3. – Wilno: Drukiem J. Zawadzkiego, 1840. – S. VIII. У сваю чаргу Чачот, выказваючы падзяку сваім памочніцам, не рызыкнуў назваць іх імёны. Гэта характарызуе асаблівасці маральнага клімату таго часу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Найбольш вывучаліся ў той перыяд землі паўночна-ўсходняй і цэнтральнай Беларусі. Як адбываліся вандроўкі па роднай зямлі, можна ўявіць па апісанні Р.А.Падбярэскага, прысвечанаму вядомаму краязнаўцу і пісьменніку Яну Баршчэўскаму (1790/1794–1851): "…трэба ведаць яго асабіста, трэба бачыць яго з кіем пілігрыма ў руках, так як я сустракаў яго ў маіх падарожжах, пешкі, сярод простага беларускага люду, на дзвінскіх плытах, у прыдарожных корчмах, на сцежках, ледзь пазначаных у лесе і на вялікіх гасцінцах"[40]. Трыццаць разоў абышоў ён родны край і, па меркаванні Г.Кісялёва, быў непараўнальным знаўцам фальклору[41].

Дзіцячыя ўражанні і "самотныя думкі" аб родным краі, аб яго дзівосным прыродным харастве і унікальнай фальклорна-этнаграфічнай спадчыне Я. Баршчэўскі апісаў у "Нарысе Паўночнай Беларусі" (1843 г., "Rocznik Literacki"). Даследчык сведчыць, што ў песнях, абрадах, паданнях народа гэтага рэгіёну шмат смутку, адчування цяжкасцей лёсу і нават роспачы. Але ён трапна заўважае і вясёлыя хвіліны, і практыцызм простых людзей. Так выглядае апісанне наведвання могілак: "…на могілках можна бачыць сцэны, якія на душу смутак наводзяць. Вось удава з малымі дзецьмі ля драўлянага крыжа, які стаіць над магілаю яе мужа, а там сірата над магілаю бацькоў выказваюць сваю журбу голасам, які раздзірае сэрца; калі хто наблізіцца да іх і паслухае іхнія словы, – яны зайздросцяць мёртвым, і гэтыя слёзныя скаргі, здаецца, працялі б і каменныя грудзі"[42]. Але пасля наведвання могілак і царквы людзі танцавалі і спявалі ў карчме. Прыгожы і не без рызыкі выезд коннай дружыны жаніха да нявесты: "…ён [малады] і яго дружына надзяваюць чырвоныя шапкі, звешваюць на грудзі чырвоныя хусткі ды імчацца праз горы да дому, дзе іх чакаюць нявеста і госці. Перад варотамі спыняюцца: салома шугае полымем, ён і дружына пераскокваюць яе наўскач на ўдалых канях, але і тут яшчэ запаленыя пучкі саломы, якія кідаюць коням у вочы …"[43]

---

[40] *Баршчэўскі, Ян.* Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я.Баршчэўскі. – Мн.: Маст. літ., 1990. – С. 356–357.

[41] *Півавар, М.В.* Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны, XVI ст. – 1944 г.: даведнік / М.В.Півавар. – Віцебск: Віцеб. абл. друкарня, 2006. – 176 с.

[42] *Баршчэўскі, Ян.* Выбраныя творы / Ян Баршчэўскі. – Мн.: Бел. кнігазбор, 1998. – С. 85.

[43] Там жа, с. 84.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рамуальд Андрэевіч Падбярэскі (1812 ці 1813–1856) паходзіў з незаможнай шляхецкай сям'і, пасля заканчэння Маскоўскага універсітэта працаваў у Маскве і Санкт-Пецярбургу, дзе падтрымліваў сувязі з дэмакратычнымі коламі, але вярнуўся ў Вільню і займаўся літаратурна-выдавецкай дзейнасцю, збіраў беларускі фальклор. Яму належыць этнаграфічны нарыс "Беларускае вяселле" (1848). Высланы за антыўрадавую літаратурную дзейнасць у Архангельскую губерню.

Казімір Андрэевіч Буйніцкі (1788–1878), памешчык, пісьменнік, публіцыст, ганаровы куратар школ Віцебскай губерні. Ён шмат вандраваў па родных мясцінах, апісаў значную колькасць населеных пунктаў Падзвіння, публікаваў артыкулы па пытаннях мясцовай сельскай гаспадаркі. У празаічных і паэтычных творах К.Буйніцкага адлюстраваны беларускія сюжэты, узятыя з народных легендаў і паданняў. Быў выдаўцом рэгіянальнага зборніка "Рубон" (1842–1849). Апублікаваў этнаграфічна-краязнаўчыя нарысы "Падарожжа па малых дарогах" (1841, у двух тамах), "Новая вандроўка па малых дарогах" (1852, у двух тамах) і інш.

Памешчык Адам Плятар (1790–1862) быў адным з першых у плеядзе выдатных даследчыкаў Падзвіння, віцебскага краю. Скончыў Віленскі універсітэт, захапіўся археалогіяй, фальклорам, вывучэннем прыроды. Падарожнічаў па Заходняй Дзвіне. Знайшоў на той час самы доўгі ў Еўропе сашнік. Вывучаў пахаванні ў курганах на славяна-балцкім сумежжы, для чаго выкарыстоўваў сабраныя фальклорныя матэрыялы. З роду Плятараў выйшлі і іншыя краязнаўцы.

Сваячка А.Плятара графіня Эмілія Францаўна Плятар (1806–1831), больш вядомая як камандзір паўстанцкага атрада ў 1830–1831 гг., стала адной з першых жанчын-збіральніц народных песень Віцебшчыны. Беларускі этнограф М.Маркс, у доме якога яна часта бывала, ставіў графіню ў першы рад культурных дзеячаў нашага народа і лічыў яе прадвесніцай беларускага адраджэння XIX ст. Яна "аддалася ўсёй душой беларускаму люду, ведала яго бяду і спачувала ёй …збірала і спявала яго песенькі, шчодра плаціла за іх дастаўкі і прабавала пяра ў іх наследаванні". На жаль, асабісты архіў, фальклорныя і краязнаўчыя запісы Э.Плятар не захаваліся. Дарэчы А.Міцкевіч прысвяціў ёй верш "Смерць палкоўніка"[44].

[44] Народная газета. – 1995. – 5 студз.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адметнай постаццю ў краязнаўстве быў Канстанцін Тызенгаўз (1786–1853), сусветна вядомы арнітолаг, унук Антонія Тызенгаўза. У маёнтку ў Паставах стварыў унікальны арніталагічны музей, у якім былі прадстаўлены мясцовыя птушкі, мелася багатая бібліятэка спецыяльнай літаратуры.

Сярод асоб, якія праявілі сябе ў даследаванні розных кірункаў тагачаснага краязнаўства, быў Адам Карлавіч Кіркор (1819–1886), нашчадак старажытнага татарскага роду. Гэта быў вучоны-энцыклапедыст, краязнавец, гісторык, этнограф, археолаг, літаратуразнавец, журналіст, выдавец. У юнацтве захапіўся археалогіяй і гісторыяй роднага краю. “Я літвін, – пісаў Кіркор жонцы [45], – ніколі не знішчаць у ва мне гэтага пачуцця. Я люблю сваю радзіму з усім натхненнем юнака, з усёй ахвярнасцю мужа”, часам называў сябе “не прыродным палякам”, а “беларусам”. Вакол А.Кіркора гуртаваліся інтэлектуалы Паўночна-Заходняга края: У.Сыракомля, У.Каратынскі, В.Дунін-Марцінкевіч, А.Адынец, І.Ходзька, С.Манюшка, Я.Тышкевіч і інш.

А.Кіркор – таленавіты навуковец і здольны арганізатар культурных праектаў. Ён удзельнічаў у шматлікіх археалагічных раскопках (раскапаў каля тысячы курганоў) і выкарыстоўваў навуковыя метады. Так, ён прыйшоў да правільнай высновы аб датаванні курганоў ад часу прыняцця хрысціянства, археалагічныя раскопкі пачаў весці крыжападобнымі траншэямі, а не распаўсюджанымі ў той час калодзежамі. Але, адзначае сучасны даследчык Л.В.Аляксееў, А.Кіркор не заўжды паслядоўна прымяняў наватарскую методыку, у прыватнасці, памылкова дапускаў, што курганы маглі мець месца ў XV ст.

А.К.Кіркор напісаў шэраг твораў, сярод якіх найбольш значнай была праца “Этнографический взгляд на Виленскую губернию” (1857–1858), складзеная па праграме РГТ. Ён апісаў быт беларускага насельніцтва Віленшчыны, цяжкую працу, галечу і голад. Сялянская сям’я амаль не ўжывала мяса, малака; яйкі і хатняя птушка прадаваліся для набыцця солі і прылад, неабходных у гаспадарцы. Але гэта працавітыя, спакойныя людзі, з дзіцячай любоўю прывязаныя да роднай

[45] Быў жанаты з артысткай Аленай Маеўскай (1828–1900), якая ў 1857 г. пакінула Кіркора і паехала ў Польшчу, дзе прыняла актыўны ўдзел у паўстанні 1863 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зямлі. Даследчык змясціў у творы больш за сто беларускіх песень, дзвесце прыказак, слоўнік беларускай мовы. "Этнографический взгляд..." быў першым буйным апісаннем матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў паўночна-заходніх зямель[46].

А.Кіркор некаторы час працаваў сакратаром Віленскага губстаткамітэта, рэдагаваў і выдаваў "Памятные книжки Виленской губернии" (1850–1854), значна пашырыў іх неафіцыйны аддзел, дзе друкаваліся багатыя матэрыялы па беларускіх паветах губерні. Апублікаваў уласныя вялікія матэрыялы па гісторыі і статыстыцы Лідскага, Ашмянскага і Віленскага паветаў.

А.Кіркор заўжды імкнуўся да выдавецкай дзейнасці. Атрымаў дазвол на выданне шасці неперыядычных зборнікаў, сярод якіх найбольш значныя краязнаўчыя матэрыялы былі апублікаваны ў зборніку "Тэка Віленьска" (1857).

У напружанай грамадска-палітычнай сітуацыі ў краі, дзе вядомыя людзі займалі пэўную ідэйную пазіцыю, А.Кіркор прытрымліваўся памяркоўных поглядаў. Але гэта не забяспечыла яму ні лаяльных адносін з боку прадстаўнікоў адміністрацыі, ні сапраўднай павагі з боку мясцовай інтэлігенцыі. У час паўстання 1863 г. ён быў пад моцным прэсам улад. Вядома выказванне Мураўёва-вешальніка: "Я держу Киркора, потому что он знает, что я 20 раз могу его повесить"[47]. Пасля паўстання ўлады стварылі немагчымыя ўмовы для яго працы ў Вільні, і А.Кіркор з'ехаў з Беларусі. Часам, калі Кіркор удзельнічаў у акцыях падтрымкі царскага ўрада, яго дзеянні атрымлівалі рэзкае асуджэнне ў мясцовай грамадскай думцы.

Сярод даследчыкаў, якія пачалі развіваць напрамак комплекснага апісання некаторых рэгіёнаў, асабліва тыповага ў краязнаўстве, вылучаюцца імёны У.Сыракомлі, П.Шпілеўскага, братоў Тышкевічаў.

Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Францішак Уладзіслаў Кандратовіч, 1823–1862) вырас у сям'і дробнага шляхціца, яго дзяцінства прайшло ў асяроддзі беларускага сялянства.

[46] *Цішчанка, І.К.* Да народных вытокаў / І.К.Цішчанка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1986. – С. 184.

[47] Цыт. па: *Кісялёў, Г.В.* Сейбіты вечнага / Г.В.Кісялёў. – Мн.: Дзяржвыд БССР, 1963. – С. 128.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пачаўшы працоўную дзейнасць у Нясвіжы, вольны час прысвячаў літаратурнай творчасці, знаёмству з архіўнымі зборамі ў радзівілаўскім палацы, напісанню працы пра гістарычнае мінулае Нясвіжа. Сюжэты многіх літаратурна-мастацкіх твораў Сыракомлі пабудаваны на беларускіх легендах, паданнях і сапраўдных падзеях. Шэраг празаічных прац маюць краязнаўчы характар. Ён пісаў пра мясцовыя помнікі, аб быце і культуры розных саслоўяў беларусаў. У.Сыракомля – аўтар некалькіх выдатных краязнаўчых кніг, шматлікіх публікацый у перыядычным друку, прысвечаных беларускім мястэчкам і вёскам, таленавітым землякам, пытанням аховы гісторыка-культурных помнікаў і інш. Асабліваe месца ў даследаваннях выдатнага краязнаўца займала Міншчына, край дзіцячых гадоў і маладосці. У кнізе “Вандроўкі па маіх былых ваколіцах” (1853) ён адлюстраваў мінулае Нясвіжа, Стоўбцаў, Койданава, Міра, падаў шмат каштоўных звестак пра лад жыцця сялянства: жыллё, гаспадарку, вопратку, харчаванне, звычаі, абрады, вусна-паэтычную творчасць. Гэта была адна з першых і лепшых краязнаўчых кніг. У пачатку 60-х гадоў выйшлі з друку манаграфіі “Мінск” (1860) і “Нёман ад вытокаў да вусця” (1861). У кнізе “Мінск” даследчык усебакова прадставіў выгляд горада і яго асобных мясцін, забудовы, жыццё гараджан. Манаграфія аб Нёмане – гэта комплекснае гістарычнае, прыродазнаўчае, этнаграфічнае і археалагічнае апісанне прынёманскага краю. Апісанні У.Сыракомлі назаўжды захавалі непаўторныя вобразы многіх беларускіх мясцін у сярэдзіне XIX ст.

У.Сыракомля адным з першых пачаў вывучаць рэгіянальныя асаблівасці беларускай мовы і збіраць моўны матэрыял. У працы “Кароткае даследаванне мовы і характару паэзіі русінаў у Мінскай правінцыі” (1856) паказаў дыялектныя асаблівасці беларускага маўлення, прывёў шматлікія ўзоры мовы, апісаў дажынкі, вячоркі, валачобныя і іншыя абрады.

Павел Міхайлавіч Шпілеўскі (1823–1861) атрымаў духоўную адукацыю і займаўся педагагічнай дзейнасцю, захапляўся краязнаўствам. Вывучаў гісторыю, побыт, вусную народную творчасць, мову жыхароў многіх мясцін Беларусі. Ён апісаў прыказкі, народныя павер’і, вясельныя абрады засцянковай шляхты ў Віцебскай губерні, краявіды і жыццё ся-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лян сярэднебеларускіх зямель, Мазыршчыны і інш. Публікацыі ў цэнтральным расійскім друку зрабілі імя краязнаўца шырока вядомым. Адна з лепшых краязнаўчых прац П.М.Шпілеўскага "Падарожжа па Палессі і беларускаму краю" (1853–1855) уяўляе захапляючыя нарысы, дзе навуковыя разважанні і гістарычныя даведкі перамяжаліся з лірычнымі адступленнямі, маляўнічымі апісаннямі беларускіх гарадоў, вёсак і мястэчак, фальклорнымі запісамі і этнаграфічнымі замалёўкамі.

Сярод выдатных беларускіх краязнаўцаў гэтага перыяду два імя займаюць асобае месца. Гэта браты Канстанцін і Яўстах Тышкевічы, графы Лагойскія, прадстаўнікі той часткі арыстакратыі, чые лепшыя саслоўныя рысы: высакароднасці, годнасці, дасканалай выхаванасці, беззаганнасці – спалучаліся з глыбокімі ведамі і навуковымі захапленнямі, адданым служэннем Айчыне і грамадскім ідэалам. Канстанцін і Яўстах выраслі ў атмасферы багатых духоўных інтарэсаў і высокай культуры. Іх бацька, Піус Тышкевіч, і маці, Аўгуста Плятар, захапляліся мастацтвам, навукай, кнігамі. У Тышкевічаў была багатая бібліятэка, у тым ліку творы на старажытнай беларускай мове, кнігі і рукапісы, прысвечаныя беларуска-літоўскім землям, мастацкая галерэя, музей; бацька вёў сямейны архіў, пісаў дзённік і хроніку роду. Ён жа пабудаваў для сям'і ў Лагойску палац у класічным стылі (разбураны ў Вялікую Айчынную вайну). Туды часта наведваліся знакамітыя госці – аматары навукі і мастацтваў: Плятары, Ходзькі, Прушынскія, Кастравіцкія, Ржэвускія, Слізені, П.Шпілеўскі і інш.

Пад уплывам бацькоў і асяроддзя Канстанцін і Яўстах з дзяцінства палюбілі родныя мясціны, захапляліся гісторыяй, археалогіяй, мастацтвам, выхоўваліся ў патрыятычным духу. Першыя раскопкі яны зрабілі ў ваколіцах Лагойска, а Яўстах ужо ў 23 гады апублікаваў першую навуковую працу па выніках раскопак. Сам даследчык успамінаў: "Пачаў капаць курганы ў 1837 годзе ў Лагойскім графстве, якія дагэтуль, хоць бы нават выпадкова, не былі разбураныя. Яны лічыліся па народнай традыцыі недатыкальнымі. Мусіў сялянам шчодра плаціць, каб узяліся капаць, і сам разам з імі капаў, каб хоць крыху ўзяць на сябе грэх"[48]. Сяляне, перш чым

[48] *Каханоўскі, Г.А.* Руплівец нашай старасвеччыны: Яўстах Тышкевіч / Г.А.Каханоўскі, А.Г.Каханоўскі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – С. 21.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узяць у рукі рыдлёўку, станавіліся на калені, маліліся за памерлых і толькі тады распачыналі раскопкі. Нават у працэсе работы, калі ўжо ўпалі векавыя хваіны, узнятая была слой за слоем зямля і перад вачыма адкрыліся астанкі спаленага чалавека, а Яўстах падымаў абрадавыя слязніцы (посуд, які ставілі памерламу ў магілу і ў які быццам бы збіраліся слёзы родных), разглядаў пацеркі і іншыя ўпрыгожванні, сяляне зноў станавіліся на калені і "творили молитвы за упокой усопших". Ішоў час, Я.Тышкевіч настойліва пашыраў свае веды ў археалогіі, гісторыі, фальклоры. Ён амаль бесперапынна праводзіў экспедыцыі па Міншчыне, асабліва Барысаўшчыне і Лагойшчыне, выязджаў на Заходнюю Дзвіну, Нёман і ў іншыя мясціны. Зямля раскрывала перад ім свае таямніцы. Вельмі многа знаходак папаўнялі дамашнюю калекцыю. Так, у Лагойскім графстве ў ваколіцах Краснага Бора Я.Тышкевіч раскапаў паселішча. Выяўлены былі унікальныя па мастацкім выкананні прадметы з эмаллю, якія склалі цэлую калекцыю (зараз яна захоўваецца ў Дзяржаўным археалагічным музеі ў Варшаве).

Навуковыя інтарэсы Тышкевічаў пашыраліся: браты вывучалі прыроду, гаспадарчы стан, заняткі насельніцтва, уклад жыцця сялян, культурныя здабыткі. Вынікі гэтай працы знайшлі адлюстраванне ў музейных калекцыях і публікацыях.

Краязнавец П.Шпілеўскі занатаваў, што ў Лагойску меліся дзвесце карцін італьянскага жывапісу, вялікі збор этрускіх ваз, рэдкіх знаходак з Пампеі і Геркуланума. Захоўвалася тут багатая калекцыя ў 1140 адзінак манет і медалёў. Гонарам сямейнага музея з'яўляліся два мініяцюрныя партрэты караля Стэфана Баторыя. Тут былі і старадаўнія рукапісы, і карты, на якіх можна было адшукаць Барысаўшчыну і Міншчыну са старажытным Лагойскам. З мясцовых збораў асабліва ганарыліся гаспадары крыжам, які Жыгімонт І Стары падараваў касцёлу ў мястэчку Гайна. Былі і іншыя каштоўныя падарункі. Шмат экспанатаў прадстаўлялі сабою зброю: кальчугі, латы, шчыты, бердышы, коп'і, мячы, амуніцыя вайны 1812 г. [49]

Яшчэ адна каштоўная калекцыя, створаная Тышкевічамі, была ў палацы ў Астрашыцкім Гарадку. Асноўнае месца

[49] *Tyszkiewicz, E.* Opisanie powiatu Borysowskiego / E.Tyszkiewicz. – Wilno: Druk. Ant.Marcinowskiego, 1847. – S. 271–272.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

займалі мастацкая галерэя і бібліятэка, у якой было многа рэдкіх дакументаў.

Краязнаўчыя кнігі і артыкулы Тышкевічаў асвятлялі цэлыя пласты гістарычнага мінулага і сучаснасці, грунтаваліся на руплівa сабраным і сістэматызаваным фактычным матэрыяле. Тышкевічы былі аднымі з першых беларускіх аўтараў комплексных краязнаўчых апісанняў рэгіёнаў. Выдатнымі былі кнігі Я.Тышкевіча "Апісанне Барысаўскага павета" і К.Тышкевіча "Вілія і яе берагі". Гэтыя кнігі – люстэрка шматаспектнай даследчыцкай работы па вывучэнні роднага краю – увайшлі ў залаты фонд беларускай краязнаўчай літаратуры.

У "Апісанні Барысаўскага павета" (1847) Я.Тышкевіч грунтоўна асвяціў прыродныя і геаграфічныя ўмовы краю, дэмаграфічнае і эканамічнае становішча, шляхі зносін, сістэму адміністрацыйнага кіравання, апісаў г.Барысаў, мястэчкі, маёнткі, цэрквы і касцёлы, сельскагаспадарчую дзейнасць, выдатных людзей, культурныя цэнтры, уклад жыцця сялян, асабліва іх святы і інш. Так, з павагай ён характарызуе навуковыя і збіральніцкія захапленні маршалка Барысаўскага павета Юзафа Слізеня, гаспадара маёнтка ў Мсціжы. У цяпліцах, аранжарэях і ў адкрытым грунце Ю.Слізень сабраў 3500 рэдкіх раслін, у маёнтку было многа птушак – паўлінаў, лебедзей, жураvoў, буслоў, канарэек, папугаяў – і жывёл – аленяў, ласёў, газеляў. У палацы месціліся калекцыі медалёў, манет і мінералаў. Гордасцю гаспадара была багатая агульнадаступная бібліятэка ў 7000 тамоў. Я.Тышкевіч сведчыць, што тым самым Ю.Слізень нямала зрабіў для заахвочвання да чытання жыхароў краю[50]. Пададзены звесткі ў кнізе і аб багатых зборах радавога маёнтка Тышкевічаў у Лагойску. Асобна аўтар звяртае ўвагу на "літоўскае паходжанне" рэчаў (выраз Я.Тышкевіча), гэта значыць на мясцовыя прадметы ці створаныя ў мінулым у ВКЛ. Напрыклад, ён указвае, што калекцыя блях для гравіроўкі "ўся літоўская канца 17 в. – матэрыял для гісторыі гравіроўкі ў Літве".

Многа месца займаюць у "Апісанні Барысаўскага павета" матэрыялы аб святах у сялянскім асяроддзі. У шматлікіх песнях, прымаўках і прыказках выказана паўсядзённае жыццё

[50] *Tyszkiewicz, E.* Opisanie powiatu Borysowskiego / E.Tyszkiewicz. – Wilno: Druk. Ant.Marcinowskiego, 1847. – S. 271.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

простага люду, яго гістарычны лёс. Так, жыццёвы народны вопыт гучыць у словах дзяўчыны-нявесты:

“Баліць мая галоўка ад вянца,
Не аддавай, мой татачка, за ўдаўца.
Аддай мяне, мой татачка, у сям’ю,
У сям’і ёсць парадак усяму”.

Прымаўкі і прыказкі барысаўчан павучаюць: “Хто скуп, ня глуп”, “Добрае чуваць далёка, а благое яшчэ далей”. Недалёкае гістарычнае мінулае ўзгадваецца ў прымаўках, напрыклад, “За Саса было хлеба і мяса. Настаў Панятоўскі, стаў хлеб нетакоўскі”.

Адлюстроўваючы гаспадарчыя справы краю, стан здароўя насельніцтва, Я.Тышкевіч клапоціцца аб узрастанні дабрабыту, паляпшэнні медыцынскага абслугоўвання, пазбаўленні людзей ад шкодных звычак. Ён адзначыў даволі частыя выпадкі раптоўнай смерці сялян ад злоўжывання бульбянай гарэлкі і лічыў неабходным даследаванне яе небяспечных элементаў; звярнуў увагу ўлад на неабходнасць арганізацыі неадкладнай медыцынскай дапамогі людзям, якія пацярпелі ад шалёных ваўкоў, і інш.[51]

Намаганнямі вышэйназваных і іншых краязнаўцаў назапашваліся веды аб духоўнай і матэрыяльнай культуры многіх беларускіх мясцін. Выразна вызначыліся фальклорна-этнаграфічны і гістарычны напрамкі краязнаўчых даследаванняў. Комплексныя апісанні асобных тэрыторый да нашых дзён захоўваюць вялікую навуковую каштоўнасць. З аматараў краязнаўства дзякуючы самаадукацыі вырасла плеяда адметных даследчыкаў.

*1.1.2. Краязнаўчыя даследаванні грамадскіх арганізацый.* Грамадскія арганізацыі як культурна-камунікатыўны феномен вядомы ў Беларусі з XVIII ст. (тайныя масонскія ложы). У пачатку XIX ст. у грамадскім руху дзейнічалі масонскія ложы, дабрачынныя, літаратурныя і навуковыя гурткі, ствараць якія дазвалялася легальна без зацвярджэння ўрадам.

Некалькі грамадскіх таварыстваў навуковага і літаратурнага профілю ў пачатку XIX ст. былі створаны пры Віленскім універсітэце. З Таварыства навук і мастацтваў (1805–1809)

[51] *Tyszkiewicz, E.* Opisanie powiatu Borysowskiego / E.Tyszkiewicz. – Wilno: Druk. Ant.Marcinowskiego, 1847. – S. 239–240.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

утварылася арганізацыя філаматаў. Навуковыя таварыствы не толькі садзейнічалі прыросту новых ведаў, але і абуджалі інтарэс да іх у шырокай публікі. У віленскіх грамадскіх арганізацыях удзельнічалі многія ўраджэнцы Беларусі, якія сваімі справамі і творчасцю праславілі яе. Гэта К.Контрым, А.Марціноўскі, Т.Зан, А.Міцкевіч, Ш.Жукоўскі і інш.

У некаторых грамадскіх арганізацыях, нягледзячы на кароткі час іх існавання, адбылася эвалюцыя ад касмапалітычна-рацыяналістычнай арыентацыі да патрыятычных настрояў. Члены таварystваў філаматаў, “прамяністых”, філарэтаў (у ліку якіх былі Т.Зан, А.Міцкевіч, А.Петрашкевіч, Ф.Малеўскі) рыхтавалі сябе да змагання за нацыянальную незалежнасць народаў. Віленскія шубраўцы на чале з К.Контрымам пачалі дыскусію аб новым змесце паняцця “народ”, абмяркоўвалі шляхі паляпшэння сацыяльна-эканамічнага становішча краю. Іх праціўнікі традыцыяналісты рамантызавалі мінулае. Умацавалася думка аб тым, што кожнаму народу неабходна захоўваць сваю індывідуальнасць. Таму ўдзел у таварыствах, якія непасрэдна не вызначалі мэт краязнаўства ў якасці галоўных, спрыяў звароту некаторых іх членаў да краязнаўчай работы. Пасля разгрому таварыства філаматаў займацца аматарскай дзейнасцю ў арганізаваных формах стала немагчымым.

Выступленне дзекабрыстаў выклікала новыя жорсткія меры ўлад, накіраваныя на кантроль грамадскага жыцця. Цяпер для ўтварэння арганізацыі неабходны быў дазвол імператара, таварыствам забаранялася любая грамадска-палітычная дзейнасць. Такое стаўленне дзяржавы рэзка абмяжоўвала функцыянаванне легальных грамадскіх арганізацый. Але прыйшоў час для стварэння арганізацый, устаўныя мэты якіх былі блізкімі да задач краязнаўства.

У 1824 г. былі створаны Віцебскае і Магілёўскае вольныя эканамічныя таварыствы, аб’яднаныя ў 1825 г. у Беларускае вольнае эканамічнае таварыства. Гэта былі першыя дазволеныя арганізацыі, якія вызначылі ў якасці мэт дзейнасці паляпшэнне рэгіянальнай сельскай гаспадаркі, ахову здароўя і магчымую дапамогу дробнай шляхце, якая не даказала свае правы на перавод у саслоўе расійскіх дваран. З-за немагчымасці разгарнуць усе вызначаныя кірункі дзейнасці таварыства засяродзілася на сельскагаспадарчых пытаннях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынікі даследаванняў таварыства знайшлі адлюстраванне ў зборніку “Летопись Белорусского общества сельских хозяев” (1841), які змяшчаў матэрыялы аб флоры, шкодніках сельскай гаспадаркі і інш. Гэта таварыства дабілася адкрыцця ў 1840 г. у Горках Магілёўскай губерні земляробчага вучылішча, дзе з цягам часу ўзніклі і формы краязнаўчай дзейнасці.

Буйнейшым аматарскім гуртком быў гурток графа Мікалая Пятровіча Румянцава (1754–1826), чалавека выдатна адукаванага, з вытанчаным густам і апантанасцю калекцыянера. Велізарнымі землямі на Беларусі быў узнагароджаны яго бацька П.А.Румянцаў-Задунайскі, адзін з буйнейшых военачальнікаў Кацярыны ІІ. М.П.Румянцаў абраў грамадзянскую кар’еру: служыў дыпламатам, міністрам камерцыі, быў пажыццёвым дзяржаўным канцлерам. Па яго волі добраўпарадкоўваўся і прыгажэў Гомель, які быў адным з любімых уладанняў Румянцава. Выйшаўшы ў адстаўку, Румянцаў цалкам захапіўся навуковымі пошукамі і згрупаваў вакол сябе кола даследчыкаў-энтузіястаў. Сярод іх былі вядомыя археографы, крыніцазнаўцы, бібліёграфы П.М.Строеў, К.Ф.Калайдовіч, А.Х.Вастокаў, П.І.Кепен, Ф.П.Адэлунг. Да ліку бліжэйшых супрацоўнікаў Румянцава ў Беларусі належалі праваслаўны святар І.І.Грыгаровіч і чыноўнік М.Р.Гартынскі. М.П.Румянцаў ахвяраваў вялікія сумы на пошукі старажытных дакументаў і іх публікацыю. Ад сваіх беларускіх супрацоўнікаў Румянцаў чакаў знаходак чаго-небудзь “исконно русского”, таму фінансаваў экспедыцыі з археаграфічнымі мэтамі ў каталіцкія і уніяцкія цэрквы і кляштары. Гэта дзейнасць прывяла да ўзнікнення археаграфічнага кірунку ў беларускім краязнаўстве.

Іван Іванавіч Грыгаровіч (1792–1852) адшукаў каштоўныя дакументы ў архівах гарадоў усходняй Беларусі, публікацыю якіх ён задумаў у выглядзе трохтомнага выдання “Белорусский архив древних грамот”. У свет выйшаў першы том (1824); быў падрыхтаваны, але не апублікаваны другі том. У першы том “Белорусского архива древних грамот” увайшлі 57 актаў. Яны паказвалі падзеі гістарычнага мінулага, але падабраны былі з антыкаталіцкай тэндэнцыйнасцю, каб засведчыць, які “ўціск давялося цярпець праваслаўным ад папізму”. Дзякуючы сваёй дзейнасці І.І.Грыгаровіч заслужыў званне “бацькі” беларускай археаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Плённую краязнаўчую работу вёў малады чыноўнік Мікалай Рыгоравіч Гартынскі (1799–1887). Ён паходзіў з магілёўскіх мяшчан і з цікавасцю вывучаў архіўныя дакументы пра Магілёў, Мсціслаў, Полацк, Оршу ў бібліятэках і архівах каталіцкіх і уніяцкіх кляштараў і цэркваў, архівах казённых палат і інш. Ім адшуканы прывілеі, дадзеныя Магілёву ў часы ВКЛ, напісаны і апублікаваны некалькі краязнаўчых работ.

Нягледзячы на пэўныя ідэалагічныя арыенціры, члены гуртка Румянцава ўнеслі важкі ўклад у выяўленне і вывучэнне актавых дакументаў, прысвечаных шэрагу беларускіх населеных пунктаў і рэгіёнаў, умацоўвалі крыніцазнаўчую аснову гісторыка-краязнаўчай працы.

Да ліку грамадскіх арганізацый, у якіх удзельнічалі беларускія краязнаўцы, належалі Рускае геаграфічнае таварыства (РГТ, 1845), Археаграфічная камісія (Санкт-Пецярбург, 1834) і інш. З’яўляліся айчынныя краязнаўцы і сябрамі замежных грамадскіх арганізацый, блізкіх да краязнаўчага руху, напрыклад Кракаўскага навуковага таварыства.

Рускае геаграфічнае таварыства атрымлівала шчодрыя ахвяраванні імператараў – апекуноў таварыства, розных ведамстваў і міністэрстваў, а таксама прыватных асоб. З таварыствам супрацоўнічалі многія беларускія краязнаўцы-этнографы. У якасці галоўнага напрамку ў сярэдзіне XIX ст. РГТ абрала фальклорна-этнаграфічную дзейнасць. У 1848 г. ва ўсе губерні была разаслана “Інструкцыя этнаграфічная” для збору звестак аб знешнасці “туземных жыхароў”, аб мясцовых гаворках, хатнім і грамадскім быце, “аб разумовых і маральных здольнасцях”, аб народных паданнях і помніках. Гэтую праграму падтрымалі мясцовая адміністрацыя і мясцовыя даследчыкі. Напрыклад, архіепіскап літоўскі Іоасаф і генерал-губернатар Паўночна-Заходняга края Б.Бібікаў спрыялі арганізацыі збору звестак па гэтай інструкцыі. У Пецярбург пачалі паступаць шматлікія артыкулы і паведамленні з беларускіх рэгіёнаў. Лепшыя матэрыялы былі апублікаваны ў “Вестнике имп. Русского географического общества”.

Унікальным для тагачаснага краязнаўства быў факт удзелу ў этнаграфічным даследаванні вольнаадпушчанага селяніна Віцебскай губерні Мікалая Аніміле. Выпадкова ўбачыўшы ў мясцовага святара інструкцыю даследавання, ён падрыхтаваў і выслаў у РГТ дзве працы, адна з якіх была выдадзена пад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

назвай “Быт белорусских крестьян Витебской губернии” (1854). Краязнавец поўнасцю і дакладна апісаў абрады і традыцыі: вяселле, хрысціны, памінкі, калядныя святы і інш. Так, М.Аніміле адзначае, што “поўнасцю вясельныя абрады спраўляюць” толькі заможныя сяляне. Бедныя на вяселле не вараць піва, а замест яго падаюць квас. Ён ахарактарызаваў жыллё, вытворчыя заняткі, адзенне, ежу, сацыяльна-маёмасны стан і іншыя бакі жыцця сялянства Падзвіння ў 1830–1840-я гг.

Археаграфічная камісія (Санкт-Пецярбург) “распорядилась о передаче ей старинных бумаг из западнорусских библиотек и архивов и успела приобрести огромные коллекции актов”[52]. З Магілёва, Мінска, Полацка і іншых месцаў дастаўляліся архівы былых цэркваў, магістратаў, павятовых судоў і іншых устаноў на тэрыторыі Беларусі часоў ВКЛ. Археаграфічная камісія звяртала ўвагу даследчыкаў на значнасць пошуку дакументаў за XV–XVII стст., “когда в Западном крае наиболее проявлялась русская самобытность независимо от позднейшего влияния Польши”[53]. Пачалася публікацыя археаграфічных зборнікаў, у якіх змяшчаліся матэрыялы, прысвечаныя праваслаўнай царкве, уніяцтву, напрыклад, “Акты, относящиеся к истории Западной России” ў пяці тамах, рэдагаваныя І.І.Грыгаровічам.

У гэты час на Беларусі яшчэ былі багатыя магнацкія архівы Радзівілаў, Сапегаў і іншых, дзе зберагаліся дакументы, якія пацвярджалі распаўсюджанасць сярод мясцовай эліты заходнееўрапейскай культуры і супярэчылі афіцыйнай дактрыне гісторыі краю. Архівы з канфіскаваных маёнткаў удзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. на працягу дзесяткаў гадоў заставаліся без належнага догляду і захавання, мянялася іх месцазнаходжанне, дакументы знікалі і гінулі. У прыватнасці, калі гродзенскі віцэ-губернатар у 1836 г. азнаёміўся з дакументамі Сапегаў у Дзярэчыне, то адзначыў, што тут была перапіска прадстаўнікоў роду з французскімі, прускімі, польскімі каралямі, высокапастаўленымі асобамі. Але дакументы не зацікавілі чыноўніка, і архіў многа гадоў мяняў месцазнаходжанне. Карціны, кнігі, манеты і скульптуры пас-

[52] Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. – СПб.: Археографическая комиссия, 1848. – Т.1. – С.1.
[53] Журнал Министерства народного просвещения. – 1842. – № 11. – С.10–11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ля канфіскацыі Дзярэчына і іншых маёнткаў Я.К.Сапегі былі адпраўлены ў Пецярбург, дзе большая частка твораў мастацтва была выстаўлена ў Эрмітажы.

Выдатнай з’явай краязнаўства і культуры з’явілася стварэнне Віленскага музея старажытнасцей і археалагічнай камісіі пры ім. Заснаваны яны былі па ініцыятыве Я.Тышкевіча ў 1855 г., у асноўным на яго сродкі, ён жа быў старшынёй музея і камісіі. Вядомы гісторык-краязнавец М.І.Балінскі быў прызначаны віцэ-старшынёй, а А.Г.Кіркор – сакратаром археалагічнай камісіі. Членамі музея і камісіі сталі вядомыя вучоныя і аматары, даследчыкі мінулага беларускіх зямель К.Буйніцкі, Ю.Крашэўскі, А.Плятар, Т.Нарбут, К.Тышкевіч, П.Тышкевіч і інш. Упершыню быў створаны калектыў, здольны вырашаць вялікія навуковыя задачы. Можна сцвярджаць, што Я.Тышкевічу ўдалося аб’яднаць усіх буйнейшых мясцовых гісторыкаў, археолагаў, этнографаў, прыродазнаўцаў. Мару аб музеі, дзе былі б сабраны мясцовыя старажытнасці, выдатны краязнавец выношваў не адзін год.

Віленскі музей старажытнасцей быў адкрыты 1 студзеня 1856 г. у будынку Віленскага універсітэта. Яго асновай з’яўляліся матэрыялы, сабраныя за многія гады Я.Тышкевічам, і бібліятэка. Члены камісіі таксама перадавалі ў музей каштоўныя прадметы даўніны. Так, К.Буйніцкі і А.Плятар перадалі ў Віленскі музей старажытнасцей свае калекцыі знаходак з Падзвіння і матэрыялы апісання Заходняй Дзвіны. Канстанцін Тызенгаўз падарыў арніталагічную калекцыю, на аснове якой адкрыўся чарговы кабінет музея. Дзве тысячы прадметаў прадстаўлялі першую ў мясцовай гісторыі археалагічную калекцыю. У музеі былі нумізматычны і мінералагічны кабінеты, калекцыі твораў мастацтва і іншыя экспанаты. Чучалы прадстаўнікоў фауны адлюстроўвалі багацце беларускай прыроды.

Камісія штомесячна праводзіла пасяджэнні, на якіх заслухоўваліся і абмяркоўваліся рэфераты і навуковыя паведамленні краязнаўчага зместу. Звесткі аб дзейнасці камісіі публікаваліся ў віленскім друку, уважліва складаліся і абмяркоўваліся гадавыя справаздачы па выніках дзейнасці. Камісія выпусціла некалькі тамоў “Записок Виленской археологической комиссии”. Заслугай камісіі з'яўляецца выданне археаграфічных зборнікаў. Сярод выданняў, якія не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

страцілі свайго значэння да нашага часу, былі: “Збор грамат” (“Zbior dyplomatów”) М.Круповіча (1858) і “Скарбніца грамат” (“Skarbiec dyplomatów”) І.М.Даніловіча (1860–1862). “Скарбніца грамат” была падрыхтавана вядомым беларускім гісторыкам і крыніцазнаўцам І.М.Даніловічам.

Пасля паўстання рэпрэсіўныя дзеянні ўлад прывялі да разгрому Віленскага музея старажытнасцей і археалагічнай камісіі. Прызначаная Мураўёвым-вешальнікам камісія для разбору прадметаў Віленскага музея старажытнасцей вызначыла склад калекцый як прыналежных “к чуждой этому краю польской народности”[54]. Яўстах Тышкевіч, зняважаны і пазбаўлены справы свайго жыцця, у хуткім часе памёр.

*1.1.3. Дзяржаўнае і школьнае краязнаўства*. Дзяржаўнае краязнаўства ўзнікла і развівалася на аснове патрэбнасцей цэнтральных і рэгіянальных органаў улады і кіравання ў інтэграванні беларускіх зямель у грамадска-палітычны, сацыяльна-эканамічны і культурны працэсы развіцця Расійскай імперыі. Яго суб’ектамі было даволі шырокае кола ўстаноў і арганізацый, у функцыі якіх уваходзіла атрыманне мясцовай інфармацыі і яе выкарыстанне ў разнастайных мэтах. У іх ліку былі ВНУ, губернскія статкамітэты, архівы.

У імператарскім Віленскім універсітэце (1803–1832), Полацкай езуіцкай акадэміі (1812–1820), Горы-Горацкім земляробчым інстытуце (з 1840 г. да 1848 г. – школа; 1848–1864 гг. – інстытут) пачаліся гістарычныя, гісторыка-літаратурныя, моўныя, прыродазнаўчыя і іншыя даследаванні беларускіх зямель.

На 1815–1824 гг. прыходзіцца пад’ём дзейнасці Віленскага універсітэта як навуковай і навучальнай установы. Пад кіраўніцтвам рэктара Я.Снядэцкага была палепшана матэрыяльна-тэхнічная база, ствараліся новыя кафедры, развіваліся крыніцазнаўчыя гістарычныя і моўныя даследаванні, прысвечаныя ВКЛ. Яго выпускнікі працавалі ўрачамі, юрыстамі і іншымі спецыялістамі. Універсітэт кіраваў школьнай сістэмай адукацыі, быў на чале Віленскай навучальнай акругі. Універсітэцкая адукацыя стала вельмі каштоўнай. Для незаможных слаёў універсітэт адкрываў шляхі навуковай і

[54] *Дневник* заседаний комиссии для разбора предметов, находящихся в Виленском музее древностей. – Вильно: тип. А.Сыркина, 1865. – С.2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прафесійнай дзейнасці, паляпшэння дабрабыту. Ва універсітэце вучыліся дзеці багатых шляхціцаў, якіх не цікавіла кар’ера чыноўнікаў. Неабходна адзначыць надзвычайную з’яву, якая заключалася ў высокім уплыве універсітэта на грамадскую свядомасць адукаваных колаў Беларусі, Літвы і Польшчы. Польскія гісторыкі прызнаюць, што ні адна ВНУ не мела падобнага грамадскага ўплыву. Гэта стала магчымым дзякуючы выдатнаму прафесарскаму складу і патрыятычнай пазіцыі выкладчыкаў, выхадцаў з беларускіх зямель, І.Даніловіча, М.Пелкі-Палінскага, М.Бароўскага, С.Б.Юндзіла, І.Анацэвіча і інш. Асабліва актыўным у розных грамадскіх пачыннях быў ад’юнкт бібліятэкі універсітэта, ураджэнец Вілейскага павета К.Контрым. Выкладчыкі аказалі значны ўплыў на фарміраванне патрыятычных настрояў студэнцтва. У студэнцкім асяроддзі, па словах Т.Зана, “сялянская” (беларуская) мова ўжывалася ахвотна. Захапленне беларускім фальклорам, звяртанне да яго ў літаратурнай творчасці пракладала шляхі для развіцця краязнаўства.

Прафесары Віленскага універсітэта ўнеслі значны ўклад у гістарычнае краязнаўства. Першы даследчык беларуска-літоўскага летапісання і права ВКЛ прафесар Ігнат Даніловіч (1787–1843) згуртаваў маладых даследчыкаў, якія добра ведалі царкоўнаславянскую, беларускую, польскую, лацінскую і іншыя мовы. Гэта былі М.Баброўскі, І.Анацэвіч, П.Сасноўскі, А.Марціноўскі і інш. Яны дапамагалі І.Даніловічу праводзіць пошук матэрыялаў. І.Даніловіч супрацоўнічаў таксама з І.Лялевелем, В.Анастасевічам, М.Румянцавым. Ён быў вядомым вучоным, і ва універсітэтах Расіі яму былі даступныя архівы, музеі, розныя калекцыі і зборы. У Супрасльскім манастыры ён адшукаў выдатны помнік беларуска-літоўскага летапісання “Супрасльскі летапіс”. Марай І.Даніловіча было адрадзіць да жыцця старажытную беларускую мову. Аднак патрыятычныя настроі, якія распаўсюджваў сваёй дзейнасцю І.Даніловіч, варожа ўспрымаліся ўладнымі структурамі як “мятежные”. За вучоным пачалі сачыць, арганізавалі траўлю, і ў 1824 г. І.Даніловіч пераехаў на працу ў Кіеўскі універсітэт. Пераадольваючы перыпетыі лёсу, ён настойліва займаўся даследаваннямі, рыхтаваў зборнік гістарычных дакументаў. На жаль, хвароба і смерць перашкодзілі выдаць практычна завершаную работу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рукапіс пад назвай “Скарбніца грамат” (1860–1862) з захаваннем прозвішча складальніка апублікаваў Віленскі музей старажытнасцей. Два тамы змяшчаюць рознага роду інфармацыю ці перадаюць арыгінальны тэкст 2383 дакументаў пра ВКЛ з часоў старажытнасці да 1569 г. Большасць матэрыялаў перакладзены на польскую мову. У канцы кожнага дакумента ўказана месца яго захавання або крыніца публікацыі. Гістарычныя дакументы адбіраліся Даніловічам адпаведна яго навуковым інтарэсам: прыведзены цікавейшыя дакументы па гісторыі Полаччыны, Бельска (малой радзімы І.М.Даніловіча), прывілеі гарадам на магдэбургскае права, малавядомыя дакументы па гісторыі родаў і інш. Сучасны даследчык “Скарбніцы грамат” В.Ф.Голубеў адзначыў каштоўнасць апублікаваных у выданні матэрыялаў, іх значэнне для вырашэння “чыста гістарычных пытанняў”, а не для абслугоўвання ідэалагічнага заказу, якімі былі выданні архіўных дакументаў, здзейсненыя па загаду ўлад пасля паўстання 1863–1864 гг.

Крыніцы, сабраныя выкладчыкамі і выхаванцамі Віленскага універсітэта, адлюстроўвалі сістэму самакіравання, якую на працягу многіх стагоддзяў мелі беларускія рэгіёны, іх гісторыю, стан гаспадаркі, адметнасці ў рэлігіі, падзеі маскоўска-літоўскіх войнаў, гісторыю сем'яў. Многія дакументы не адпавядалі міфам аб вечнай прыналежнасці беларусаў да Расіі. Не выпадкова ўлады імкнуліся публікаваць такія дакументы, якія б больш адпавядалі афіцыйнай палітыцы ў дачыненні да Беларусі. За гэтую справу ў Беларусі тады браліся ці аматары, як І.І.Грыгаровіч, ці чыноўнікі. Так, з пазіцый афіцыйнай ідэалогіі публікацыю гістарычных актаў “Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам” (1848) здзейсніў мінскі цывільны губернатар А.Сямёнаў.

Свае кірункі даследаванняў вызначылі і іншыя ВНУ. Прафесары і студэнты Полацкай езуіцкай акадэміі падрабязна апісалі забудову і састаў жыхароў г. Полацка, гісторыю Віцебскага і Полацкага краёў. Матэрыялы друкаваліся ў часопісе “Месячнік Полацкі”. Дзякуючы гэтым матэрыялам выданне ўспрымалася чытачамі як орган высокага грамадзянскага, патрыятычнага значэння. Так, невядомы падпіс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чык са Слонімшчыны ў вершы, прысвечаным “Месячніку Полацкаму”, называе часопіс “беларусам”, якому прыходзіцца вытрымліваць знявагу і ўціск афіцыйных колаў.

У Горы-Горацкім земляробчым інстытуце, які рыхтаваў аграномаў, былі музеі (заалагічны, анатамічны, сельскагаспадарчых машын), батанічны сад (3870 раслін), бібліятэка больш за 7000 тамоў. Выкладчыкі І.А.Сцебут, А.М.Бажанаў, С.С.Касовіч і іншыя займаліся рэгіянальнай агратэхналогіяй; іх вынікі знайшлі адлюстраванне ў “Записках Горы-Горецкого земледельческого института” (1852–1857). За ўдзел выкладчыкаў і студэнтаў у паўстанні 1863–1864 гг. інстытут быў пераведзены ў Санкт-Пецярбург.

На ніве школьнай адукацыі пэўны перыяд працавалі каталіцкія ордэны. Але гэтыя школы не выклікалі даверу ўлад і іх закрыццё было прадвызначана. Фарміравалася новая сетка навучальных устаноў, якая адпавядала расійскай сістэме адукацыі, у прыватнасці, адкрываліся гімназіі. Захаваліся звесткі аб краязнаўчай рабоце асобных навучальных устаноў. Так, у 1837 г. выхаванцы Себежскай гімназіі вялі запісы народных абрадаў, легендаў і песень.

У гэты перыяд узнікла шмат дзяржаўных інстытутаў, функцыянаванне якіх непасрэдна было звязана са зборам і апрацоўкай мясцовай інфармацыі, але асноўная іх дзейнасць разгарнулася пазней. Гэта найперш губернскія статыстычныя камітэты (статкамітэты), Віцебскі і Віленскі архівы старажытных актавых кніг. Губернскія статкамітэты пачалі ўтварацца па загаду Сената ў 1834 г. Асноўнымі іх задачамі былі збор і абагульненне рэгіянальных статыстычных звестак аб гаспадарцы і насельніцтве.

Па заданні Генштаба расійскай арміі з ваенна-стратэгічнымі мэтамі было праведзена вывучэнне беларускіх зямель. Збор звестак быў даручаны афіцэрам, ураджэнцам заходніх губерняў. Хаця дакладнага плана збору матэрыялу аб “присоединенных территориях” падрыхтавана не было, збіралі разнастайны матэрыял – гістарычны, геаграфічны, прыродазнаўчы, гаспадарчы, моўны і іншы, які ў сукупнасці найбольш поўна адлюстроўваў асаблівасці таго ці іншага рэгіёну. Паходжанне дапамагала афіцэрам атрымаць звесткі з сямейных архіваў, прыватных музеяў і бібліятэк. Пад назвай “Материалы для географии и статистики России, собранные

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

офицерами Генерального штаба”, пачалі выдавацца гістарычна-статыстычныя апісанні губерняў: Віленскай, падрыхтаванае А.Карэвай, Гродзенскай – П.Баброўскім, Мінскай – І.Зяленскім. Лепшым з іх з’яўляецца апісанне “Гродненская губерния”, выкананае П.Баброўскім, за якое аўтар быў адзначаны залатым медалём РГТ. Пад уплывам праведзенай працы П.Баброўскі захапіўся краязнаўствам, ён надрукаваў каля 80 навуковых прац па гісторыі, этнаграфіі, геаграфіі “роднага яму Паўночна-Заходняга края”.

*1.1.4. Краязнаўства ў перыядычным друку.* Хаця ў краі цяжка было атрымаць дазвол на выданне перыядычнага органа, але перадавыя людзі імкнуліся выказваць свае думкі, абменьвацца імі. Ю.Крашэўскі, напрыклад, характарызуючы стан літаратуры на Віленшчыне і Гродзеншчыне, пісаў: “Мы, уладары зямлі, маем абавязкі гаспадарчыя і грамадскія, аднак павінны разрывацца на часткі, жадаючы служыць літаратуры і мове”. А. Плятар у 1850 г. у лісце да Ю.Крашэўскага пісаў, што пажадана было б заняцца “выданнем правінцыяльных штогоднікаў, у якіх бы збіраліся гістарычныя, археалагічныя, фізічныя, статыстычныя і іншыя матэрыялы, карысныя для апісання нашага краю”. (*Historia* Nauki Polskiej: w 7 t. / pod red. B.Suchodolskiego. – Wroctaw itd.: Wyd. PAN, 1977. – T. 3. – S. 203).

У гэты час вынікі краязнаўчых даследаванняў пачалі сістэматычна друкавацца ў перыядычным друку Вільні, Полацка, Варшавы, Пецярбурга і іншых гарадоў, а таксама ў беларускай губернскай перыёдыцы. Выдаваліся кнігі і зборнікі краязнаўчага зместу. Найбольшую распаўсюджанасць атрымаў перыядычны друк, выпускаемы ў Вільні. У газетах і часопісах “Kurier Litewski”, “Dziennik Wileński”, “Tygodnik Wileński” рэдактарамі былі вядомыя людзі, якія мелі дачыненне да краязнаўчых даследаванняў, – А.Марціноўскі, С.Б.Юндзіл, К.Контрым, М.Балінскі. У гэтых выданнях знайшлі месца афіцыйныя і неафіцыйныя матэрыялы беларускіх рэгіёнаў, лісты і артыкулы рэгіянальнай тэматыкі.

Ю.Крашэўскі выдаваў у 1841–1852 гг. “Атэнэум” (66 тамоў). Назва паказвае амбіцыйныя імкненні Ю.Крашэўскага, такія назвы мелі найбольш значныя часопісы ў Еўропе. Па змесце часопіс быў літаратурным, мастацкім і навуковым. Сярод галін навукі вядучай была гісторыя, перш за ўсё –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

публікацыя гістарычных крыніц XVI–XVIII стст., прысвечаных асобным беларускім мясцінам, асабліва ў трох першых тамах. У "Атэнэуме" друкаваліся І.Даніловіч, Т.Нарбут, Я.Тышкевіч, У.Сыракомля. Краязнаўчыя нарысы "Белая на Палессі" Ю.Крашэўскага, нататкі пра пінскі францысканскі кляштар А.Машынскага, "Народныя песні на Віцебшчыне", сабраныя і перакладзеныя Р.Зянькевічам, і іншыя матэрыялы папаўнялі здабыткі беларускага краязнаўства.

Найбольш выразныя характарыстыкі краязнаўчага выдання меў зборнік пад назвай "Рубон"[55], які выпускаў у 1842–1849 гг. памешчык К.Буйніцкі. Выданне прызначалася для жыхароў Віцебскай губерні, Падзвіння. Кола аўтараў складалі таксама пераважна жыхары гэтага рэгіёну, у іх ліку даволі вядомы краязнавец І.Я.Храпавіцкі. К.Буйніцкі пісаў у першым томе выдання аб гэтых аўтарах, што яны "...вянок самародных кветак, расцвіўшых на беразе Дзвіны"[56]. Тут друкаваліся разнастайныя матэрыялы: артыкулы па галінах навук, асабліва па сельскай гаспадарцы, эканоміцы, геаграфіі, гісторыі, арыгінальныя і перакладныя творы мастацкай літаратуры. Напрыклад, у першым томе былі змешчаны тры навуковыя артыкулы А.Плятара, верш "Дзвіна" І.Я.Храпавіцкага, "Марына, аповесць беларуская" А.К.Гроза і інш. У артыкуле "Падарожжа па краі" выказваюцца пачуцці бязмежнай любові да роднай беларускай зямлі, з гумарам і іроніяй, але і з несумненай назіральнасцю характарызуюцца мясцовая моладзь, некаторыя рысы нацыянальнага характару. Калі польскую моладзь аўтар параўноўвае з трапяткой асінай, падкрэсліваючы яе пустапарожнасць, гаварлівасць, рухавасць, то маладыя беларускія шляхціцы "поўзаюць, карпеюць, дрэмлюць, спяць, пазяхаюць, неміласэрна нудзяцца, гавораць аб брычках, фурманах, псах, Бог ведае аб чым; словам, моладзь гэтая часта пры найлепшых прыродных здольнасцях і талентах падобная бывае да перакісшых грыбоў у цёмных лясах…"[57].

У зборніку А.Г.Кіркора "Тэка Віленьска" былі апублікаваны адметныя гістарычныя і краязнаўчыя матэрыялы: К.Тышкевіча аб замках і гарадзішчах, у тым ліку пра замак у

[55] Рубон – старажытная славянская назва ракі Заходняя Дзвіна.
[56] Rubon. –Wilno, 1842. – T. 1. – S. VI.
[57] Rubon. – Wilno, 1845. – T. 6. – S. 116.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лагойску; А.Мухлінскага аб беларускіх татарах, аб творчасці У.Сыракомлі і С.Манюшкі; "Іконатэка" – слоўнік, прысвечаны мастакам, якія малявалі гістарычныя падзеі, рэстаўрыравалі касцёлы ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Большасць краязнаўчых выданняў гэтага перыяду, якія выйшлі на тэрыторыі Беларусі, былі польскамоўнымі.

Улады са свайго боку пачалі ствараць афіцыйныя органы мясцовага перыядычнага друку. Імі сталі губернскія ведамасці, на старонках якіх змяшчалася афіцыйная інфармацыя, у тым ліку прысвечаная пэўнай мясцовасці.

*1.1.5. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства.* Захаваліся нешматлікія звесткі пра існаванне ў бібліятэках ВНУ, канфесіянальных устаноў і прыватных асоб рукапісаў і друкаў, прысвечаных беларускім землям. Такія зборы выкарыстоўваліся для краязнаўчых даследаванняў. Адной з самых каштоўных прыватных бібліятэк была бібліятэка Тышкевічаў, у складзе якой "знаходзяцца рэчы немалога інтарэсу для гісторыі, асабліва краёвай", сведчыў аўтар "Апісання Барысаўскага павета". У выдатнай па падборы кніг бібліятэцы, па словах Я.Тышкевіча, 500 былі рэдкасцю ў "бібліяграфіі польскай", што зноў жа сведчыць аб наяўнасці айчынных кніг. Сярод славутых людзей павета ён падаў звесткі аб жыцці і дзейнасці прафесара Ш.Ф.Жукоўскага, які вёў і бібліяграфічную работу ў бібліятэцы Віленскага універсітэта.

Першай спецыялізаванай бібліятэкай, прысвечанай Паўночна-Заходняму краю і асобным яго мясцінам, была бібліятэка Віленскага музея старажытнасцей і археалагічнай камісіі. Усяго бібліятэка музея налічвала каля 15 тыс. выданняў па гісторыі ВКЛ. Я.Тышкевіч перадаў туды 3000 тамоў выданняў, каштоўных для вывучэння беларускіх зямель.

У бібліяграфічнай прадукцыі назіраецца павышаны інтарэс да краязнаўчых і беларусазнаўчых праблем. Бібліяграфічныя агляды змясцілі ў сваіх кнігах К.І.Грум-Гржымайла "Про колтун" (1828), А.Рыпінскі "Беларусь" (1840). У аглядзе па тэме "Ян Баршчэўскі і Беларусь", напісаным Р.А.Падбярэскім і змешчаным у кнізе "Шляхціц Завальня", характарызаваліся творы на беларускай і польскай мовах, прысвечаныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі, і крытыкаваліся тыя аўтары, якія не шанавалі культуру роднага краю.

Краязнаўчая персанальная бібліяграфія папоўнілася біябібліяграфічным слоўнікам "Бібліятэка пісьменнікаў Полацкай часткі", складзеным Д.Браўнам (змешчаны ў выданні А.Банера "Бібліятэка пісьменнікаў Таварыства Ісуса" (1853–1856). Ён адлюстроўваў біяграфічныя і бібліяграфічныя звесткі аб членах ордэна езуітаў Полаччыны, якія на працягу 1564–1852 гг. вызначыліся сваімі працамі ў галіне тэалогіі, гісторыі, літаратуры, моваазнаўства і інш.

## Глава 2. Развіццё краязнаўчага руху ў 1865–1917 гг.

### *2.1. Арганізацыйныя аспекты краязнаўчага руху і асноўныя кірункі вывучэння рэгіёнаў*

"Усім пачынанням культурным польскім, як беларускім і літоўскім, палажыў канец 1863 год", – напісаў гісторык А.Брукнер[58]. Гэта выказванне характарызуе і становішча краязнаўчага руху на Беларусі пасля разгрому паўстання 1863–1864 гг. Улады прыступілі да вынішчэння ўсімі спосабамі "польшчызны" на Беларусі, а таксама і культурнага беларускага руху. Многа відных асоб, якія раней вывучалі беларускія рэгіёны, сталі ахвярамі рэпрэсій, эмігрыравалі, страцілі магчымасць займацца любімай справай, не перанеслі жахлівых падзей, якія напаткалі іх блізкіх і край. Сярод іх браты Яўстах і Канстанцін Тышкевічы, Т.Нарбут, К.Буйніцкі, А.Рыпінскі і інш. Толькі асобныя дэмакратычна настроеныя рускія вучоныя, як этнограф А.Н.Пыпін[59], выказалі падтрымку Тышкевічам, Кіркору, справядліва ацаніўшы іх дзейнасць па навуковых заслугах, а не па прыпісаных палітычных задумах. Віленскі археалагічны музей і археалагічная камісія, разрабаваныя і абняслаўленыя, перайшлі ў ведамства Віленскай вучэбнай акругі. Быў закрыты Горы-Горацкі земляробчы інстытут, апошняя ВНУ ў дарэвалюцыйнай Беларусі, што адмоўна адбілася на арганізацыі і дасягненнях беларускага краязнаўства.

[58] *Brükner, A.* Dzieje kultury polskiej / A.Brükner. – Warszawa: Wiedza Powszechna, 1991. – T. 1. – S. 641.

[59] *Алексеев, Л.В.* Археология и краеведение Беларуси, XVI в. – 30-е годы XX в. / Л.В.Алексеев. – Мн.: Бел. навука, 1996. – С. 83.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Узровень культурнага, духоўнага жыцця нават у вялікіх гарадах рэзка ўпаў, у канфіскаваных маёнтках, дзе раней вяліся краязнаўчыя даследаванні, з'явіліся новыя гаспадары. Шырока прапагандавалася ідэалогія заходнерусізму. У 60–70-я гг. не было ніводнай грамадскай арганізацыі з краязнаўчымі мэтамі дзейнасці, намнога паменшыўся выпуск кніг, было забаронена друкаванне на польскай мове, канфіскавана польскамоўная літаратура з бібліятэк, знішчаліся беларускія выданні, надрукаваныя лацінскім шрыфтам. Але рэпрэсіі не маглі вынішчыць у людзей жадання даследаваць мінулае свайго краю, вывучаць духоўную і матэрыяльную культуру сялянства, прыродныя багацці, гаспадарчы лад жыцця. Толькі ў 80-я гады пачаўся эканамічны ўздым, а ў грамадска-палітычным і культурным жыцці заявілі аб сабе дзеячы новага пакалення беларускага краязнаўчага руху. Гістарычная рэгіянальная свядомасць насельніцтва трывала замацавалася ў катэгорыі "тутэйшасці", якая паказвала непарыўную сувязь з гэтай зямлёй. Любоў да зямлі і беларускага народа адзначалі ў якасці дзвюх галоўных рыс "тутэйшасці" даследчыкі гэтага феномена, у прыватнасці ўраджэнец Валожыншчыны Мар'ян Здзяхоўскі[60]. На змену "тутэйшасці" ў пачатку ХХ ст. прыйшло асэнсаванае паняцце беларускасці. Краязнаўцы гэтага перыяду ўнеслі значны ўклад у станаўленне нацыянальнай свядомасці і разгортванне "нашаніўскага перыяду" беларускага адраджэння.

Ва ўмовах нацыянальна-культурнага прыгнёту друкаваць краязнаўчыя працы магчыма было на рускай ці на польскай мовах. Толькі падзеі рэвалюцыі 1905 г. спрыялі з'яўленню друкаваных краязнаўчых матэрыялаў на беларускай мове.

У гэты перыяд развіваліся тыя ж арганізацыйныя формы краязнаўства, як і на папярэднім этапе: грамадскае, дзяржаўнае і школьнае. Але суб'екты краязнаўчага руху змяніліся, што тлумачылася не толькі натуральным бегам часу, але, на жаль, і рэпрэсіўнымі дзеяннямі цэнтральных і мясцовых улад.

*2.1.1. Грамадскі краязнаўчы рух.* У гэтай плыні краязнаўства плённа працавалі асобныя краязнаўцы і грамадскія

[60] *Zienkiewicz, T.* Polskie życie literackie w Mińsku w XIX i na początku XX wieku do roku 1921) / T.Zienkiewicz. – Olsztyn: Wyższa szkoła pedagogiczna, 1997. – S. 27.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізацыі. Прычым у канцы XIX – пачатку XX ст. кола грамадскіх краязнаўчых арганізацый і арганізацый з выражаным аспектам рэгіёназнаўчых даследаванняў пачало прыметна павялічвацца. Паступова пашыралася сацыяльнае прадстаўніцтва ўдзельнікаў краязнаўчага руху. Даследаваннямі займаліся памешчыкі, чыноўнікі, настаўнікі, святары, пісьменнікі, выдаўцы, урачы, інжынеры. Да краязнаўчага руху далучыліся асобныя адукаваныя сяляне. Сярод шляхціцаў у параўнанні з папярэднім перыядам звузілася кола прадстаўнікоў арыстакратыі: пасля апошняга паўстання былая магутная магнатэрыя амаль знікла ў Беларусі. Аднак, як і раней, адмысловымі цэнтрамі краязнаўства былі памешчыцкія сядзібы, дзе былі багатыя бібліятэкі, архівы, музеі, а гаспадары глыбока цікавіліся гісторыяй, этнаграфіяй, археалогіяй і іншымі галінамі краязнаўства. Некаторыя з іх валодалі метадамі навуковых даследаванняў, праводзілі раскопкі, ладзілі экспедыцыі, былі ўдзельнікамі навуковых таварыстваў, шмат друкаваліся.

У канцы XIX – пачатку XX ст. у Беларусі працавала плеяда выдатных краязнаўцаў, якія праводзілі краязнаўчыя даследаванні разнастайнай тэматыкі, пераважна па гістарычных навуках, этнаграфіі і фальклоры, а таксама па прыродазнаўстве. Плённа займаліся краязнаўчымі даследаваннямі памешчыкі М.Ф.Кусцінскі, В.А.Шукевіч, чыноўнікі і выкладчыкі А.М.Семянтоўскі, А.П.Сапуноў, М.Я.Нікіфароўскі, Е.Р.Раманаў, Я.Ф.Карскі, М.В.Доўнар-Запольскі і інш.

Асобнае месца ў краязнаўстве заняў Напалеон Орда (1807–1883), ураджэнец Пінскага павета (зараз Іванаўскі раён). З маладых гадоў ён удзельнічаў у нацыянальна-вызваленчым руху, што адбілася на яго жыццёвым лёсе. Выключэнне з ліку студэнтаў Віленскага універсітэта, эміграцыя, канфіскацыя ў казну радавога маёнтка Варацэвічы, пошукі прытулку і працы і многія іншыя выпрабаванні не зламілі яго духу і патрыятычных пачуццяў. У сталым узросце (каля 1860 г.) Н.Орда пачаў ствараць малюнкі гістарычных помнікаў былога ВКЛ і сучасных краявідаў. Аб сваёй задумцы ён паведамляў сябру І.Дамейку: “З 1856 г. знаходжуся ў краі, і, як ведаеш, быў мастаком-аматарам. Пасля вяртання мне ў галаву прыйшла шчаслівая думка наведаць нашу правінцыю, такую дарагую нашаму сэрцу, але так мала знаёмую суайчыннікам. Пада-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рожнічаючы з алоўкам у руцэ, намаляваў рэшткі нашага мінулага і цывілізацыі. Зрабіў каля 1000 малюнкаў і пачаў выдаваць альбом, які, хвала Богу, у мяне добра ідзе". Мастак паведамляў таксама аб намеры наведаць Віленскую, Гродзенскую, Мінскую і Магілёўскую губерні. Замалёўкі з натуры карысталіся ў той час шырокай папулярнасцю ў Еўропе, і Н.Орда з захапленнем прыступіў да адлюстравання замкаў, палацаў, касцёлаў і іншых помнікаў, відаў мястэчак і буйных гарадоў. Больш за 30 малюнкаў ён прысвяціў Гродне – гораду, якому належала адметная роля ў гісторыі і дзе захавалася архітэктурнае аблічча мінулага. Ён намаляваў Гродзенскі, Крэўскі, Лідскі, Гальшанскі, Навагрудскі, Нясвіжскі, Мірскі і іншыя замкі. Многія малюнкі прысвечаны шляхецкім сядзібам, палацам і іх паркава-ландшафтнаму атачэнню. На некаторых малюнках адлюстраваны сядзібы знакамітых сучаснікаў: Адама Міцкевіча ў Завоссі і Тугановічах, паэта Антона Эдварда Адынца ў Гейстунах (Ашмянскі раён), гісторыка Тэадора Нарбута ў Шаўрах (Воранаўскі раён) і інш. Шматлікія малюнкі Н.Орды адлюстроўваюць касцёлы і кляштары. Малюнкі ён дапаўняў краязнаўчымі звесткамі: на кожным лісце знізу ўказваў назву аб'екта, кароткія звесткі аб ім, час пабудовы, важнейшыя падзеі, звязаныя з адлюстраваным аб'ектам, прозвішчы фундатараў, уладальнікаў, мастакоў і інш. Так, у запісе пад малюнкам касцёла ў Дзярэчыне ёсць радкі: "Касцёл і магіла Сапегаў варварскі разбураны і разабраны на цэглу. Унутры бачыў цудоўныя фрэскі". За мастаком пільна сачылі паліцэйскія органы.

Дзякуючы дзейнасці мастака захаваліся ўяўленні аб помніках і памятных мясцінах многіх рэгіёнаў, якія зніклі з цягам часу ці непазнавальна змяніліся. Таму малюнкі Н.Орды з'яўляюцца крыніцамі для рэстаўратараў, гісторыкаў, краязнаўцаў, спецыялістаў ландшафтнага дызайну, мастацтвазнаўцаў[61].

Аляксей Міхайлавіч Семянтоўскі (1823–1893) паходзіў са старажытнага ўкраінскага шляхецкага роду і быў запрошаны на пасаду губернскага ляснічага ў Віцебск. У хуткім часе Семянтоўскага абралі сакратаром віцебскага губстаткамітэта.

[61] Два выданні вытрымала кніга "Беларусь у малюнках Напалеона Орды. Другая палова XIX стагоддзя". – Мн., 2001 (і Мн., 2004).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яго пяру належыць каля паўтары сотні прац, прысвечаных статыстыцы, гісторыі, археалогіі і этнаграфіі Віцебшчыны.

Памешчык Міхаіл Францавіч Кусцінскі (1829–1905) яшчэ ў студэнцкія гады пад уплывам аднакурсніка па Санкт-Пецярбургскаму універсітэту графа Уварава захапіўся археалагічнымі раскопкамі. У сваім маёнтку Завідавічы Лепельскага павета Віцебскай губерні ён сабраў багатую калекцыю мясцовых каменных прылад. Праводзіў раскопкі ў Лепельскім павеце і ў розных мясцінах Смаленскай губерні. Выступаў з навуковымі дакладамі, надрукаваў шэраг артыкулаў.

Глыбокае захапленне ў многіх краязнаўцаў выклікала народная фальклорна-этнаграфічная спадчына. Даследчыкі ўсведамлялі, што назапашаны стагоддзямі пласт духоўнай і матэрыяльнай культуры настолькі багаты і разнастайны, што вывучэнне яго патрабавала велізарных высілкаў. Часовы фактар, які змяняў існуючыя формы народнага ладу жыцця, таксама падштурхоўваў краязнаўцаў шукаць эфектыўныя спосабы даследаванняў. Невыпадкова, акрамя распрацоўкі і рэалізацыі праграм фальклорна-этнаграфічных даследаванняў РГТ, асобныя краязнаўцы імкнуліся арганізаваць сетку карэспандэнтаў – добраахвотных памочнікаў, збіральнікаў матэрыялу – з ліку мясцовых жыхароў. Удала рэалізавалі яе магчымасці П.В.Шэйн і М.Федароўскі. Шырокая сетка такіх карэспандэнтаў дазволіла падрыхтаваць П.В.Шэйну капітальнае выданне збору фальклорных твораў – “Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края” (1887–1902).

Да ліку карэспандэнтаў П.В.Шэйна адносіцца і выдатны даследчык Віцебшчыны Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі (1845–1910). Збіраючы фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, ён доўгі час не рашаўся публікавацца самастойна. Нікіфароўскі нарадзіўся ў сяле Вылена Веліжскага павета Віцебскай губерні ў беднай сям’і. Атрымаў прафесійную адукацыю ў Віцебскай духоўнай семінарыі, але працаваў настаўнікам ва ўстановах адукацыі. Захапіўся вывучэннем фальклору і этнаграфіі Віцебшчыны. Толькі ў 90-я гг. ён пачаў друкаваць свае навуковыя працы. Усяго М.Нікіфароўскі выдаў каля 20 твораў па этнаграфіі, фальклоры і гісторыі Віцебшчыны. Найбольшую каштоўнасць маюць “Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белору-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сии и описание предметов обиходности” (1895), “Очерки Витебской Беларуси” (1892–1899), “Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания об лицах и местах” (1897), “Простонародные загадки” (1898). Даследаванні М.Нікіфароўскага зафіксавалі побыт насельніцтва Віцебшчыны ў другой палове XIX ст. Адна з лепшых яго прац “Очерки Витебской Беларуси” прысвечана вывучэнню ежы, адзення, жылля, гаспадарчых пабудоў і вытворчай дзейнасці сялян. Так, краязнавец ахарактарызаваў 112 страў з мукі, круп, гародніны, мяса, рыбы і садавіны, указаў час і парадак іх ужывання. Кожная страва абазначана мясцовымі назвамі. М.Нікіфароўскі заўважыў, што сяляне пачалі ўжываць гарадскія стравы: катлеты, пірагі, ласункі і піва. У гэтай працы ён выдзеліў 10 груп сярод сялянскага саслоўя ў залежнасці ад эканамічнага становішча: кулак, серадняк, “жыхар туды і сюды, так сабе. Ні то, ні сё”, “заборысты жыхар”, які ідзе ў гару па шляху дабрабыту і інш. Асобны артыкул ён прысвяціў жабракам, ахарактарызаваў прафесійных і выпадковых жабракоў. Апісаў правядзенне вольнага часу, гульні дзяцей, моладзі і дарослых (звыш 60 гульняў), музычнае мастацтва.

У працы М.Нікіфароўскага “Странички из недавней старины города Витебска” (1899) упершыню пададзены звесткі аб жыцці гарадскога насельніцтва.

Сярод лепшых збіральнікаў народнай вуснапаэтычнай творчасці быў Міхал Федароўскі (1853–1923), паляк па паходжанні. Шмат гадоў ад Беласточчыны да Слуцка ён вывучаў духоўную і матэрыяльную культуру народа, збіраў этнаграфічныя матэрыялы, гістарычныя дакументы, рэдкія кнігі, творы жывапісу і графікі, праводзіў археалагічныя раскопкі, друкаваўся.

Буйнейшым даследчыкам Віцебшчыны быў Аляксей Парфеньевіч Сапуноў (1852–1924) – ураджэнец мястэчка Усвяты Віцебскай губерні, памешчык, настаўнік, архіварыус старажытных актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерняў, сакратар Віцебскага губернскага статкамітэта, член Дзярждумы Расіі 3-га склікання ад партыі акцябрыстаў. Пасля рэвалюцыі працаваў на адміністрацыйнай і педагагічнай рабоце. Быў абраны прафесарам і выкладаў у Віцебскім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута. Сапуноў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вельмі любіў свой край, горад Віцебск, і гэтыя пачуцці жывілі тую незвычайную энергію, з якой вёў ён краязнаўчую працу. На аснове архіўных пошукаў, вывучэння неапублікаваных і друкаваных крыніц падрыхтаваў вялікую колькасць прац, прысвечаных роднаму краю. На даследаванні і выданні выдаткоўваў уласныя сродкі. Даследчык-самавук ахапіў усе перыяды віцебскай гісторыі, усе бакі жыцця. Буйнейшымі яго навуковымі працамі з'яўляюцца тры тамы дакументаў па гісторыі Віцебшчыны "Витебская старина" (планавалася шэсць тамоў) і манаграфіі "Двинские или Борисовы камни" (1890), "Река Западная Двина" (1893). Гэтыя і многія іншыя творы Сапунова не страцілі свайго значэння сёння. Навуковыя работы Аляксея Парфеньевіча высока ацэнены прафесійнымі гісторыкамі, хаця адзначаліся і метадалагічныя недахопы яго прац. Сучасныя віцябляне шануюць памяць выдатнага краязнаўца, а яго паслядоўнікі аб'ядналіся ў Віцебскі краязнаўчы фонд імя А.П.Сапунова.

Сучаснікам і таварышам А.П.Сапунова быў не менш апантаны краязнавец Еўдакім Раманавіч Раманаў (1855–1922). Ён нарадзіўся ў мястэчку Беліца Гомельскага павета Магілёўскай губерні ў беднай сям'і і рана асірацеў. Экстэрнам здаўшы экзамен на званне настаўніка народнай школы, Раманаў усё жыццё займаўся самаадукацыяй. Атрымаўшы павышэнне па службе, працаваў інспектарам народных вучылішчаў Віцебскай, затым Гродзенскай і Магілёўскай губерняў. У 1897–1903 гг. быў рэдактарам неафіцыйнай часткі "Могилевских губернских ведомостей" і шмат зрабіў для публікацыі ў газеце краязнаўчых матэрыялаў, але, на жаль, быў беспадстаўна звольнены. Краязнаўчыя даследаванні Раманава былі звязаны з Магілёўскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай губернямі. З пачатку педагагічнай дзейнасці ён вывучаў гісторыю, беларускую літаратуру і мову, захапіўся археалогіяй, этнаграфіяй і фальклорам. Ім праведзены шматлікія археалагічныя раскопкі на Магілёўшчыне і Віцебшчыне, на аснове якіх апублікаваны артыкулы і падрыхтаваны археалагічныя карты губерняў. Е.Раманаў напісаў вялікую колькасць артыкулаў, якія адлюстроўвалі вынікі збіральніцтва, экспедыцый, раскопак і публікаваліся ў розных выданнях. У наш час у Эрмітажы, у Музеі антрапалогіі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этнаграфіі імя Пятра I АН Расіі захоўваюцца звыш 2000 прадметаў з яго археалагічных раскопак.

З сабраных даследчыкам матэрыялаў атрымаўся адмыслова фальклорна-этнаграфічны “Белорусский сборник”, асобныя тамы якога змяшчалі песні, прыказкі, загадкі (т. 1), міфалагічныя і бытавыя казкі (т. 3 і 4), замовы, духоўныя вершы, тэксты батлеечнага дзейства (т. 5) і інш. Гэта было надзвычай шырокае вывучэнне побыту, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа XIX – пачатку XX ст.[62] Грунтоўныя выданні “Материалы по этнографии Гродненской губернии” (1911–1912) і “Материалы по исторической топографии Витебской губернии. Уезд Велижский” (1898) увайшлі ў лік лепшых беларускіх краязнаўчых кніг. Выпусціў тры выпускі зборніка “Могилевской старины” (1900–1903), дзе змясціў краязнаўчыя артыкулы, гістарычныя дакументы, рассеяныя па нумарах “Могилевских губернских ведомостей”. Сярод іх “Баркулабаўскі летапіс”, “Падарожныя запіскі стольніка П.А.Талстога аб Магілёўскай губерні”, “Апісанне Крычаўскага графства 1786 г. А.Мейера”, шэраг прац магілёўскага краязнаўца П.Гаручкі і самога Е.Раманава і інш. Некаторы час Е.Раманаў працаваў над зборам моўнага матэрыялу на Магілёўшчыне, імкнучыся дапоўніць слоўнік І.І.Насовіча. Няўрымслівы даследчык арганізаваў тры царкоўна-археалагічныя музеі, імкнуўся аб’яднаць краязнаўцаў для сумеснай працы, выступіўшы ініцыятарам стварэння грамадскіх краязнаўчых арганізацый. На жаль, адсутнасць дыплома аб вышэйшай адукацыі, слабае здароўе стварылі ў жыцці гэтага таленавітага даследчыка і арганізатара краязнаўчага руху многа цяжкасцей і бяды. Краязнаўчая спадчына Е.Р.Раманава захавала сваё навуковае значэнне. Сёння Магілёўскі абласны краязнаўчы музей носіць імя гэтага незвычайнага чалавека.

Сярод краязнаўцаў адзначанага перыяду адметнае месца займалі выдатныя збіральнікі старажытнасцей, якімі былі Э.Гутэн-Чапскі і А.К.Ельскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[62] “*Беларускі* зборнік” планаваўся аўтарам у 15 тамах, але пры жыцці Раманава былі выдадзены 9 тамоў (1886–1912), 10-ы том выпусціў Інбелкульт (1928), падрыхтаваныя 11–14-я тамы загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, лёс 15-га тома невядомы.

Граф Эмерык Гутэн-Чапскі (1828–1896) належаў да багацейшай беларускай арыстакратыі, быў губернатарам Вялікага Ноўгарада, віцэ-губернатарам Санкт-Пецярбурга, дырэктарам Ляснога дэпартамента Міністэрства дзяржаўнай маёмасці Расіі, займаў і іншыя адказныя пасады. Апантаны калекцыянер, ён збіраў творы мастацтва, старажытныя рэліквіі, зброю, кнігі і рукапісы. У 1879 г. з-за наспяваючага канфлікту з імператарам Аляксандрам ІІ Э.Чапскі вярнуўся ў радавы маёнтак Станькава Мінскага павета. Для сваіх багатых збораў пабудаваў "скарбніцу" – двухпавярховы будынак у выглядзе сярэдневяковага замка. У скарбніцы былі размешчаны выдатныя нумізматычныя зборы, карціны, партрэты, іконы, посуд, тканіны, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, зброя, медалі, археалагічныя і геалагічныя знаходкі і інш. У бібліятэцы (звыш 20 тыс. тамоў) зберагаліся каштоўныя выданні і багацейшы збор старажытных рукапісаў. Сярод гэтых багаццяў было многа рэчаў і дакументаў, звязаных паходжаннем з беларускімі землямі, уладаннямі Гутэн-Чапскіх і іх родам. Граф сам выконваў раскопкі ў наваколлі Станькава, дзе знайшоў залатыя, бронзавыя, жалезныя і каменныя рэчы. Аздобай музея былі старыя віды беларускіх гарадоў, напрыклад, Гродна ў 1568 і 1580 гг., партрэты мясцовых магнатаў і простых людзей, 70 твораў, прысвечаных Т.Касцюшку, 10 – А.Міцкевічу. Па сямейных абставінах Э.Чапскі з жонкай у 1894 г. пакінуў Станькава і пераехаў у Кракаў. Туды ж былі вывезены шэсць вагонаў прадметаў і бібліятэка, якія маглі быць аднесены да каштоўнейшых у Еўропе[63]. Каштоўнасці "расійскага" і "мясцовага паходжання" засталіся ў Станькаве ў валоданні сына Караля Чапскага, мінскага гораданачальніка. З прадметаў і дакументаў "польскага паходжання", вывезеных у Кракаў, арганізаваны музей фон Гутэн-Чапскіх. Рассеянне музейных калекцый Гутэн-Чапскіх – вялікая страта для беларускай культуры і Дзяржыншчыны (Койданаўшчыны).

Шырокую вядомасць набыў прыватны музей памешчыка А.К.Ельскага (1834–1916). Нястомны вандроўнік, выдатны знаўца многіх мясцін Беларусі, ён сабраў з дапамогай аматараў старасветчыны багаты збор гістарычных рэчаў, манет,

[63] *Мальдзіс, А.І.* Выдадзена нашымі сябрамі / А.І.Мальдзіс // Помнікі гісторыі і культуры. – 1980. – № 4. – С.41–43.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

медалёў, рукапісаў, стварыў каштоўную бібліятэку. Музей і бібліятэка месціліся ў сядзібе Замосце Ігуменскага павета. У Замосце наведваліся многія краязнаўцы, пісьменнікі, аматары гісторыі. Сам Ельскі выкарыстоўваў сабраныя матэрыялы для навуковай працы і напісання шматлікіх твораў. У прыватнасці, ён напісаў каля 10 тыс. артыкулаў пра беларускія населеныя пункты і іншыя аб'екты на яе тэрыторыі для "Геаграфічнага слоўніка Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін" – аднаго з важнейшых даведнікаў для многіх пакаленняў краязнаўцаў[64]. На жаль, унікальны збор Ельскага таксама страчаны.

У гэты перыяд пашырылася кола грамадскіх арганізацый, якія вялі краязнаўчую працу. Працягваліся краязнаўчыя даследаванні РГТ. У 1864 г. пры Маскоўскім універсітэце было створана Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі, у дзейнасці якога прымалі ўдзел беларускія краязнаўцы. Многія краязнаўцы нярэдка былі членамі некалькіх таварыстваў. Калі ў 1906 г. у Варшаве ўзнікла Польскае краязнаўчае таварыства (ПКТ), беларускія краязнаўцы з ахвотай прымалі ў ім удзел.

Адметнай з'явай было імкненне ініцыятараў краязнаўчага руху стварыць мясцовыя краязнаўчыя арганізацыі. Дзякуючы ім узніклі некалькі добраахвотных таварыстваў: Віцебская вучоная архіўная камісія (ВВАК), Таварыства па вывучэнні Беларускага края, царкоўна-археалагічныя камітэты, арганізацыі па ахове помнікаў у Мінску і інш. Імкненне да супрацоўніцтва, абмену вынікамі даследчай працы і пашырэння краязнаўчых ведаў стымулявала выкарыстанне такіх новых формаў, як выставы і з'езды.

Важнай падзеяй было стварэнне Паўночна-Заходняга аддзела РГТ (1867). Паўночна-Заходні аддзел РГТ (існаваў каля 10 гадоў[65]) адыграў станоўчую ролю ў актывізацыі сіл для вывучэння роднага краю. Яго членамі былі вядомыя беларускія краязнаўцы М.А.Дзмітрыеў, П.В.Шэйн, Е.Р.Раманаў, А.М.Семянтоўскі, Ю.Крачкоўскі, І.І.Насовіч, І.Берман і інш. Значнасць гэтай арганізацыі заключалася як у кансалідацыі

[64] *Slownik* geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów słowiańskich: w 15 t. – Warszawa: Nakladem W. Walewskiego, 1880 – 1902.

[65] У 80-я гг.XIX ст. работа Паўночна-Заходняга аддзела РГТ прыпынілася і ўзнавілася толькі ў 1910-я гг.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследчыкаў, так і ва ўкараненні навуковых метадаў дзейнасці па вывучэнні тэрыторый. У спецыяльных праграмах і метадычных інструкцыях змяшчаліся патрабаванні да збіральнікаў з мэтай забяспечыць дакладнасць запісаў народна-паэтычных твораў, іх пашпартызацыю і інш. Пераважная ўвага надавалася археалогіі, археаграфіі, этнаграфіі, статыстыцы. У адказ на распаўсюджваемыя праграмы паступілі тысячы запісаў фальклору і этнаграфічных матэрыялаў. Частка іх была надрукавана самастойнымі выданнямі і на старонках перыядычнага друку. Да збіральніцкай дзейнасці прыцягваліся добраахвотнікі: памешчыкі, святары, настаўнікі, семінарысты, вучні школ і іншае адукаванае насельніцтва. Так, 12 красавіка 1873 г. на пасяджэнні камітэта Паўночна-Заходняга аддзела РГТ паведамлялася, што па праграме даследавання сялянскіх сем’яў – заможных, сярэдніх і бедных – настаўнікі народных вучылішчаў прыслалі 262 апісанні, якія далі каштоўныя звесткі аб сялянскім быце, вераваннях, звычаях і фальклоры.

У дзейнасці Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі пры Маскоўскім універсітэце прымалі ўдзел не толькі вядомыя беларускія краязнаўцы, але і сяляне (С.А.Дудараў, В.і А.Зяньковічы).

На гістарычную тэматыку пераважна арыентаваліся такія мясцовыя краязнаўчыя арганізацыі, як Таварыства па вывучэнні Беларускага края, царкоўна-археалагічныя камітэты, Віцебская вучоная архіўная камісія.

Таварыства па вывучэнні Беларускага края было створана ў Магілёве ў 1902 г. па ініцыятыве Е.Р.Раманава. У 1913 г. перайменавана ў Таварыства па вывучэнні Магілёўскай губерні. Яго ўдзельнікі арганізавалі гісторыка-этнаграфічны музей, выпусцілі зборнікі дакументаў і матэрыялаў “Могилевская старина”.

У канцы XIX ст. было прынята “Палажэнне аб царкоўна-археалагічных камітэтах”. Перад імі ставіліся задачы краязнаўчай дзейнасці, а менавіта гістарычнага абследавання ўнутранага і знешняга развіцця мясцовага царкоўна-рэлігійнага і грамадскага жыцця, вывучэння народных звычаяў і традыцый, легенд, песень, апісанне архіваў цэркваў і помнікаў старажытнасці, назіранне за захаванасцю храмаў і могілак. Актыўнымі супрацоўнікамі царкоўна-археалагічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камітэтаў былі мясцовыя святары. Так, у Мінскі царкоўна-археалагічны камітэт яны перадавалі прадметы царкоўнай даўніны, кнігі і рукапісы. Дзякуючы такой дапамозе стала магчымым стварыць багатую бібліятэку і музей. У бібліятэцы былі прадстаўлены творы гістарычнай, археалагічнай і філалагічнай тэматыкі. У 1910 г. у музеі было больш за 1000 прадметаў царкоўнай даўніны.

Віцебская вучоная архіўная камісія (ВВАК), створаная ў 1909 г., была грамадскай арганізацыяй, скіраванай на вывучэнне і папулярызацыю гістарычнага мінулага Полацка-Віцебскага края. Камісіяй кіравалі старшыня, праўленне і савет. Існавала часткова на дзяржаўныя субсідыі, членскія ўзносы і ахвяраванні, зборы з лекцый. Гэта была шматлікая арганізацыя, у складзе якой у 1910 г. налічваліся 452 члены. Сярод іх былі многія вядомыя краязнаўцы: В.С.Арсеньеў, А.П.Сапуноў, М.М.Багародскі, У.К.Стукаліч і інш. Краязнаўцамі быў створаны гістарычны архіў (314 спраў), музей, дзе былі прадстаўлены манеты, медалі і бібліятэка. Удзельнікі камісіі правялі пошукавую работу ў гонар стагоддзя Айчыннай вайны 1812 г.: адшукалі брацкія магілы, звесткі пра ўдзельнікаў вайны, адкрылі помнік у Віцебску. Важным кірункам дзейнасці была і архіўная работа, выдаваўся зборнік "Полоцко-Витебская старина". Камісія дабілася вырашэння даўно наспеўшай задачы – стварэння магчымасці ў мясцовых умовах набываць вышэйшую гістарычную адукацыю. У 1911 г. пачало працу Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. ВВАК наладзіла шырокія сувязі з расійскімі і замежнымі навуковымі ўстановамі. Гэта была адна з лепшых краязнаўчых арганізацый пачатку ХХ ст.

У 1916 г. у Мінску ўзніклі грамадскія арганізацыі, галоўнай мэтай якіх была ахова помнікаў[66]. Вядомыя мінчане, якія ў даваенны перыяд руплівa працавалі па збіранні і вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны, былі арганізатарамі гэтых таварыстваў. Сярод іх М.Чапская, Ю.Чапскі, А.Хжаноўскі, Ю.Вейсенгоф, І.Віткевіч, С.Дангель. Старшынёй стаў Станіслаў Трэпка. У студзені 1918 г. мінская арганізацыя была пераўтворана ў філію Варшаўскага таварыства аховы помнікаў старажытнасці. Галоўнымі яе мэтамі

[66] *Спачатку* таварыства аховы помнікаў узнікла пры аддзеле Мінскага таварыства дапамогі ахвярам вайны. Адначасова быў створаны аддзел аховы помнікаў мастацтва і культуры пры цэнтральным грамадзянскім камітэце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

былі інвентарызацыя і выратаванне каштоўных помнікаў, якія знаходзіліся на абшарах Мінскай, Віленскай і Віцебскай губерняў. Функцыянавалі некалькі аддзелаў, у тым ліку бібліятэчна-гістарычны, секцыя старога Мінска. Збіраліся старадрукі, гістарычныя дакументы, прымаліся на дэпазітарнае захоўванне карціны знакамітых айчынных і замежных мастакоў, складаліся бібліяграфічныя паказальнікі па гісторыка-культурнай тэматыцы[67]. Філія арганізавала 50 экспедыцый у памешчыцкія сядзібы, у выніку якіх было дастаўлена 600 скрынак, дзе налічвалася 36 прадметаў. У Мінску яна наладзіла дзве выставы твораў мастацтва, публічныя чытанні, выпусціла серыю паштовак. Многія прадметы пазней трапілі ў музеі і бібліятэкі Польшчы[68].

Індывідуальная збіральніцкая і даследчая праца, праца ў грамадскіх краязнаўчых арганізацыях у гэты перыяд дапоўнілася такімі новымі формамі ўзаемадзеяння краязнаўцаў, як выставы і з’езды.

На Усерасійскай этнаграфічнай выстаўцы, прысвечанай славянскаму з’езду, што праходзіў у Маскве ў маі 1867 г., з Беларусі ўдзельнічалі шэсць сялян за рознымі заняткамі: пчаляр, рыбак і іншыя, былі прадстаўлены макеты прылад працы, прадметы адзення і інш.

Асабліва важнай падзеяй для беларускіх краязнаўцаў стаў IX Археалагічны з’езд, які прайшоў летам 1893 г. у Вільні і прысвячаўся Паўночна-Заходняму краю. Спецыяльна прызначаны папярэдні камітэт у Маскве (1891) выпрацаваў пытанні, на якія з’езду належала атрымаць адказы. Ад прыватных асоб і ўстаноў у Віленскае аддзяленне камітэта паступіла больш за 900 адказаў. У некаторых з іх змяшчаліся каштоўныя факты і звесткі. На іх падставе скарбнік Віленскага музея Ф.В.Пакроўскі склаў археалагічную карту Віленскай губерні. З грунтоўнымі дакладамі на з’ездзе выступілі многія беларускія краязнаўцы: аб курганных раскопках у Мінскай губерні – В.Завітневіч, у Віленскай – Ф.Пакроўскі, у Магілёўскай – М.Фурсаў, у Барысаўскім павеце – М.Авенарыус, па старажытнай архітэктуры цэркваў Святой Сафіі і Спаса-Ефрасіннеўскай у Полацку і Благавешчання ў Віцебску

---

[67] *Гарбачова, В.В.* Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі: біябібліягр. слоўнік / В.В.Гарбачова. – Мн.: БДУ, 2004. – 398 с.

[68] ***Zienkiewicz, T.*** Polskie Łycie literackie w Mińsku w XIX i na początku XX wieku do roku 1921) / T.Zienkiewicz. – Olsztyn: Wyższa szkoła pedagogiczna, 1997. – S. 112.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– А.М.Паўлінаў і інш. Быў выдадзены зборнік навуковых прац, у якім разам з навуковымі артыкуламі былі і краязнаўчыя бібліяграфічныя паказальнікі археалагічнай тэматыкі.

Краязнаўчыя гістарычныя і фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, здабытыя ўдзельнікамі грамадскага краязнаўчага руху, выражалі розныя навуковыя і ідэйныя падыходы, выкарыстоўваліся для падтрымкі або абвяржэння дзяржаўных ідэалагем. Самыя каштоўныя і аб’ектыўныя даследаванні служылі фарміраванню беларускай нацыянальнай ідэі і нацыянальнага руху. Гэта асабліва ярка можна паказаць на прыкладах краязнаўцаў небеларускага паходжання, нават калі яны цалкам падзялялі пануючыя афіцыйныя ўяўленнні аб беларускім народзе і яго гістарычным шляху. Так, С.В.Максімаў, прыхільнік дзяржаўнай ідэалогіі заходнерусізму, праводзячы па заданні РГТ вывучэнне этнічных меж паміж беларусамі і суседнімі народамі на правым беразе Дняпра, прыйшоў да высновы, што Мглінскі і Суражскі паветы населены беларусамі “чыстага бясприкладнага тыпу”, але гэтага этноніма яны не ведалі, а называлі сябе “ліцьвінамі”[69]. Беражліва захоўваў аўтэнтычныя рысы беларускага фальклору польскі вучоны Ота Кольберг (1814–1890) – аўтар шматтомнай працы “Народ. Яго звычаі, лад жыцця, мова, паданні, прыказкі, абрады, забабоны, забавы, музыка і танцы”, дзе падаў багатыя матэрыялы з розных рэгіёнаў Беларусі.

*2.1.2. Дзяржаўнае краязнаўства*. Істотны ўклад у даследаванне беларускіх рэгіёнаў унеслі дзяржаўныя арганізацыі і ўстановы. Менавіта да гэтага перыяду адносяцца важнейшыя дасягненні ў краязнаўчай дзейнасці губернскіх статыстычных камітэтаў, архіваў, афіцыйнага перыядычнага друку.

Губернскія статкамітэты ў гэты перыяд набылі значэнне своеасаблівых цэнтраў краязнаўчага руху. Такой думкі прытрымліваюцца сучасныя гісторыкі, напрыклад, Г.В.Кісялёў. У гэтых установах працавалі выдатныя краязнаўцы А.Г.Кіркор, А.М.Семянтоўскі, А.П.Сапуноў. Губернскія статкамітэты разгарнулі дзейнасць па зборы статыстычных звестак, публікацыі статыстычных і даведачных матэрыялаў і інш. Гэта памятныя кніжкі, агляды губерняў, даведнікі. Так, Мінскі губернскі статыстычны камітэт да 1917 г. падрых-

[69] *Беларускі* фальклор: энцыклапедыя. Л–Я. – Мн.: БелЭн, 2006. – С.89.

таваў 53 выпускі памятных кніжак, 36 аглядаў Мінскай губерні, штогод выдаваў справаздачы аб дзейнасці Мінскага губернскага статкамітэта (1887–1915), спіскі землеўладальнікаў і спіскі населеных месцаў губерні, манаграфічныя краязнаўчыя працы.

Для памятных кніжак характэрна багацце фактаграфічнай інфармацыі, зручна структураванай па раздзелах, прысвечаных сферам грамадскага жыцця краю. Напрыклад, вытрымка з "Памятной книжки Минской губернии на 1873 год" са звесткамі аб святарах розных канфесій на Случчыне: "Слуцкие конфессии. **[Протестантская].** Суперинтендант Белорусского округа пастор Фелициан Михайлович Ванновский, настоятель Слуцкого прихода, вице-суперинтендант, пастор Юлиан Францевич Бергель имеет наперстный крест и медаль в память войны 1853–1856 г., в должности с 27 января 1867. **[Иудейская].** Слуцкий казенный общественный раввин Залман Вульфович Шапиро. В должности с 1 ноября 1860. **[Магометанская].** Мулла Осмоловской соборной мечети Имам Степанович Якубовский. В должности с 1 апреля 1861. Хатыб Ляховичской мечети Иосиф Авраамович Якубовский. В должности с 1 января 1868"[70] і інш. У гэтых выданнях змяшчаліся таксама артыкулы, прысвечаныя мінуламу і сучасным пытанням развіцця губерняў. Напрыклад, "Памятная книжка Минской губернии на 1891 год" змяшчае такія краязнаўчыя творы, як "Минский театр и его прошлое" і "Летопись города Минска"[71]. Высокая інфармацыйная насычанасць памятных кніжак зрабіла іх да цяперашняга часу важнымі крыніцамі вывучэння рэгіянальнай гісторыі.

Станоўчы ўклад у краязнаўчую дзейнасць унеслі такія дзяржаўныя ўстановы, як цэнтральныя архівы старажытных актаў. Віленскі архіў старажытных актаў (1852–1915) быў падначалены куратару Віленскай вучэбнай акругі; Віцебскі (1852–1902) – генерал-губернатару Смаленскаму, Віцебскаму і Магілёўскаму. Архіў у Вільні змяшчаў актавыя дакументы з усёй тэрыторыі ВКЛ: акты цэнтральных і рэгіянальных органаў улады, у тым ліку Галоўнага Літоўскага трыбунала,

[70] *Памятная* книжка Минской губернии на 1873 год. – Мн.: Губ. типография, 1873. – С.105–106.

[71] *Памятная* книжка Минской губернии на 1891 год. – Мн.: Типолитография Б.И.Соломонова, 1890. – XXXIV+240+36+95 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гродскіх і земскіх судоў, архівы гарадоў. У сярэдзіне XIX ст. фонды Віленскага архіва складалі 17 439 адзінак, у пачатку XX ст. – да 30 000 актавых кніг і звязак. Найбольш поўна адлюстраваны дакументы, прысвечаныя сучасным Гродзеншчыне і Міншчыне. Пасля Першай сусветнай вайны і эвакуацыі фондаў палова іх была страчана. У Віцебскім архіве зберагаліся дакументы з віцебскіх і магілёўскіх земляў ВКЛ. Пасля закрыцця гэтага архіва ў 1902 г. яго фонды былі перавезены ў Віленскі архіў.

Хаця і самі архівы, і метадалогія археаграфічных даследаванняў тады яшчэ знаходзіліся ў пачатковай стадыі развіцця, іх супрацоўнікі ўнеслі важкі ўклад у публікацыю дакументаў перыяду ВКЛ, прысвечаных беларускім рэгіёнам і населеным пунктам. У другой палове XIX ст. архівы пачалі выпускаць зборнікі актавых дакументаў.

Віленскі цэнтральны архіў здзейсніў шэраг выданняў, якія адлюстроўвалі яго зборы. Сярод важнейшых – "Опись документов Виленского центрального архива древних актовых книг" (10 выпускаў, 1901–1913). У выданне ўвайшла вялікая колькасць дакументаў, прысвечаных беларускім рэгіёнам, напрыклад, выпуск 10 "Акты Брестского гродского суда за 1575–1715 годы".

Віцебскі цэнтральны архіў апублікаваў "Историко-юридические материалы, извлечёные из архивных книг губерний: Виленской и Могилёвской, хранящихся в Центральном архиве в Витебске и изданных под редакцией архивариуса сего архива Сазонова" (32 кнігі, 1871–1906).

Археаграфічныя даследаванні і выданні здзяйснялі Віленская і Віцебская археаграфічныя камісіі. Гэтыя афіцыйныя навуковыя ўстановы былі створаны з мэтай "абгрунтаваць адзін з кірункаў вялікадзяржаўнай палітыкі – русіфікацыю Беларусі і Літвы. Важнейшым абавязкам камісіі з'яўлялася публікацыя дакументаў пра існаванне праваслаўных цэркваў і манастыроў для доказу, што ВКЛ – "спрадвечна руская зямля"[72]. Паражэнне паўстання 1863–1864 гг. не зменшыла грамадскую важнасць пытання гістарычных шляхоў беларусаў. Афіцыйныя колы імкнуліся, як і на папярэднім этапе, прыцягнуць да абгрунтавання курса русіфікацыі гістарычныя крыніцы, прысвечаныя беларускім рэгіёнам. Буйнейшым вы-

[72] *Энцыклапедыя* гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн.: БелЭн, 1994. – Т. 2. – С. 278.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даннем Віленскай археаграфічнай камісіі былі “Акты Віленскай камісіі…” у 39 тамах. У “Актах…” апублікаваны матэрыялы судоў, магістратаў, інвентары старостваў і маёнткаў, матэрыялы па царкоўнай уніі і інш. Выданне, заснаванае на дакументах Цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг у Вільні, ахоплівала матэрыял, які адносіўся да населеных пунктаў, уключаных у межы Мінскай, Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў.

У метадалагічным аспекце выданні характарызаваліся не толькі тэндэнцыйным падыходам да адбору гістарычных дакументаў, але таксама няякаснай падрыхтоўкай тэкстаў: недакладным перакладам са старажытнай беларускай мовы на рускую ці нават пераказамі дакументаў замест публікацыі аўтэнтычных тэкстаў, адсутнасцю паказальнікаў да выданняў і інш. Аднак гэтыя зборнікі адлюстравалі багаты фактычны матэрыял і да нашага часу выкарыстоўваюцца краязнаўцамі.

*2.1.3. Краязнаўства ў перыядычным друку.* Перыядычны друк на працягу ўсяго перыяду быў важным камунікацыйным каналам краязнаўства. Нават у цяжкія 60–70-я гг. XIX ст. у газетах і часопісах публікаваліся артыкулы, прысвечаныя апісанню матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва беларускіх губерняў і па іншых тэмах. З найбольшай рэгулярнасцю яны з’яўляліся ў выданнях, якія рэдагаваліся краязнаўцамі. Так, А.Кіркор рэдагаваў “Виленский вестник” і асобныя выпускі “Памятных книжек Виленской губернии”, Р.Ігнацьеў – “Минские губернские ведомости”, А.Семянтоўскі – “Памятные книжки Витебской губернии”, Е.Раманаў – “Могилевские губернские ведомости”.

Афіцыйныя губернские ведомости адлюстроўвалі бягучыя падзеі, ствараючы своеасаблівы летапіс мясцовага жыцця, а таксама змяшчалі краязнаўчыя матэрыялы даследчага характару. Апошнія найбольш канцэнтраваліся ў неафіцыйных частках гэтых газет. Праз газеты краязнаўцы звярталіся да сучаснікаў з заклікамі да вывучэння роднага краю. Так, інспектар дырэкцыі народных вучылішчаў Г.Кульжынскі на старонках “Гродненских губернских ведомостей” (1867, № 22) тлумачыў важнасць вывучэння родных мясцін, мінулага і асаблівасцей сённяшняга побыту насельніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пачатку XX ст. у губернскіх ведамасцях неафіцыйныя аддзелы вылучыліся ў самастойныя органы друку, якія змяшчалі асабліва многа краязнаўчых матэрыялаў. Напрыклад, у “Витебских губернских ведомостях” з’явіліся артыкулы, прысвечаныя Віцебску, Полацку, Веліжу і іншым населеным пунктам. У газеце “Витебский вестник”, якая пачала выдавацца замест прыпыненай неафіцыйнай часткі губернскіх ведамасцей, публікаваліся даследаванні Е.Р.Раманава, А.П.Сапунова і іншых краязнаўцаў.

Краязнаўчыя матэрыялы змяшчаліся ў “Минских епархиальных ведомостях” і “Полоцких епархиальных ведомостях”, якія пачалі выдавацца ў гэты перыяд. У ведамасцях асвятляліся падзеі з гісторыі рэлігійнага жыцця ў розных мясцовасцях, а таксама артыкулы этнаграфічнага і гістарычнага зместу.

Звесткі аб бягучых падзеях асвятляліся ў гарадскіх газетах, якія з’явіліся ў 80-х гг. XIX ст. – пачатку XX ст. Гэта “Минский листок” (1886–1902), “Северо-Западный край” (1886–1905), “Северо-западная жизнь” (1911–1915) і інш. Каштоўныя публікацыі па этнаграфіі, гісторыі, археалогіі і іншых пытаннях былі надрукаваны ў “Записках Северо-Западного отдела императорского Русского географического общества” (1910–1913), у расійскіх часопісах “Этнографическое обозрение”, “Вестник Юго-Западной и Западной России” (1862–1871).

Матэрыялы краязнаўчага характару публікаваліся ў выданнях грамадскіх арганізацый і ў прыватных часопісах на польскай мове (расійскіх і замежных): “Kwartalnik Łitewski”, “Kraj” (СПб), “Łitwa i Ruś” (Вільня), “Kwartalnik Historyczny”, “Lud” (Львоў) і інш. Выходзілі яны не доўга, але змясцілі цікавыя артыкулы і рэдкія фатаграфіі. Для беларускіх краязнаўцаў адным з галоўных перыядычных органаў стаў часопіс Польскага краязнаўчага таварыства “Зямля” (“Ziemia”), які пачаў выходзіць у Варшаве з 1909 г. Тут друкаваліся такія вядомыя краязнаўцы, як В.А.Шукевіч, Я.В.Булгак і інш. Я.В.Булгак, “бацька” краязнаўчай фатаграфіі, апублікаваў артыкулы і выдатныя фотаздымкі беларускіх гарадоў і іншых мясцовасцей. Краязнаўцы імкнуліся да выпуску рэгіянальных перыядычных органаў, але ва ўмовах пачатку XX ст. гэта было зрабіць складана. Так, у 1917 г. выходзілі “Нашы крэсы. Магілёўшчына” на польскай мове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У публікацыях расійскіх і замежных перыядычных выданняў, прысвечаных рэгіёнам Беларусі, гэтыя землі разглядаліся ці як заходнія часткі Расіі, ці як гістарычна польскія тэрыторыі. Вастрыня палітычнага, як называлі ў той час "польскага", пытання, актыўная русіфікацыя, няспеласць нацыянальнай беларускай ідэі былі прычынамі такіх трактовак. Такім чынам, у краязнаўчых публікацыях, як у люстэрку, выяўляліся ідэалагічная, светапоглядная пазіцыя іх аўтараў, складанасць працэсу згуртавання мясцовых інтэлектуальных эліт вакол афіцыйных або апазіцыйных ідэйных плыняў. Напрыклад, русафільскі характар краязнаўчых публікацый у газеце "Витебский вестник" асабліва выяўляўся ў работах А.Пшчолкі. Адлюстраваны ён і ў публікацыях "Записок Северо-Западного отдела императорского Русского географического общества" і інш.

У пачатку ХХ ст. значны ўплыў на разгортванне краязнаўчага руху аказала газета "Наша Ніва". Яе ідэйная платформа была цалкам супрацьлеглай афіцыйнай прэсе. Прызнанне факта існавання самастойнага беларускага народа, выкарыстанне беларускай мовы, усебаковае адлюстраванне народнага жыцця прыцягвалі да краязнаўчай работы новыя сілы: мясцовую інтэлігенцыю, адукаваных сялян. Газета наладжвала з імі цесныя сувязі, абуджала народныя таленты. У інфармацыйных падборках "З Літвы і Беларусі", "З усіх старон", "Аб усём патроху" адлюстроўваліся бягучыя падзеі з розных мясцін, у тым ліку з гаспадарчага і культурнага жыцця, здарэнні, агульныя апісанні многіх сельскіх мясцовасцей і гарадоў. Так, за першыя тры гады ў газеце былі надрукаваны больш за 900 карэспандэнцый амаль з паўтысячы вёсак, мястэчак і гарадоў. З ліку яе аўтараў і супрацоўнікаў выйшлі такія выдатныя краязнаўцы, як браты Іван і Антон Луцкевічы, У.Галубок. Рэдактар-выдавец газеты А.У.Уласаў таксама належаў да гэтага кола. Напрыклад, у 1908–1909 гг. ён апублікаваў артыкулы, прысвечаныя апісанню беларускіх мястэчак і гарадоў ("Наша Ніва", 1908, № 1; 1909, № 3).

*2.1.4. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства.* Улады з мэтай узмацнення культурнага ўплыву адкрылі ў 1867 г. Віленскую публічную бібліятэку. У гэтую галоўную ў Паўночна-Заходнім краі бібліятэку паступіла частка рукапісаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кніг з канфіскаваных кляштарных і іншых бібліятэк. Сярод іх былі важныя дакументы, прысвечаныя беларускім мясцінам. Пры бібліятэцы быў музей, створаны з экспанатаў Віленскага музея старажытнасцей Тышкевічаў. Краязнаўчыя выданні і рукапісныя матэрыялы збіраліся і ў іншых публічных, спецыяльных і прыватных бібліятэках.

У асобных бібліятэках назапашваліся спецыялізаваныя зборы, якія мелі вялікую каштоўнасць для вывучэння беларускіх рэгіёнаў. Такімі былі бібліятэкі, якія ствараліся ў грамадскіх краязнаўчых арганізацыях, губернскіх статыстычных камітэтах. Краязнаўчы характар мела бібліятэка Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. Савет камісіі звярнуўся да мясцовай грамадскасці з заклікам перадаць у бібліятэку творы краязнаўчай літаратуры. Шматлікія арганізацыі – статыстычныя камітэты, архівы, музеі, універсітэты і інстытуты – адгукнуліся на просьбу віцяблян. Свае кнігі перадалі краязнаўцы А.Сапуноў, В.Арсеньеў, У.Стукаліч, У.Кадыгробаў, М.Багародскі і іншыя, паступілі каштоўныя краязнаўчыя кніжныя зборы М.Я.Нікіфароўскага і А.М.Семянтоўскага. У 1911 г. у бібліятэцы налічвалася 1859 назваў выданняў у 3726 экземплярах, з іх 600 кніг былі прысвечаны Віцебшчыне. Але і ў іншых выданнях па гісторыі, генеалогіі, геральдыцы, зборніках гістарычных дакументаў таксама змяшчаліся матэрыялы пра віцебскія землі.

Цікавыя прыватныя краязнаўчыя бібліятэкі меліся ў вядомых краязнаўцаў. Зборы, прысвечаныя рэгіёнам, былі ў складзе прыватных бібліятэк памешчыкаў і прадстаўнікоў мясцовай інтэлігенцыі. Свяшчэннік Гінтоўт (Гродна) сабраў каля 4000 кніг па гісторыі краю. Член ВВАК В.П.Федаровіч набыў каля 1000 кніг па гісторыі Віцебшчыны[73]. У бібліятэцы Новабарысаўскага памешчыка І.Х.Каладзеева, члена ВВАК, апантанага збіральніка матэрыялаў аб Айчыннай вайне 1812 г., былі выданні аб падзеях вайны на Барысаўшчыне і ў іншых мясцінах Беларусі[74]. Каштоўныя выданні аб беларускіх тэрыторыях, а таксама мясцовыя выданні, у тым ліку бясцэнныя старадрукі, былі ў бібліятэках слуцкага святара Бергеля,

[73] *Цыбуля, В.А.* Прыватныя бібліятэкі, архівы і музеі / В.А.Цыбуля // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1982. – № 3. – С.36–38.

[74] *Военский, К.А.* Отечественная война в Новоборисовском собрании И.Х.Колодеева: [библиогр. очерк] / К.А.Военский. – СПб.: Главное упр. уделов, 1904. – 16 с.

памешчыка А.Ельскага, члена Мінскага губстаткамітэта, археолага-аматара Г.Татура і інш.

Аўтары краязнаўчых кніг і артыкулаў у розных формах падавалі бібліяграфічныя звесткі аб дакументных крыніцах па тэме. Асабліва распаўсюджанымі былі падрадковыя бібліяграфічныя спасылкі, агляды крыніц у прадмовах ці ў пачатку тэксту, цытаванне. Напрыклад, грунтоўныя бібліяграфічныя агляды па тэме змясцілі Е.Р.Раманаў у “Материалах по исторической топографии Витебской губернии. Уезд Велижский” (1898), Г.І.Аношка ў “Кратком физико-географическом очерке Гродненской губернии” (1893).

У другой палове XIX ст. павялічыўся выпуск краязнаўчых бібліяграфічных матэрыялаў, прысвечаных невялікім тэрыторыям у этнічных межах Беларусі. Такія матэрыялы рыхтавалі прадстаўнікі мясцовай патрыятычна настроенай інтэлігенцыі, якія вывучалі родны край, збіралі гістарычныя, археалагічныя, этнаграфічныя звесткі, цікавіліся прыродай і іншымі пытаннямі.

Заметны ўклад у стварэнне краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў унеслі рускія вучоныя і бібліёграфы. Буйнейшыя рэтраспектыўныя паказальнікі належаць менавіта ім. У 80-я гг. былі апублікаваны два значныя рэтраспектыўныя паказальнікі рускіх бібліёграфаў П.А.Чарнеўскага “Указатель материалов для изучения Северо-Западного края (Ковенская, Виленская и Гродненская губернии) в археологическо-этнографическом отношении” і З.М.Пенкінай “Полесье“. Член Ковенскага губернскага статыстычнага камітэта П.А.Чарнеўскі апублікаваў свой паказальнік у “Памятной книжке Ковенскай губернии 1882 года”. У раздзелы, прысвечаныя археалогіі і этнаграфіі, уключана літаратура на рускай і замежных мовах, якасна складзены бібліяграфічныя апісанні і анатацыі.

Бібліяграфічны паказальнік “Полесье“ З.М.Пенкіна падрыхтавала па заказе будаўнікоў Палескай чыгункі. У ім адлюстравана літаратура аб Мінскай, Гродзенскай і Магілёўскай губернях, геаграфічныя межы якіх ахоплівалі ў той час і землі сучаснай Гомельшчыны і Брэстчыны. Паказальнік выкананы на высокім метадычным узроўні. Ахоплены многія галіны краязнаўства: гісторыя, геаграфія, статыстыка, эканоміка і інш. Праведзена грунтоўнае выяўленне матэрыялу аб рэгіёне з літаратуры аб Расіі, Паўночна-Заходнім і Паўднёва-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заходнім краях; публікацый па мясцовым друку палескіх губерняў, улічана краязнаўчая літаратура. Шырока прыменена анатаванне, указаны крытычныя матэрыялы.

На пасяджэннях Паўночна-Заходняга аддзела РГТ ставілася пытанне аб падрыхтоўцы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Актуальнасць бібліяграфічнага падагульнення краязнаўчай літаратуры як падставы навуковых даследаванняў праявілася пры падрыхтоўцы IX Археалагічнага з’езда ў Вільні. Таму ў “Трудах …” Віленскага аддзялення Маскоўскага апераджальнага камітэта па яго арганізацыі трэці раздзел быў прысвечаны “материалам для библиографического указателя произведений, относящихся к Западной Росии”. Тут былі надрукаваны тры бібліяграфічныя дапаможнікі па пытаннях вывучэння беларускага краю. Гэта бібліяграфічны нарыс Я.Ф.Карскага “К вопросу о разработке старого западнорусского наречия“, паказальнік па археалогіі Мінскай губерні А.П.Смародскага і паказальнік па археалогіі Заходняй Расіі (ананімны). У паказальніку А.П.Смародскага ўлічана літаратура на рускай і польскай мовах, якая выйшла ў XIX ст. Спачатку размешчаны бібліяграфічныя апісанні, прысвечаныя археалогіі Мінскай губерні ў цэлым, затым – па гарадах і паветах губерні.

Павялічыўся інтарэс і да бібліяграфавання новай літаратуры, прысвечанай Паўночна-Заходняму краю. Такія матэрыялы друкаваліся ў большасці перыядычных выданняў і зборнікаў. Напрыклад, у бібліяграфічным раздзеле “Записок Северо-Западного отдела императорского Русского географического общества” адлюстроўвалася літаратура пра Беларусь за адзін – два гады. Гэта быў адзін з першых на Беларусі часопісаў, дзе для бібліяграфічнай характарыстыкі выданняў прымяняліся разгорнутыя анатацыі, рэфераты і рэцэнзіі. Але ў гэтым выданні, якое было пад кантролем цэнтральнай і мясцовай адміністрацыі, яскрава праявіліся ідэалагічныя ацэнкі твораў з пазіцый заходнерусізму. Напрыклад, мову старажытных беларускіх помнікаў пісьменства называлі заходнерускай (дыялект), адмаўлялі беларусам у праве на самастойную тэрыторыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Напэўна, кожнае краязнаўчае выданне знаходзілася ў полі зроку складальнікаў бібліяграфічных матэрыялаў на старонках перыядычнага друку. Невыпадкова ў газеце “Наша Ніва” ў бібліяграфічнай заметцы на кнігу А.К.Снітко “Минск в XVII столетии” адзначана: “Гісторыя нашага краю так мала апрацавана, што можна радавацца выхаду ў сьвет кніжак, падобных гэтай, калі яны пішуцца с халодным розумам справядлівага суддзі, які глядзіць назад на 300 гадоў, прабуючы знайсці праўду аб прадзедаўшчыне”[75].

Некаторыя краязнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы таго перыяду захавалі крыніцазнаўчае значэнне да нашага часу.

## Пытанні і заданні

1. Якія формы краязнаўства развіваліся ў названы гістарычны перыяд?
2. Ахарактарызуйце дзейнасць буйнейшых краязнаўцаў.
3. Ахарактарызуйце дзейнасць грамадскіх краязнаўчых арганізацый.
4. Ахарактарызуйце краязнаўчыя даследаванні ў Віленскім універсітэце, Полацкай езуіцкай акадэміі, Горы-Горацкай земляробчай школе.
5. Якія адміністрацыйныя і навуковыя ўстановы прадстаўлялі дзяржаўнае краязнаўства?
6. Хто з краязнаўцаў працаваў у губстаткамітэтах?
7. Ахарактарызуйце краязнаўчыя перыядычныя выданні.
8. У якіх бібліятэках былі фонды краязнаўчай літаратуры?
9. Ахарактарызуйце краязнаўчую бібліяграфічную прадукцыю ўказанага перыяду.
10. Прывядзіце прыклады краязнаўчых збораў у прыватных музеях.

---

[75] *Наша Ніва:* факсімільнае выданне (1909. Вып. 2.). – Мн.: Бел. навука, 1996. – С. 711.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэст

I. Дапоўніце сказы

*Заданне 1.* Выдаўцом часопіса “Рубон” быў (адказ дайце па ўзоры: І.Храпавіцкі) ______________________________

*Заданне 2.* Віленскі музей старажытнасцей і археалагічную камісію заснаваў (адказ дайце па ўзоры: А.Плятар)_________

*Заданне 3.* Працу “Быт белорусских крестьян Витебской губернии” (1854), падрыхтаваную на аснове праграмы РГТ, напісаў (адказ дайце па ўзоры: М.Кусцінскі)______________

*Заданне 4.* Віцебская вучоная архіўная камісія была створана ў _________ г.

*Заданне 5.* Бібліяграфічныя паказальнікі па археалогіі Мінскай губерні склаў (адказ дайце па ўзоры: Я.Карскі) ________________________________________________

*Заданне 6.* Выданні тыпу памятных кніжак губерній і аглядаў губерній рыхтаваліся (адказ дайце па ўзоры: губернскімі сельскагаспадарчымі таварыствамі) ___________ ________________________________________________

II. Адзначце правільны (ыя) адказ (ы):

*Заданне 7.* У краязнаўчай дзейнасці ў першай палове – сярэдзіне XIX ст. удзельнічалі:

а) члены гуртка Румянцава,

б) Таварыства па вывучэнні Магілёўскай губерні,

в) Віленскі універсітэт,

г) Віленская археалагічная камісія,

д) Віленскі музей старажытнасцей,

е) губернскія статкамітэты,

ж) Віленскі і Віцебскі цэнтральныя архівы старажытных актаў.

*Заданне 8.* У краязнаўчай дзейнасці ў другой палове XIX – пачатку XX ст. удзельнічалі:

а) Віцебская вучоная архіўная камісія,

б) Віленскі універсітэт,

в) губернскія статкамітэты,

г) Віленскі і Віцебскі цэнтральныя архівы старажытных актаў,

д) царкоўна-археалагічныя камітэты,

е) Заходні аддзел РГТ,

ж) губернскія і павятовыя таварыствы ўрачоў.

*Заданне 9.* Пад кіраўніцтвам РГТ праводзіліся:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а) этнаграфічныя і фальклорныя экспедыцыі,
б) экскурсіі ў Віленскім музеі старажытнасцей.

*Заданне 10.* І.Грыгаровіч быў супрацоўнікам:
а) часопіса "Месячнік Полацкі",
б) гуртка графа Румянцава,
в) Віленскага універсітэта,
г) Мінскага губстаткамітэта.

*Заданне 11.* Краязнаўчай работай займаліся прафесары Віленскага універсітэта:
а) І.Даніловіч,
б) К.Тышкевіч,
в) Н.Орда,
г) Ж.Анацэвіч.

*Заданне 12.* Віленскі музей старажытнасцей арганізаваны з:
а) прыватнай калекцыі Тышкевічаў,
б) прыватнай калекцыі мінскага губернатара Сямёнава,
в) калекцый РГТ,
г) матэрыялаў губстаткамітэтаў.

*Заданне 13.* Да ліку першых грамадскіх арганізацый краязнаўчага кірунку ў Беларусі належалі:
а) губернскія статкамітэты,
б) вайсковыя часці Расійскай арміі,
в) Беларускае таварыства сельскіх гаспадароў,
г) Віленскі музей старажытнасцей,
д) Віленская археалагічная камісія.

*Заданне 14.* Археалагічнымі раскопкамі ў рэгіёнах актыўна займаліся:
а) І.Грыгаровіч,
б) А.Рыпінскі,
в) Е.Раманаў,
г) А.Кіркор,
д) М.Доўнар-Запольскі.

*Заданне 15.* Анкеты (праграмы) для збору звестак аб жыцці сялян распаўсюджваліся:
а) РГТ,
б) Віцебскай вучонай архіўнай камісіяй,
в) прыватнымі краязнаўчымі музеямі,
г) губернскімі і павятовымі таварыствамі ўрачоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заданне 16.* Афіцэрамі Генштаба Расійскай арміі былі выдадзены:

а) выпускі “Месячніка Полацкага”,

б) “Гісторыя літоўскага народа”,

в) гістарычна-статыстычныя апісанні беларускіх губерняў,

г) агляды губерняў.

III. Суаднясіце

*Заданне 17.* Дзеячаў краязнаўчага руху і цэнтры (установы), у якіх яны працавалі (ці стварылі іх):

| | |
|---|---|
| 1. Э.Чапскі | а) Віцебскі губернскі статкамітэт |
| 2. А.С.Дамбавецкі | б) Прыватны музей, Станькава |
| 3. А.Ельскі | в) Магілёўскае губернскае праўленне, губернатар |
| 4. Е.Р.Раманаў | г) Прыватны музей, Замосце Ігуменскага павета |
| 5. А.П.Сапуноў | д) Таварыства па вывучэнні беларускага краю |

*Заданне 18.* Аўтараў і іх краязнаўчыя працы:

| | |
|---|---|
| 1. К.Тышкевіч | а) “Витебская старина” |
| 2. А.П.Сапуноў | б) “Очерки Витебской Беларуси” |
| 3. Е.Р.Раманаў | в) “Вандроўкі па маіх былых ваколіцах” |
| 4. М.Я.Нікіфароўскі | г) “Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях” |
| 5. У.Сыракомля | д) “Материалы по исторической топографии Витебской губернии. Уезд Велижский” |
| 6. А.С.Дамбавецкі | е) “Падарожжа па Палессі і беларускім краі” |
| 7. Я.Тышкевіч | ж) “Нарыс паўночнай Беларусі” |
| 8. Я.Баршчэўскі | з) “Апісанне Барысаўскага павета” |
| 9. П.Шпілеўскі | і) “Вілія і яе берагі” |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заданне 19.* Імёны краязнаўцаў і праяўленне іх дзейнасці:

| | |
|---|---|
| 1. Я.Булгак | а) "Скарбніца грамат" |
| 2. Я.Тышкевіч | б) Малюнкі гістарычных помнікаў, маёнткаў, палацаў, канфесіянальных установў, ландшафтных відаў |
| 3. І.Даніловіч | в) Арніталагічны музей у Паставах |
| 4. Э.Гутэн-Чапскі | г) Краязнаўчая фатаграфія |
| 5.К.Тызенгаўз | д) Віленскі музей старажытнасцей і Археалагічная камісія |
| 6. Н.Орда | е) Музей "скарбніца" і бібліятэка ў Станькаве |

*Заданне 20.* Суаднясіце архіўныя ўстановы і іх выданні:

| | |
|---|---|
| 1. Віцебскі цэнтральны архіў | а) "Витебская старина" |
| 2. Віленская археаграфічная камісія | б) "Каталог древних актовых книг губерний: Виленской, Гродненской, Минской и Ковенской…" |
| 3. Віцебская вучоная архіўная камісія | в) "Историко-юридические материалы, извлечёные из архивных книг губерний: Виленской и Могилёвской…" |
| | д) "Полоцко-Витебская старина" |

IV. Размяркуйце ў храналагічнай паслядоўнасці:

*Заданне 21.* Я.Булгак, Я.Чачот, Э.Чапскі.

V. Ці згодны Вы са сцвярджэннем?

*Заданне 22.* У Полацкай езуіцкай акадэміі вяліся сельскагаспадарчыя рэгіянальныя даследаванні.

*Заданне 23.* Органам Польскага краязнаўчага таварыства быў часопіс "Край" ("Kraj").

*Заданне 24.* У 1916 г. у Мінску ўзніклі грамадскія арганізацыі, якія займаліся выяўленнем помнікаў даўніны ў рэгіёне і іх аховай.

*Заданне 25.* Дзейнасць Віленскага музея старажытнасцей і Археалагічнай камісіі атрымала падтрымку з боку царскага ўрада.

*Заданне 26.* У краязнаўчых даследаваннях у XIX ст. пачалі прымаць удзел прадстаўнікі сялянства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заданне 27.* Паўночна-Заходні аддзел РГТ паставіў пытанне аб падрыхтоўцы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў.

VI. Гістарычныя партрэты. Пазнайце імя краязнаўца

*Заданне 28.* Хто з краязнаўцаў у пачатку XIX ст. збіраў народныя батанічныя, астранамічныя і іншыя тэрміны, матэрыялы па дыялекталогіі, тапаніміцы, археалогіі, падрыхтаваў "Слоўнік назваў гарадзішчаў і ўрочышчаў" і палымяна заклікаў вывучаць народную спадчыну: "Трэба пайсці і схіліцца пад страху селяніна ў розных аддаленых старонках, трэба спяшацца на яго святы, забавы і розныя прыгоды. Там, у дыме, які ўздымаецца над галовамі, снуюць яшчэ старыя абрады, спяваюцца даўнія спевы і ў плясках просталюдзінаў называюцца імёны забытых багоў".

*Заданне 29.* Пра якога краязнаўца першай паловы XIX ст. Р.А.Падбярэскі напісаў: "Трэба ведаць яго асабіста, трэба яго бачыць з кіем паломніка ў руцэ, так як я яго спаткаў у маіх падарожжах, пешшу, сярод беларускага люду, на плытах Дзвіны, у прыдарожных карчмах, на сцежках ледзь прыметных у лесе і на вялікіх дарогах".

*Заданне 30.* Хто з краязнаўцаў стварыў выдатны прыватны музей і бібліятэку ў маёнтку Замосце Ігуменскага павета, напісаў многа краязнаўчых прац, у "Геаграфічным слоўніку Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін" змясціў вялікую колькасць артыкулаў пра населеныя пункты і геаграфічныя аб'екты на беларускіх землях?

*Заданне 31.* Хто з краязнаўцаў у лісце да Ю.Крашэўскага пісаў, што пажадана было б заняцца "выданнем правінцыяльных штогоднікаў, у якіх бы збіраліся гістарычныя, археалагічныя, фізічныя, статыстычныя звесткі, карысныя для апісання нашага краю," сам праводзіў археалагічныя раскопкі ў Падзвінні, апублікаваў многа артыкулаў краязнаўчага зместу?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел IV. КРАЯЗНАЎЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ (1918–1945)

## Глава 1. Развіццё краязнаўства ў БССР, страты ў гады Вялікай Айчыннай вайны

### *1.1. Грамадскі краязнаўчы рух. Дзейнасць Цэнтральнага бюро краязнаўства*

У гады Першай сусветнай вайны, рэвалюцыі і ваеннай інтэрвенцыі сістэматычнай краязнаўчай работы не вялося. Л.В. Аляксееў сведчыць, што краязнаўчыя арганізацыі тады ўтвараліся стыхійна[76]. У Слуцку, некалькіх вёсках Ігуменскага павета з'явіліся краязнаўчыя таварыствы і гурткі. У Мінску дзеячамі беларускага нацыянальнага руху было створана некалькі грамадскіх арганізацый, якія ўздымалі пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны: таварыства беларускай культуры "Прасвета", беларускае культурна-асветнае таварыства "Бацькаўшчына", маладзёжныя арганізацыі. У польскім краязнаўчым часопісе "Зямля" паведамлялася, што ў кастрычніку 1918 г. у Мінску ўзнікла Польскае таварыства прыяцеляў навук[77], у ліку секцый якога была і краязнаўчая секцыя. Прысутнасць на сходзе 80 чалавек сведчыць аб зацікаўленасці мінчан у развіцці і папулярызацыі навуковых даследаванняў. З перапынкамі таварыства вяло краязнаўчую і архіўную работу і ў 1920 г.[78] Разам са стварэннем новага, у краязнаўстве, на жаль, мелі месца факты разбурэння набыткаў шматгадовай дзейнасці. Так, у пачатку 20-х гг. у Віцебску былі знішчаны бібліятэка і музейная калекцыя Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута і зачынены сам інстытут, бібліятэка і калекцыя царкоўных старажытнасцей, створаныя А.П.Сапуновым і Е.Р.Раманавым.

Стварэнне БССР мела велізарнае культурна-гістарычнае значэнне для беларускага народа. Абвешчаныя Камуністычнай партыяй і савецкім урадам новыя сацыяльныя ідэалы,

---

[76] *Алексеев, Л.В.* Археология и краеведение Беларуси, XVI в. – 30-е годы XX в. / Л.В.Алексеев. – Мн.: Бел. навука, 1996. – С. 174–175.

[77] ***Zienkiewicz, T.*** Polskie życie literackie w Mińsku w XIX i na początku XX wieku do roku 1921) / T.Zienkiewicz . – Olsztyn: Wyższa szkoła pedagogiczna, 1997. – S. 112–113.

[78] Вядома, што арганізацыю ўзначальваў Б.Усас, сакратаром быў П.Гутаровіч. У распараджэнні таварыства мелася каля 40 тыс. гістарычных дакументаў і рукапісаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальна-культурнае разняволенне беларусаў, як і іншых этнічных меншасцей Расійскай імперыі, выклікалі ў 20-я гг. незвычайны грамадскі ўздым, інтарэс да гісторыі, беларускай мовы і культуры. Менавіта ў гэты перыяд была створана выдатная беларуская мастацкая літаратура, расквітнелі мастацтва, навука, краязнаўчы рух. Гарадская і вясковая інтэлігенцыя, навучэнцы, студэнты аб'ядноўваліся для вывучэння сваіх родных мясцін, вучоныя распрацоўвалі гістарычны і сучасныя аспекты рэгіёназнаўства. Так, у Слуцкім павятовым аддзеле народнай адукацыі ў 1922 г. была створана павятовая камісія беларусазнаўства, якая ставіла задачы вывучэння і даследавання Беларусі і асабліва Слуцкага края. Члены камісіі праводзілі экспедыцыі па вёсках, падчас якіх было зроблена больш за 2000 замалёвак народнага арнаменту, сабраны гістарычныя каштоўнасці, напрыклад партрэты князёў Алелькавічаў. Са збораў камісіі вядзецца гісторыя Слуцкага краязнаўчага музея. Праз год камісія беларусазнаўства была рэарганізавана ў Слуцкае павятовае таварыства краязнаўства.

Краязнаўчы рух у БССР у міжваенны час у арганізацыйным аспекце ўяўляў складаную сістэму. Асноўнымі кампанентамі гэтай сістэмы былі грамадскі краязнаўчы рух, прадстаўлены краязнаўчымі арганізацыямі розных узроўняў; дзяржаўнае краязнаўства, якое вялося навуковымі, гаспадарчымі, культурнымі ўстановамі, у тым ліку бібліятэкамі, ВНУ; школьнае краязнаўства і краязнаўчы друк.

Адметнымі рысамі краязнаўства ў БССР былі яго масавасць і дзяржаўная падтрымка. Дзяржаўная падтрымка ў 20-я гг. дабратворна паўплывала на развіццё краязнаўства, фарміраванне яго новых кірункаў, шматлікі колькасны склад удзельнікаў, надала яму вялікі размах, абумовіла асаблівасці арганізацыйнай структуры. Але пад уплывам змены дзяржаўнага курса ў адносінах да палітыкі беларусізацыі ў канцы 20-х гг. улады стварылі атмасферу, небяспечную для краязнаўчай дзейнасці, арганізавалі рэпрэсіі супраць краязнаўцаў.

Грамадскі краязнаўчы рух і краязнаўства ў цэлым у БССР на працягу 1923–1936 гг. узначаліла Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК). ЦБК, створанае ў канцы 1923 г., з'яўлялася самастойнай структурнай адзінкай Інбелкульта – галоўнай шматгаліновай навуковай установы рэспублікі[79].

[79] Ёсць звесткі аб стварэнні ў 1921 г. камісіі па рэгістрацыі краязнаўчых арганізацый у Навукова-тэрміналагічнай камісіі. Інбелкульт афіцыйна адкрыты 30.01.1922 г. на яе базе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Функцыянаванне ў складзе Інбелкульта паказвала важнасць краязнаўства як галіны даследчай дзейнасці. Першапачаткова ў склад ЦБК былі ўведзены вядомыя вучоныя – географы А.А.Смоліч, М.В.Азбукін, гісторыкі У.І.Пічэта, В.Д.Друшчыц, аграрнік С.В.Скандракоў (сакратар), прадстаўнікі ад Галоўпалітасвета і іншых арганізацый. Значны асабісты ўклад у стварэнне ЦБК унёс першы старшыня Інбелкульта грамадска-палітычны дзеяч і мовазнавец С.М.Некрашэвіч. Стварэнне ЦБК пры Інбелкульце паказвала, што за ўзор цэнтра краязнаўчага руху быў узяты вопыт РСФСР, дзе ў 1922 г. пачалася дзейнасць Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Расійскай акадэміі навук.

У 1925 г. быў абраны новы склад ЦБК, у які ўвайшлі П.Р.Вілянстовіч (старшыня), Р.К.Шукевіч-Трацякоў (намеснік старшыні), С.В.Скандракоў (сакратар), В.Д.Друшчыц, М.В.Азбукін, І.А.Сербаў, К.Крапіва, прадстаўнікі ад секцый Інбелкульта, Саюза працаўнікоў асветы, БДУ, Сельскагаспадарчага інстытута, Цэнтральнай статыстычнай управы, Галоўпалітасвета, Цэнтраархіва і іншых арганізацый.

Кіраванне дзейнасцю ЦБК і яго фінансаванне ажыццяўлялася Прэзідыумам Інбелкульта, перад якім ЦБК трымала справаздачы. Задачы і змест работы ЦБК вызначаліся яго ўставам, які быў зацверджаны ў 1928 г. Прэзідыумам Інбелкульта. Узначальвалі ЦБК дзеячы, здольныя рэалізаваць дзяржаўныя інтарэсы і бягучы ідэалагічны курс, П.Р.Вілянстовіч, М.І.Бялуга, В.Серафімаў. У самы плённы перыяд існавання ЦБК (1925–1929) яго старшынёй быў Павел Рыгоравіч Вілянстовіч, буйны партыйны і дзяржаўны дзеяч[80]. Адным з самых актыўных дзеячаў быў вучоны сакратар ЦБК М.І.Каспяровіч.

Асноўнымі кірункамі дзейнасці ЦБК былі:

– арганізацыя краязнаўчага руху і кіраванне ім,

– каардынацыя краязнаўчай дзейнасці,

– арганізацыя навуковых краязнаўчых даследаванняў,

– метадычнае забеспячэнне дзейнасці краязнаўчых арганізацый.

ЦБК узначаліла фарміраванне сеткі краязнаўчых таварыстваў, рэгістравала іх, спрыяла вырашэнню важнейшых

[80] У гэты перыяд П.Р. Вілянстовіч адначасова працаваў намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК і адказным сакратаром ЦКК КП(б)Б, намеснікам наркама Рабоча-сялянскай інспекцыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пытанняў краязнаўчага руху. У 1924 г. было зарэгістравана 19 краязнаўчых арганізацый: Віцебскае і Магілёўскае акруговыя, Сенненскае, Бешанковіцкае, Лёзненскае раённыя і іншыя, але колькасць іх бесперапынна павялічвалася, што выклікала патрэбу абмеркаваць праблемы краязнаўства на рэспубліканскім узроўні. З мэтай вырашэння галоўных задач, напрамкаў і формаў краязнаўчай работы пад кіраўніцтвам ЦБК адбыліся два Усебеларускія краязнаўчыя з’езды і тры канферэнцыі. У акругах і раёнах склікаліся рэгіянальныя краязнаўчыя канферэнцыі, на якіх абмяркоўваліся актуальныя арганізацыйныя пытанні, задачы краязнаўчай дзейнасці і вынікі даследчай і пошукавай працы. Шырокі кадравы склад краязнаўцаў быў прыметным папаўненнем нешматлікіх прафесійных навуковых рэсурсаў. Падначаленасць Інбелкульту гарантавала непасрэднае ўзаемадзеянне краязнаўчых арганізацый і навуковых структур у вывучэнні рэгіёнаў Беларусі.

Першая Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя прайшла ў лістападзе 1924 г. На ёй сабраліся краязнаўцы і прадстаўнікі дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, якія вялі краязнаўчую работу. Абмен думкамі і прынятыя на канферэнцыі рашэнні паклалі пачатак шырокаму разгортванню краязнаўчага руху ў БССР. На канферэнцыі былі вырашаны арганізацыйныя пытанні і прынята рашэнне аб выпуску часопіса “Наш край”.

Асноўнымі формамі краязнаўчых арганізацый былі акруговыя і раённыя таварыствы, створаныя ў тагачасных буйнейшых адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінках, краязнаўчыя гурткі ў школах і тэхнікумах. Краязнаўчыя таварыствы ў ВНУ былі прыроўненыя да акруговых таварыстваў. Краязнаўчае таварыства БДУ было першай краязнаўчай арганізацыяй у ВНУ СССР.

Галоўнай мэтай усіх краязнаўчых арганізацый было прызнана ўсебаковае вывучэнне акруг і раёнаў, асобных населеных пунктаў.

Пад кіраўніцтвам ЦБК, пры падтрымцы дзяржаўных органаў і на энтузіязме насельніцтва краязнаўчы рух пашыраўся і ў пачатку 1926 г. было зарэгістравана ўжо 167 краязнаўчых арганізацый, у якіх налічвалася каля 5000 чалавек. Гэты вялікі рэсурс збіральнікаў і даследчыкаў уносіў важкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўклад у назапашанне звестак пра рэгіёны, якія неабходны былі для ўсебаковага вывучэння мясцовасцей Беларусі, папулярызацыі краязнаўчых ведаў, выхавання ў насельніцтва грамадзянскіх рыс і патрыятызму, фарміравання рэсурсна-фактаграфічнай базы многіх галін беларусазнаўчых ведаў.

У сярэдзіне 20-х гг. склаліся тры тыпы краязнаўчых арганізацый: а) акружныя краязнаўчыя таварыствы, б) раённыя краязнаўчыя таварыствы, в) гурткі (пры школах, тэхнікумах, хатах-чытальнях, сельскіх саветах). Вялікую работу праводзілі Віцебскае, Магілёўскае, Аршанскае акружныя таварыствы краязнаўства, краязнаўчыя арганізацыі ў Гомелі, Мінску і іншых рэгіёнах. Так, плённа працавалі ўдзельнікі Віцебскага акружнога таварыства краязнаўства на чале з М.І.Каспяровічам. У ім было 500 членаў і існавалі пяць секцый (культурна-гістарычная, прыродазнаўчая, мастацкая, асветніцкая, беларусазнаўчая), працавалі астранамічны пункт, феналагічнае бюро, камісіі па стварэнні краязнаўчых музеяў, збіранні жывой мовы Віцебшчыны, вывучэнні яўрэйскай культуры і інш. Праводзіліся агульныя пасяджэнні таварыства, на якіх чыталіся рэфераты па выніках даследаванняў (гісторыя Віцебска, жыццё і дзейнасць А.П.Сапунова, віцебская архітэктура і інш.). Выйшлі каштоўныя краязнаўчыя кнігі: зборнік “Віцебшчына”, “Віцебскі краёвы слоўнік” М.І.Каспяровіча.

У Аршанскім акруговым краязнаўчым таварыстве плённа вяліся гістарычныя даследаванні і друкаваліся іх вынікі. Былі выдадзены такія важныя работы, як “Гісторыя Воршы”, “Матэрыялы да гісторыка-археалагічнай карты акругі”, “1905 на Аршаншчыне”, “Ворша ад XI да XV ст.”.

У сярэдзіне 20-х гг. шэраг краязнаўчых арганізацый адкрылі краязнаўчыя музеі, што сведчыць аб актыўнай збіральніцкай і навуковай рабоце па вывучэнні рэгіёнаў.

На першым Усебеларускім краязнаўчым з’ездзе (7–10 лютага 1926 г.) удзельнічалі 120 дэлегатаў, якія прадстаўлялі ЦБК, 87 краязнаўчых таварыстваў і гурткоў. Былі абмеркаваны палітычны даклад А.Р.Чарвякова, справаздача ЦБК, даклады з месцаў і даклады па галінах краязнаўства. З дакладамі выступілі выдатныя вучоныя: С.М.Некрашэвіч (“Мовазнаўчая праца краязнаўчых арганізацый”,) М.В.Доўнар-Запольскі (“Краязнаўчая праца ў галіне гісторыі і археалогіі”),



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У.М.Ігнатоўскі (“Далейшыя шляхі краязнаўства на Беларусі”) і інш. У пастановах з’езда было вырашана важнейшай галіной сучаснай краязнаўчай працы “прызнаць вывучэнне прыроды і яе вытворчых сіл”, намечаны асноўныя кірункі дзейнасці па выяўленні, апрацоўцы раслін і мінералаў, феналагічных і метэаралагічных назіранняў, удзеле ў падрыхтоўцы карт. Было прапанавана распрацаваць і выдаць праграмы па зборы дыялектычнага матэрыялу, правесці шырокую агітацыю па збіранні слоў з беларускай народнай мовы, звярнуць увагу на укладанне краёвых слоўнікаў. Краязнаўцы з вялікім энтузіязмам прыняліся за гэту дзейнасць. У 1926 г. яны сабралі каля 50 тыс. картак-слоў для ўкладання краёвых моўных слоўнікаў. За тры гады працы па зборы моўнага матэрыялу ў Інбелкульт краязнаўчыя арганізацыі Віцебскай акругі даслалі 37 285, Мінскай – 18 121, Мазырскай – 10 842, Бабруйскай – 10 367, Гомельскай – 2371, Полацкай – 1895 картак-слоў. Агульная колькасць асоб, якія прынялі ўдзел у зборы слоўнага матэрыялу, даходзіла да 2500. У большасці гэта былі настаўнікі, студэнты, аграномы, вучні сямігадовых школ. Рэспубліканскі і мясцовы друк шырока асвятляў ход гэтай работы.

З 1926 г. разгарнулася работа па падрыхтоўцы краёвых слоўнікаў у акруговых краязнаўчых таварыствах. Найбольшага поспеху дасягнулі на Віцебшчыне, перш за ўсё дзякуючы самаадданай працы навуковага сакратара Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства М.І.Каспяровіча (1900–1937). З верасня 1924 г. ён пачаў збіраць слоўны матэрыял. На кірмашах, святах, у гутарках з сялянамі старанна запісваў народныя словы і выразы, асаблівасці вымаўлення і выкарыстання. Праз віцебскую газету “Заря запада” ён заклікаў мясцовую інтэлігенцыю ўдзельнічаць у гэтай працы. Неўзабаве больш за 200 добраахвотныя супрацоўнікі даставілі ў слоўнікавую камісію Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства 36 071 картку-слова, што разам з сабранымі з М.І.Каспяровічам склала 46 192 карткі-словы. Гэта дало магчымасць М.Каспяровічу прыступіць да складання моўнага слоўніка. “Віцебскі краёвы слоўнік” (1927) ахопліваў 9703 словы. Слоўнік адлюстраваў тагачасную мову на Віцебшчыне і стаў адной з крыніц для распрацоўкі літаратурнай беларускай мовы. Аднак меў недахопы як у тлумачэнні нека-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

торых слоў, так і ў пэўнай недакладнасці ілюстрацыйнага матэрыялу.

У Калінінскім акруговым таварыстве краязнаўства (г.Клімавічы) работай па падрыхтоўцы слоўніка кіраваў Я.К.Бялькевіч – дырэктар Мсціслаўскага педтэхнікума. Актыўны ўдзел прымалі студэнты тэхнікума. Гэты слоўнік адрозніваўся ад віцебскага тым, што змяшчаў не пераклад беларускіх слоў на рускую мову, а іх тлумачэнне на беларускай мове. Завершаны быў слоўнік Я.Бялькевічам у 1959 г. і выдадзены Інстытутам мовазнаўства АН БССР пад назвай “Краёвы слоўнік усходняй Магілёўшчыны” (1970). Вялася работа па зборы слоўнага матэрыялу членамі Мазырскага акруговага таварыства. Рукапіс слоўніка, падрыхтаванага А.Я.Крукоўскім, загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны. У іншых акругах праца над слоўнікамі не была даведзена да завяршэння.

Калі ў 1927 г. у сувязі з пераходам на новы, больш складаны метад збору слоўнага матэрыялу, работа замарудзілася, слоўнікавая камісія Інбелкульта параіла рыхтаваць невялікія раённыя слоўнікі. Пры гэтым прымалася пад увагу, што кожнае раённае краязнаўчае таварыства будзе збіраць мясцовыя словы і ў любым выпадку захоўваць архіўны матэрыял у якасці даведніка для мовазнаўцаў. Па даручэнні слоўнікавай камісіі М.Каспяровіч склаў праграму “Як сабраць і ўкласці слоўнік мовы свайго раёна”, апублікаваную ў “Нашым краі”. Але наступіўшыя грамадскія перамены не дазволілі шырока разгарнуць работу па стварэнні раённых слоўнікаў. Выданнем слоўніка аб'ёмам 9000 моўных адзінак у 1929 г. завяршылася дзейнасць краязнаўцаў Чэрвеньшчыны. “Краёвы слоўнік Чэрвеньшчыны” быў падрыхтаваны настаўнікам, заснавальнікам мясцовай краязнаўчай арганізацыі, М.В.Шатэрнікам. Гэты слоўнік лічыцца эталонным для Міншчыны, паколькі мова Чэрвеньшчыны з’яўляецца тыповай для ўсяго рэгіёну. Галоўная вартасць слоўніка, як адзначаў Я.Ф.Карскі, у прыкладах, якія пацвярджаюць значэнне слоў. Гэтыя прыклады прыводзяцца ў дакладным запісе і па іх можна вывучаць фанетычныя, марфалагічныя і сінтаксічныя з'явы адлюстраванай у слоўніку мясцовасці. Сам Карскі па матэрыялах слоўніка М.В.Шатэрніка апублікаваў нарыс аб гаворцы на Чэрвеньшчыне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вядома, што член Заслаўскага раённага таварыства У.Шалешка сабраў 7000 слоў для ўкладання моўнага слоўніка вёскі Недраскі, аднак далейшы лёс краязнаўца і яго працы невядомы.

На другім Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе (10–13 лютага 1927 г.) дэлегаты прадстаўлялі ўжо 9-тысячны калектыў краязнаўцаў. Значна больш, чым на першым з'ездзе, было членаў раённых краязнаўчых арганізацый. З'езд канстатаваў, што работа ў рэгіёнах вялася над зборам краёвага слоўнага матэрыялу, фальклору, над метэаралагічнымі і феналагічнымі назіраннямі. Але на з'ездзе было вынесена рашэнне аб пераарыентацыі краязнаўчай работы на вывучэнне мясцовай эканомікі і энергетычных рэсурсаў. Тым самым змест краязнаўчых даследаванняў звязваўся з задачамі, якія ставіліся партыйнымі і ўрадавымі структурамі як галоўныя ў сацыяльна-эканамічным будаўніцтве краіны. Гэта прывязвала краязнаўчую работу да дзяржаўнай ідэалагічнай і эканамічнай палітыкі і тым абмяжоўвала яе змест. Рашэнні з'езда адлюстравалі пачатак адміністрацыйнага ўціску на краязнаўчы рух і тых негатыўных з'яў, што ў хуткім часе прывялі да яго спынення.

На II Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі (7–12 студзеня 1929 г.) былі прадстаўлены 8 акруговых таварystваў краязнаўства, 101 раённае, 96 краязнаўчых гурткоў, а ўсяго 301 краязнаўчая арганізацыя агульным лікам 10 510 членаў. Гэта былі самыя высокія паказчыкі грамадскага краязнаўчага руху. На III Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі (студзень 1930 г.) зафіксаваны 333 краязнаўчыя арганізацыі, але колькасць членаў у іх паменшылася да 8819 чалавек.

**Колькасныя паказчыкі грамадскага краязнаўчага руху**

| Гады | Колькасць краязнаўчых арганізацый | Колькасць членаў |
|---|---|---|
| 1926 | 167 | 5 000 |
| 1927 | 251 | 9 000 |
| 1929 | 301 | 10 510 |
| 1930 | 333 | 8 819 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынікі розных кірункаў і формаў краязнаўства публікаваліся на старонках перыядычнага друку і асобных выданняў. Краязнаўцы імкнуліся арганізаваць выпуск спецыяльных перыядычных выданняў. У 20-я гг. часопісы пад назвай "Наш раён" выпускаліся Барысаўскім, Смалявіцкім і Асіповіцкім раённымі краязнаўчымі таварыствамі. Унікальныя матэрыялы ўвайшлі ў краязнаўчыя зборнікі "Аршаншчына", "Віцебшчына" і інш. Але выключная роля ў разгортванні краязнаўчага руху і яго дасягненнях належыць часопісу "Наш край". Часопіс – лепшы перыядычны орган беларускага краязнаўства за ўсю яго гісторыю, выдаваўся ЦБК з кастрычніка 1925 г. па 1930 г. У перадавым рэдакцыйным артыкуле гаварылася: "З'явілася патрэба ў спецыяльным краязнаўчым часопісе, з дапамогай якога краязнаўчыя арганізацыі і асобы, зацікаўленыя краязнаўствам, маглі б абмяняцца сваімі ведамі, пазнаёміцца з новымі краязнаўчымі працамі і знайсці інструкцыі для сваёй дзейнасці"*. Рэдактарам часопіса быў З.Бядуля, членамі рэдакцыі М.Каспяровіч, М.Бялуга, А.Казак. У "Нашым краі" друкаваліся вядомыя вучоныя і аматары краязнаўства: М.В.Азбукін, Д.М.Васілеўскі, В.Пераход, І.М.Сяржанін, В.Ф.Купрэвіч, А.Я.Крукоўскі, П.Ф.Салаўёў, А.М.Ляўданскі, З.К.Магілёўчык, А.У.Фядзюшын, С.С.Шутаў, А.Г.Немцаў, Я.Р.Калодкін і інш. На старонках часопіса асвятлялася становішча краязнаўчага руху ў Беларусі, методыка і тэхналогія краязнаўчых даследаванняў і друкаваліся іх вынікі, ставіліся першачарговыя задачы краязнаўства. Асноўнымі раздзеламі часопіса былі: агульнанавуковы, матэрыялы з месцаў, анкеты, праграмы і інструкцыі, хроніка, бібліяграфія. У 1926–1928 гг. у "Нашым краі" былі апублікаваны 94 даследчыя работы, прысвечаныя асобным рэгіёнам, 51 артыкул па метадалогіі і гісторыі краязнаўства, 100 праграм і інструкцый па краязнаўчых даследаваннях, 129 паведамленняў аб рабоце мясцовых арганізацый, 16 бібліяграфічных паказальнікаў і аглядаў. Багаты метадычны і інфармацыйны матэрыял дапамагаў авалодаць методыкай збіральніцкай і даследчай працы шматлікім пачынаючым краязнаўцам, сярод якіх было нямала асоб, не меўшых вышэйшай адукацыі. Фотаздымкі, схемы, табліцы, планы, карты павышалі інфарматыўнасць публікацый, дапа-

* Наш край. – 1925. – № 1. – С. 4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магаючы выданню і сёння заставацца каштоўнай дакументальнай крыніцай краязнаўчых даследаванняў.

Выдатнай падзеяй стаў выхад кнігі М.І.Каспяровіча “Краязнаўства” (1929) – першай абагульняючай працы па галіне. У ёй аўтар аналізаваў развіццё краязнаўчага руху ў Беларусі, раскрыў метадычны патэнцыял даследча-пошукавай краязнаўчай дзейнасці. З сучасных пазіцый не з усімі вывадамі аўтара можна пагадзіцца. Напрыклад, вылучэнне “этапаў польскага і рускага краязнаўства на Беларусі” не раскрывае ўсёй складанасці перапляцення гісторыка-культурных уплываў і замацоўвае факты мясцовай краязнаўчай дзейнасці за іншымі культурамі.

Спецыфічнай рысай гадоў хуткага разгортвання краязнаўчага руху было выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу: рэгіянальныя органы ўпраўлення, кіраўніцтва ўстаноў і прадпрыемстваў садзейнічалі адкрыццю краязнаўчых арганізацый. Гэта з’ява мела і станоўчыя, і адмоўныя рысы. Станоўчае выяўлялася ў дзеяннях мясцовага кіраўніцтва па стварэнні краязнаўчых арганізацый, аказанні ім ідэйнай і матэрыяльнай падтрымкі (прадастаўленні памяшканняў для пасяджэнняў і інш.). Некаторыя кіраўнікі сур’ёзна цікавіліся краязнаўствам і асабіста ўзначалілі пярвічныя арганізацыі; напрыклад, старшынямі пярвічных краязнаўчых арганізацый былі рэктар БДУ У.І.Пічэта, дырэктар Мсціслаўскага педтэхнікума І.К.Бялькевіч. Аднак разгортванне краязнаўчага руху не працякала роўна і бесканфліктна. Адмоўныя рысы праявіліся ў фармальных падыходах да функцыянавання суполак, асабліва ў “добраахвотна-прымусовым” залічэнні работнікаў арганізацый і прадпрыемстваў у склад іх членаў. Гэта вяло да пасіўнасці часткі ўдзельнікаў краязнаўчых гурткоў і таварыстваў. На краязнаўчых з’ездах з трывогай адзначалася, што актыўна працуе меншая частка членаў, прыводзілася лічба 5%. Аднак увогуле ніколі ў айчыннай гісторыі яшчэ не было такога масавага краязнаўчага руху, як у другой палове 20-х гг.

Цэнтралізаванае кіраванне краязнаўчым рухам праз ЦБК было аптымальным для свайго часу. Яно дазваляла прыцягваць краязнаўцаў да выканання маштабных праграм, забяспечыць неабходную метадалагічную падрыхтоўку для правядзення даследаванняў. ЦБК былі распрацаваны шматлікія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праграмы краязнаўчых даследаванняў рознай тэматыкі, якія друкаваліся асобнымі выданнямі і на старонках перыядычнага органа ЦБК часопіса “Наш край”. Метадалагічная падрыхтоўка была адной з найбольш актуальных задач, паколькі ўпершыню да краязнаўства далучыліся тысячы людзей з невысокім агульнаадукацыйным узроўнем. У ЦБК распрацоўваліся інструкцыйныя і метадычныя матэрыялы па збіранні фактычнага матэрыялу, яго запісу і іншых формах фіксавання і апрацоўкі. Для павышэння ўзроўню краязнаўцаў па радыё перадаваліся цыклы метадычных лекцый, друкаваліся артыкулы ў перыядычных выданнях, рабіліся даклады на краязнаўчых з’ездах і канферэнцыях, на настаўніцкіх курсах. ЦБК было пастаўлена пытанне аб увядзенні курса краязнаўства ва ўсіх тэхнікумах і ВНУ і вырашана станоўча. Членамі ЦБК быў складзены “План курса краязнаўства ў вышэйшых навучальных установах і тэхнікумах”, які рэалізаваны быў толькі ў некаторых тэхнікумах, пераважна педагагічных. З гэтай жа мэтай ЦБК сумесна з Таварыствам краязнаўства пры БДУ былі арганізаваны паўтарамесячныя курсы-студыі па краязнаўстве, якія наведвалі каля 200 студэнтаў ВНУ і тэхнікумаў Мінска.

ЦБК каардынавала дзве асноўныя краязнаўчыя плыні: дзяржаўную навуковую і грамадскі краязнаўчы рух. Каардынацыя краязнаўчай работы праз ЦБК заключалася ў тым, што краязнаўчыя таварыствы і гурткі прымалі актыўны ўдзел у рабоце секцый Інбелкульта, працуючы па прапанаваных ім праграмах і методыцы, сумесна праводзілі навуковыя экспедыцыі ў многія рэгіёны БССР, абмяркоўвалі задачы і напрамкі краязнаўчай дзейнасці на з’ездах і канферэнцыях.

Вынікі даследаванняў дасылаліся ў секцыі Інбелкульта ў выглядзе пісьмовых паведамленняў і разнастайных матэрыялаў. Напрыклад, сумесная праца краязнаўчых таварыстваў, асобных краязнаўцаў-аматараў і слоўнікавай камісіі Інбелкульта вялася пры падрыхтоўцы краёвых слоўнікаў жывой беларускай мовы. Ад краязнаўчых арганізацый Інбелкульт атрымліваў багаты матэрыял па фальклоры, этнаграфіі, назіраннях за з’явамі прыроды. Краязнаўчыя арганізацыі дасылалі сабраныя матэрыялы ў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію, у ЦБК РСФСР і ў іншыя дзяржаўныя ўстановы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЦБК і краязнаўчыя арганізацыі развівалі сувязі з краязнаўчымі цэнтрамі РСФСР, з навуковымі і краязнаўчымі арганізацыямі Польшчы, Літвы і іншых краін. Найбольш актыўныя стасункі падтрымліваліся з ЦБК РСФСР. У ЦБК РСФСР адпраўляліся інфармацыйныя і даследчыя матэрыялы, адказы па запытах, экземпляры беларускага часопіса "Наш край". Беларускія краязнаўцы ўдзельнічалі ў краязнаўчых з'ездах і канферэнцыях у РСФСР.

Па ўсіх гэтых кірунках дзейнасці ЦБК і мясцовых краязнаўчых арганізацый БССР былі дасягнуты значныя поспехі, што дазваляе сцвярджаць аб найвышэйшым пад'ёме краязнаўчай работы. Аднак наступілі благія часы: з першай хваляй рэпрэсій супраць беларускага нацыянальнага адраджэння краязнаўчы рух быў разбураны, вядучыя кіраўнікі і вучоныя, як і многія радавыя краязнаўцы, сталі ахвярамі рэпрэсій. Пераарыентацыя на абслугоўванне задач сацыялістычнага будаўніцтва прывяла да скажэння рэальных магчымасцей краязнаўчых арганізацый. Так, на ўзроўні СССР было абвешчана, што "вывучэнне сыравіны – справа шырокіх працоўных мас". Прапанавалася ствараць турыстычныя групы па 5–25 чалавек, якія маглі б "у час адпачынку" выйсці ў паход для адшукання і даследавання карысных выкапняў. Папярэдне на занятках група павінна была прайсці спецыяльнае навучанне, а раённыя ўлады абавязваліся забяспечыць турыстаў рыштункам і інструментамі[81]. Але ў рэчаіснасці паспяховыя геолага-разведачныя работы патрабуюць спецыяльнай прафесійнай падрыхтоўкі і спецыфічнай арганізацыі. Падобныя заведама невыканальныя задачы, што ставіліся ў канцы 20 – пачатку 30-х гг., разбуралі краязнаўчы рух.

У 1930 г. былі зменены старшыня і навуковы сакратар ЦБК (імі сталі В.Серафімаў і В.Самцэвіч). Часопіс "Наш край" стаў выдавацца пад назвай "Савецкая краіна", рэзка змяніўся яго змест: ідэалагічнае выкрыццё так званага нацыяналізму становіцца галоўнай мэтай многіх публікацый. Некаторыя дзеячы не толькі адхілялі ўсё станоўчае, што было зроблена краязнаўцамі, але і абвінавачвалі краязнаўства ў варожай, контррэвалюцыйнай, на карысць замежнай буржуазіі,

[81] *Самцэвіч, В.* У масавы даследчы паход за сыравінай для прамысловасці другой пяцігодкі / В.Самцэвіч. – Мн.: Бел. акад. навук. Масавы сектар і ЦБК, 1932. – 28 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці. Напрыклад, у выданні “Устаноўкі і метады беларускай нацдэмаўскай этнаграфіі” адзначалася, што “некаторыя ўстановы Інбелкульта і АН, і перш за ўсё кафедра этнаграфіі і Цэнтральнае бюро краязнаўства, ператварыліся ў сапраўдныя штабы кулацкай ідэалагічнай агентуры, што дзейнічаюць праз мясцовыя краязнаўчыя гурткі, праз сетку карэспандэнтаў, якія рэкрутаваліся пераважна з настаўніцтва, праз мясцовыя музеі і іншыя культурныя арганізацыі на месцах”[82]. Р.М.Выдра, адзін з актыўных пагромшчыкаў краязнаўства, у кнізе “Беларускі нацдэмакратызм у краязнаўчым руху БССР”, выдадзенай Інстытутам філасофіі Акадэміі навук, ганьбіў і апаганьваў самаадданую працу многіх беларускіх краязнаўцаў, іх лідэраў: «Беларускія нацдэмы, якія амаль цалкам авалодалі краязнаўчым рухам у Савецкай Беларусі, падпарадкавалі яго сваім буржуазна-рэстаўратарскім, контррэвалюцыйным і фашыстоўскім задачам, ніколі не хавалі сваёй гістарычнай роднасці са сваімі шавіністычна-нацыяналістычнымі папярэднікамі з лагера беларускай буржуазіі. Вось чаму ў высокай ступені характэрныя тыя гістарычныя нарысы “беларусазнаўства” ці “беларускага краязнаўства”, якія з’яўляліся ў “Нашым краі”, – усе гэтыя матэрыялы ў адзін голас, адкрыта, без усялякага сораму, усталёўваюць ідэйную і арганізацыйную сувязь сучаснага нацдэмакратызму ў краязнаўчым руху БССР з беларускім буржуазна-дэмакратычным рухам ў дарэвалюцыйны час»[83]. Некаторыя даследчыкі стаялі на пазіцыях прымітыўнага разумення нацыянальнай культурнай спадчыны, якое дэкларавалася кіраўніцтвам рэспублікі. Так, В.Кнорын пераконваў: «Пралетарыят і рэвалюцыйнае сялянства ў … нацыяналістычнай міфатворчасці патрэбы не адчуваюць. Наадварот, пралетарыят павінен выкрываць класавую сутнасць нацыянальных герояў, выкрываць класавы змест міфа аб нацыянальным “залатым веку” ў мінулым, паказаўшы эксплуататарскую класавую падаплёку гэтых міфаў…»[84]. Контррэвалюцыянерамі, замежнымі шпіёнамі былі аб’яўлены

[82] *Нікольскі, М.М.* Устаноўкі і метады беларускай нацдэмаўскай этнаграфіі / М.М.Нікольскі. – Мн.: [Б.в.], 1933. – С. 12.

[83] *Выдра, Р.* Беларускі нацдэмакратызм у краязнаўчым руху БССР / Р.Выдра. – Мн.: Бел. акад. навук, 1931. – 87 с.

[84] *Кнорын, В.* За культурную рэвалюцыю / В.Кнорын. – Мн.: Бел. дзярж. выд-ва, 1928. – С. 80.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

С.М.Некрашэвіч, М.І.Каспяровіч, Д.М.Васілеўскі, Я.Ю.Лёсік, У.І.Пічэта, А.А.Шлюбскі, В.Ю.Ластоўскі, М.М.Улашчык і іншыя вядомыя краязнаўцы. Многія прайшлі праз арышты, высылкі ў аддаленыя рэгіёны СССР, былі расстраляны. М.Каспяровіч, які для сапраўдных краязнаўцаў быў душой справы, а для ворагаў "князем краязнаўства", таксама стаў ахвярай рэпрэсій. Краязнаўчую дзейнасць узначаліў В.Серафімаў[85], які працаваў у сістэме школьнай адукацыі. Краязнаўчы рух пачаў хутка развальвацца[86]. Адзін з найбольш адыёзных выкрывальнікаў нацыяналізму ў краязнаўстве Ф.П.Садоўскі сам у сярэдзіне 1931 г. канстатаваў, што старыя краязнаўцы адышлі ад працы, новыя не прыцягнуты і назіраецца поўны развал краязнаўства.

ЦБК у 1930–1933 гг. існавала ў складзе масавага сектара Акадэміі навук. Яго кіраўніцтва імкнулася абгрунтаваць краязнаўства як частку масавай навукова-даследчай работы на заводах і фабрыках, калгасах і саўгасах. Апошняя, III Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя (студзень 1930 г.) прайшла ў рэзкіх абвінавачваннях ЦБК за адсутнасць "яснай устаноўкі" па эканамічных пытаннях. Асноўным кірункам работы ЦБК становіцца навукова-метадычнае забеспячэнне краязнаўцаў праграмамі па вывучэнні карысных выкапняў, лекавых траў, феналагічных з'яў, гісторыі грамадзянскай вайны, партызанскага руху.

ЦБК спрабавала захаваць арганізацыйную структуру краязнаўства, зрабіць яе асноўным звяном раённыя краязнаўчыя бюро. Гэта рэарганізацыя адлюстравана ў распрацаваным ЦБК "Палажэнні аб раённых бюро краязнаўства" (1929). Раённыя бюро прызначаліся кіруючым органам краязнаўчага руху і павінны былі функцыянаваць пры раённых аддзелах народнай адукацыі. Акруговыя і раённыя таварыствы краязнаўства былі скасаваныя. Пазней было прызнана, што эксперымент па рэарганізацыі краязнаўчых таварыстваў быў заганным. Ён надаў краязнаўчым арганізацыям адміністрацыйныя функцыі, адарваў ад тых патрэб, якія сапраўды цікавілі мясцовае насельніцтва.

---

[85] *Серафімаў, В.* Узмацніць барацьбу з варожымі вылазкамі ў краязнаўстве / В.Серафімаў, Ф.Садоўскі // Сав. краіна. – 1932. – № 2. – С. 73–75.

[86] Там жа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У неспрыяльныя 1929–1930 гг. гісторыка-краязнаўчая тэматыка знікае са старонак “Нашага края”. Над часопісам узнікла пагроза закрыцця ці кардынальнага змянення яго зместу. У № 1 за 1930 г. надрукаваны зварот ЦБК да краязнаўчых арганізацый з патрабаваннем звязаць сваю работу з “небывалым пад’ёмам калектывізацыі і будаўніцтвам фабрык”. Але спробы прадставіць новую тэматыку не ўратавалі часопіс. «Сама назва “Наш край” павінна быць выкінута на сметнік гісторыі», – заклікаў Р.М.Выдра. У канцы 1930 г. замест “Нашага края” выйшаў часопіс “Савецкая краіна”, змест якога адпавядаў афіцыйнай палітыцы і ідэалогіі. “Наш край” быў аб’яўлены контррэвалюцыйным, памагатым панскай Польшчы, скіраваным на аднаўленне капіталістычнай Беларусі. “Адсюль зразумела, чаму краязнаўства ў БССР да гэтага часу ганялася за старажытнасцю, мінуўшчынай, капалася ў пылу і брудзе цэркваў, касцёлаў, сінагог, упускаючы пытанні сацыялістычнага будаўніцтва”, – паведамляла “Савецкая краіна”[87].

У 1932 г. была прынята пастанова СНК БССР “Аб мерапрыемствах па разгортванні краязнаўчага руху”[88], якая прадпісвала краязнаўцам даследаваць і паказваць выключна поспехі сацыялістычнага будаўніцтва. Краязнаўчыя арганізацыі абавязваліся актывізаваць дзейнасць па прыцягненні ў “масавыя краязнаўчыя ячэйкі” на заводах, фабрыках, МТС, саўгасах, калгасах, ВНУ і школах працоўных, камсамольцаў, чырвонаармейцаў, студэнтаў, навучэнцаў, рацыяналізатараў. АН БССР і Наркамасветы павінны былі распрацаваць тэматыку краязнаўчых даследаванняў, забяспечыць метадычную дапамогу. Насуперак дырэктыўным указанням грамадскі краязнаўчы рух пачаў рэзка згортвацца, краязнаўчыя арганізацыі закрываліся. 17 лютага 1937 г. СНК БССР выдаў пастанову “Аб развіцці музейнай і краязнаўчай справы БССР”. У пастанове вызначалася сістэма краязнаўчых арганізацый. Ніжэйшы ўзровень стваралі краязнаўчыя ячэйкі на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах, школах і ўстановах; у раённых і акруговых цэнтрах павінны былі працаваць раённыя і акруговыя бюро. Кіраўніцтва краязнаўчай работай цалкам перайшло да Наркамасветы. 25 красавіка 1937 г. Наркам-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[87] Савецкая краіна. – 1930. – № 1-2 (11-12). – С. 4.
[88] Савецкая краіна. – 1932. – № 6. – С. 3–4.

асветы ў распараджэнні “Аб пастаноўцы і арганізацыі краязнаўчай работы” адзначыў, што няма неабходнасці ствараць асобныя краязнаўчыя арганізацыі, таму што ўся краязнаўчая работа павінна праводзіцца пры Дамах культуры, вучэбных установах і музеях. Некалькі пазней НКА СССР лістом-дырэктывай “Аб пастаноўцы і арганізацыі краязнаўчай работы” давёў да ведама, што няма ніякай патрэбы ў стварэнні спецыяльных краязнаўчых арганізацый. Кіраўніцтва краязнаўчай працай ускладвалася на мясцовыя музеі.

У развіццё грамадскага краязнаўчага руху ў міжваенны перыяд пэўны ўклад уносілі добраахвотныя арганізацыі іншага профілю, асабліва Добраахвотнае таварыства пралетарскага турызму і экскурсій. У 1933 г. у таварыстве налічвалася 45 тысяч чалавек, што сведчыць аб масавым характары гэтай арганізацыі. Члены таварыства ўдзельнічалі ў паходах выхаднога дня, экскурсіях па вывучэнні прамысловых прадпрыемстваў і калгасаў. Але і ў гэтай арганізацыі праяўляўся характэрны для савецкага часу адміністрацыйны падыход. Напрыклад, у 1933 г. у турыстычных паходах ўдзельнічалі 1062 чалавекі, менш чым дзесятая частка ад колькаснага складу арганізацыі[89]. Па прычыне адсутнасці матэрыяльнай базы для разгортвання турызму 16 сакавіка 1935 г. гэтае таварыства было скасавана, а функцыі па развіцці турызму перайшлі да прафсаюзных і краязнаўчых арганізацый.

У вывучэнне і ахову рэгіянальнай фауны станоўчы ўклад ўносіла таварыства паляўнічых і рыбаловаў, створанае ў 1921 г. Таварыства садзейнічала стварэнню 34 заказнікаў пры лясніцтвах. Матэрыялы прыродазнаўчага зместу публікаваліся на старонках часопіса таварыства “Паляўнічы Беларусі”.

У 1926 г. у СССР было адноўлена Дзяржаўнае РГТ, з 1938 г. – Усесаюзнае геаграфічнае таварыства пры АН СССР. Беларускія вучоныя сталі актыўнымі членамі гэтага таварыства.

Галоўныя прычыны заняпаду краязнаўчага руху звязаны з таталітарнасцю палітычнага рэжыму СССР, з нецярпімасцю ўлад да нацыянальных атрыбутаў беларускай культуры, што стала трагедыяй для навуковай і творчай інтэлігенцыі, для тых, хто лічыў сябе грамадзянінам, гаспадаром у сваёй краіне. Кіруючыя колы БССР, партыйныя і савецкія чыноў-

[89] *Мешечко, Е.Н.* Географическое краеведение / Е.Н.Мешечко. – Мн.: Экоперспектива, 2002. – С.31.

нікі адстойвалі інтарэсы культурнай рэвалюцыі, якую разглядалі з пазіцый дыктатуры пралетарыяту і бяднейшага сялянства. Пры такой палітыцы заняпад краязнаўства быў прадвызначаны.

### *1.2. Дзяржаўнае краязнаўства*

Краязнаўства ў 20-я гг. стала часткай дзейнасці навуковых устаноў рэспублікі, ВНУ і ССНУ. У кантэксце фарміравання структуры беларускай навукі ўзнік дэфіцыт фактаграфічнага матэрыялу, рэгіянальных звестак, неабходных для хуткага развіцця беларусазнаўчых галін ведаў і іншых галін, для якіх характэрны рэгіёназнаўчы кампанент. Гэтая унікальная сітуацыя, абцяжараная праблемамі недахопу кадравага навуковага патэнцыялу, падштурхоўвала навуковыя ўстановы да супрацоўніцтва з мясцовымі краязнаўцамі, а таксама з'явілася галоўнай прычынай іх непасрэднага ўдзелу ў краязнаўчым руху.

У многіх навуковых, навучальных, культурных, гаспадарчых установах і арганізацыях былі створаны структуры, якія займаліся краязнаўчымі даследаваннямі. Краязнаўчы кірунак прысутнічаў у дзейнасці Мінскага таварыства гісторыі і старажытнасцей (1919–1925), створанага пры Мінскім педагагічным інстытуце, членамі якога былі У.І.Пічэта, М.Я.Янчук, П.В.Харламповіч, настаўнікі і аматары гісторыі[90]. Да краязнаўчых таварыстваў пры ўстановах адносіліся: этнаграфічная камісія пры Віцебскім аддзяленні Маскоўскага археалагічнага інстытута (1922), Беларускае вольна-эканамічнае таварыства (1921) у Беларускім палітэхнічным інстытуце, Таварыства вывучэння прыроды, сельскай гаспадаркі і лесаводства (1923) у Беларускім дзяржаўным інстытуце сельскай гаспадаркі, Таварыства краязнаўства і Навуковае таварыства па вывучэнні Беларусі пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі (БДА СГ) у Горках (1925–1931).

Значны ўклад у вывучэнне рэгіёнаў Беларусі быў унесены шматлікімі структурнымі падраздзяленнямі Інбелкульта. У 1925 г. былі створаны гісторыка-археалагічная, этнаграфіч-

---

[90] У 1922 г. у гэтым таварыстве з удзелам прадстаўнікоў іншых грамадскіх арганізацый было створана часовае бюро краязнаўства, прызначанае для кіравання краязнаўчай работай у рэспубліцы, але выканаць пастаўленую мэту не ўдалося.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ная, прыродазнаўчая, лінгвістычная, літаратурная, мастацтвазнаўчая, педагагічная, сельскагаспадарчая, сацыяльна-эканамічная секцыі і іншыя адзінкі. Дзяржплан БССР перадаў Інбелкульту камісію па вывучэнні прыродных і вытворчых сіл. Інбелкульт атрымаў права адкрываць музеі, бібліятэкі, архівы, склікаць навуковыя канферэнцыі, праводзіць археалагічныя раскопкі і арганізоўваць экспедыцыі. У кастрычніку 1928 г. пастановай ЦВК і СНК БССР Інбелкульт быў рэарганізаваны ў Беларускую акадэмію навук.

Этнаграфічная секцыя адразу паставіла задачу ўстанавіць цесную сувязь з краязнаўчымі арганізацыямі і для збору матэрыялу стварыць шырокую карэспандэнцкую сетку, праводзіць этнаграфічныя экспедыцыі. Шматлікія этнаграфічныя экспедыцыі дазволілі сабраць багаты матэрыял: рэчы, вуснапаэтычную творчасць, песні і інш. Напрыклад, у 1924 г. А.Сержпутоўскі і кампазітар Я.Прохараў правялі экспедыцыю ў Горацкі, Чавускі, Мсціслаўскі і Клімавіцкі паветы з мэтай вывучэння вуснапаэтычнай і музычнай народнай творчасці. Сабраны матэрыял знаходзіў месца ў музейных калекцыях, абагульняўся ў публікацыях. Выдадзена шмат артыкулаў і кніг этнаграфічнага зместу. Апісанню абрадаў і вераванняў сялянства прысвечана праца А.А.Шлюбскага “Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны” (1927), высокую ацэнку атрымалі нарысы І.А.Сербава “Вільчынскія паляне” (па групе вёсак на р.Прыпяць).

У гісторыка-археалагічнай секцыі працавалі выдатныя вучоныя, якія актыўна ўдзельнічалі ў краязнаўчым руху, – М.В.Доўнар-Запольскі, А.В.Бурдзейка, В.Д.Друшчыц, Ф.І.Забэла, М.В.Мялешка, К.І.Кернажыцкі, У.І.Пічэта, А.М.Ляўданскі, С.А.Дубінскі, А.Д.Каваленя, К.М.Палікарповіч, В.Р.Тарасенка, С.С.Шутаў і інш. Гісторыкі даследавалі беларускія гарады Віцебск, Магілёў, Навагрудак, Брэст.

Гістарычная камісія польскага аддзялення Інбелкульта выяўляла і апрацоўвала матэрыялы пра беларускія рэгіёны за перыяд XIX–XX стст. у архівах Масквы і Ленінграда. Каштоўныя матэрыялы былі знойдзены пра паўстанне 1863 г. Яны былі апублікаваны ў зборніку “1863 год на Міншчыне” (1927).

На жаль, частка вучоных была прыцягнута для разгрому курса беларусізацыі і краязнаўчага руху. Тыя, хто ў пачатку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

30-х гг. пазбег рэпрэсій, вымушаны былі абслугоўваць бягучы палітычны заказ. Так, таленавіты археолаг А.М.Ляўданскі[91] ад даследавання праблем генезісу беларускага насельніцтва і К.М.Палікарповіч – праблем каменнага веку вымушаны былі перайсці да вывучэння праблем гісторыі вытворчасці і тэхнікі, у прыватнасці вытворчасці жалеза з балотных руд, што не мела практычнага значэння.

Прыродазнаўчыя рэгіянальныя даследаванні праводзілі прыродазнаўчая і сельскагаспадарчая секцыі Інбелкульта і Навуковае таварыства па вывучэнні Беларусі пры БДАСГ у Горках. Экспедыцыямі былі ахоплены ўсе акругі БССР, а таксама такія прыродныя рэгіёны, як Беларускае Палессе (Гомельшчына) і Прыдняпроўе. Вывучалі раслiннае покрыва, глебы, фауну. Гэтыя даследаванні спрыялі назапашванню навуковых ведаў аб прыродзе асобных рэгіёнаў. Таксама на іх падставе вызначаліся навуковыя кірункі ў батанічнай навуцы, уключаючы батаніка-геаграфічнае раяніраванне тэрыторыі і геабатанічнае картаграфаванне.

У вывучэнне фауны шэрага рэгіёнаў вялікі ўклад быў зроблены прафесарам Анатолем Уладзіміравічам Фядзюшыным. У Пухавіцкім і Любанскім раёнах ён вывучаў птушак (1921, 1923); на Віцебшчыне, Магілёўшчыне і Гомельшчыне – розных прадстаўнікоў фауны. Шмат часу прысвяціў пошуку ацалелых паселішчаў бабра, іх уліку і збору матэрыялаў па экалогіі гэтай жывёлы. У 1924 г. у вярхоўях Бярэзіны і яе прытоках ён знайшоў вялікае паселішча баброў і звярнуўся да ўлад рэспублікі з прапановай аб неадкладнай арганізацыі ў гэтых месцах рэспубліканскага бабровага запаведніка. Сабраны ім багаты матэрыял стаў асноўным калекцыйным фондам пры стварэнні заалагічных музеяў Інбелкульта і БДУ. Напрыклад, у заалагічным музеі Інбелкульта быў экспанат шкуры апошняга дзікага ката, забітага ў 1927 г. у Бабруйскім раёне. Вывады вучонага паказвалі, што з 1915 г. па 1925 г. асноўныя віды фауны ў беларускіх рэгіёнах скараціліся.

Развіваліся геалагічныя даследаванні, накіраваныя на пошук у рэгіёнах карысных рэсурсаў. Былі адкрыты радовішчы карысных выкапняў для прамысловасці будаўнічых матэрыялаў.

[91] Рэпрэсіраваны ў 1937 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынікі даследаванняў знайшлі адлюстраванне ў сямі выпусках “Матэрыялаў па вывучэнні флоры і фауны Беларусі”, дзевяці выпусках навуковых зборнікаў “Запіскі Беларускага дзяржаўнага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі”, шматлікіх артыкулах у часопісе “Наш край”, у выданнях “Прырода Асіповіцкага раёна”, “Міншчына”, “Віцебшчына”, “Працах навуковага таварыства па вывучэнні Беларусі пры БДА СГ у Горках” і інш.

У галіне медыцыны рэгіёназнаўчымі даследаваннямі пачалі займацца медыцынская секцыя краязнаўчага таварыства БДУ, медыцынская секцыя Інбелкульта і медыцынскія інстытуты, створаныя ў сістэме Наркамаховы здароўя ў Віцебску і Мінску. Затым іх пачалі ажыццяўляць кафедры медыцынскага факультэта БДУ, а Інбелкульт узяў на сябе метадычнае і арганізацыйнае кіраўніцтва навуковымі даследаваннямі і аб’яднаў як урачоў, так і медыцынскую грамадскасць БССР. Была створана медыцынская секцыя Інбелкульта. У яе склад увайшлі вядомыя навукоўцы і ўрачы, адным з асноўных арганізатараў з’яўляўся І.І. Цвікевіч. У 1927 г. у секцыі працавалі 76 правадзейных членаў. У медыцынскай секцыі краязнаўчага таварыства БДУ было ў 1928 г. 35 членаў. Да правядзення даследчай работы студэнтаў рыхтавалі спецыяльна: чыталі лекцыі, знаёмілі з праграмамі і анкетамі даследаванняў. Кіравалі працай секцыі краязнаўчага таварыства БДУ супрацоўнікі медыцынскай секцыі Інбелкульта П.В.Трамповіч і І.І.Цвікевіч.

Медыцынская секцыя краязнаўчага таварыства БДУ і Беларускі санітарна-бактэрыялагічны інстытут займаліся пераважна вывучэннем санітарнага стану гарадоў і вёсак. Тагачасныя санітарна-бытавыя ўмовы жыцця сялян былі даследаваны студэнтамі БДУ пад кіраўніцтвам З.К.Магілёўчыка па спецыяльных праграмах-анкетах. Двары ў выбраных вёсках ва ўсіх акругах, за выключэннем Полацкай, абследаваліся праз адзін. Падрабязна апісваліся планіроўка двара, яго санітарна-бытавыя ўмовы, тыпы жылля, унутраная будова, памеры хаты і вокнаў, іншыя асаблівасці. Краязнаўцы грунтоўна вывучылі водазабеспячэнне і санітарныя ўмовы Мінска, удзельнічалі ў комплексным вывучэнні санітарнага стану Асіповіцкага раёна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распрацоўваліся пытанні краявой паталогіі сацыяльных хвароб. Шмат матэрыялаў па гэтым кірунку было прадстаўлена на ўсебеларускіх з’ездах працаўнікоў аховы здароўя і з’ездах урачоў розных спецыяльнасцей. Так, у пастанове II Усебеларускага з’езда ўчастковых урачоў адзначалася, што задачамі на бліжэйшы час з’яўляюцца краязнаўчыя падыходы да вывучэння санітарных умоў быту і працы рабочых з захворваннямі, якія з’яўляюцца характэрнымі для краю. З’езд ухваліў “навукова-краязнаўчы ўхіл” часопіса “Беларуская медычная думка” і пастанавіў, што для дапамогі ўрачам у даследаваннях павінны пастаянна дзейнічаць навукова-кансультацыйныя нарады спецыялістаў.

Сярод характэрных захворванняў быў валляк. Даследаваннямі распаўсюджання гэтай хваробы займалася спецыяльна створаная камісія медыцынскай секцыі Інбелкульта для вывучэння валляка. Камісія вызначыла, што захворванне эндэмічным валляком насельніцтва БССР мае ачаговы характар і ахоплівае вялікую тэрыторыю. Адны вёскі ўяўлялі ярка адлюстраваныя ачагі гэтай хваробы, іншыя характарызаваліся слабымі прыметамі. Вялікую тэрыторыю ахоплівалі гэтыя ачагі на Палессі. Валляк у Мінску вывучала ўрач І.Бірыла, у Віцебскай акрузе – І.Андрэева. Члены валлёвай камісіі рабілі таксама спробы наладзіць рацыянальнае лячэнне захворвання і прапанавалі метады яго прафілактыкі ёдам.

Цесныя сувязі з мясцовымі краязнаўчымі арганізацыямі і ЦБК мела таксама этнолага-лінгвістычная секцыя Інбелкульта. Ад іх быў атрыманы багаты матэрыял па жывой беларускай мове. Інбелкульт, са свайго боку, распрацоўцаў методыку збору слоўнага матэрыялу, прымяняў сістэму грашовай аплаты картачнага матэрыялу і рыхтаваў да друку рэгіянальныя моўныя слоўнікі. За тры гады працы ў Інбелкульт былі дастаўлены 119 153 карткі-словы. Найбольш поўна ў моўным аспекце былі абследаваны Койданаўскі, Старобінскі, Краснапольскі раёны, шэраг раёнаў Віцебшчыны. Але сабраны матэрыял змяшчаў шмат паўтораў, а таксама слоў, змешчаных у “Беларуска-расійскім слоўніку” М.Я.Байкова і С.М.Некрашэвіча (1925). Каб пазбегнуць дубліравання, у краязнаўчыя арганізацыі быў разасланы “Беларуска-расійскі слоўнік” і ў газеце “Савецкая Беларусія” надрукавана новая інструкцыя М.Я.Байкова па методыцы запісу слоў. Істотную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапамогу краязнаўцам аказала “Праграма для збірання асаблівасцей беларускіх гаворак і гаворак, пераходных да суседніх моў”, складзеная С.М.Некрашэвічам (1927). У 1927 г. паводле інструкцыі Байкова сабралі 1500 новых слоў і каля 20 тыс. выпраўленняў да асобных слоў па іх вымаўленні, націску, граматычнаму роду. У 1928 г. у Інбелкульце прыступілі да стварэння слоўніка жывой беларускай мовы. Яго праект рыхтаваў М.Я.Байкоў. Аднак змяненне палітычнай сітуацыі ў дачыненні да беларускай мовы і ўскладненне методыкі збору слоў прывялі да спынення гэтай працы. Дадзены кірунак краязнаўчай працы дапамог захаваць значны пласт жывой мовы, якая ўжывалася ў шэрагу беларускіх рэгіёнаў: на Віцебшчыне, Усходняй Магілёўшчыне, у Чэрвеньскім раёне. Упершыню была распрацавана методыка збору моўнага матэрыялу, даступная краязнаўцам, якія не мелі філалагічнай падрыхтоўкі. Гэты слоўны матэрыял стаў у далейшым асновай для грунтоўных філалагічных даследаванняў.

Супрацоўнікі секцыі мастацтва (М.Шчакаціхін, Я.Дыла, З.Бядуля, Ф.Ждановіч, Я.Міровіч, У.Галубок, В.Галіна і іншыя) зрабілі першы значны ўклад у даследаванне гісторыі і сучаснага стану беларускага мастацтва. Члены тэатральнай падсекцыі збіралі матэрыял аб тэатральнай творчасці ў асобных рэгіёнах, напрыклад, аб стане тэатра ў Заходняй Беларусі, пра дзейнасць беларускіх драматычных гурткоў на Случчыне, Чэрвеньшчыне і ў Мінску; быў апублікаваны артыкул “Адраджэнне беларускага тэатра на Міншчыне” Ф.П.Ждановіча. І хаця большасць падрыхтаваных матэрыялаў не былі апублікаваны, але менавіта тады закладваліся як новы кірунак у змесце краязнаўчых даследаванняў, так і падмурак нацыянальнай навукі аб тэатры.

Для даследаванняў мастацтва рэгіёнаў плённымі былі спецыяльныя экспедыцыі па зборы матэрыялаў народнага мастацтва, у склад якіх уваходзілі мастакі. Падчас экспедыцый збіраліся і фатаграфаваліся аб’екты старажытнай архітэктуры, цудоўныя ўзоры ткацтва.

У 1926 г. у Інбелкульце была створана камісія гісторыі мастацтва, старшынёй якой стаў М.Шчакаціхін. Захоплены вывучэннем гісторыі беларускага мастацтва, даследчык абараніў кандыдацкую дысертацыю, выпусціў першы том “На-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рысаў з гісторыі беларускага мастацтва". У "Нарысах…" змясціў навуковы агляд мастацтва ад курганных старажытнасцей да гатычных формаў у царкоўнай архітэктуры XV–XVI стст. Даследаваў матывы краязнаўства ў сучасным мастацтве. Асабліва плённымі былі вынікі вывучэння архітэктурных помнікаў. Так, М.Шчакаціхін даследаваў замак у Рагачове, разам з І.Хозеравым – помнікі хрысціянскай архітэктуры ў Полацку. Летам 1930 г. у ліку іншых вядучых беларускіх вучоных М. Шчакаціхін быў арыштаваны, памёр у ссылцы ў Башкірыі.

У ліпені 1939 г. у Віцебску была адкрыта мастацкая галерэя Ю.Пэна, з якой у пасляваенны перыяд толькі асобныя творы трапілі ў Віцебскі абласны краязнаўчы музей.

У 30-я гг. увага да краязнаўства ў Акадэміі навук пачала знікаць. Акрамя непрыхільных грамадска-палітычных умоў, калі прыйшлі ў заняпад многія галіны навукі, адной з прычын магчыма разглядаць памяншэнне ўвагі да краязнаўства. Навуковыя даследаванні цяпер канцэнтраваліся ў спецыяльных навуковых установах і ВНУ.

Да дакументна-пошукавай і даследчай дзейнасці па краязнаўстве далучыліся архівы і музеі, сетка якіх фарміравалася ў гэты перыяд. У сувязі з краязнаўчым рухам паўсталі пытанні супрацоўніцтва архіваў і краязнаўчых арганізацый. Неабходнасць узаемадзеяння была відавочнай, але яго характар выклікаў спрэчкі. У той час узнікла меркаванне, што краязнаўчыя арганізацыі могуць выконваць не толькі функцыі выяўлення дакументаў у палацавых, валасных і іншых рэгіянальных архівах (акрамя архіваў Кастрычніцкай рэвалюцыі), але і ажыццяўляць іншыя архіўныя працэсы (апрацоўкі, захавання, выкарыстання). На краязнаўчых з'ездах і канферэнцыях, а таксама на канферэнцыях і нарадах архівістаў абмяркоўвалася гэта праблема. Абгрунтавана прааналізаваў яе М.В.Мялешка, буйны архівіст, які таксама быў членам ЦБК. У яго выступленнях і публікацыях выказана слушная думка аб тым, што месцам захоўвання неапублікаваных дакументаў павінны быць менавіта архівы, дзе для гэтага створаны спецыяльныя ўмовы. Архіўныя работнікі павінны не толькі выконваць работу па апрацоўцы і захаванні фондаў, але і ўдзельнічаць у "адшуканьні матар'ялаў для дасьледчыкаў". Краязнаўцы, са свайго боку,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“павінны больш цікавіцца лёсам архіваў, не глядзець на архівы, як на нешта чужое, казённае, мала даступнае”[92]. Яны павінны актыўна ўдзельнічаць у выяўленні і збіранні архіўных дакументаў, разам з архівістамі займацца іх далейшай распрацоўкай, выкарыстоўваць у даследаваннях. Вядомы сучасны даследчык архіўнай справы Беларусі М.Ф.Шумейка ацаніў думкі М.В.Мялешкі і некаторых іншых спецыялістаў, а таксама рэзалюцыі па пытаннях супрацоўніцтва краязнаўчых арганізацый і архіваў, што былі прыняты ў 20-я гг., як плённыя і перспектыўныя і адзначыў актуальнасць іх рэалізацыі ў тых умовах[93]. У 30-я гг. архівы былі падначалены НКВД, што пераўтварыла іх у закрытыя для краязнаўцаў установы і перапыніла супрацоўніцтва.

Навуковую і асветніцкую дзейнасць ажыццяўлялі таксама музейныя ўстановы, у тым ліку краязнаўчыя музеі. Да пачатку 1927 г. у БССР былі адкрыты Беларускі дзяржаўны музей у Мінску, Віцебскі і Гомельскі дзяржаўныя культурна-гістарычныя музеі, каля 20 акруговых, раённых і іншых музеяў у Оршы, Магілёве, Полацку, Слуцку, Бабруйску, Клімавічах, Мазыры і іншых гарадах.

Беларускі дзяржаўны музей у Мінску, адкрыты ў 1923 г., хаця і не быў краязнаўчым, але змяшчаў багацейшыя зборы з розных рэгіёнаў. У канцы 1928 г. у ім налічвалася больш за 30 000 адзінак. “Этнаграфічны аддзел у сучасны момант мае вялікую колькасць выключнага па харастве, паўнаце і рэдкасці матэрыялу – тканіны і вопратку, узоры, якія ўжо не часта сустракаюцца на вёсцы, значную колькасць прадметаў быту…”[94]. Багатыя краязнаўчыя музеі былі створаны ў 20-я гг. у Віцебску, Магілёве і Гомелі. У Віцебскім дзяржаўным культурна-гістарычным музеі, заснаваным на прыватных калекцыях А.Брадоўскага і В.Федаровіча, а таксама былога царкоўна-археалагічнага музея, змяшчалася больш за 30 000 экспанатаў. У Магілёўскім (1924) і Гомельскім (1927) музеях налічвалася па 10 000 экспанатаў. Вялася работа па стварэнні іншых акруговых і раённых краязнаўчых музеяў. У пачатку 1930 г. у БССР было 4 акруговых і 15 раённых краязнаўчых

[92] *Шумейко, М.* Белорусские архивы и краеведение в 1920-е годы / М.Шумейко // Архівы і справаводства. – 2003. – № 4. – С. 92.

[93] Там жа, с.87 – 95.

[94] *Харламповіч, П.* Пяцігоддзе Беларускага дзяржаўнага музею / П.Харламповіч // Наш край. – 1927. – № 1. – С. 12.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музеяў. Каштоўныя зборы былі прадстаўлены ў Аршанскім, Бабруйскім, Клімавіцкім, Мазырскім, Нараўлянскім, Полацкім і Слуцкім краязнаўчых музеях. Музеі карысталіся вялікай папулярнасцю. Улады патрабавалі ад музеяў удзелу ў ідэалагічнай прапагандзе, адлюстравання ў экспазіцыях сацыялістычнага будаўніцтва, класавай барацьбы пралетарыяту, антырэлігійнай дзейнасці і інш.

Пад прэсам наступу на краязнаўчыя арганізацыі ў сярэдзіне 30-х гг. многія краязнаўчыя музеі, створаныя імі, пачалі ліквідавацца, а каштоўныя калекцыі губляліся і знішчаліся. У 1936–1938 гг. закрыліся краязнаўчыя музеі ў Слуцку, Мазыры, Нароўлі, Мсціславе, Чэрвені і іншых гарадах, лёс калекцый іх невядомы. Некалькі грамадскіх краязнаўчых музеяў былі перададзены Наркамасветы і такім чынам набылі дзяржаўны статус.

У навуковы краязнаўчы рух значны ўклад уносілі выкладчыкі і студэнты БДУ, іншых ВНУ і тэхнікумаў. Актыўна працавала краязнаўчае таварыства пры БДУ пад кіраўніцтвам вядомага гісторыка У.І.Пічэты. Падчас экспедыцый студэнты збіралі матэрыялы аб прыродзе, па гісторыі і культуры, рыхтаваліся да кіравання краязнаўчай работай. Сакратаром таварыства быў студэнт Мікола Улашчык, які ў пасляваенны час стаў адным з самых знакамітых айчынных археографаў і крыніцазнаўцаў. У канцы 30-х гг. у перапынках паміж арыштамі М.Улашчык, пазбаўлены права пражывання ў Беларусі, напісаў успаміны[95], са старонак якіх праз непаўторны каларыт часу паўсталі клопаты і памкненні студэнцкай моладзі – шчырай, рамантычнай, захопленай марамі – дайсці да кожнага куточка роднай зямлі. Першыя пасяджэнні таварыства прайшлі ў гарачых спрэчках “што рабіць, як рабіць, каго прымаць у гурток. … Пасьля розных спрэчак, нарадаў было вырашана, што ўзімку, у час заняткаў, будзем працаваць тэарэтычна – вывучаць мэтады, а ўлетку прымемся за практычную працу. Кожны павінен быў узяць на ўчот і апісаць тыя гістарычныя і археолёгічныя помнікі, якія знаходзіліся на яго бацькаўшчыне”[96]. Маладых краязнаўцаў у паходах чакалі нечаканыя адкрыцці: “Дабіраемся

[95] *Улашчык, М.М.* Краязнаўства (Нататкі пра бадзянні ў 1924–1929 гг.): з рукапіснай спадчыны / М.М.Улашчык. – Мн.: БелНДІДАС; Пейто, 1999. – 160 с.
[96] Там жа, с. 14, 15.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўрэшце да саміх паляшукоў[97]”. “Што яны паляшукі, гэта ўсім цьвёрда ведама. Паляшукі – асобны народ, а крыху далей на поўнач, у Мяжэвічах, ужо жыве Літва.

– Што, як? Літва?

– Ну да, Літва! Хіба ж вы, вучоны чалавек, ня ведаеце?

Я, вучоны, усё ня ведаў, што тут Літва. Пачынаецца гутарка на гэту тэму, і высьвятляецца, што Літвою паляшукі завуць Случчыну і наогул усю Беларусь. Пытаю ў іх пра сучасную Літву, але пра яе паляшукі нічога ня чулі наогул”[98].

Навуковае таварыства па вывучэнні Беларусі пры БДА СГ мела статус асобнай навуковай установы Інбелкульта ў г.Горкі. Краязнаўчы кірунак быў адным з галоўных у яго дзейнасці[99]. У другой палове 20-х гг. у складзе таварыства было 115 членаў. Асабліва падкрэслівае краязнаўчы напрамак дзейнасці таварыства склад яго ўдзельнікаў: вучоных, студэнтаў, настаўнікаў, сялян. Самымі актыўнымі краязнаўцамі былі прафесары П.Ф.Салаўёў, Ф.В.Лунгерсгаўзен, М.Ганчарык. Яны ўдасканальвалі таварыства, наладзілі супрацоўніцтва з Горацкім раённым таварыствам краязнаўства, удзельнічалі ў рабоце рэгіянальных і ўсебеларускіх краязнаўчых канферэнцый. Змястоўны профіль дзейнасці быў звязаны з многімі дысцыплінамі прыродазнаўчага і сельскагаспадарчага комплексаў: глебазнаўствам, геалогіяй, батанікай, раслінаводствам, жывёлагадоўляй і інш. Аб’ектам даследаванняў з’яўляліся розныя тэрыторыі Беларусі, у тым ліку Горацкі раён. Вынікі публікаваліся ў зборніках БДА СГ і на старонках часопіса “Наш край”. Так, трэці выпуск “Прац…” таварыства быў прысвечаны апісанню Горацкага раёна. Члены таварыства выступалі з дакладамі на шматлікіх краязнаўчых канферэнцыях. У 1929 г. гэта таварыства ўвайшло ў склад Акадэміі навук БССР, а ў 1931 г. падчас структурных перабудоў у акадэміі яго дзейнасць спынілася.

Выкладчыкі і навучэнцы некаторых ССНУ, асабліва педагагічных тэхнікумаў, прымалі актыўны ўдзел у краязнаўчай дзейнасці. Адным з асноўных яе кірункаў быў удзел у зборы

---

[97] Вёска Дзякавічы Любанскага раёна.

[98] *Улашчык, М.М.* Краязнаўства (Нататкі пра бадзянні ў 1924–1929 гг.): з рукапіснай спадчыны / М.М.Улашчык. – Мн.: БелНДІДАС: Пейто, 1999. – С. 140.

[99] *Кузьмініч, Т.В.* Бібліяграфічная праца навуковага таварыства па вывучэнні Беларусі ў кантэксце інфармацыйнай дзейнасці ў рэспубліцы (другая палова 20 – пачатак 30-х гг. XX ст.) / Т.В.Кузьмініч // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2006. – Вып. 8. – С.214, 218.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жывой мовы насельніцтва асобных рэгіёнаў. Паспяховую работу па зборы слоўнага матэрыялу праводзілі краязнаўчыя гурткі пры Мінскім, Рагачоўскім і Мсціслаўскім педтэхнікумах і Магілёўскім землямерным інстытуце.

Менавіта для студэнцкай моладзі, пераважна навучэнцаў педагагічных тэхнікумаў, упершыню пачалося выкладанне краязнаўства як вучэбнай дысцыпліны.

У гэтыя гады ў краіне фарміравалася сістэма мясцовых газет, органаў раённых камітэтаў Камуністычнай партыі і райсаветаў, прадпрыемстваў і калгасаў, на старонках якіх адлюстроўваліся падзеі мясцовага жыцця, друкаваліся артыкулы краязнаўцаў, змяшчаліся звесткі аб разгортванні краязнаўчага руху. Мясцовыя газеты сталі асноўнымі крыніцамі вывучэння рэгіёнаў.

### *1.3. Школьнае краязнаўства*

У фарміраванні вучэбна-выхаваўчай дзейнасці савецкай школы краязнаўству адводзілася значная роля. У 1919 г. пры Наркамаце асветы БССР была створана экскурсійная секцыя. Асобная ўвага надавалася падрыхтоўцы настаўнікаў да арганізацыі краязнаўчых даследаванняў. Менавіта настаўнікі ў гарадах і вёсках былі найбольш актыўнымі ўдзельнікамі краязнаўчага руху, даводзілі ідэі краязнаўства да вучняў і мясцовага насельніцтва. У такіх нарматыўных дакументах, як “Палажэнне аб адзінай працоўнай школе”, дэкларацыі “Асноўныя прынцыпы адзінай працоўнай школы”, акцэнтавалася ўвага на вывучэнні школьнікамі навакольнай прыроды і жыцця роднага краю шляхам удзелу ў даступных даследаваннях (назіранні, экскурсіі і інш.). “Краязнаўчы прынцып”, як пісалі ў той час, знайшоў адлюстраванне ў вучэбных праграмах. У 1926 г. была створана Школьная краязнаўчая камісія, у склад якой ад ЦБК увайшлі М.Каспяровіч і Г.Аляксандраў, а пры акруговых і раённых краязнаўчых таварыствах – школьна-краязнаўчыя секцыі. У школах ствараліся краязнаўчыя гурткі. Многія з іх працавалі вельмі актыўна, выкарыстоўвалі разнастайныя формы і метады даследчыцка-збіральніцкай працы. Так, у краязнаўчым гуртку пры Уздзенскай сямігодцы Мінскай акругі налічвалася 70 членаў. Вучні збіралі матэрыялы аб паўстанні 1863 г., рэвалюцыйных падзеях 1905 г. у краі, складалі гістарычныя апісанні вёсак. Вынікі даследаванняў асвятляліся на старон-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ках школьнага рукапіснага часопіса. Члены гуртка Асіповіцкай чыгуначнай школы стварылі краязнаўчы музей [100].

Школьнае краязнаўства набыло масавы характар. З агульнай колькасці ўдзельнікаў краязнаўчага руху ў БССР 87% складалі настаўнікі і вучні[101]. У пачатку 1930 г. у школах былі створаны 12 краязнаўчых музеяў і 8 краязнаўчых куткоў.

На працягу 20-х гг. у школьных краязнаўчых даследаваннях склаўся комплексны падыход да вывучэння мясцовага жыцця, прыярытэт аддаваўся гісторыка-этнаграфічным і моўным даследаванням. Але рэпрэсіі і прымусовая пераарыентацыя краязнаўцаў на выкананне непасільных задач (даследаванне прыродных рэсурсаў, рацыяналізацыю вытворчасці) дэфармавалі і школьны краязнаўчы рух. Колькасць нізавых краязнаўчых арганізацый у школах скарачалася, у 1932 г. іх засталося толькі 46. Але крах грамадскага краязнаўства і рэпрэсіі не маглі цалкам вынішчыць краязнаўчую работу ў школах. У пастанове "Аб мерапрыемствах па разгортванні краязнаўчага руху" ад 1 чэрвеня 1932 г. СНК БССР паставіў задачу ўзмацніць краязнаўчую работу ў школах, разгарнуць падрыхтоўку настаўнікаў-краязнаўцаў на курсах і канферэнцыях. Былі распрацаваны спецыяльныя праграмы краязнаўчай падрыхтоўкі настаўнікаў[102], праведзены даследаванні і інструктажы па разгортванні краязнаўчай працы ў шэрагу раёнаў (Койданаўскім, Дубровенскім, Шклоўскім, Аршанскім і інш.). Спецыяльная падрыхтоўка дапамагала настаўнікам авалодаць формамі, метадамі і зместам краязнаўчай працы ў школе. З ліку настаўнікаў выйшла многа вядомых краязнаўцаў. Яны ўзначальвалі краязнаўчыя арганізацыі, прымалі ўдзел у краязнаўчых з'ездах і канферэнцыях, праводзілі даследаванні па шырокім коле тэм.

Дзякуючы краязнаўчай працы, школьнікі далучаліся да актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці населеных пунктаў і сацыялістычных пераўтварэннях. Краязнаўства выконвала станоўчую ролю ў выхаванні патрыятычнага светапогляду беларускай моладзі.

---

[100] *Шорац, Л.Ф.* Школьнае гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 20–30-я гады XX ст. / Л.Ф.Шорац // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 2005. – № 4. – С. 36–37.

[101] Там жа, с.36.

[102] Праграма краязнаўчай падрыхтоўкі настаўнікаў масавай школы // Савецкая краіна. – 1933. – № 1. – С.80.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *1.4. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства*

Кароткачасовы, але высокі ўздым краязнаўчай дзейнасці быў магчымы дзякуючы належнаму бібліятэчна-бібліяграфічнаму забеспячэнню. ЦБК распаўсюджвала сярод краязнаўцаў неабходную метадычную і навуковую літаратуру. У першыя гады існавання краязнаўчых таварystваў для іх былі выпісаны невялікія бібліятэкі краязнаўчай літаратуры. Часопіс “Наш край” да 1927 г. рассылаўся бясплатна ўсім краязнаўчым арганізацыям.

Створаныя ў міжваенны час бібліятэкі розных тыпаў і відаў, у тым ліку Дзяржаўная бібліятэка (ДБ) БССР, пачалі краязнаўчую работу. Работнікі хат-чытален і масавых бібліятэк удзельнічалі ў зборы слоўнага матэрыялу і ў іншых напрамках краязнаўчай дзейнасці. Асабліва вялікае значэнне мела звяртанне бібліятэкараў да вывучэння ролі бібліятэкі ў краязнаўстве. Гэтая тэма разглядалася ў бібліятэчных аб’яднаннях, якія здзяйснялі метадычную дапамогу бібліятэкам. Так, Віцебскае бібліятэчнае аб’яднанне ўжо ў 1924 г. паставіла задачу вывучыць тэму “Бібліятэкар і краязнаўства”[103]. Але звестак аб краязнаўчай рабоце бібліятэк няшмат у параўнанні з дзейнасцю па інфармацыйным забеспячэнні важнейшых у той час палітычнай прапаганды, сацыялістычнай перабудовы гаспадаркі і інш.

Асаблівае значэнне надавалася бібліяграфічнаму забеспячэнню краязнаўчых даследаванняў. Вывучаючы бібліяграфічную дзейнасць Інбелкульта, Т.В.Кузьмініч адзначыла, што “…амаль усе пастаянныя камісіі і секцыі, таварыствы, якія ўваходзілі ў яго склад, былі зарыентаваны не толькі на непасрэдна навуковую працу згодна з профілем, але і на бібліяграфічную як неад’емную частку навуковых даследаванняў”[104].

Бібліяграфічная камісія Інбелкульта, ДБ БССР і грамадскія краязнаўчыя арганізацыі адной з галоўных задач лічылі

[103] *Покало, М.И.* История библиотечного дела в БССР / М.И.Покало. – Мн.: Вышэйш. шк., 1986. – С.79.

[104] *Кузьмініч, Т.В.* Бібліяграфічная праца навуковага таварыства па вывучэнні Беларусі ў кантэксце інфармацыйнай дзейнасці ў рэспубліцы (другая палова 20 – пачатак 30-х гг. XX ст.) / Т.В.Кузьмініч // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2006. – Вып. 8. – С.208.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфаванне краязнаўчай і беларусазнаўчай літаратуры[105].

У ДБ БССР стваралася Цэнтральная краязнаўчая картатэка, дзе адлюстроўваліся публікацыі, якія выйшлі ў Беларусі, і беларусазнаўчая літаратура. Навукоўцы Інбелкульта знаёміліся з падрыхтаванымі бібліяграфічнымі запісамі, дапамагалі ў рэдагаванні структуры картатэкі, якая будавалася паводле “Універсальнай дзесятковай класіфікацыі”. У 1926 г. у картатэцы было звыш 50 тысяч бібліяграфічных запісаў, а напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны – 200 тысяч. Копіі картачак з апісаннямі краязнаўчай літаратуры перадаваліся ў бібліятэкі. На аснове картатэкі Бібліяграфічнай камісіяй быў падрыхтаваны і апублікаваны ў часопісе “Наш край” у 1926 г. рэтраспектыўны паказальнік “Геаграфія Беларусі. Падарожжы”, які садзейнічаў краязнаўчым геаграфічным і іншым даследаванням.

Некалькі рэтраспектыўных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, прысвечаных Віцебшчыне, Магілёўшчыне, Аршаншчыне, Мазыршчыне і Полаччыне, былі апублікаваны ў часопісе “Наш край”, у мясцовых краязнаўчых зборніках. У пісьме ў ЦБК РСФСР ад 14.III.1928 г. паведамлялася і аб іншых бібліяграфічных праектах: падрыхтоўцы работнікамі ЦБК “бібліяграфіі беларускага краязнаўства”, бібліяграфаванні літаратуры ў Магілёўскім і Віцебскім акруговых таварыствах краязнаўства і інш.[106] Рэгіён Заходняй Беларусі таксама атрымаў адлюстраванне ў бягучых і рэтраспектыўных бібліяграфічных дапаможніках.

Бібліяграфічнае аснашчэнне шматлікіх краязнаўчых публікацый сведчыць аб вялікай увазе да падагульнення дакументаваных ведаў па тэматыцы ў тагачасным краязнаўстве, аб увядзенні ў навуковы зварот і ў сферу папулярызацыі краязнаўчых ведаў значнага патоку дакументаў. Падрадковыя бібліяграфічныя спасылкі, прыартыкульныя і прыкніжныя спісы літаратуры, агляды, цытаванне дапамагалі прасачыць сувязі новых ведаў са створанымі раней, паказвалі каштоў-

[105] *Лявончыкаў, В.Е* Беларуская бібліяграфія. Агульны курс: падручнік / В.Е.Лявончыкаў. – Мн.: Вышэйш. шк., 1991. – С.134–135.

[106] *Кузьмініч, Т.В.* Бібліяграфічная праца навуковага таварыства па вывучэнні Беларусі ў кантэксце інфармацыйнай дзейнасці ў рэспубліцы (другая палова 20 – пачатак 30-х гг. XX ст.) / Т.В.Кузьмініч // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2006. – Вып. 8. – С.211.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насць ці прагалы фактаграфічнай і метадалагічнай базы асобных элементаў дакументнага масіву, мадэлявалі сувязі паміж імі.

Грунтоўнасць падрыхтаваных бібліяграфічных дапаможнікаў, імкненне да вычарпальнай паўнаты адлюстравання матэрыялаў аб родным краі, актыўны ўдзел у іх падрыхтоўцы краязнаўцаў, вучоных і спецыялістаў характарызуюць навукова-дапаможную краязнаўчую бібліяграфічную прадукцыю.

## Глава 2. Краязнаўства ў Заходняй Беларусі (1921–1939)

### *2.1. Грамадскі краязнаўчы рух, дзяржаўнае і школьнае краязнаўства*

У Польшчы краязнаўчы рух стаў праявай сацыяльна-культурнай актыўнасці насельніцтва. Яшчэ да рашэнняў Рыжскага мірнага дагавора, падчас захопу беларускіх зямель польскімі войскамі, узнікалі ініцыятывы па арганізацыі краязнаўчай дзейнасці з боку польскай і беларускай інтэлігенцыі. Найперш імкнуліся ўзнавіць функцыянаванне Польскага краязнаўчага таварыства (ПКТ) як вядучай грамадскай арганізацыі, а таксама развіць рэгіёназнаўчыя даследаванні ў навуковых установах і новаадкрытым Віленскім універсітэце імя С. Баторыя. У красавіку 1920 г. адбыўся з’езд ПКТ, на якім прынялі новы ўстаў (папярэдні, 1907 г., не адпавядаў новым гістарычным умовам). Паміж абранымі членамі рады ПКТ размеркавалі абавязкі для фарміравання рэгіянальных аддзелаў, якія з’яўляліся асноўнай структурнай адзінкай гэтай грамадскай арганізацыі. На паўночна-ўсходніх землях стварэнне аддзелаў было даручана прафесару К.Славінскаму з Вільні. К.Славінскі, асвятляючы на з’ездзе справу па развіцці краязнаўчага руху ў Беларусі і Літве, адзначыў, што ўзнікаюць непераадольныя перашкоды з-за няпэўнасці палітычнай сітуацыі, недахопу ініцыятыўных людзей, вялікіх цяжкасцей у пашпартным рэжыме і ў сродках камунікацыі. Аддзелы Польскага краязнаўчага таварыства ўдалося адкрыць толькі ў Навагрудку і Вільні[107].

[107] У якасці галоўнага кірунку дзейнасці Віленскі аддзел вырашыў збіраць краязнаўчыя фатаграфіі Я.Булгака. Пад гэты праект яшчэ на з’ездзе ПКТ Віленскаму аддзелу была выдзелена чацвёртая частка фінансавых сродкаў арганізацыі. Фотамастак-краязнавец Я.Булгак перадаў аддзелу адбіткі з 6000 здымкаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заключэнне Рыжскага мірнага дагавора (1921) замацавала за Польшчай вялікія беларускія тэрыторыі. Паводле праведзенага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу заходнебеларускія землі ўваходзілі ў склад Беластоцкага, Віленскага, Навагрудскага[108] і Палескага (цэнтр ваяводства – Брэст над Бугам) ваяводстваў. Плошча Заходняй Беларусі ахоплівала 113 тыс. км, ці 29% тэрыторыі Польшчы. У 1921 г. тут пражывалі 3 372 134 чалавекі, што складала 12,5% насельніцтва Польшчы. Беларусаў з іх было 70,5%.

Польская дзяржава аднаўлялася ў атмасферы высокага патрыятызму. Да фактараў паспяховага развіцця адносілі інфармацыйнае забеспячэнне і краязнаўчы рух. Краязнаўству адводзілася важная роля ў грамадзянскім і патрыятычным выхаванні, адукацыі, у культурным і гаспадарчым развіцці рэгіёнаў. На старонках часопіса Польскага краязнаўчага таварыства "Зямля", які ўзнавіўся ў 1919 г., краязнаўства называлі фундаментам нацыянальнай свядомасці[109].

Каб заахвоціць краязнаўствам студэнцкую моладзь, упраўленне студэнцкага кола ПКТ абʼявіла конкурс на лепшую лекцыю па краязнаўстве, якая магла быць прысвечана апісанню пэўнага раёна, а таксама горада, мястэчка, вёскі, ці праект краязнаўчай экскурсіі.

Грамадскі, дзяржаўны і школьны краязнаўчы рух хутка пашыраўся. Усё гэта адбывалася і ў заходнебеларускіх землях.

Нацыянальнае жыццё этнічных меншасцей у Польшчы было клопатам Міністэрства народнай асветы і рэлігійных веравызнанняў і рэгулявалася пэўнымі прававымі нормамі. Польшча, імкнучыся ўключыцца ў еўрапейскі дом, дэкларавала правы нацыянальных меншасцяў, замацаваныя ў Версальскім трактаце і ў Рыжскім мірным дагаворы. Але ўнутрыпалітычны курс польскага ўрада быў непрыхільным для беларусаў. Зыходзячы з пазіцыі, што Заходняя Беларусь – гэта гістарычна польскія землі, улады адкрыта ажыццяўлялі паланізацыю розных грамадскіх сфер, укаранялі ў свядомасць беларускага насельніцтва ідэі польскай дзяржаўнасці.

Беларускі рух, што з'яўляўся складаным спалучэннем культурных, ідэалагічных, палітычных пазіцый і мэт, які бесперапынна выкарыстоўваўся ў ідэалагічным і палітычным супрацьстаянні паміж СССР і БССР, з аднаго боку, і Польш-

[108] Створана для ўзвышэння радзімы А.Міцкевіча, імя і творчасць якога ў Польшчы набылі значэнне сімвалаў барацьбы за незалежнасць.
[109] Ziemia. – 1922. – № 1. – S. 1.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чай, з другога, зазнаваў большы палітычны ўціск з боку польскіх улад у параўнанні з другімі этнічнымі плынямі. Кіраўніцтва Польшчы імкнулася заканадаўчымі мерамі абмежаваць магчымасць удзелу беларусаў у нацыянальным жыцці. Напрыклад, калі ў 1936 г. беларусы правялі, як і да рэвалюцыі, у Вільні – галоўным цэнтры беларускага грамадскага і культурнага жыцця – урачыстае і прыгожае свята "Дзень беларускай культуры", то ў 1937 г. яно было не дазволена. Дзеячы нацыянальнага руху былі перакананы, што "беларускае літаратурнае і навуковае жыццё ў Заходняй Беларусі з'яўляецца вельмі занядбаным"[110]. Такія ж негатыўныя з'явы адбываліся і ў краязнаўстве, дзе на заканадаўчым узроўні ўлады стымулявалі аматараў краязнаўства да ўдзелу ў масавых дзяржаўных краязнаўчых установах[111], што перашкаджала функцыянаванню нешматлікіх беларускіх краязнаўчых арганізацый.

Насуперак усім цяжкасцям свядомая беларуская грамадскасць імкнулася павышаць узровень нацыянальнага жыцця, выкарыстоўваючы розныя арганізацыйныя формы: стварэнне нацыянальнай школы (Таварыства беларускай школы), грамадскіх, навуковых і асветніцкіх арганізацый, палітычных партый, развіццё кнігадрукавання і перыядычнага друку на беларускай мове, удзел у сейме. Так, напрыклад, старшыня Беларускага пасольскага клуба Б.Тарашкевіч ад імя беларускіх дэпутатаў у 1923 г. выказаў на сейме пратэст супраць дзяржаўнага курса Польшчы ў заходнебеларускім краі і дакладна сфармуляваў патрабаванні адносна абароны нацыянальных, эканамічных, культурных і іншых правоў беларускай супольнасці: адбудаваць зруйнаваныя вайною гарады і мястэчкі, безадкладна выдаць законы, якія забяспечвалі б беларусам культурнае і асветнае развіццё, дапусціць беларускую мову ў адміністрацыю і суд.

У пачатку 20-х гг. на тэрыторыі заходнебеларускіх ваяводстваў па ініцыятыве мясцовай інтэлігенцыі пачалі ўтварацца краязнаўчыя арганізацыі, сярод іх буйнейшымі былі Віленскае таварыства прыяцеляў навук, Беларускае навуковае таварыства і Палескае краязнаўчае таварыства, якія

[110] Калосьсе. – 1935. – № 1. – С. 1–2.

[111] У законах "Права аб таварыствах", "Аб студэнцкіх таварыствах", "Аб апецы над грамадскімі музеямі" і іншых абмяжоўваліся магчымасці ўдзелу ў грамадскіх нацыянальных арганізацыях.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не з’яўляліся структурнымі адзінкамі ПКТ. Гэтыя арганізацыі падтрымалі ідэю рэгіяналізму, якая зарадзілася ў асяроддзі віленскіх вучоных і інтэлігенцыі і абазначала канцэнтрацыю навуковых і творчых сіл для вывучэння мінулага і сучаснасці былых зямель ВКЛ, што ўвайшлі ў склад Польшчы. Ідэя рэгіяналізму даследчай, культурнай і інфармацыйнай дзейнасці ў 20-х гг. актыўна папулярызавалася, але прыхільнікаў у іншых частках Польшчы фактычна не атрымала. Заходнебеларускія землі, ці так званы Віленскі рэгіён, павінны былі вывучацца мясцовымі даследчыкамі (выкладчыкамі Віленскага універсітэта імя С.Баторыя і інш.), а таксама вучонымі, інтарэсы якіх былі звязаны з ім. Увага засяроджвалася на даследаванні этнічных субкультур, асаблівасцей этнаграфічных рыс рэгіёну. Прастора сучасных грамадска-палітычных праблем, у прыватнасці, аўтаноміі Заходняй Беларусі, не закранaлася.

Асаблівае значэнне мела дзейнасць Палескага краязнаўчага таварыства ў Пінску (1924–1927). У складзе гэтай арганізацыі працавалі вядомыя краязнаўцы П.Алевінскі, Д.Георгіеўскі, С.Тамашэвіч, Р.Гарашкевіч. Гэта таварыства ініцыявала стварэнне Палескага музея, які адкрыўся ў 1926 г. і працуе ў наш час як музей Беларускага Палесся. Мэтай музея было захаванне і папулярызацыя прыроды, археалагічных, этнаграфічных здабыткаў, вырабаў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, помнікаў, а таксама гістарычнага шляху гэтага унікальнага рэгіёну. Зборы музея ў значнай ступені фарміраваліся дзякуючы прыватным ахвяраванням мясцовых краязнаўцаў, матэрыялаў экскурсій. Падтрымку ў арганізацыі музея аказалі і мясцовыя ўлады. У 1927 г. пад уплывам часткі сяброў Палескае краязнаўчае таварыства было пераўтворана ў рэгіянальны Пінскі аддзел ПКТ.

Польскае краязнаўчае таварыства хутка ўзмацнялася і прымала актыўныя меры для стварэння аддзелаў – асноўных рэгіянальных структур ПКТ, у тым ліку на тэрыторыі заходнебеларускіх ваяводстваў. Аддзелы ўзнікалі пры наяўнасці 20 аматараў краязнаўства. Калі ў 1922 г. з 30 аддзелаў на беларускіх землях называецца толькі Навагрудскі, то ў канцы 30-х гг. іх колькасць павялічылася да 15[112]. Структура ПКТ ускладнілася: на рэгіянальным

[112] Ziemia. – 1939. – № 5-6. – S. 197.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узроўні складваліся краязнаўчыя гурткі і дэлегатуры. Краязнаўчыя гурткі ўваходзілі ў гарадскія аддзелы – арганізацыі, створаныя для краязнаўцаў з ваколіц. Гурткі займаліся пераважна папулярызацыяй краязнаўчых ведаў сярод мясцовага насельніцтва. Рэгіянальныя аддзелы стваралі і каардынавалі дзейнасць мясцовых дэлегатур. Калі дэлегатура значна вырастала па колькасці сяброў і вяла актыўную краязнаўчую работу, то статут ПКТ дазваляў пераўтварыць яе ў асобны аддзел і вызначыць тэрыторыю дзейнасці. Дэлегатуры функцыянавалі ў Давыд-Гарадоцкім, Лідскім і Пінскім аддзелах ПКТ[113]. Ваяводскія аддзяленні ПКТ утваралі акругі. Галоўнае праўленне ПКТ у Варшаве непасрэдна кіравала ўсімі рэгіянальнымі падраздзяленнямі. Але ў 1936 г. перайшлі на вертыкальны прынцып пабудовы таварыства. Гэта значыла, што галоўнаму праўленню былі падначалены ўсе ваяводскія аддзяленні ПКТ (акругі); яны, у сваю чаргу, кіравалі рэгіянальнымі аддзеламі на тэрыторыі ваяводства. Такім чынам, рэформа дазваляла цэнтральнаму кіраўніцтву больш якасна ўплываць на дзейнасць краязнаўчых арганізацый.

Асноўнымі кірункамі дзейнасці рэгіянальных суполак ПКТ былі: лекцыйная работа, правядзенне курсаў па краязнаўстве і фотамастацтве, арганізацыя турыстычна-краязнаўчага руху, краязнаўчых выстаў, музеяў, бібліятэк, стварэнне фота- і кінадакументаў у галіне краязнаўства, выданне краязнаўчых часопісаў, даведнікаў і іншай краязнаўчай літаратуры.

У розных формах краязнаўчага руху прымалі ўдзел мясцовыя чыноўнікі, настаўнікі і вучні гімназій, святары, бібліятэкары, медыкі, пісьменнікі, журналісты і інш. Найбольш актыўна працавалі краязнаўчыя аддзелы ў Баранавічах, Брэсце, Ваўкавыску, Глыбокім, Гродна, Давыд-Гарадку, Лідзе, Пінску. У Ваўкавыску краязнаўчае таварыства мела багатыя зборы старажытных дакументаў, каля 3000 музейных экспанатаў. Павет і горад Ваўкавыск звярнуліся да магістра С.Кракоўскага з Віленскага універсітэта за дапамогай у вывучэнні 200 *кг* гістарычных дакументаў. Некаторыя дакументы траплялі ў таварыства цікавымі шляхамі. Так, пры рамонце страхі дома жыхара Каласоўскага ў 1938 г. была знойдзена “Konfrimacje” 1773 г. праў і прывілеяў для горада караля Станіслава Аўгуста, з якой вынікала, што Ваўкавыск

[113] Там жа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

атрымаў магдэбургскае права ад Аляксандра Ягелончыка. Гэты дакумент таварыства набыло за 150 злотых.

ПКТ надавала вялікую ўвагу пашырэнню выдавецкай дзейнасці. Яго рэгіянальныя структуры наладзілі выпуск краязнаўчых часопісаў “Зямля” (“Ziemia Lidzka”, “Ziemia Pińska” і іншых) і кніг. Гісторыка-краязнаўчы часопіс “Лідская зямля”, які ў 1936–1939 гг. выходзіў пад рэдакцыяй таленавітага краязнаўца У.Абрамовіча, дасягнуў узроўню лепшых краязнаўчых перыядычных выданняў у Польшчы. Краязнавец і вучоны М.Ліманоўскі адзначаў, што часопіс “зрушвае магільную пліту бяспамяцтва” з лідскай зямлі і “прадстаўляе на дзённы свет яе багацці”[114]. Выдаваліся мясцовыя газеты, на старонках якіх адлюстроўваліся бягучыя падзеі, друкаваліся і гісторыка-краязнаўчыя матэрыялы. Але перыядычныя выданні нярэдка выходзілі на працягу кароткага тэрміну, што тлумачылася недахопам сродкаў і ініцыятыўнасці выдаўцоў.

Яркай рысай грамадскага краязнаўства было развіццё фотадакументавання. Працягвалася творчасць “бацькі краязнаўчай фатаграфіі” Я.Булгака. Ён стварыў самабытныя партрэты, пейзажы, відавыя фатаграфіі, адлюстраваў непаўторныя фрагменты мінулага многіх беларускіх мясцін. Займаўся таксама даследаваннямі і папулярызацыяй фотамастацтва і выкладаў яго ў Віленскім універсітэце.

Стымулявалі падрыхтоўку краязнаўчых кніг конкурсы на лепшае выданне. Некаторыя з тагачасных выданняў, аўтары якіх выкарысталі шырокае кола крыніц, надоўга захавалі значэнне для гісторыка-краязнаўчых даследаванняў. Так, унікальныя і цікавыя факты паўстаюць са старонак кніг вядомых краязнаўцаў Р.Гарашкевіча ”Powiat Stoliński” (1929), А.Снежкі “Kościol farny w Mirze: szkic monograficzny. 1587–1937” (1937), У.Абрамовіча “Strone nowogródskie: szkice krajoznawcze” (1938) і інш.

Сярод культавых краязнаўчых мясцін асаблівае значэнне набыла Навагрудчына – малая радзіма Адама Міцкевіча, куды накіроўваліся аматары краязнаўства, навучэнцы не толькі з заходнебеларускіх зямель, а з усіх куткоў Польшчы. Калі восенню 1938 г. на Навагрудчыне праходзілі “Міцкевічаўскія

[114] Ziemia Lidzka. – 1939. – № 1. – S.37 – 38.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дні”, то для праезду турыстаў быў паніжаны кошт білетаў на чыгунцы.

Але ўсё ж такі ў дзейнасці структур ПКТ у Заходняй Беларусі адзначаецца няўстойлівасць. Праца шэрага іх прыпынялася ў выніку ад’езду заснавальнікаў, з-за недахопу краязнаўцаў-арганізатараў з ліку мясцовага насельніцтва. Блізкасць мэт і зместу дзейнасці ПКТ і Польскага турыстычнага таварыства прывяла да іх аб’яднання ў 1938 г.

Сярод іншых арганізацый вялікае значэнне ў навуковым даследаванні беларускіх зямель мела дзейнасць Таварыства сяброў навук пры Віленскім універсітэце імя С.Баторыя. Гэта была арганізацыя з вялікім навуковым патэнцыялам. У 1923 г. у таварыстве былі 640 членаў, багатая бібліятэка і музей. Трэці аддзел таварыства аб’ядноўваў даследчыкаў мінулага ВКЛ, філасофіі і права. Яго членамі былі вядомыя гісторыкі М.Бранштэйн, С.Зайянчкоўскі, А.Прахазка, Я.Якубоўскі, Я.Івашкевіч, Ф.Канечны і інш. Члены таварыства вывучалі пераважна перыяд XIV–XIX стст., ахопліваючы мноства пытанняў мінулага паўночна-заходніх зямель Беларусі. Адной з лепшых формаў краязнаўчай дзейнасці трэцяга аддзела таварыства было правядзенне конкурсаў на лепшую манаграфію на польскай мове аб мінулым ваяводства, павета, горада, мястэчка на тэрыторыі былога ВКЛ. Для мястэчка мінулае павінна было адлюстроўвацца ад часу першых звестак да сённяшніх дзён, для іншых тэрыторый дапускаліся храналагічныя абмежаванні. Таварыства выпускала навуковы часопіс “Ateneum Wileński”. Удзельнікі таварыства, вучоныя універсітэта выпусцілі значную колькасць манаграфій, прысвечаных даследаванню мінулага беларускіх тэрыторый ВКЛ. Напісаныя з пазіцый польскай ідэалогіі, гэтыя працы змяшчаюць багаты фактычны матэрыял, шматлікія бібліяграфічныя спасылкі, у тым ліку на рэдкія, унікальныя дакументы, якія цікавяць і ў наш час краязнаўцаў-даследчыкаў і бібліятэкараў-бібліёграфаў.

Адным з напрамкаў дзейнасці грамадскіх краязнаўчых арганізацый і іншых удзельнікаў краязнаўчага руху было адкрыццё музеяў. Сярод іх стваральнікаў вылучаецца яркая асоба Іосіфа Іосіфавіча Стаброўскага (1869–1968). Ураджэнец г.Слоніма, выпускнік Полацкага кадэцкага корпуса, ён атрымаў адукацыю археолага і ваеннага. Палкоўнік Стаброў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скі ўдзельнічаў у Першай сусветнай вайне. Вярнуўшыся ў родны горад у 1921 г., пачаў збіраць матэрыялы пра мінулае краю. Вялікая гісторыка-археалагічная калекцыя стала асновай створанага ім краязнаўчага музея.

Буйнейшымі ў Заходняй Беларусі былі Палескі музей і музей, створаны Ю.Ядкоўскім у Гродне. Вучоны-археолаг Ю.Ядкоўскі (1890–1950) з дзіцячых гадоў марыў аб збіранні старадаўніх рэчаў і настойліва ажыццяўляў свае планы. Жыхары горада ведалі, што старажытныя кнігі і рэчы варта паказаць доктару Ядкоўскаму. На падставе яго прыватных збораў у Гродне быў адкрыты Дзяржаўны музей (1922), а Ю.Ядкоўскі прызначаны на пасаду яго дырэктара. У музеі, які размясціўся ў старым каралеўскім замку, былі аддзелы археалогіі, культава-сакральных помнікаў, народнага мастацтва, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, зброі і інш. Яны змяшчалі экспанаты па васьмі навакольных беларускіх паветах. Пры музеі працавалі інвентарызацыйна-рэстаўрацыйная і фатаграфічная майстэрні, бібліятэка і архіў. Як археолаг і фатограф Ю.Ядкоўскі папаўняў музей матэрыяламі ўласных раскопак і фотадакументамі. З фотаапаратам ён аб’ехаў мястэчкі і ўсе цікавыя мясціны краю. Напрыклад, у Песках сфатаграфаваў дзіўную па прыгажосці сінагогу, у Поразаве – печ па абпаленні чорназадымленай керамікі. Пастаянна звяртаўся да настаўнікаў, дырэктараў школ з просьбамі паведамляць аб усіх цікавых знаходках, дакументах, помніках і аб народных майстрах. Музей, створаны Ю.Ядкоўскім, і сёння вядзе вялікую навукова-даследчую і папулярызатарскую дзейнасць па вывучэнні Гродзеншчыны.

Мэтай школьнага краязнаўчага руху было патрыятычнае выхаванне навучэнскай моладзі, што разумелася як выхаванне польскага рэгіянальнага патрыятызму. У школьных установах выкладаліся рэгіёназнаўчыя вучэбныя дысцыпліны, на якіх вучні знаёміліся з гістарычным мінулым і прыродай ваяводства, працавалі краязнаўчыя гурткі. Асаблівы акцэнт пры вывучэнні мінулага рабіўся на разглядзе ўдзелу мясцовага насельніцтва ў паўстаннях 1794, 1830–1831, 1863–1864 гг. Кіравалі гурткамі ў польскіх гімназіях і пачатковых школах настаўнікі ці сябры рэгіянальных аддзелаў ПКТ. Актыўную работу праводзілі навучэнцы Пінска, Брэста, Ліды, Глыбокага і іншых гарадоў і мястэчак. Яны збіралі звесткі аб падзеях

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паўстання 1863 г., этнаграфічны матэрыял, вывучалі гісторыка-культурныя помнікі, запаведныя мясціны свайго краю, распрацоўвалі турыстычныя маршруты. Так, вучні Пінскай дзяржаўнай гімназіі імя Ю.Пілсудскага выпускалі краязнаўчыя працы, напрыклад, "Чар Палесся чар" (1936), "Некалькі слоў аб Пінску і святы, абрады і павер'і палескага люду" (1936) і інш.

Навукова-метадычнае забеспячэнне школьнага краязнаўчага руху здзяйсняла рэгіянальна-краязнаўчая секцыя Саюза польскіх настаўнікаў.

У Віленскім універсітэце краязнаўчай дзейнасцю займаліся Беларускі студэнцкі саюз, Таварыства прыяцеляў беларусаведаў Віленскага універсітэта. Мэта таварыстваў – згуртаваць студэнцкую моладзь для навуковай працы ва ўсіх галінах беларусазнаўства. Дзейнічалі філалагічная, этнаграфічная, гістарычна-эканамічная і літаратурная секцыі[115]. Студэнты разгарнулі шырокую культурна-асветніцкую работу, накіраваную супраць паланізацыі іх радзімы.

З ліку настаўнікаў выйшлі вядомыя краязнаўцы-даследчыкі. Браслаўскаму настаўніку Ота Гедэману (1887–1937) належыць важная крыніцазнаўчая праца "Гісторыя Браслаўскага павета" (1929).

### *2.2. Краязнаўчая дзейнасць беларускіх нацыянальна-культурных і навуковых арганізацый*

Свядомая беларуская інтэлігенцыя і студэнты стварылі шэраг грамадскіх арганізацый, распачаўшых краязнаўчую дзейнасць. Сярод іх адметную ролю выконвалі Беларускае навуковае таварыства і знакаміты Беларускі музей імя І.Луцкевіча, Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры.

Браты Іван і Антон Луцкевічы належаць да выдатных дзеячаў беларускага грамадска-палітычнага і культурнага руху. Справай жыцця І.Луцкевіча было стварэнне музея, экспанаты якога паказвалі б багацце беларускай гісторыі і культуры. Апантаны збіральнік і дыпламаваны археолаг І.Луцкевіч правёў шэраг раскопак, этнаграфічных вандровак. Ён марыў прыцягнуць да даследчыцка-збіральніцкай працы многіх людзей, ад простых сялян да замежных навукоўцаў. Для рэалізацыі сваёй задумы І.Луцкевіч (ужо цяжка хворы на су-

[115] Калосьсе. – 1935. – № 1. – С.71.

хоты) у студзені 1918 г. ініцыяваў стварэнне Беларускага навуковага таварыства. Мэтай існавання таварыства па статуце з’яўлялася “markdown рознабаковая навуковая праца, развіццё любові да навуковых доследаў і пашырэнне ведаў”. Таварыству І.Луцкевіч перадаў архіў, бібліятэку, калекцыю старажытнасцей. Праз два гады пасля яго смерці быў адкрыты Беларускі музей імя І.Луцкевіча (1921–1944), які ўзначаліў Антон Луцкевіч. Акрамя дырэктара пастаянна працаваў у музеі бібліятэкар У.Самойла. Калегіяльнае кіраўніцтва здзяйсняла рада. Музей размяшчаўся ў так званых Базыльянскіх мурах (былым кляштары базыльян) у Вільні. Беларускі музей уваходзіў як паўнамоцны сябра ў склад Саюза музеяў Польшчы. Матэрыяльную і іншую дапамогу музею аказвалі актыўныя дзеячы беларускага нацыянальнага руху Ф.Аляхновіч, В. і Я.Багдановічы, Э.Будзька, В. і Ф.Грышкевічы, В.Іваноўскі, П.Сергіевіч, А., Я. і С.Станкевічы, Р.Шырма і інш. Сабраныя ў музеі скарбы павінны былі служыць захаванню гістарычнай спадчыны беларускага народа і абуджэнню яго нацыянальнай свядомасці. Багатымі былі археалагічная, нумізматычная, сфрагістычная, этнаграфічная, мастацкая, прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і іншыя калекцыі музея. Тут былі рэчы, знойдзеныя падчас раскопак у Ашмянскім, Барысаўскім, Гомельскім, Лідскім, Мінскім, Навагрудскім, Пастаўскім і іншых паветах. Шмат прадметаў паходзілі з археалагічных раскопак Я.Тышкевіча і І.Луцкевіча. Сфрагістычная калекцыя налічвала 103 пячаткі, у тым ліку пячаткі на сігнетах полацкіх князёў Усяслава і Барыса, пячатка Міндоўга. Калекцыя твораў мастацтва ўключала вялікую колькасць старадаўніх абразоў, уключаючы абразы мясцовага пісьма. “Сапраўдным скарбам” музея А.Луцкевіч назваў калекцыю твораў беларускай народнай разьбы з Віленшчыны і Навагрудчыны. Этнаграфічныя зборы ўключалі тканіны хатняга вырабу, народнае адзенне, славутыя слуцкія паясы. Сучаснае мастацтва было прадстаўлена творамі П.Сергіевіча, Я.Драздовіча і інш.

Новыя набыткі складалі нязначную долю ў параўнанні са зборамі І.Луцкевіча. Напрыклад, у 1926 г. па просьбе А.Луцкевіча Язэп Драздовіч вандраваў па Пінскім Палессі – краі, дзе захоўваліся глыбінныя народныя традыцыі. Музею мастак перадаў альбомы этнаграфічных замалёвак (народных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

строяў, прадметаў ужытку і інш.). Супрацоўнікі музея пераважна займаліся ўпарадкаваннем і каталагізацыяй фондаў, стварэннем экспазіцый, правядзеннем экскурсій. Музей наведвалі не толькі жыхары паўночна-заходніх ваяводстваў, але і беларусы, якія пражывалі ў розных краінах свету. У 1931–1932 гг. музей наведалі звыш 500 чалавек. Дзейнасць музея спынілася з устанаўленнем савецкай улады ў 1939 г., калі было закрыта Беларускае навуковае таварыства, арыштаваны А.Луцкевіч і іншыя сябры таварыства. Падчас нямецкай акупацыі ўдалося захаваць скарбы музея, але ў 1945 г. ён быў закрыты, а яго зборы рассеяны. Найбольш каштоўныя матэрыялы засталіся ў Літве, а ў Беларусь трапіла частка рукапісаў. Гэтыя дакументы захоўваюцца цяпер у Цэнтральным дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва Беларусі.

Мэтамі Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (БІГК, 1926–1937), створанага па ініцыятыве беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў пад кіраўніцтвам В.Гадлеўскага, былі навукова-даследчая і асветніцкая дзейнасць, якая ў значнай ступені вялася на аснове краязнаўчага падыходу. Так, у секцыях эканомікі і статыстыкі, этнаграфіі і археалогіі і іншых інстытута даследаваліся матэрыялы, звязаныя з пэўнымі беларускімі мясцовасцямі. БІГК стварыў дзесяткі гурткоў на тэрыторыі заходнебеларускіх паветаў, функцыянаванне якіх залежала ад актыўнасці мясцовага насельніцтва. У 1935 г. было больш за 20 гурткоў. На вечарынах, лекцыях і тэатральных прадстаўленнях, якія ладзіліся членамі рэгіянальных суполак БІГК, таксама адлюстроўвалася краязнаўчая тэматыка. БІГК выпускаў часопіс “Калосьсе”. Таварыства БІГК было закрыта віленскім ваяводам у студзені 1937 г.

Тагачасныя матэрыялы аб жыцці заходнебеларускіх рэгіёнаў, аб адметных людзях і гістарычныя тэмы асвятляліся на створаных дзеячамі беларускага руху старонках часопісаў “Калосьсе”, “Шлях моладзі”, “Беларускі летапіс”, “Беларуская борць” і інш. Напрыклад, у “Калосьсі” была апублікавана праца М.Пяцюкевіча, прысвечаная М.Нікіфароўскаму[116].

[116] *Пяцюкевіч, М.* Мікола Нікіфароўскі – беларускі этнограф / М.Пяцюкевіч // Калосьсе. – 1935. – № 4. – С. 217–225.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *2.3. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства*

У развіццё краязнаўчай работы значны ўклад унеслі бібліятэкі. У 20–30-я гг. у Польшчы існавала вялікая колькасць бібліятэк розных тыпаў, але ў Заходняй Беларусі менш, чым на іншых тэрыторыях, было адкрыта навуковых і школьных бібліятэк. Матэрыялы міжваеннага польскага бібліятэчнага друку сведчаць, што ў бібліятэках на беларускіх землях пераважалі фонды польскамоўных дакументаў. Так, у 1931 г. толькі ў 46 школьных бібліятэках (ці 0,5% ад іх агульнай колькасці) была прадстаўлена літаратура на беларускай мове. Яна займала 0,1 % агульнай колькасці тамоў у школьных бібліятэках. Параўнанне гэтай лічбы з працэнтным складам насельніцтва, для якога беларуская мова была роднай (а гэта 3,1% насельніцтва), паказвае значны недахоп літаратуры на беларускай мове ў бібліятэчных фондах. Пад уплывам асаблівасцей нацыянальна-культурнай палітыкі ўрада польская мова актыўна пашыралася і заняла вядучае месца ў падрыхтоўцы краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі бібліятэк.

Многія бібліятэкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі разгарнулі краязнаўчую дзейнасць: фарміравалі фонды краязнаўчай літаратуры, рознымі сродкамі папулярызавалі яе сярод чытачоў, выкарыстоўвалі бібліяграфічныя метады і формы. Так, у гарадской бібліятэцы г. Ліды, адной з лепшых у Заходняй Беларусі, быў створаны фонд краязнаўчай літаратуры, які актыўна выкарыстоўваўся. Гэта літаратура была адлюстравана ў каталогу[117]. Захаваліся звесткі аб краязнаўчай рабоце школьных, царкоўных (касцёльных) і навуковых бібліятэк.

У некаторых аддзелах ПКТ таксама фарміраваліся краязнаўчыя бібліятэкі і фонды фотадакументаў. Буйнейшыя былі ў Пінскім, Ваўкавыскім, Глыбоцкім і Лідскім аддзелах[118].

Сярод бібліятэк беларускіх нацыянальных арганізацый буйнейшай была бібліятэка Беларускага музея імя І.Луцкевіча. У ёй захоўвалася 14 000 тамоў, у тым ліку краязнаўчага зместу. У бібліятэцы працавала шмат студэнцкай моладзі і вучоных з Францыі, Германіі, Нарвегіі, Паўночнай Амерыкі і іншых краін, занятых беларусазнаўчымі і краязнаўчымі даследаваннямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[117] *Саітава, В.І.* Краязнаўчая работа ў Лідзе / В.І.Саітава // Бібліятэчны свет. – 1999. – № 3. – С.22–23.

[118] Ziemia. – 1939. – № 5-6. – S. 197.

Багатыя фонды літаратуры аб беларускіх землях меліся ў Публічнай бібліятэцы Віленскага універсітэта і ў Публічнай бібліятэцы імя Яўстахія і Эміліі Урублеўскіх (Вільня), арганізаванай на аснове прыватнай бібліятэкі знакамітага юрыста, віднага беларускага дзеяча Тадэвуша Урублеўскага (1858–1925), пляменніка Валерыя Урублеўскага.

Публічная бібліятэка універсітэта вяла рэгістрацыю новых твораў друку, якія выходзілі ў заходнебеларускім краі, так званым "Віленскім бібліяграфічным рэгіёне", каталагізавала іх, адлюстроўвала ў бягучых бібліяграфічных дапаможніках. З канца 1927 г. да 1931 г. у бібліятэцы ствараўся каталог друкаў, якія выйшлі ў Беластоцкім, Навагрудскім, Палескім і Віленскім ваяводствах.

У бібліятэцы імя Урублеўскіх асноўнымі раздзеламі фонду былі раздзелы аб горадзе Вільні ("Вільніяна"), аб мінулым і сучаснасці былых зямель Вялікага княства Літоўскага ("Літуанікі"[119]). Большасць фонду гэтых раздзелаў склалі кнігі і іншыя дакументы ад пачатку XIX ст. да паўстання 1863 г., якія паходзілі з архіва віленскай друкарні Завадскіх, кнігазбораў Г.Плятара, Г.Татура, В.Федаровіча і інш. Сам Т.Урублеўскі меў славу "самага працавітага і найсумленнейшага бібліятэкара, уражваў эрудыцыяй і памяццю бібліёграфа"[120]. Пасля смерці заснавальніка гэта бібліятэка стала дзяржаўнай публічнай. Урад абавязаўся захоўваць цэласнасць яе фондаў і знаходжанне іх толькі на тэрыторыі Вільні. Паводле статута 1937 г. была пашырана тэрыторыя, з якога бібліятэка мела права збіраць друкі, рукапісы, карты, гравюры, музейныя і архіўныя матэрыялы, у тым ліку з шэрага еўрапейскіх краін. З розных куткоў Беларусі ехалі працаваць у бібліятэку аматары старажытнасцей, краязнаўцы. У ліку яе каталогаў быў каталог мясцовых выданняў.

Важнейшым краязнаўчым праектам дзвюх публічных бібліятэк стала бібліяграфічная рэгістрацыя новых выданняў усяго заходнебеларускага рэгіёну і літаратуры, прысвечанай яму. Праект быў абгрунтаваны дырэктарам Публічнай бібліятэкі Віленскага універсітэта А.Лысакоўскім і біблія-

[119] У пачатку 1925 г. налічвалася 80 534 тамоў твораў друку, звыш 28 000 рукапісаў, пісьмаў, старажытных актаў і мноства іншых дакументаў.

[120] Ś.p. Tadeusz Wróblewski, jako założyciel Biblijoteki im. E. i E. Wróblewskich // Ateneum Wileński. – 1925 – 1926. – T.3. – S. 436–444.

тэкарам Публічнай бібліятэкі імя Яўстахія і Эміліі Урублеўскіх С.Бурхартам. А.Лысакоўскі лічыў неабходным стварыць орган бягучага бібліяграфічнага ўліку новых выданняў на тэрыторыі “ўсходніх ускраін” Польшчы і актыўна даводзіў рэгіянальны прынцып арганізацыі бібліяграфіі да бібліятэчнай грамадскасці і ўлад[121]. Таму спісы новых выданняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, падрыхтаваныя Публічнай бібліятэкай Віленскага універсітэта, пачалі штодзённа друкаваць у “Дзённіку Віленьскім” і нават чытаць на радыё. У 1922 г. на падставе бібліяграфічнай рэгістрацыі бібліятэка прыступіла да выпуску паказальнікаў “Віленская рэгіянальная бібліяграфія ў…годзе” і пазней “Перыядычныя выданні Віленскага бібліяграфічнага рэгіёну”. Складальнікам паказальнікаў быў супрацоўнік бібліятэкі, бібліёграф і даследчык гісторыі ВКЛ Міхал Амброс.

Бібліяграфічная рэгістрацыя выданняў у межах гістарычных рэгіёнаў Польшчы ў сярэдзіне 20-х гг. была прыхільна ацэнена ўладамі, што знайшло адлюстраванне ў афіцыйных дакументах. Рэгіянальная арганізацыя бібліяграфіі была замацавана ў дэкрэце прэзідэнта ад 10 мая 1927 г. як галоўны прынцып пабудовы бібліяграфіі ў краіне. На тэрыторыі Заходняй Беларусі быў вызначаны Віленскі бібліяграфічны рэгіён на чале з Публічнай бібліятэкай універсітэта.

У паказальніку “Віленская рэгіянальная бібліяграфія ў… годзе” адлюстроўваліся ўсе выданні, выдадзеныя на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель, а таксама творы, прысвечаныя рэгіёну, незалежна ад месца публікацыі. Паказальнік “Перыядычныя выданні Віленскага бібліяграфічнага рэгіёну” адлюстроўваў перыёдыку рэгіёну за год, гэта значыць быў паказальнікам мясцовага друку. Матэрыял аб газетах, часопісах і іншых перыядычных выданнях размяркоўваўся па раздзелах у алфавіце месцаў выхаду, унутры – па перыядычнасці. Такая методыка была зручнай для выяўлення перыядычных выданняў, што публікаваліся ў беларускіх гарадах, для ўдакладнення тыпаў і зместу выданняў. Так, з паказальніка за 1929 г. можна даведацца, што ў Баранавічах і

[121] Тэрмін “заходнебеларускі” ён не выкарыстоўваў. Ужываліся паняцці “Віленскі раён”, “4 ваяводствы паўночна-заходнія”, “крэсы всходне”.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кобрыне выходзілі па два перыядычныя выданні, у Пінску – 5, Гродне – 12, Брэсце – 16 і г.д.[122]

З гэтых бібліяграфічных крыніц, напрыклад, відаць, што ў першай палове 1930 г. на беларускай мове выйшла 25 выданняў, што складала 1% ад агульнай колькасці выданняў, у 1931 г. – 40 выданняў (2,8%) і з'яўлялася трэцім паказчыкам пасля выданняў на польскай і яўрэйскай мовах. Беларускамоўныя выданні, як правіла, выходзілі ў Вільні. У выдавецкай прадукцыі пераважалі малааб'ёмныя матэрыялы (да чатырох старонак) і брашуры. Кнігі, напрыклад, у 1931 г. склалі толькі 15, 1%.

Значная колькасць друкаў мела краязнаўчы характар. Напрыклад, сярод шасці перыядычных выданняў, што выпускаліся ў Глыбокім, зафіксаваны краязнаўча-паляўнічалітаратурны месячнік "Ziemia Dziśnieńska", які выпускаўся членамі краязнаўчага гуртка гарадской гімназіі імя Люблінскай уніі пад рэдакцыяй Я.Драздовіча.

Праявай паланізатарскага падыходу ў рэгіянальных бібліяграфічных паказальніках было прадстаўленне шматмоўнага заходнебеларускага друку бібліяграфічнымі апісаннямі ў лацінскай транскрыпцыі.

У 1930 г. прэзідэнцкім рашэннем Віленскі бібліяграфічны рэгіён быў скасаваны. Улады ўлічылі, што інфармацыйнабібліяграфічны рэгіяналізм падтрымлівае "лакальны сепаратызм" па гістарычных і этнічных межах народаў і з'яўляецца перашкодай ва ўз'яднанні польскіх зямель[123]. Публічная бібліятэка Віленскага ўніверсітэта абавязана была прыпыніць выпуск паказальнікаў "Віленская рэгіянальная бібліяграфія ў…годзе" і "Перыядычныя выданні Віленскага бібліяграфічнага рэгіёну".

Аднак моцныя рэгіянальныя сувязі і традыцыі парушыць было нялёгка. Як адзначыў М.Амброс, каб захаваць карысны бібліяграфічны вопыт, неабходна было "выходзіць на новыя шляхі": адлюстроўваць не толькі мясцовыя выданні, але і літаратуру аб рэгіёне[124].

[122] На жаль, паказальнік "Перыядычныя выданні Віленскага бібліяграфічнага рэгіёну" не быў выкарыстаны ў ліку крыніц пры падрыхтоўцы нацыянальнага рэтраспектыўнага паказальніка "Газеты Беларусі.1776 – 1975" (Мн., 2003).

[123] У канцы 20-х гг. у Польшчы былі прыняты рашэнні аб выпуску органаў бягучай нацыянальнай бібліяграфіі.

[124] *Ambros, M.* Wileńska bibliografja regionalna w I półroczu 1930 / M. Ambros // Ateneum Wileński. – 1930. – Z.3-4. – S.351–354.

Гэты план быў рэалізаваны ў Публічнай бібліятэцы імя Яўстаха і Эміліі Урублеўскіх[125]. На працягу 1929–1936 гг. тут складаўся краязнаўчы бібліяграфічны паказальнік "Бібліяграфія гісторыі зямель б.В.Кс.Літоўскага за год…". Рыхтавалі яго бібліёграфы Стэфан Бурхарт і Алена Дрыга. Паказальнік стаў пераемнікам бібліяграфічных выданняў Публічнай бібліятэкі Віленскага універсітэта. Ён выходзіў асобнымі выпускамі, а таксама публікаваўся ў часопісе "Ateneum Wileńskie". Адлюстроўваліся ўсе творы друку, апублікаваныя пераважна ў Польшчы, а таксама ў БССР, СССР, Германіі, Англіі, Літве, Латвіі і іншых краінах. У адборы дакументаў вытрымліваліся прынцыпы навуковасці і навізны, ідэалагічнай устрыманасці. Напрыклад, не бібліяграфаваліся адкрыта палітызаваныя публікацыі, што з'яўляліся як у Польшчы, так і ў БССР і СССР, але ўключаліся арыгінальныя краязнаўчыя творы. Напрыклад, улічаны кніжкі, прысвечаныя Піншчыне, напісаныя членамі краязнаўчага гуртка дзяржаўнай гімназіі ў Пінску. Сістэматычная групоўка дазваляла ўсебакова раскрыць змест дакументаў; асобна выдзяляліся раздзелы краязнаўства, бібліяграфічных прац, рэцэнзій і крытычных матэрыялаў.

У кожным выпуску паказальніка былі звесткі аб кнігах і іншых дакументах, апублікаваных на тэрыторыі Заходняй Беларусі: у Брэсце над Бугам, Навагрудку, Пінску, Слоніме, Гродне і іншых месцах. Гэта былі краязнаўчыя матэрыялы, прысвечаныя гісторыі, этнаграфіі, эканоміцы, турызму і інш. У прадмове да выпуску за 1935 г. ёсць адзнака, што раздзел "Беларусы" "выдатна ўзбагаціў" Мар'ян Пецюкевіч, вядомы заходнебеларускі дзеяч, бібліёграф, загадчык аддзела савецкай літаратуры ў бібліятэцы імя Урублеўскіх. У прадмовах складальнікі звярталіся да аўтараў, творы якіх маглі быць прапушчаны, з прапановай дасылаць іх бібліяграфічныя апісанні ў бібліятэку.

Буйнейшыя публічныя бібліятэкі арганізавалі бягучы бібліяграфічны ўлік мясцовага друку і літаратуры аб краі, які па прыметах тэрытарыяльнага ахопу і моўным адлюстраванні забяспечваў шырокі спектр патрэбнасцей у вывучэнні

[125] Ś.p. Tadeusz Wróblewski, jako założyciel Biblijoteki im. E. i E. Wróblewskich // Ateneum Wileński. – 1925 – 1926. – T.3. – S.436–444.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заходнебеларускіх зямель. Да бібліяграфічнага адлюстравання новай літаратуры аб рэгіёне і мясцовых выданняў праяўлялі інтарэс і шматлікія перыядычныя выданні, у тым ліку “Ateneum Wileński”, “Ziemia Lidzka”, “Калосьсе” і інш.[126]

Бібліятэкі, існаваўшыя ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., былі ліквідаваны з прыходам савецкай улады. Да нашага часу дайшла толькі частка створанай у іх краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі. Яна – не толькі помнік працы тым бібліёграфам, што імкнуліся адлюстраваць усё выдадзенае ў заходнебеларускім краі і аб краі, але і жывая крыніца рэгіянальнай памяці. Паказальнікі “Віленская рэгіянальная бібліяграфія ў…годзе”, “Перыядычныя выданні Віленскага бібліяграфічнага рэгіёну”, “Бібліяграфія гісторыі зямель б.В.Кс.Літоўскага за год…” не страцілі свайго крыніцазнаўчага значэння і павінны выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы рэтраспектыўных бібліяграфічных дапаможнікаў.

## Пытанні і заданні

1. Ахарактарызуйце ўплыў грамадскіх умоў на развіццё краязнаўства ў БССР.
2. Раскрыйце структуру краязнаўчых арганізацый у БССР, ахарактарызуйце ролю і кірункі дзейнасці Цэнтральнага бюро краязнаўства.
3. Ахарактарызуйце значэнне часопіса “Наш край” у краязнаўчым руху ў рэспубліцы.
4. Назавіце буйнейшых краязнаўцаў БССР.
5. Якія прычыны прывялі да разбурэння краязнаўчага руху ў БССР?
6. Ахарактарызуйце грамадскія ўмовы развіцця краязнаўства ў Заходняй Беларусі ў 1921 – 1939 гг.
7. Ахарактарызуйце структуру Польскага краязнаўчага таварыства.
8. Прывядзіце прыклады лепшых дасягненняў краязнаўчай дзейнасці дзеячаў і арганізацый нацыянальнага беларускага руху.

---

[126] *Саітава, В.І.* Краязнаўчая работа ў Лідзе / В.І.Саітава // Бібліятэчны свет. – 1999. – №.3. – С.22–23; *Саитова, В.И.* Журнал “Ateneum Wileńskie” / В.И.Саитова // Библиография. – 1999. – № 5. – С.82 – 91.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Назавіце буйнейшых заходнебеларускіх краязнаўцаў.

10. Ахарактарызуйце перыядычныя краязнаўчыя выданні ў Заходняй Беларусі.

11. Вызначце моцныя і слабыя бакі арганізацыі краязнаўства ў БССР і ў Заходняй Беларусі.

**Тэст**

I. Дапоўніце сказы

*Заданне 1.* Гэтага знакамітага краязнаўца ў час рэпрэсій называлі "князем краязнаўства" (адказ дайце па ўзоры: М.Мялешка) ____________________________________________

*Заданне 2.* Старшынёй ЦБК у 1925–1929 гг. быў (адказ дайце па ўзоры: С.Скандракоў) __________________________

*Заданне 3.* Краязнаўчае таварыства пры БДУ узначальваў (адказ дайце па ўзоры: М. Улашчык) ____________________

*Заданне 4.* У складзе якіх устаноў існавала ЦБК:

а) ад 1923 да 1930 г.________________

б) у 1930 – 1933 гг.__________________

*Заданне 5.* Укажыце падзею, якая адбылася ў краязнаўчым руху БССР у:

а) лютым 1926 г.___________________

б) лютым 1927 г.___________________

в) студзені 1930 г. __________________

*Заданне 6.* ЦБК распрацавала "Палажэнне аб раённых бюро краязнаўства" ў _________ г.

*Заданне 7.* Часопіс "Наш край" выдаваўся ў ___________гг.

*Заданне 8.* Назавіце грамадскую арганізацыю, у складзе якой функцыянавалі краязнаўчыя гурткі, дэлегатуры, аддзелы і акругі ______________

*Заданне 9.* Бібліяграфічныя паказальнікі "Віленская рэгіянальная бібліяграфія ў…годзе" і "Перыядычныя выданні Віленскага бібліяграфічнага рэгіёну" выпускала ___________

II. Адзначце правільны (ыя) адказ (ы)

*Заданне 10.* Цэнтральная краязнаўчая картатэка вялася ў:

а) Магілёўскім акруговым таварыстве краязнаўства,

б) Дзяржаўнай бібліятэцы БССР,

в) Навуковым таварыстве па вывучэнні Беларусі пры БДА СГ у Горках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заданне 11.* Прозвішча складальніка “Краёвага слоўніка ўсходняй Магілёўшчыны”:

а) А.Я.Крукоўскі,

б) М.Я.Байкоў,

в) І.К.Бялькевіч,

г) М.В.Шатэрнік.

*Заданне 12.* Навуковае таварыства па вывучэнні Беларусі пры БДА СГ у Горках мела статус:

а) асобнай навуковай установы Інбелкульта,

б) сельскагаспадарчай секцыі Інбелкульта,

в) камісіі ЦБК.

*Заданне 13.* У якім афіцыйным дакуменце ўказвалася, што няма неабходнасці ствараць асобныя краязнаўчыя арганізацыі:

а) пастанова СНК БССР “Аб развіцці музейнай і краязнаўчай справы БССР” ад 17 лютага 1937 г.

б) распараджэнне Наркамасветы “Аб пастаноўцы і арганізацыі краязнаўчай работы” ад 25 красавіка 1937 г.

*Заданне 14.* Таварыства сяброў навук пры Віленскім універсітэце імя С.Баторыя выдавала:

а) “Атэнэум Віленскі”,

б) “Бібліяграфія гісторыі зямель б.В.Кс.Літоўскага за год…”,

в) “Калосьсе”.

*Заданне 15.* Конкурсы на лепшую манаграфію на польскай мове аб мінулым ваяводства, павета, горада, мястэчка праводзіла:

а) Упраўленне студэнцкага кола ПКТ,

б) Таварыства сяброў навук пры Віленскім універсітэце імя С.Баторыя,

в) Палескае краязнаўчае таварыства ў Пінску.

III. Суаднясіце

*Заданне 16.* Дзеячаў краязнаўства з арганізацыямі, у якіх яны працавалі:

| | |
|---|---|
| 1. М.Каспяровіч | а) Краязнаўчае таварыства пры БДУ |
| 2. І.Бялькевіч | б) Таварыства па вывучэнні Беларусі пры БДА СГ |
| 3. А.Луцкевіч | в) Віцебскае акруговае краязнаўчае таварыства |
| 4. П.Салаўёў | г) Краязнаўчае таварыства Мсціслаўскага педтэхнікума |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 5. Р.Гарашкевіч | д) Беларускі гістарычна-этнаграфічны музей (Вільня) |
| 6. М.Улашчык | ж) Палескае краязнаўчае таварыства ў Пінску |

*Заданне 17.* Імёны краязнаўцаў і праяўленне іх дзейнасці:

| | |
|---|---|
| 1. Ю.Ядкоўскі | а) Этнаграфічныя даследаванні |
| 2. Ф.Ждановіч | б)Збіранне рэгіянальнага слоўнага матэрыялу |
| 3. А.Шлюбскі | в) Прыродазнаўчыя даследаванні |
| 4. А.Фядзюшын | г) Даследаванні мастацтва |
| 5. З.Магілёўчык | д) Санітарна-гігіенічныя ўмовы |
| 6. І.Бірыла | е) Актывіст разгрому краязнаўчага руху |
| 7. М.Каспяровіч | ж) Стварэнне краязнаўчага музея ў Гродне |
| 8.Р.Выдра | з) Рэгіянальная паталогія |

*Заданне 18.* Назвы краязнаўчых выданняў і іх аўтараў:

| | |
|---|---|
| 1."Гісторыя Браслаўскага павета" | а) М.Каспяровіч |
| 2. "Вільчынскія паляне" | б) Ф.Ждановіч |
| 3. "Віцебскі краёвы слоўнік" | в) А.Сербаў |
| 4. "Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны" | г) А.Шлюбскі |
| 5. "Адраджэнне беларускага тэатра на Міншчыне" | д) О.Гедэман |

IV. Ці згодны Вы са сцвярджэннем?

*Заданне 19.* У пастанове "Аб мерапрыемствах па разгортванні краязнаўчага руху" (чэрвень 1932 г.) СНК БССР паставіў задачу ўзмацніць краязнаўчую работу ў школах.

*Заданне 20.* У пачатку 30-х гг. краязнаўцы-гісторыкі вывучалі гісторыю вытворчасці і тэхнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заданне 21.* У 1929 г. у БССР было 167 грамадскіх краязнаўчых арганізацый, у якіх налічвалася 5000 членаў.

*Заданне 22.* Аршанскае акруговае краязнаўчае таварыства выпусціла зборнік "Віцебшчына".

V. Што аб'ядноўвае

*Заданне 23.* Р.К.Шукевіч-Трацякоў, С.В.Скандракоў, В.Д.Друшчыц, М.В.Азбукін, І.А.Сербаў, К.Крапіва ________
________________________________________________

*Заданне 24.* П.Алевінскі, Д.Георгіеўскі, С.Тамашэвіч, Р.Гарашкевіч ________________________________________

*Заданне 25.* П.Ф.Салаўёў, Ф.В.Лунгерсгаўзен, М.Ганчарык
______________________________________________

VI. Гістарычныя партрэты. Пазнайце імя краязнаўца

*Заданне 26.* Студэнт БДУ, адзін з арганізатараў краязнаўчага таварыства БДУ, аўтар успамінаў пра станаўленне краязнаўчай працы гэтай арганізацыі, удзельнік краязнаўчых "бадзянняў у 1924–1929 гг.", у далейшым знакаміты гісторык і крыніцазнавец ____________________________________

*Заданне 27.* Вывучаў птушак і іншых прадстаўнікоў фауны. У 1924 г. у вярхоўях Бярэзіны і яе прытоках знайшоў вялікае паселішча баброў, выступіў з ініцыятывай стварэння запаведніка для захавання каштоўнага і рэдкага на той час віду ____________________________________________

*Заданне 28.* Прафесар БДУ і старшы навуковы супрацоўнік АН БССР, адзін з актыўных пагромшчыкаў краязнаўства, аўтар артыкула "Беларускі нацдэмакратызм у краязнаўчым руху БССР" ______________________________________

*Заданне 29.* Заснавальнік Беларускага навуковага таварыства і знакамітага Беларускага музея ў Вільні, апантаны збіральнік старажытнасцей ___________________________

*Заданне 30.* Удзельнік беларускага нацыянальнага руху, стваральнік вядомай прыватнай бібліятэкі ў Вільні, у якой былі багаты фонд выданняў і рукапісаў, прысвечаных беларускім тэрыторыям, а таксама каталог мясцовых (заходнебеларускіх) дакументаў. Меў славу "самага працавітага і найсумленнейшага бібліятэкара, уражваў эрудыцыяй і памяццю бібліёграфа" ______________________________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел V. КРАЯЗНАЎЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ ў 1946–1980-я гг.

## Глава 1. Аднаўленне краязнаўчага руху і развіццё школьнага краязнаўства

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны пачалося ўзнаўленне краязнаўчай дзейнасці. З вялікім энтузіязмам беларускі народ, як і іншыя народы СССР, адбудоўваў эканоміку, аднаўляў усе структуры, неабходныя для мірнага жыцця і далейшага развіцця грамадства. Хуткія станоўчыя зрухі адбываліся ў сістэме адукацыі, навукі, культуры, сродкаў масавай інфармацыі і выдавецкай дзейнасці. Да даследаванняў прыступілі вернутыя з эвакуацыі, адноўленыя і новыя навуковыя ўстановы: АН БССР, НДІ, ВНУ; культурна-асветныя і навучальныя ўстановы: музеі, бібліятэкі, школы, палацы піянераў; СМІ; добраахвотныя грамадскія таварыствы. Асабліва цяжкім было першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, калі матэрыяльныя нястачы суправаджаліся негатыўнымі праявамі сталінскага рэжыму. Сістэма партыйна-палітычнага кіравання выкарыстоўвала прапагандысцкі рэпрэсіўны механізм, які ўзмацняў ідэалагічную апрацоўку свядомасці народных мас, забараняў свабоду сумнення і не спрыяў распаўсюджанню агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей. Зноў, як і да вайны, хвалі жорсткай крытыкі і рэпрэсій сеялі ў грамадстве падазронасць і недавер. Лепшых вучоных ганьбілі за “низкопоклонство перед Западом”. Пасля XX з’езда КПСС пачаліся працэсы дэмакратызацыі, якія спрыялі ажыўленню грамадскай актыўнасці ўсіх слаёў насельніцтва і дабратворна ўплывалі на развіццё краязнаўчага руху. Адбудаваўшы рэспубліку пасля знішчальнай вайны, беларускі народ у 1986 г. перанёс экалагічную чарнобыльскую трагедыю. Гэтая падзея прыцягнула ўвагу да экалагічных праблем, праблем аховы прыроды, здароўя насельніцтва ў краязнаўчых даследаваннях.

На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў у Беларусі не было створана краязнаўчага таварыства як асобнай грамадскай арганізацыі, што мела месца ў міжваенны перыяд, але краязнаўчы рух развіваўся ў такіх сацыяльных інстытутах, як адукацыйныя ўстановы, бібліятэкі, музеі, адлюстроўваўся ў друку, а многія журналісты, пісьменнікі і вучоныя трывала

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звязалі свой творчы і прафесійны шлях з краязнаўствам. Краязнаўства стала кірункам дзейнасці шэрага ўплывовых грамадскіх арганізацый: ЦК ЛКСМБ, піянерскай арганізацыі, добраахвотных таварystваў аховы помнікаў гісторыі і культуры, аховы прыроды, Беларускага фонду культуры і інш.

Дзяржава і грамадства асобае значэнне надавалі выхаванню моладзі ў духу патрыятызму, высокія прыклады якога паказалі беларусы і іншыя народы падчас змагання з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Самы дзейсны шлях фарміравання патрыятычнай свядомасці, бясспрэчна, заключаўся ў далучэнні школьнікаў да краязнаўчай работы. Таму школьнае краязнаўства стала адным з важнейшых кірункаў краязнаўчага руху. Вялікую ролю краязнаўства ў выхаванні навучэнскай моладзі адзначылі ўдзельнікі з’езда настаўнікаў рэспублікі, які адбыўся ў 1945 г. Была звернута ўвага на стварэнне ў школах краязнаўчых музеяў і гурткоў, правядзенне экскурсій, на даследча-пошукавую работу па вывучэнні мясцовай гісторыка-культурнай спадчыны. Ужо ў 1947 г. адзначаецца ўздым краязнаўчай работы ў школе. Створаны вясной Рэспубліканскі савет па арганізацыі і правядзенні паходаў і экскурсій, у які ўвайшлі вядомыя вучоныя, прадстаўнікі ЦК ЛКСМБ і Міністэрства асветы, а таксама іншыя арганізацыі па рабоце з вучнямі распрацавалі турыстычныя маршруты, звязаныя з месцамі баявой славы, з гісторыка-археалагічнымі помнікамі. Летам у паходах і экскурсіях па родных мясцінах удзельнічалі звыш 100 000 вучняў. У наступныя гады колькасць удзельнікаў турыстычных паходаў па родным краі павялічвалася. Міністэрства асветы БССР і ЦК ЛКСМБ прынялі некалькі афіцыйных дакументаў, прысвечаных пытанням арганізацыі краязнаўчай дзейнасці ў школе. Юныя краязнаўцы сустракаліся з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны, наведвалі месцы баёў. Вывучаючы родны край, яны таксама наведвалі новабудоўлі, прадпрыемствы, калгасы і саўгасы, сустракаліся з перадавікамі вытворчасці, вучонымі, пісьменнікамі, дзеячамі мастацтва. На радыё і ў перыядычным друку шырока асвятляліся пытанні школьнага краязнаўства.

Назапашаны вопыт пошукавай краязнаўчай работы і сабраныя матэрыялы сталі асновай для стварэння школьных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўчых гурткоў. Такія гурткі працавалі па пэўным кірунку, набывалі метадычны вопыт, узначальваліся настаўнікамі, захопленымі краязнаўствам. З іх збораў пачалі фарміравацца школьныя краязнаўчыя музеі. Так, у 50-я гады цікавую краязнаўчую работу праводзілі вучні Пружанскай СШ № 2, Ваўкавыскай СШ № 2, Юравічскай СШ Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці і інш. Найбольш каштоўныя экспанаты перадаваліся ў абласныя і раённыя краязнаўчыя музеі.

У 1952 г. у Мінску была адкрыта Рэспубліканская турысцкая база, а ў 1953 г. – Цэнтральная дзіцячая турысцка-экскурсійная станцыя, якія сталі важнымі арганізацыйнымі і інструкцыйна-метадычнымі цэнтрамі турысцка-краязнаўчай работы са школьнікамі. Цэнтральная дзіцячая турысцка-экскурсійная станцыя была падначаленая Міністэрству асветы і ЦК ЛКСМБ, у далейшым яна была перайменавана ў Рэспубліканскі цэнтр турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі.

Развіццё краязнаўчай работы ў школе актывізавалася ў 60-я гг. Настаўнікі геаграфіі, біялогіі, гісторыі, літаратуры, мовы, фізікі і хіміі шырока выкарыстоўвалі мясцовы фактычны матэрыял на ўроках, арганізоўвалі пазакласную работу па яго вывучэнні, разам з вучнямі стваралі краязнаўчыя музеі. Так, пад кіраўніцтвам настаўніка-краязнаўца М.У.Семака вучні Лунненскай СШ Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці вялі шырокую работу па зборы звестак аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, інтэрнацыянальных сувязях. Былі адшуканы невядомыя Героі Савецкага Саюза, атрымаўшыя гэтае высокае званне за абарону мястэчка, а імя 18-гадовага Івана Шарамета нададзена Лунненскай СШ. У гонар герояў вайны вучні заклалі парк, дзе быў устаноўлены манумент з імёнамі герояў. На яго адкрыцці ўсхвалявана выступалі адшуканыя на прасторах СССР родныя загінуўшых. У школьным музеі баявой славы і інтэрнацыянальнай дружбы адбываліся пасяджэнні, урокі мужнасці, сустрэчы з пісьменнікамі, героямі вайны, мясцовымі ўдзельнікамі падпольнай КПЗБ, праводзіліся экскурсіі для наведвальнікаў з розных куткоў вобласці. Штогод музей наведвалі больш за 2 тыс. чалавек, а за 20 гадоў існавання музея ў ім пабывала больш за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

40 тыс. школьнікаў, студэнтаў, салдат і афіцэраў[127]. А вучні Гудзевічскай школы Мастоўскага раёна пад кіраўніцтвам настаўніка А.М.Белакоза стварылі гісторыка-этнаграфічны музей: на падставе сабраных экспанатаў была адноўлена сялянская сядзіба XVIII ст. Вучні зберагалі і вывучалі побыт мясцовага насельніцтва. Настаўнік У.А.Урбановіч у Райцаўскай СШ Карэліцкага раёна і Валеўскай СШ Навагрудскага раёна наладзіў работу літаратурнага краязнаўчага гуртка, школьнага краязнаўчага музея, укараніў сістэму формаў літаратурнай краязнаўчай работы. Настаўнік звярнуў увагу на важнасць выпрацоўкі ўменняў весці пошук друкаваных і рукапісных дакументальных крыніц, карыстацца бібліятэчнымі каталогамі і даведачнымі выданнямі. Сам У.А.Урбановіч выпусціў дзве кнігі з абагульненнем свайго наватарскага вопыту[128].

У гэтыя дзесяцігоддзі сярод самых дзейсных формаў вывучэння мінулага і патрыятычнага выхавання былі рух чырвоных следапытаў і рэспубліканскія экспедыцыі піянераў і школьнікаў па родным краі.

Рух чырвоных следапытаў узнік у Ленінградзе ў канцы 50-х гг. і шырока распаўсюдзіўся ў Беларусі. У 1980 г. была прынята пастанова аб стварэнні Рэспубліканскага клуба чырвоных следапытаў школ і пазашкольных устаноў рэспублікі “Пошук”. У кіраўніцтве рухам удзельнічалі ЦК ЛКСМБ, Міністэрства асветы БССР, Дзяржаўны камітэт БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні, Беларускае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Рэспубліканская арганізацыя ветэранаў. Усе грамадскія арганізацыі працавалі па калектыўна зацверджаным плане.

60–80-я гг. былі перыядам найвышэйшага ўздыму турыстычна-краязнаўчага руху. Рэспубліканскія экспедыцыі піянераў і школьнікаў па родным краі арганізоўвалі Міністэрства асветы БССР, ЦК ЛКСМБ, Рэспубліканскі савет піянерскай арганізацыі імя У.І.Леніна сумесна з іншымі грамадскімі арганізацыямі і пазашкольнымі ўстановамі. Рэспубліканскія экспедыцыі былі часткай усесаюзных экспедыцый і паходаў камсамольцаў і моладзі па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. З 1957 г. па 1977 г. у

[127] Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1981. – № 3. – С.5.
[128] “Па дарагіх мясцінах” (1964), “Шляхамі паэтаў і герояў” (1970).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі адбыліся 9 рэспубліканскіх экспедыцый піянераў і школьнікаў: “Па партызанскіх сцежках”, “Па дарогах сямігодкі”, “Запаветы Леніна – у жыццё”, “Шляхамі перамог” і інш. У экспедыцыі “Летапіс Вялікай Айчыннай” (1981) вяліся пошук дакументаў і рэліквій ваеннага часу, запіс успамінаў франтавікоў і партызан.

У турыстычна-краязнаўчай экспедыцыі “Моя Родина – СССР” школьнікі Беларусі ўдзельнічалі з 1971 г. На кожным яе этапе перад юнымі краязнаўцамі стаялі важныя задачы вывучэння мінулага і сучаснасці роднага краю, яго дасягненняў у эканоміцы і культуры. Колькасна ўдзел навучэнцаў у рэспубліканскіх экспедыцыях вызначаўся мільённымі паказчыкамі. Падчас экспедыцый краязнаўцы наведвалі месцы рэвалюцыйных, ваенных, гістарычных падзей, сустракаліся з іх удзельнікамі, збіралі звесткі аб устанаўленні савецкай улады, поспехах прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, стваралі летапісы вёсак, калгасаў, саўгасаў, прадпрыемстваў, школ, збіралі матэрыялы і дакументы, баявыя рэліквіі, стваралі музеі, пакоі і куткі рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы, закладалі паркі, скверы і помнікі ў гонар герояў, выконвалі заданні навукова-даследчых, гаспадарчых і грамадскіх арганізацый. На працягу 1960–1980-х гг. удзельнікі пошукавага руху ўстанавілі імёны больш за 30 тыс. чырвонаармейцаў, партызан, падпольшчыкаў, якія лічыліся загінуўшымі. З дапамогай школьнікаў каля двух тысяч воінаў атрымалі ўзнагароды, якія не былі ім уручаны ў гады вайны. Рэгулярна праводзіліся масавыя мерапрыемствы “Вахта памяці”, аперацыі “Доўг”, “Памяць”, “Імя на абеліску” і інш. Вынікі пошукава-даследчай дзейнасці шырока адлюстроўваліся ў рэспубліканскіх сродках масавай інфармацыі, уключаліся ў краязнаўчыя кнігі, у тым ліку ў гісторыка-дакументальныя хронікі “Памяць” гарадоў і раёнаў Беларусі.

## Глава 2. Развіццё дзяржаўнага краязнаўства

### *2.1. Краязнаўства ў вышэйшых навучальных установах*

Краязнаўчая работа пачала разглядацца як важны элемент навучання і выхавання студэнцкай моладзі. Камсамольскія арганізацыі ВНУ, пярвічныя арганізацыі іншых добраахвотных таварыстваў наладжвалі ўдзел студэнцкай моладзі ва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўсесаюзных паходах па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. Студэнты-краязнаўцы стваралі клубы і музеі, збіралі матэрыялы па гісторыі навучальных установ, аб мінулым населеных пунктаў, пра выдатных землякоў. Так, члены клуба "Пошук" Беларускага дзяржаўнага універсітэта ўстанаўлівалі імёны студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў, загінуўшых у Вялікай Айчыннай вайне. Турыстычны клуб "Гарызонт" Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М.Горкага праводзіў "зорныя паходы" па знакамітых гістарычных мясцінах. Студэнты Беларускага політэхнічнага інстытута некалькі разоў станавіліся лаўрэатамі ўсесаюзнага паходу па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. Даследчую работу па вывучэнні гісторыі Гродзеншчыны праводзіў гісторыка-краязнаўчы гурток Гродзенскага педагагічнага інстытута, створаны ў 1955 г. Ініцыятарам і кіраўніком гуртка быў доктар гістарычных навук, прафесар Я.Н.Мараш. Пачынаючы з 1965 г. на базе гуртка рэгулярна праводзіліся навукова-метадычныя і навукова-практычныя канферэнцыі. Яго ўдзельнікі, набыўшы каштоўны метадычны вопыт і глыбокі інтарэс да краязнаўства, пасля заканчэння інстытута працягвалі навучанне ў аспірантуры, абаранялі дысертацыі, публікавалі вынікі даследаванняў, далучалі да краязнаўчай працы вучняў школ. Вынікі працы гуртка абагульнены ў дзвюх кнігах, падрыхтаваных і выдадзеных Я.Н. Марашам у рэспубліканскіх выдавецтвах (1976, 1989), у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый.

Вялікі ўклад у патрыятычнае выхаванне моладзі, развіццё формаў краязнаўчай работы ўносілі студэнты, удзельнікі будаўнічых атрадаў, штабы працоўных спраў навучальных устаноў. Студэнты вялі пошук магіл воінаў, адкрывалі помнікі, праводзілі сустрэчы з ветэранамі вайны і ваенна-спартыўныя святы, аказвалі дапамогу сем'ям загінуўшых. Сваю работу студэнцкія атрады ўзгаднялі з ваенкаматамі, арганізацыямі Добраахвотнага таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту (ДТСААФ), Таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры і з іншымі арганізацыямі.

Дзякуючы пошукава-даследчай рабоце моладзі ў сярэдзіне 70-х гг. былі ўстаноўлены імёны тысяч загінуўшых падчас вайны, адкрыты больш за 6 тыс. помнікаў і мемарыяльных дошак, закладзены тысячы паркаў і сквераў, створаны 726

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

клубаў баявой славы, 809 народных музеяў, 45 тыс. музеяў, пакояў і куткоў рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы, напісаны паўтары тысячы летапісаў калектываў і камсамольскіх арганізацый[129].

Вынікі даследчай краязнаўчай працы студэнтаў падводзіліся на навуковых канферэнцыях, усесаюзных і рэспубліканскіх конкурсах студэнцкіх навуковых работ.

У пасляваенны перыяд тэматыка краязнаўчых даследаванняў навучэнскай моладзі фарміравалася пад значным уплывам рашэнняў партыйных з’ездаў і пленумаў, пастаноў ЦК КПСС і ЦК КПБ, святкавання юбілейных дат Кастрычніцкай рэвалюцыі, перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Але кірункі краязнаўчых даследаванняў пашыраліся і ахоплівалі некаторыя аспекты народнага побыту і духоўнай культуры, супраціўлення пануючым уладам у часы феадальна-буржуазнага развіцця беларускіх зямель. У полі інтарэсаў краязнаўцаў нязменна заставаліся гісторыя фабрык, заводаў, калгасаў, саўгасаў і іншых прадпрыемстваў і ўстаноў, вёсак і гарадоў.

Краязнаўства, як вучэбная дысцыпліна, увайшло ў праграмы гістарычных, геаграфічных, філалагічных і іншых факультэтаў ВНУ. З 1965 г. на геаграфічным факультэце БДУ чытаюць курс “Школьнае краязнаўства і турызм”, з 1978 г. была ўведзена спецыялізацыя “Краязнаўства, методыка і арганізацыя турысцка-экскурсійнай справы”. Упершыню развіццё бібліяграфічнага краязнаўства ў Беларусі пачалі вывучаць студэнты, якія навучаліся па спецыяльнасці “бібліятэказнаўства і бібліяграфія” ў Мінскім інстытуце культуры. Складаліся вучэбныя праграмы гістарычнага і геаграфічнага краязнаўства, пачалі выходзіць вучэбныя дапаможнікі: “Пособие по краеведению” П.А.Лярскага (1969), “Историческое краеведение Белоруссии” (1980), “Географическое краеведение” Я.М.Мяшэчка (1986), падрыхтаваныя вучонымі БДУ. Развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства ў дарэвалюцыйны і савецкі час было даследавана В.Е.Лявончыкавым і знайшло адлюстраванне ў вучэбным дапаможніку “Белорусская библиография. Общий курс”, у артыкулах Л.Р.Амяльковіч.

---

[129] Историческое краеведение Белоруссии: учеб. пособие. – Мн.: Изд-во БГУ, 1980. – С. 38.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Многія выкладчыкі ВНУ сталі выдатнымі арганізатарамі краязнаўчага руху і таленавітымі краязнаўцамі-даследчыкамі. Гэта Я.Н.Мараш (Гродзенскі педінстытут), Я.М.Мяшэчка, Э.М.Загарульскі, А.А.Стуканаў, М.Ф.Пілiпенка, А.Н.Плавінскі (БДУ), У.Калеснік (Брэсцкі педінстытут) і інш.

### *2.2. Музейнае краязнаўства*

У арганізацыйнай структуры краязнаўства значная роля адводзілася краязнаўчым музеям. У многіх раённых гарадах Беларусі краязнаўчыя музеі пачалі адкрывацца ў першыя пасляваенныя гады. Так, Баранавіцкі краязнаўчы музей быў створаны ў 1946 г., Мазырскі – у 1949 г.; Слуцкі, Лепельскі, Лідскі, Мінскі краязнаўчыя музеі пачалі працу ў 50-я гг. У наступныя дзесяцігоддзі працягвалася стварэнне новых краязнаўчых музеяў. Дзякуючы рашэнням улад, ініцыятыўнасці мясцовых краязнаўцаў у 1972 г. працавалі 22 дзяржаўныя краязнаўчыя музеі: абласныя, гарадскія і раённыя. Стварэнне значнай колькасці буйных краязнаўчых музеяў адлюстроўвала вынікі пошукавай дзейнасці краязнаўцаў па зборы каштоўных матэрыялаў, прысвечаных рэгіёнам. Так, Міхаіл Фёдаравіч Мельнікаў (1921–1993) нястомна збіраў дакументы па гісторыі Крычаўшчыны і пра яе выдатных ураджэнцаў, арганізаваў і ўзначаліў Крычаўскі краязнаўчы музей. І.І.Стаброўскі ў гады Вялікай Айчыннай вайны захаваў археалагічную калекцыю і бібліятэку Слонімскага краязнаўчага музея і адраджаў яго дзейнасць. У кожным музеі збіраліся экспанаты, якія мелі непаўторную інфармацыю пра рэгіён. Хаця краязнаўчыя музеі адрозніваліся па паўнаце збораў, іх каштоўнасці, але кожны з іх захоўваў гісторыка-культурную спадчыну краю, вёў дзейнасць па яе вывучэнні і папулярызацыі. Дабратворна ўплывалі на развіццё краязнаўчай дзейнасці музеяў рашэнні Савета Міністраў, Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, аблвыканкамаў і навуковых установаў па ахове, рэстаўрацыі і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры.

У канцы 80-х гг. значэнне музейнай дзейнасці яшчэ больш узрасла, пашырыліся яе змястоўныя кірункі. У гэты час былі створаны унікальныя краязнаўчыя музеі і рэгіянальныя гісторыка-культурныя комплексы, пачалася рэстаўрацыя выдатных гістарычных помнікаў, перш за ўсё славутага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мірскага замка. На базе асобных адрэстаўрыраваных помнікаў архітэктуры былі адкрыты новыя музеі. Так, у Раўбічах Мінскай вобласці ў будынку былога касцёла адкрыўся музей беларускага народнага мастацтва, рамёстваў і народных промыслаў. У краязнаўчай рабоце адбываецца абуджэнне інтарэсу да традыцыйнай народнай тэхналогіі, рамёстваў, адраджэння традыцый народнага побыту. У 1990 г. быў створаны першы раённы дом рамёстваў у Глыбокім, у гуртках якога вучні авалодвалі сакрэтамі тэхналогіі рамёстваў.

У асобных раёнах з канца 80-х гг. пачалі распрацоўваць краязнаўчыя праграмы тыпу “Вяртанне вытокаў” (Івянецкі раён). У ходзе яе выканання быў створаны музей фальклору ў вёсцы Опаль, музей народнай медыцыны ў вёсцы Стрэльна. У выніку пошукавай работы падрыхтаваны матэрыялы да стварэння раённага краязнаўчага музея.

Сярод краязнаўчых музеяў былі адметныя сваімі зборамі, а таксама гісторыяй узнікнення. Так, унікальны Веткаўскі музей народнай творчасці (адкрыты ў 1987 г.) быў заснаваны на аснове калекцыі Ф.Р.Шклярава (выдатны калекцыянер стаў і першым дырэктарам). Музей размешчаны ў купецкім доме XIX ст., звыш 6000 экспанатаў яго характарызуюць народную культуру, побыт, традыцыйнае мастацтва, промыслы Веткаўшчыны. Сярод іх старадрукі XVI–XVIII стст., рукапісы з пачатку XVI да пачатку XX ст., у тым ліку рукапісы крукавага нотнага пісьма, таксама і веткаўскай школы, абразы XVII – пачатку XX ст., дзелавая і асабістая перапіска майстроў, рахункі, старадаўняя і сучасная разьба па дрэве, чаканка, ліццё, шыццё золатам, жэмчугам, бісерам, вышыўкі. Раздзелы ў музеі адлюстроўвалі мясцовыя краявіды: “Слабада”, “Кірмаш”, “Манастыр”, “Рака”.

Інстытут геахіміі і геадэзіі АН Беларусі стварыў у раёне Уручча Музей валуноў (1985). Гэта збор некалькіх тысяч эталонных і рэдкіх валуноў. Сярод іх ёсць археалагічныя аб’екты з выбітымі знакамі ў форме лука са стрэламі, крыжоў (напрыклад, крыж Стэфана Баторыя), сонца, валуны з надпісамі, слядамі апрацоўкі, культавыя і інш. Адзін з гранітных валуноў знаходзіўся раней у Мінску на Свіслачы і называўся Стары. Яшчэ ў пачатку XX ст. Старому ахвяравалі мёд, малако, віно, упрыгожвалі яго ручнікамі і тканінай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На базе буйнейшых гістарычных цэнтраў у 1967 г. былі створаны гісторыка-археалагічныя запаведнікі ў Полацку, Заслаўі і Гродне. У другой палове 80-х – 1990 г. яны былі пераўтвораны ў гісторыка-культурныя запаведнікі. Напрыклад, у склад Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка ўвайшлі Полацкі верхні замак з Сафійскім саборам, гарадзішча, будынкі былога езуіцкага калегіума і іншыя аб’екты. Заслаўскі запаведнік (1986) уключыў замак (гарадзішча “Вал”) з былым кальвінісцкім зборам другой паловы XVI – пачатку XVII ст., гарадзішча “Замэчак” X–XI стст., звязанае з памяццю Рагнеды і Ізяслава, фарны касцёл святой Марыі, курганныя могільнікі. На тэрыторыі запаведніка размешчаны музеі народнага побыту: “Млын”, “Хата завознікаў” (карчма), “Кузня”, “Свіран”. Музеі ўяўляюць сабой рэканструкцыі аб’ектаў, што размяшчаліся ў канцы XIX – пачатку XX ст. у Заслаўі і навакольных вёсках. Усе запаведнікі з'яўляюцца цэнтрамі гісторыка-краязнаўчых даследаванняў і буйнейшымі турыстычнымі цэнтрамі.

Супрацоўнікі краязнаўчых музеяў былі адной з буйнейшых катэгорый прафесійных краязнаўцаў. Многія з іх актыўна публікавалі вынікі даследаванняў. Так, дырэктар Мінскага краязнаўчага музея (г. Маладзечна) Генадзь Аляксандравіч Каханоўскі апублікаваў многа артыкулаў па матэрыялах архіўных і археалагічных пошукаў, этнаграфічных і фальклорных экспедыцый. Перайшоўшы на працу ў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, Каханоўскі захапіўся вывучэннем гісторыі краязнаўства, што адлюстравана ў кнізе “Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст.” (1984). Гэта выдатнае даследаванне ўвайшло ў кола важнейшых крыніц па гісторыі айчыннага краязнаўства. Г.Л.Каханоўскі стаў у 80-я гг. на чале руху грамадскасці па аднаўленні беларускай краязнаўчай арганізацыі.

## Глава 3. Краязнаўчая дзейнасць добраахвотных арганізацый. Стварэнне Беларускага краязнаўчага таварыства

У пасляваенны час былі створаны добраахвотныя грамадскія таварыствы, у статутах якіх прадугледжвалася краязнаўчая дзейнасць. Гэта Беларускае добраахвотнае тава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Беларускае таварыства аховы прыроды, Беларускі фонд культуры, Беларускае геаграфічнае таварыства і інш.

Створанае ў сярэдзіне 60-х гг. Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры ставіла задачай зберагаць гісторыка-культурную спадчыну, папулярызаваць веды аб помніках і памятных мясцінах, прыцягваць насельніцтва да ўдзелу ў ахове помнікаў. У таварыстве былі створаны саветы і секцыі па кірунках работы.

Чарговыя задачы і напрамкі дзейнасці вызначаліся на з’ездах таварыства. У перыяд паміж з’ездамі кіраванне ажыццяўляў Рэспубліканскі савет. Дзейнічалі 6 абласных і Мінскі гарадскі (на правах абласнога) савет, 140 раённых і гарадскіх саветаў таварыства, звыш сямі тысяч пярвічных арганізацый [130]. Таварыства хутка пераўтварылася ў адну з самых вялікіх грамадскіх арганізацый рэспублікі. Яго членамі з'яўляліся каля 2,1 млн. асоб. Значную дапамогу таварыству аказвалі мясцовыя органы кіравання, прадпрыемствы і ўстановы. Таварыства разгарнула дзейнасць па выяўленні помнікаў гісторыі і культуры, іх вывучэнні, забеспячэнні іх аховы, фінансаванні кансервацыі і рэстаўрацыі выдатных помнікаў і па іншых кірунках. У пачатку 80-х гг. было выяўлена больш за 17 тыс. помнікаў гісторыі і культуры, з якіх каля 7 тыс. адносіліся да помнікаў рэвалюцыйнай і баявой славы савецкага часу[131]. Шмат было зроблена, каб пачалася рэстаўрацыя Мірскага замка, кальвінскага збору ў Смаргоні і інш. Была праведзена рэстаўрацыя Камянецкай вежы на Брэстчыне, архітэктурнага комплексу на Замкавай гары ў Гродне, Сафійскага сабора ў Полацку і многіх іншых славутых помнікаў. Асаблівая ўвага надавалася ўвекавечанню памяці загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. У 60–80-я гг. у вёсках і гарадах Беларусі былі ўстаноўлены шматлікія помнікі загінуўшым землякам. Дзякуючы дзейнасці таварыства на помніках мінулага з’явіліся памятныя дошкі, ахоўныя знакі. Таварыства фінансавала многа унікальных выданняў (напрыклад, манаграфіі “Археалагічныя

[130] Историческое краеведение Белоруссии: учеб. пособие. – Мн.: Изд-во БГУ, 1980. – С.33.

[131] *Барысенка, Ф.В.* Помнікі працоўнай доблесці / Ф.В. Барысенка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1981. – № 4. – С.2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

помнікі Гомельшчыны" У.У.Багамольнікава і А.А.Макушнікава, "Археалагічныя помнікі Міншчыны" М.М.Чарняўскага і інш.). У 1970–1989 гг. выдавала штоквартальны бюлетэнь "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі", на старонках якога краязнаўчая тэматыка займала пачэснае месца.

Беларускае таварыства аховы прыроды (1962) спрыяла ўзяццю пад ахову дзяржавы, мясцовых органаў улады і грамадскасці унікальных і адметных аб'ектаў, арганізацыі прыродаахоўваемых зон, папулярызацыі ведаў. Членамі гэтай шматтысячнай арганізацыі былі навучэнцы, працоўныя, спецыялісты, вучоныя. З 1966 г. пачалі праводзіцца конкурсы на лепшае азеляненне населеных пунктаў. Сярод масавых формаў удзелу навучэнскай моладзі ў ахове прыроды атрымалі распаўсюджанне "блакітныя" і "зялёныя" патрулі, дні, тыдні, месячнікі аховы прыроды, лесу, саду, аховы птушак, свят ураджаю, кветак і інш. У 1984 г. прыродаахоўную работу праводзілі 195 тыс. юных аматараў прыроды[132]. У школьных лясніцтвах вучні вырошчвалі малады пасадачны матэрыял, збіралі плады і насенне дрэў і кустоў, вывешвалі шпакоўні, праводзілі даследчую работу. На старонках часопіса Беларускага таварыства аховы прыроды "Родная прырода" рэгулярна змяшчаліся матэрыялы аб мясцовых прыродных аб'ектах, цікавых з'явах і назіраннях.

Краязнаўчы кірунак дзейнасці ярка вызначыўся ў рабоце Беларускага рэспубліканскага савета па турызме і экскурсіях і яго абласных падраздзяленняў (1962–1966). Значнасць экскурсійна-краязнаўчай работы праяўлялася найперш у абуджэнні інтарэсу да гістарычных і унікальных прыродных мясцін, пачуццяў любві да роднай зямлі.

Беларускі фонд культуры (1987) быў створаны ў мэтах захавання, адшукання і ўшанавання айчыннай культурнай і мастацкай спадчыны. У гэтай грамадскай арганізацыі ўдзельнічаюць калектывы прадпрыемстваў, устаноў, грамадзяне. Кіруючымі органамі з'яўляюцца прэзідыум на чале са старшынёй і праўленне. Старшынёй БФК працаваў вядомы пісьменнік Іван Чыгрынаў. Камісіі і саветы фонду ўзначалілі пэўныя кірункі дзейнасці, у іх ліку – краязнаўчая камісія. Абласныя і Мінскае гарадское аддзяленні БФК засяродзіліся на

[132] *Мешечко, Е.Н.* Географическое краеведение: учеб. пособие / Е.Н.Мешечко. – Мн.: Вышэйш. шк., 1986. – С. 33.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зберажэнні і папулярызацыі мясцовай культурнай спадчыны. БФК спрыяў выхаду многіх краязнаўчых выданняў.

У другой палове 80-х гг. упершыню за пасляваенны час па ініцыятыве грамадскасці пачалі ствараецца самастойныя краязнаўчыя арганізацыі, у якіх працавалі прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі, вучоныя, студэнты, навучэнцы. Гэтая выдатная з'ява сведчыла аб патрэбе грамадства ў краязнаўчай дзейнасці, аб яго высокай сацыяльнай і духоўнай ролі. Час перабудовы, развіцця дэмакратыі, патокі новай інфармацыі, у тым ліку раней забароненай, свабоднае распаўсюджанне розных ідэй і меркаванняў былі магутнымі стымуламі краязнаўчай дзейнасці. Новыя краязнаўчыя таварыствы скіравалі сваю працу на тыя кірункі, якія мала ці зусім не даследаваліся ў папярэдні час і садзейнічалі нацыянальна-культурнаму адраджэнню. Уздым беларускага краязнаўства завяршыўся стварэннем у снежні 1989 г. Беларускага краязнаўчага таварыства (БКТ), якое было абвешчана на Усебеларускай канферэнцыі краязнаўцаў у Мінску. Кіруючымі органамі БКТ былі рада ў колькасці 87 чалавек і сакратарыят. Старшынёй рады выбралі выдатнага дзеяча сучаснага краязнаўства Г.А.Каханоўскага, намеснікамі сталі вядомыя вучоныя М.В.Біч, Л.Р.Казлоў, З.Х.Санько, В.С.Талстой, В.А.Чамярыцкі. У чэрвені 1991 г. Міністэрства юстыцыі зарэгістравала Статут БКТ[133]. За ўзор арганізацыі былі ўзяты Цэнтральнае бюро краязнаўства і краязнаўчая камісія Беларускага фонду культуры. У абласцях і раёнах пачалі стварацца рэгіянальныя суполкі Беларускага краязнаўчага таварыства. Яны маглі быць прадстаўлены грамадскімі аб'яднаннямі, клубамі, гурткамі і іншымі формамі, створанымі ў працоўных калектывах, навучальных установах, грамадскімі і рэлігійнымі арганізацыямі і інш.[134] Асноўнымі задачамі краязнаўства былі вызначаны: пошукавая, архіўна-бібліяграфічная работа, выяўленне помнікаў гісторыі і культуры, арганізацыя музеяў, напісанне гісторыі вёсак і гарадоў, стварэнне банка краязнаўчай інфармацыі, вывучэнне помнікаў прыроды, тапанімікі, збіранне вуснай народнай творчасці, дапамога органам асветы. Краязнаўчая дзейнасць разглядалася ў рэчышчы культурна-нацыянальнага адраджэння.

---

[133] Статут Беларускага краязнаўчага таварыства. – Мн.: [Б. в.], 1991. – 28 с.
[134] Там жа, с. 11.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Узнаўленне БКТ паспрыяла разгортванню краязнаўчай работы на месцах, з’яўленню новых актывістаў краязнаўчага руху і стварэнню новых краязнаўчых арганізацый. Краязнаўчыя таварыствы ініцыявалі правядзенне раённых і гарадскіх навуковых канферэнцый і чытанняў. Узнікненне гэтых формаў паказала ўзмацненне арганізацыі краязнаўчага руху, узаемадзеянне паміж краязнаўчымі ўстановамі і арганізацыямі, паміж прафесійнымі і аматарскімі плынямі, набыткі навуковага патэнцыялу краязнаўства. Напрыклад, у 1989 г. намаганнямі абласных арганізацый Гомельшчыны: археалагічнага цэнтра, таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, музея ў Гомелі – адбылася першая навуковая канферэнцыя па гістарычным краязнаўстве. У далейшым канферэнцыя стала традыцыйнай, а яе навуковыя вынікі знайшлі адлюстраванне ў зборніках “Гомельшчына: археалогія, гісторыя, помнікі”.

Тыя ж дабратворныя грамадскія фактары, якія спрыялі ўзнікненню краязнаўчых арганізацый, прывялі і да з’яўлення нацыянальна-культурных грамадскіх арганізацый. Гэтыя арганізацыі таксама далучыліся да краязнаўчай работы. Вывучэнне гістарычнага мінулага сваёй супольнасці, яе распаўсюджання ў межах пэўнай тэрыторыі, традыцыі і побыт, лёсы асобных людзей і сем’яў сталі асноўнымі напрамкамі збіральніцкай і даследчай працы. Ва ўмовах шматэтнічнага складу насельніцтва Беларусі ў другой палове 80-х гг. у некаторых мясцовасцях пачалі адкрывацца польскія, літоўскія, украінскія, татарскія і іншыя таварыствы. Так, у 1987 г. у Лідзе пачаў працаваць клуб аматараў польскай культуры імя А.Міцкевіча – першая польская арганізацыя не толькі ў Беларусі, але ў СССР, затым адкрыліся і іншыя польскія арганізацыі. Яны разгарнулі дзейнасць па вывучэнні польскай мовы, правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў і свят, даследаванні сямейна-радавой гісторыі, падзей, якія аказалі значны ўплыў на лёсы этнасу ў рэгіёне і інш. З 1990 г. лідскае аддзяленне Саюза палякаў Беларусі адрадзіла выданне часопіса “Лідская зямля” (“Ziemia Lidzka”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Глава 4. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства

У пасляваенны перыяд бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства ў Беларусі пачало развівацца як ніколі раней хуткімі тэмпамі. Таму спрыялі многія фактары, як звязаныя з развіццём бібліятэчнай галіны, так і з іншымі гісторыка-культурнымі асаблівасцямі перыяду.

Разбураная ў гады Вялікай Айчыннай вайны сетка бібліятэк паспяхова аднаўлялася і ўдасканальвалася, пачалася падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў. Так, у 1950 г. па колькасці бібліятэк і сукупным аб’ёме іх фондаў былі перасягнуты паказчыкі 1940 г. (адпаведна 4847 бібліятэк з фондам 6543 тыс. экземляраў у 1950 г. да 4172 з фондам у 5028 тыс. экземпляраў у 1940 г.)[135]. У 1980 г. колькасць бібліятэк у рэспубліцы вырасла да 16 942 з аб’ёмам фондаў да 198, 3 млн. экземпляраў[136]. Развіваліся працэсы ўзаемадзеяння бібліятэк розных сістэм і ведамстваў, умацоўваліся каардынацыйныя цэнтры, паляпшалася навукова-метадычнае забеспячэнне бібліятэчна-бібліяграфічнай работы. Паспяхова была праведзена цэнтралізацыя публічных масавых бібліятэк.

Станоўча ўплывалі на станаўленне краязнаўчага напрамку дзейнасці шматлікія фактары, звязаныя з задачамі адбудовы народнай гаспадаркі і яе далейшага ўмацавання, развіцця культуры, павышэння значнасці ідэйна-патрыятычнага выхавання моладзі, пашырэння краязнаўства ў галіне адукацыі і інш. Важным было павелічэнне выпуску краязнаўчай літаратуры. З задавальненнем бібліятэкары адзначалі выхад комплексных апісанняў беларускіх гарадоў, абласцей і раёнаў, якія знайшлі шырокае выкарыстанне ў даведачна-бібліяграфічным абслугоўванні, у масавых формах работы. У выдавецтвах краіны выпускаліся па-мастацку аформленыя серыі папулярных кніг, прысвечаныя абласцям і гарадам рэспублікі. У гэтых кнігах былі адлюстраваны розныя бакі жыцця: дасягненні эканомікі, культуры, асветы, прыродныя ўмовы і інш. Тэкставыя часткі, напісаныя вядомымі пісьменнікамі, журналістамі, і шматлікія фотаздымкі ўзбагачалі ўяўленне чытача аб рэгіёне. Так, Г.Каханоўскі выдаў кнігі “Вілейка”, “Маладзечна”; пісьменнік Р.Няхай –

[135] *Покало, М.И.* История библиотечного дела в БССР / М.И. Покало. – Мн.: Вышэйш. шк., 1986. – С. 127.
[136] Там жа, с.190.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кнігу “Мінская вобласць”. У гэтых выданнях змяшчаліся каштоўныя гістарычныя звесткі, асвятляліся невядомыя падзеі, жыццё выдатных людзей краю. Шырокае развіццё атрымаў выпуск мемуарнай літаратуры. Масавымі тыражамі выходзілі ўспаміны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, перадавікоў працы, партыйных і савецкіх кіраўнікоў, дзеячаў мастацтва і іншых аўтараў, якія асвятлялі важныя падзеі ў гісторыі многіх мясцін і населеных пунктаў. Такая літаратура папаўняла фонды публічных масавых, абласных, школьных і іншых бібліятэк краіны, дзякуючы чаму фарміравалася дакументальная складаючая іх краязнаўчай работы.

У такіх спрыяльных умовах бібліятэкі пачалі разглядаць краязнаўства як адзін з важнейшых кірункаў сваёй дзейнасці. Варта нагадаць, што ў міжваенны перыяд ЦБК і мясцовыя краязнаўчыя арганізацыі непасрэдна займаліся інфармацыйным забеспячэннем краязнаўства. У пасляваенны ж час ва ўмовах адсутнасці самастойнай краязнаўчай арганізацыі ў рэспубліцы справа інфармацыйнага забеспячэння краязнаўства натуральна выклікала ўдзел бібліятэк і іх актыўныя захады па стварэнні інфармацыйных рэсурсаў краязнаўства, па задавальненні патрэбнасцей карыстальнікаў у краязнаўчай інфармацыі і ведах. У абласных і многіх публічных бібліятэках выдзяляліся фонды краязнаўчай літаратуры, фарміраваліся бібліяграфічныя рэсурсы, пашыралася папулярызацыя краязнаўчых ведаў у разнастайных формах. Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Магілёўская і Маладзечанская абласныя бібліятэкі першымі пачалі выпуск друкаваных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Гэта былі краязнаўчыя календары, комплексныя, тэматычныя і персанальныя паказальнікі. Змест іх быў звязаны найперш з гераічнымі падзеямі Вялікай Айчыннай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі, працоўнымі дасягненнямі па аднаўленні эканомікі[137].

Дзяржаўная бібліятэка БССР узначаліла навукова-метадычнае забеспячэнне бібліятэчнага краязнаўства. Галоўная бібліятэка рэспублікі аказвала навукова-метадычную дапамогу па краязнаўстве абласным і публічным масавым бібліятэкам: выпусціла метадычныя матэрыялы, праводзіла семінары і канферэнцыі па краязнаўстве, стажыроўкі

[137] *Симановский, И.Б.* Белорусская советская библиография / И.Б.Симановский. – Мн.: Гос. б-ка БССР, 1965. – Ч. 1. – С. 97–102.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліёграфаў-складальнікаў краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, наладзіла рэцэнзаванне краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў і інш. Асабісты значны ўклад належаў галоўнаму бібліёграфу ДБ БССР Р.М.Чыгіровай. Вялікім прыхільнікам краязнаўчай работы быў і дырэктар бібліятэкі І.Б.Сімаиоўскі. Але відны бібліяграфазнавец атаясамліваў краязнаўства з беларусазнаўствам і распаўсюджваў такое разуменне на многія крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі, у тым ліку летапіс “БССР у друку СССР”, паказальнік экстэрыёрыкі, створаны па яго ініцыятыве[138].

На рубяжы 60–70-х гг. ва ўсіх абласных бібліятэках былі створаны аддзелы/сектары беларускай і краязнаўчай літаратуры. Хаця перавод нацыянальных выданняў у адзін з аддзелаў быў небясспрэчным, замацаванне краязнаўчага кірунку мела станоўчае значэнне, падкрэслівала іх актыўную пазіцыю ў інфармацыйным забеспячэнні рэгіёназнаўства. Абласныя бібліятэкі ўпершыню пачалі мэтанакіравана фарміраваць краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы аб сваім рэгіёне, вывучаць краязнаўчыя інфармацыйныя патрэбнасці, развіваць разнастайныя формы іх забеспячэння і папулярызацыі краязнаўчых ведаў. У 60-х гг. у абласных бібліятэках буйнейшым бібліяграфічным рэсурсам ужо былі карткавыя краязнаўчыя каталогі. У канцы 60 – пачатку 70-х гг. пачаўся выпуск паказальнікаў тыпу “Новая літаратура аб вобласці”, у якіх адлюстроўваўся бягучы дакументны паток аб вобласці. Гэтыя паказальнікі выконвалі галоўную ролю ў бягучым інфармаванні даследчыкаў, спецыялістаў, кіраўнікоў і ўсёй грамадскасці аб новым дакументным патоку, прысвечаным абласцям. Адлюстроўваліся розныя віды дакументаў: кнігі, матэрыялы з кніг, артыкулы са зборнікаў, часопісаў, газет, рэцэнзіі, ноты, карты, фотаздымкі і інш. З найбольшай паўнатой распісваліся рэгіянальныя газеты, матэрыялы з якіх не адлюстроўваліся ў “Летапісе газетных артыкулаў” Кніжнай палаты БССР.

У 70–80-я гг. плённа развіваліся розныя кірункі бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, у тым ліку падрыхтоўка шматлікіх краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Абласныя і публічныя масавыя бібліятэкі ў канцы перыяду сталі

---

[138] *Симановский, И.Б.* Белорусская советская библиография / И.Б.Симановский. – Мн.: Гос. б-ка БССР, 1965. – Ч. 1. – С. 61, 63–64, 70–72.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

буйнейшымі інфармацыйнымі цэнтрамі па краязнаўстве ў рэгіёнах. У 1981 г. Дзяржаўная бібліятэка БССР выпусціла зборнік артыкулаў, у якім былі адлюстраваны лепшыя дасягненні бібліятэчнага краязнаўства[139].

Пашыраўся краязнаўчы напрамак і ў дзейнасці спецыяльных бібліятэк. У гэтых бібліятэках фарміраваліся дакументныя фонды і бібліяграфічныя рэсурсы аб мясцовасці і сваёй арганізацыі (установе), вялося задавальненне патрэбнасцей спажыўцоў інфармацыі па краязнаўстве. Так, бібліятэка Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта краязнаўчую работу ўзгадняла з кафедрай гісторыі БССР. У бібліятэцы былі створаны фундаментальная універсальная краязнаўчая картатэка, некалькі тэматычных краязнаўчых картатэк (“Польшча і Гродзеншчына” і інш.), выдадзены бібліяграфічны паказальнік “Принеманский край. Города и районные центры” (1982). На занятках па асновах бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў і асновах навукова-гістарычных даследаванняў студэнты знаёміліся з бібліяграфічнымі рэсурсамі краязнаўства, атрымлівалі ўяўленні аб яго крыніцах і метадах фактаграфічнага і бібліяграфічнага пошуку і інш.[140] Тады ж упершыню пачалося вывучэнне гісторыі бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства (В.Е.Лявончыкаў і Л.Р.Амяльковіч). Значны ўклад у развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці па краязнаўстве ў Беларусі ўнесла галоўны бібліёграф ДБ БССР Р.М.Чыгірова.

### Пытанні і заданні

1. Ахарактарызуйце арганізацыйную структуру краязнаўства.
2. У чым выяўляецца ўплыў грамадскіх умоў на краязнаўчую дзейнасць?
3. Па якіх кірунках развівалася школьнае краязнаўства?
4. Якія грамадскія арганізацыі ўдзельнічалі ў краязнаўчым руху?

---

[139] Состояние, развитие и пути совершенствования краеведческой работы библиотек Белоруссии: сб. ст. / сост. Р.М.Чигирева; Гос. б-ка БССР им. В.И.Ленина. – Мн., 1981. – 69 с.

[140] *Мараш, Я.Н.* Библиографическая работа библиотеки Гродненского университета по историческому краеведению / Я.Н.Мараш, Г.М.Таюрская // Вопросы библиографоведения и библиотековедения: межвед. сборник. – Мн.: Университетское, 1985. – Вып. 6. – С. 159–164.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Назавіце буйнейшых краязнаўцаў перыяду.

6. Якія грамадскія ўмовы спрыялі стварэнню Беларускага краязнаўчага таварыства? Ахарактарызуйце яго задачы і кірункі дзейнасці. Хто яго ўзначаліў?

7. Па якіх кірунках вялося развіццё краязнаўчай дзейнасці бібліятэк?

## Тэст

### I. Дапоўніце сказы

*Заданне 1.* Рэспубліканскі клуб чырвоных следапытаў школ і пазашкольных устаноў рэспублікі “Пошук” быў створаны ў _________ г.

*Заданне 2.* У турыстычна-краязнаўчай экспедыцыі “Моя Родина – СССР” школьнікі Беларусі ўдзельнічалі з ______ г.

*Заданне 3.* У абласных бібліятэках былі створаны _____________________________________ аддзелы/сектары

*Заданне 4.* Значны ўклад у развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці па краязнаўстве ў Беларусі ўнесла галоўны бібліёграф ДБ БССР ___________________________

*Заданне 5.* У снежні 1989 г. было створана ______________
_____________________________________________

*Заданне 6.* Рэгіянальнае аддзяленне Саюза палякаў на Беларусі пачало выдаваць у г.Ліда перыядычнае выданне _____________________________________________

### II. Адзначце правільны (ыя) адказ (ы)

*Заданне 7.* У 1967 г. у Полацку, Заслаўі і Гродне былі створаны:

а) гістарычна-археалагічныя запаведнікі,

б) краязнаўчыя музеі,

в) гістарычна-культурныя запаведнікі.

*Заданне 8.* У якой грамадскай арганізацыі была створана краязнаўчая камісія:

а) Беларускае таварыства аховы прыроды,

б) ЦК ЛКСМБ,

в) Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры,

г) Беларускі фонд культуры.

*Заданне 9.* Мясцовыя грамадскія краязнаўчыя арганізацыі пачалі адраджацца:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а) у канцы 50-х гг.,
б) у пачатку 70-х гг.,
в) у канцы 80-х гг.

*Заданне 10.* Развіццё бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства ў Беларусі ў дарэвалюцыйны і савецкі час даследавалі:
а) В.Е.Лявончыкаў,
б) Л.Р.Амяльковіч,
в) І.Б.Сіманоўскі,
г) Р.М.Чыгірова.

*Заданне 11.* Старшынёй рады БКТ быў абраны:
а) Э.М.Загарульскі,
б) Г.А.Каханоўскі,
в) А.М.Белакоз,
г) Ф.Р.Шкляраў.

III. Суаднясіце

*Заданне 12.* Установы і дзеячаў краязнаўства з музеямі, якія былі імі створаны:

| | |
|---|---|
| 1. Ф.Р.Шкляраў | а) Гістарычна-этнаграфічны музей Гудзевічскай СШ |
| 2. А.М.Белакоз | б) Крычаўскі краязнаўчы музей |
| 3. Інстытут геахіміі і геадэзіі АН | в) Веткаўскі музей народнай творчасці |
| 4. М.Ф.Мельнікаў | г) Музей валуноў |

*Заданне 13.* Назвы краязнаўчых выданняў і іх аўтараў

| | |
|---|---|
| 1. Г.А.Каханоўскі | а) “Географическое краеведение” |
| 2. Я.М.Мяшэчка | б) “Археология и краеведение Беларуси, XVI в. – 30-е годы XX в. ” |
| 3. Л.В.Аляксееў | в) “Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст.” |

IV. Ці згодны Вы са сцвярджэннем?

*Заданне 14.* У пасляваенны час у Беларусі была адноўлена самастойная краязнаўчая арганізацыя па ўзоры ЦБК.

*Заданне 15.* У краязнаўчым руху прымалі ўдзел ЦК ЛКСМБ, піянерская арганізацыя, добраахвотныя таварыствы аховы помнікаў гісторыі і культуры, аховы прыроды, Беларускі фонд культуры.

*Заданне 16.* Найбольш развітой формай краязнаўчага руху з’яўлялася школьнае краязнаўства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заданне 17.* Краязнаўства як вучэбная дысцыпліна ў 60-я гг. увайшло ў праграмы гістарычных і геаграфічных факультэтаў ВНУ.

V. Што аб'ядноўвае

*Заданне 18.* М.В.Біч, Л.Р.Казлоў, З.Х.Санько, В.С.Талстой, В.А.Чамярыцкі ________________________________________

VI. Гістарычныя партрэты. Пазнайце імя краязнаўца

*Заданне 19.* Прафесар, арганізатар і кіраўнік гістарычна-краязнаўчага гуртка Гродзенскага педагагічнага інстытута ____________________________________________________

*Заданне 20.* Вывучаў гісторыю Слонімшчыны і Гродзеншчыны, у гады Вялікай Айчыннай вайны захаваў археалагічную калекцыю створанага ім Слонімскага краязнаўчага музея ____________________________________________

*Заданне 21.* Галоўны бібліёграф ДБ БССР, унесла значны ўклад у навукова-метадычнае забеспячэнне дзейнасці бібліятэк па краязнаўстве _______________________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Раздзел VI. РАЗВІЦЦЁ КРАЯЗНАЎСТВА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ (1991–2000)

## Глава 1. Грамадскі краязнаўчы рух. Дзейнасць Беларускага краязнаўчага таварыства

Дасягненне дзяржаўнага суверэнітэту ў 1991 г. стала магутным фактарам уздыму нацыянальнай свядомасці, імкнення лепш пазнаць мінулае сваёй радзімы, ганарыцца яе сучаснымі дасягненнямі, годна прадстаўляць Беларусь у свеце. Стала магчымым узнавіць многія забароненыя раней тэмы, “белыя плямы” айчыннай і рэгіянальнай гісторыі, вярнуць з нябыту сотні імён выдатных людзей мінулага. Спрыялі развіццю краязнаўства прынятыя ў Рэспубліцы Беларусь законы і дзяржаўныя праграмы: законы аб культуры, адукацыі (1991, новая рэдакцыя 2002), бібліятэчнай справе (1995, новая рэдакцыя 2003), турызме (1999) і іншыя; праграмы “Спадчына”, дзяржаўнай падтрымкі традыцыйнай культуры (1994–1996 гг.), захавання традыцыйнай культуры вёскі (на 2005–2010 гг.) і інш. У апошнія гады прымаюцца праграмы развіцця малых гарадоў, праграмы развіцця унікальных гістарычных цэнтраў (праграма развіцця г.Полацка). Важнае значэнне набылі праграмы інавацый.

Пад уплывам дабратворных грамадскіх умоў у першай палове 90-х гг. хутка пашыраўся грамадскі краязнаўчы рух, адна за адной узнікалі новыя краязнаўчыя арганізацыі. Яны дзейнічалі ў многіх рэгіёнах і населеных пунктах краіны. Так, М.Гаравы ў 1992 г. арганізаваў краязнаўчы цэнтр у Рагачове, Горацкае краязнаўчае таварыства “Бацькаўшчына” ўзначаліў вопытны краязнавец У.М.Ліўшыц. Некаторыя краязнаўчыя арганізацыі распрацоўвалі ўласны статут, сімволіку, адкрывалі грашовы рахунак у банку, выпускалі перыядычныя органы. “Віцебскі краязнаўчы фонд імя А.П.Сапунова” пад кіраўніцтвам вядомага краязнаўца, журналіста А.М.Падліпскага значную ўвагу надаваў публікацыі новых даследаванняў. Беларускае краязнаўчае таварыства імя Т.Нарбута, якое ўзначаліў прафесар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы С.А.Габрусевіч, ставіла мэтай пашырэнне краязнаўчага руху як на Гродзеншчыне, так і ў Заходняй Беларусі, выдавала часопіс “Свіцязь”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кіраўніцтва краязнаўчым рухам у першай палове 90-х гг. ажыццяўляла Беларускае краязнаўчае таварыства (БКТ) на чале з Г.А.Каханоўскім. БКТ вызначала задачы, кірункі, змест, формы краязнаўчай дзейнасці. Краязнаўства, кіруемае сіламі мясцовых аматараў, разглядалася як істотная ўмова паўнакроўнага развіцця народа, нацыянальнай культуры, духоўнай паўнацэннасці чалавека. Паспяховасць функцыянавання БКТ звязвалася з фарміраваннем аптымальнай арганізацыйнай структуры. Кожнае новае краязнаўчае таварыства рэгістравалася як грамадская арганізацыя. Ва ўсіх абласных цэнтрах былі створаны краязнаўчыя аб’яднанні (таварыствы). Абласныя краязнаўчыя аб’яднанні садзейнічалі ўзаемадзеянню краязнаўцаў, рассеяных інстытуцыяльна і тэрытарыяльна, актывізацыі даследчай працы, правядзенню навуковых канферэнцый, папулярызацыі краязнаўчых ведаў і развіццю краязнаўчага друку. Так, наладзілася супрацоўніцтва абласных і раённых краязнаўчых музеяў і таварыстваў у выпуску краязнаўчых зборнікаў “Віцебскі сшытак” (Віцебскі абласны краязнаўчы музей і Віцебскае абласное краязнаўчае аб’яднанне), “Браслаўскія чытанні” (Браслаўскае музейнае аб’яднанне і Браслаўскае таварыства імя О.Гедэмана) і інш. Гродзенская краязнаўчая асацыяцыя сумесна з абласным таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры, райвыканкамамі вобласці, дзяржаўным універсітэтам імя Я.Купалы і краязнаўчымі музеямі рыхтуе і праводзіць навуковыя краязнаўчыя канферэнцыі.

Аднак дзейнасць рады і іншых цэнтральных органаў БКТ (па аналогіі з ЦБК у 20-я гг.) наладзіць не ўдалося. У сучасных гістарычных умовах БКТ не мела той адміністрацыйнай падтрымкі з боку улад, кіраўніцтва прадпрыемстваў і ўстаноў, як у міжваенны час. Не ўдалося вызначыць кірункі і формы ўдзелу цэнтральных органаў у краязнаўчым руху. Функцыянаванне цэнтра цалкам залежала ад актыўнасці і зацікаўленасці ў працы абранага кіраўніцтва, дзейнасць якога, на жаль, трымалася на энергічнасці Г.А.Каханоўскага. Пасля яго заўчаснай смерці ў 1994 г. праца цэнтральных органаў БКТ прыпынілася.

Аднак усведамляючы важнасць арганізацыі грамадскага краязнаўчага руху і ролю кіруючых органаў, праз некаторы час беларускія краязнаўцы зноў паставілі пытанне аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адраджэнні БКТ. Было вызначана шырокае кола задач па выяўленні крыніц краязнаўства, арганізацыі турыстычна-экскурсійнай і выхаваўчай дзейнасці, развіцці краязнаўчага друку, распрацоўцы прапаноў для рэгулявання праваадносін у сферы гісторыка-культурнай спадчыны. Аднак дзейнасць БКТ не ўдалося наладзіць і на гэты раз.

Краязнаўчыя колы працягвалі адстойваць ідэю аднаўлення БКТ як структураванай рэспубліканскай грамадскай арганізацыі, узначальваемай цэнтральнымі органамі. Для дасягнення мэты і дапамогі краязнаўцам ва ўзаемадзеянні ў 2003 г. стала магчымым распачаць выданне "Краязнаўчай газеты". Галоўным рэдактарам газеты стаў старшыня БФК Уладзімір Гілеп. У склад рэдакцыі ўвайшлі вядомыя сучасныя краязнаўцы В.У.Скалабан, А.І.Мальдзіс, В.П.Рагойша, А.П.Грыцкевіч, А.М.Карлюкевіч і інш. У раздзелах і рубрыках газеты ўсебакова адлюстроўваюцца новыя дасягненні краязнаўства. Узбагачаючы веды аб мінулым розных мясцін Беларусі, газета асвятляе сучасныя формы краязнаўства, арганізуе абмен думкамі. На старонках газеты з 2003 г. друкуецца "Малая краязнаўчая энцыклапедыя", якая знаёміць з паняццямі, неабходнымі пачынаючым краязнаўцам, аматарам краязнаўства. У рубрыцы "Сучасныя беларускія краязнаўцы" змяшчаюцца матэрыялы да слоўніка дзеячаў краязнаўства.

Лідэры сучаснага краязнаўства У.А.Гілеп, А.І.Бутэвіч, В.У.Скалабан і іншыя выканалі вялікую работу па кансалідацыі краязнаўцаў і падрыхтоўцы новага ўстаноўчага з'езда. Наступная спроба стварэння БКТ адбылася вясной 2005 г. падчас краязнаўчай канферэнцыі ў БДУ культуры і мастацтваў. Аднак ініцыятары атрымалі адмову ў юрыдычнай рэгістрацыі таварыства.

Калі спробы адрадзіць цэнтральны кіруючы орган краязнаўства былі няўдалымі, то стварэнне краязнаўчых арганізацый на месцах вялося паспяхова. Гэтыя арганізацыі падтрымліваюцца мясцовымі ўладамі. У сельскіх населеных пунктах, гарадах, раёнах, абласцях, ва ўстановах пачалі дзейнічаць таварыствы, якія аб'ядналі аматараў краязнаўства, спецыялістаў і вучоных. Сучасныя краязнаўчыя арганізацыі значна адрозніваюцца паміж сабой складам і колькасцю ўдзельнікаў, матэрыяльна-рэсурснай базай, задачамі і зместам работы. У адпаведнасці з гэтымі прыметамі магчыма ды-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ферэнцыраваць сучасныя краязнаўчыя арганізацыі на пэўныя группы.

1. Краязнаўчыя навуковыя і навукова-асветныя таварыствы, дзейнасць якіх прысвечана даследаванню і папулярызацыі ведаў аб пэўнай тэрыторыі. Аб'ядноўваюць пераважна вучоных, спецыялістаў і даследчыкаў-аматараў пэўнага рэгіёну. Іх удзельнікі праводзяць навуковыя канферэнцыі, выпускаюць навуковую і папулярную літаратуру, перыядычныя выданні, выступаюць у сродках масавай інфармацыі, праводзяць сустрэчы з насельніцтвам у бібліятэках, школах, ВНУ. Да ліку такіх арганізацый адносяцца, напрыклад, заходнепалескае навукова-краязнаўчае таварыства "Загароддзе", грамадскае аб'яднанне "Культурна-гістарычная калегія імя К.Астрожскага", "Тураўскае навукова-асветнае таварыства", "Віцебскі краязнаўчы фонд імя А.Сапунова", навагрудскае таварыства філаматаў "Прамень" і інш.

Так, навукова-краязнаўчае таварыства "Загароддзе", зарэгістраванае пры НАН Беларусі, дзейнічае з 1995 г. і мае афіцыйны статус рэспубліканскага грамадскага аб'яднання. Яго членамі з'яўляюцца вучоныя, настаўнікі і іншыя краязнаўцы, чые навуковыя інтарэсы звязаны з Заходнім Палессем. Узначальвае таварыства ўраджэнец рэгіёну, вучоны Ф.Д.Клімчук. Асноўная форма дзейнасці – міжнародныя навуковыя семінары і канферэнцыі, удзельнікамі якіх з'яўляюцца як члены таварыства, так і іншыя зацікаўленыя даследчыкі. Напрыклад, актыўнымі ўдзельнікамі навуковых семінараў па пытаннях даследавання Палесся з'яўляюцца настаўнікі СШ Брэстчыны Я.Р.Квачук, Ю.П.Максімовіч, вучоныя НАН Ф.Д.Клімчук, М.А.Саскевіч і інш. Матэрыялы навуковых семінараў апублікаваны ў трох выпусках зборніка "Загароддзе". Сайт таварыства размешчаны ў Інтэрнеце.

Падобны статус мае грамадскае аб'яднанне "Тураўскае навукова-асветнае таварыства", буйнейшым вынікам дзейнасці якога з'яўляюцца зборнікі "Тураўшчына", што выдаюцца разам з НАН Беларусі. Актыўную выдавецкую дзейнасць праводзіць "Віцебскі краязнаўчы фонд імя А.Сапунова". Таварыства філаматаў "Прамень" (г. Навагрудак) выдавала гісторыка-літаратурны часопіс "Зямля Навагрудская" на беларускай і польскай мовах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Краязнаўчыя арганізацыі, прафіляваныя на пэўным змесце, актуальнай для рэгіёну тэматыцы даследаванняў. Да іх ліку адносяцца гісторыка-краязнаўчыя цэнтры, клубы гістарычнай рэканструкцыі і інш. Так, у Смаргоні Уладзімір Лігута стварыў ваенна-гістарычны цэнтр, прысвечаны падзеям Першай сусветнай вайны. Клубы, якія займаюцца гістарычнай рэканструкцыяй, не толькі праводзяць работу па дэталёвым вывучэнні асобных падзей, але таксама мерапрыемствы, якія абуджаюць у насельніцтва цікавасць да мінулага. Так, падчас III Міжнароднага рыцарскага фестывалю, які адбыўся ў верасні 2007 г. на цэнтральнай пляцоўцы гісторыка-культурнага комплексу "Лінія Сталіна", выступленні 30 рыцарскіх клубаў прыцягнулі шматлікіх гледачоў.

3. Краязнаўчыя гурткі і таварыствы, створаныя ў сістэме навучальных устаноў, па зместавай накіраванасці дзейнасці могуць адпавядаць профілю першай ці другой груп краязнаўчых арганізацый, але іх удзельнікамі, як правіла, з'яўляюцца прадстаўнікі дадзенай установы: студэнты, навучэнцы, выкладчыкі, аспіранты, магістранты.

Задачы краязнаўства з'яўляюцца арганічнымі і для шэрага іншых грамадскіх арганізацый экалагічнага, турыстычнага ці іншага профілю. Гэта натуральная і вельмі станоўчая з'ява, якая паказвае латэнтнае праяўленне краязнаўства на розных участках грамадскага жыцця. Напрыклад, нацыянальна-культурныя таварыствы, якія аб'ядноўваюць прадстаўнікоў пэўнага этнасу (палякаў, татар, літоўцаў, украінцаў) і гісторыі, праводзяць разнастайную культурна-масавую і асветніцкую работу, гістарычныя даследаванні, наладзілі друк на этнічных мовах і аб этнасах. Напрыклад, Саюз палякаў у Беларусі і яго рэгіянальныя суполкі выпускаюць мясцовую перыёдыку "Ziemia Lidzka"[141] (Ліда), "Głos znad Niemna" (Гродна); украінскае грамадска-культурнае аб'яднанне – "Голос Берестейщини" (Брэст), асветніцкая арганізацыя "Просвіта Берестейщини імені Т.Шевченко" – газету "Берестейский край". На старонках такіх выданняў змешчана шмат новых па змесце і навуковых падыходах матэрыялаў. Адной з самых дзейсных арганізацый з'яўляецца Таварыства польскай культуры Лідскай зямлі, якое выпускае

[141] З органа Лідскага аддзела Саюза палякаў у Беларусі газета пераўтварылася ў незалежнае выданне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўчыя кнігі[142]. Нацыянальна-культурныя таварыствы ўкараняюць унікальныя формы краязнаўчай работы, як, напрыклад, першы сусветны з'езд лідзян (май 1992 г.), дзе сабраліся ўраджэнцы Лідскага рэгіёну і іх нашчадкі з многіх краін[143].

Некаторыя рэгіянальныя арганізацыі спынілі сваю работу, але ў той жа час стварэнне новых краязнаўчых арганізацый працягваецца. Вельмі істотную ролю адыгрываюць матэрыяльныя ўмовы і суб'ектыўны фактар. Калі з'яўляюцца дасведчаныя і апантаныя краязнаўствам людзі, тады паспяхова рэалізуюцца буйныя краязнаўчыя праекты.

У 90-я гг. краязнаўчыя арганізацыі, як правіла, разам з навуковымі і навучальнымі арганізацыямі, музеямі, мясцовымі выканаўчымі камітэтамі і іншымі ўстановамі наладзілі правядзенне раённых і гарадскіх навуковых краязнаўчых канферэнцый і чытанняў. Некаторыя з іх – у Браславе, Навагрудку, Карэлічах, Гомелі, Гродне, Полацку, Рагачове, Рэчыцы і іншых гарадах – сталі традыцыйнымі. Краязнаўчыя канферэнцыі і чытанні належаць да лепшых формаў сучаснага краязнаўства. Матэрыялы канферэнцый, як правіла, публікуюцца ў навуковых зборніках. Так, зборнік "Першыя і Другія Карэліцкія чытанні" (1996) быў прымеркаваны да 600-годдзя Карэліч і Міра, якое шырока адзначалася ў 1995 г. Сярод аўтараў артыкулаў былі такія вядомыя вучоныя, як А.Мальдзіс, Д.Бубноўскі, У.Мархель, Я.Запруднік і інш. Па-новаму яны адлюстравалі постаці славутых людзей рэгіёну: І.Дамейкі, Б.Кіта, У.Жылкі і іншых, гістарычныя падзеі і факты.

Даклады, выставы, экскурсіі, прэзентацыі, якія праводзяцца падчас канферэнцый, зносіны з мясцовым насельніцтвам дазваляюць шырока распаўсюдзіць вынікі новых даследаванняў, вярнуць забытыя імёны, спрыяюць пераадоленню састарэлых стэрэатыпаў, абуджаюць інтарэс да мясцовай гісторыі, узмацняюць нацыянальную свядомасць і патрыятызм. Пад уплывам навуковых адкрыццяў грамадскасць многіх рэгіёнаў дамаглася ўстанаўлення памятных дошак і

[142] Напрыклад, "Ігнацій Дамейка (1802–1889)" (2000), "Казімір Нарбутт (1738–1807)" (2004), "Мацей Догель (1715–1760)" (2006) і інш.

[143] Jak Feniks z popiołu...Polacy na ziemi Lidzkiej w latach 1987–1997. – Lida: T-wo kultury polskiej ziemi Lidzkiej, 1997. – S.63.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

помнікаў выдатным землякам, ушанавання адметных гістарычных падзей.

Кожная краязнаўчая арганізацыя з'яўляецца унікальнай, і вельмі пажадана, каб яе ўзнікненне і дзейнасць былі дакументальна зафіксаваны, але такіх фактаў няшмат. Так, А.С.Кузьміч вывучае арганізацыю Гомельскага гарадскога краязнаўчага таварыства, У.М.Ліўшыц, Т.В.Кузьмініч – развіццё краязнаўчых арганізацый у Горках Магілёўскай вобласці.

Працягваецца плённая дзейнасць на ніве краязнаўства добраахвотных грамадскіх арганізацый, якія займаліся ёю на папярэднім этапе. У 90-я гг. некаторыя з гэтых арганізацый, згубіўшы падтрымку дзяржаўных структур, страцілі значную колькасць сваіх членаў, не мелі магчымасці працаваць па шэрагу апрабаваных кірункаў дзейнасці. Але прайшоўшы шлях пераацэнкі дзейнасці і вызначэння новых формаў і кірункаў, яны ўносяць плённы ўклад у краязнаўства. Так, Беларускае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры і яго абласныя саветы працягваюць шматбаковую дзейнасць, накіраваную на захаванне рэгіянальнай гісторыка-культурнай спадчыны, папулярызацыю яе здабыткаў, патрыятычнае выхаванне грамадзян, асабліва моладзі.

Інтарэс да краязнаўства паказваюць новыя грамадскія арганізацыі, такія як Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, гістарычныя клубы. У газеце ТБМ імя Скарыны “Наша слова” пастаянна друкуюцца артыкулы, прысвечаныя важнейшым падзеям гістарычнага мінулага, знакамітым людзям Беларусі.

У розных плынях сучаснага краязнаўства працуюць апантаныя даследчыкі. Значны ўклад у вывучэнне і папулярызацыю ведаў пра Брэстчыну ўнеслі Л.М.Несцярчук, В.Я.Ляшук, Т.А.Хвагіна; Віцебшчыну – У.Арлоў, К.С.Шыдлоўскі, С.М.Асіноўскі, А.М.Падліпскі, А.Г.Лісаў, Д.Р.Газін, І.Зямчонак; Гомельшчыну – У.Ф.Ісаенка, А.І.Атнагулаў; Гродзеншчыну – А.І.Мальдзіс, А.М.Белакоз, І.П.Крэнь, А.М.Пяткевіч, В.В.Швед, М.П.Гайба, В.М.Чарапіца; Магілёўшчыну – А.Р.Агееў, І.А.Пушкін, І.А.Марзалюк, У.М.Ліўшыц, А.І.Мартынаў, А.М.Ненадавец; Міншчыну – А.П.Грыцкевіч, Э.М.Загарульскі, А.М.Карлюкевіч, Я.Я.Янушкевіч, Ф.І.Янушкевіч, В.П.Рагойша, А.І.Валахановіч, У.І.Содаль; г.Мінск –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З.Ф.Шыбека, У.Дзянісаў і інш. Многія гісторыкі-краязнаўцы прысвяцілі свае творы розным мясцінам Беларусі. Гэта вучоныя М.І.Ермаловіч, Г.В.Кісялёў, М.А.Ткачоў, В.У.Скалабан, даследчык унікальнай сядзібнай культуры А.Т.Федарук, пісьменнік Ю.Татарынаў і інш.

## Глава 2. Школьнае краязнаўства

Адметнасцю арганізацыі школьнага краязнаўства на сучасным этапе з'яўляецца сумесная дзейнасць школ і шырокага кола пазашкольных устаноў. Вядучая роля ў развіцці краязнаўчай дзейнасці ў навучальных установах на сучасным этапе належыць Міністэрству адукацыі РБ і Рэспубліканскаму цэнтру турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі, якія ўзаемадзейнічаюць з шырокім колам іншых арганізацый, устаноў, грамадскіх таварыстваў. Пад іх кіраўніцтвам развіваюцца арганізацыйныя формы краязнаўства, фарміруюцца яго змястоўныя аспекты. Міністэрства адукацыі садзейнічае ўкараненню рэгіёназнаўчага зместу ў вучэбныя дысцыпліны. Такі падыход спрыяе лепшаму засваенню ведаў, таму што на мясцовым матэрыяле лягчэй рэалізуюцца даступнасць, нагляднасць і некаторыя іншыя педагагічныя прынцыпы. У рэзалюцыях I і II з'ездаў настаўнікаў Беларусі (1998, 2001) была зафіксавана неабходнасць сістэматычнай краязнаўчай работы з вучнямі. Напрыклад, дзяржаўны адукацыйны стандарт па геаграфіі (1999, новая рэдакцыя 2002) прадугледжвае абавязковае вывучэнне геаграфіі сваёй вобласці, што садзейнічае сістэматызацыі ведаў аб глабальных, рэгіянальных і мясцовых экалагічных, палітычных і сацыяльна-эканамічных працэсах.

Міністэрства адукацыі ўлічвае высокую ролю краязнаўства ў грамадзянскім і патрыятычным выхаванні дзяцей і юнацтва, ахопліваючы не толькі навучанне, але пазакласную і пазашкольную дзейнасць. У сістэме міністэрства працуюць 53 установы, якія займаюцца развіццём турыстычна-краязнаўчай дзейнасці. У абласных цэнтрах створаны аддзелы беларусазнаўства і краязнаўства па арганізацыі пазашкольнай працы. Гэтыя аддзелы займаюцца арганізацыяй школьнага краязнаўства і яго навукова-метадычным забеспячэннем. Краязнаўчыя аддзелы функцыянуюць у складзе рэгіянальных цэнтраў фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Так, удзельнікі пошукавага клуба Магілёўскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту пад кіраўніцтвам вядомага краязнаўца М.С.Барысенкі ўстанавілі імёны 25 воінаў, загінуўшых пры абароне Магілёва.

Сярод устаноў Міністэрства адукацыі асаблівую ролю адыгрывае Рэспубліканскі цэнтр турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі. Цэнтр спалучае актуальныя і запатрабаваныя сярод школьнікаў і юнацтва кірункі дзейнасці. Аздараўляльныя і спартыўныя мэты разам з пазнаннем роднага краю выхоўваюць станоўчыя маральныя якасці ў моладзі. У складзе Рэспубліканскага цэнтра ёсць аддзелы – метадычны, краязнаўчы, экскурсійны, патрыятычнага выхавання. Гэтыя аддзелы каардынуюць, абагульняюць вопыт, рыхтуюць да выпуску метадычныя дапаможнікі, аказваюць дапамогу ў арганізацыі экскурсій. У раёнах вылучаны дзіцяча-юнацкія цэнтры турызму і экскурсій, дзе пад кіраўніцтвам вопытных педагогаў вядзецца турыстычна-экскурсійная і пошукава-даследчая работа.

Асноўнымі арганізацыйнымі формамі краязнаўчай дзейнасці ў школах з'яўляюцца: удзел ва ўсебеларускай турыстычна-краязнаўчай экспедыцыі "Жыву ў Беларусі і тым ганаруся" (раней "Наш край"), стварэнне краязнаўчых музеяў, даследчая работа.

У 1992 г. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь была зацверджана ўсебеларуская турыстычна-краязнаўчая экспедыцыя "Наш край" (замест экспедыцыі "Моя Родина – СССР"). На розных этапах экспедыцыі ставіліся мэты далучыць вучняў да больш глыбокага вывучэння спадчыны роднага краю, стварэння рэгіянальных краязнаўчых праграм і праектаў, распрацоўкі арыгінальных маршрутаў па наваколлі. Так, падчас выканання IV этапу ў 2004–2006 гг. школьнікі ўдзельнічалі ў такіх маршрутах, як "Прыродная спадчына", "Адраджэнне гістарычнай памяці", "Культурная спадчына", "Старонкі ваеннай гісторыі", "Славутыя імёны Бацькаўшчыны". Абласныя, гарадскія і раённыя краязнаўчыя саветы распрацавалі рэгіянальныя праграмы ("Пазнай сябе і свой край" у Гомельскай вобласці, "Нам засталася спадчына" ў Гродзенскай вобласці, "Наш край Прыдняпроўскі" ў Магілёўскай вобласці). На аснове абласных праграм былі распрацаваны раённыя і гарадскія праграмы: "Аршаназнаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ства”, “Мінсказнаўства”, “Смаргоназнаўства” і інш. Праграмы дапамагаюць сістэмна развіваць турыстычна-краязнаўчую дзейнасць.

Вынікі даследаванняў, выкананых навучэнцамі, прадстаўляюцца на краязнаўчых чытаннях, алімпіядах і конкурсах, на абласных і рэспубліканскіх канферэнцыях удзельнікаў экспедыцыі, асвятляюцца ў СМІ. На Магілёўшчыне традыцыйным стала правядзенне абласных краязнаўчых алімпіяд, у арганізацыі якіх удзельнічае абласны краязнаўчы музей. Краязнаўчыя конкурсы праходзяць ва ўсіх абласцях краіны. На базе Рэспубліканскага цэнтра турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі праводзяцца вучнёўскія канферэнцыі па рознай тэматыцы, на якіх юныя краязнаўцы асвятляюць вынікі даследчай працы, вядуць абмен вопытам краязнаўчай работы. Прызнаны навуковая каштоўнасць матэрыялаў даследаванняў і іх значэнне для выкарыстання ў вучэбна-выхаваўчай дзейнасці.

Рэспубліканскі цэнтр турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі сумесна з Беларускім добраахвотным таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры і БФК праводзіць рэспубліканскія конкурсы на лепшы праект краязнаўчага маршруту “Мой край”, лепшы музей, пакой, экспазіцыю прыродазнаўчага профілю і інш. Высокія ацэнкі атрымалі краязнаўчыя праекты, падрыхтаваныя вучнямі Крэўскай СШ Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці, СШ № 13 г.Мінска, Рагачоўскага краязнаўчага цэнтра Гомельскай вобласці, дзіцяча-юнацкага цэнтра падарожжаў і краязнаўства “Бабраня” г. Бабруйска Магілёўскай вобласці і інш.

Традыцыйным стала правядзенне рэспубліканскіх краязнаўчых чытанняў педагагічных работнікаў. Такія чытанні праводзіліся ў абласных гарадах і ў Мінску. Так, БДУ культуры і мастацтваў сумесна з Рэспубліканскім цэнтрам турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі правялі рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю і чытанні з педагогамі-краязнаўцамі па тэме “Краязнаўства і патрыятычнае выхаванне моладзі” (2005); рэспубліканская канферэнцыя па тэме “Краязнаўства як адзін з кірункаў вучэбна-выхаваўчай работы ў школе і ВНУ” прайшла ў Брэсце (2008).

Паспяхова працягваецца пошукавая дзейнасць вучняў па аднаўленні невядомых фактаў і падзей Вялікай Айчыннай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вайны. Да свята 60-годдзя Перамогі праводзілася рэспубліканская патрыятычная акцыя навучэнцаў “Перамога”. Разам з педагогамі юныя краязнаўцы вывучалі архіўныя дакументы, гістарычную літаратуру, запісвалі ўспаміны, пабывалі на экскурсіях і ў паходах па месцах ваенных дзеянняў, аказалі дапамогу ветэранам вайны, добраўпарадкавалі помнікі. Краязнаўцамі Гомельскай вобласці былі выяўлены 1016 імён невядомых воінаў, адкрыты 22 помнікі і мемарыяльныя дошкі, а ў Мінскай вобласці – 25 помнікаў, памятных знакаў і дошак, выяўлены 133 імёны воінаў[144].

У сярэдзіне 90-х гг. XX ст. Міністэрствам адукацыі былі прыняты інструкцыйна-метадычныя матэрыялы па арганізацыі турыстычна-краязнаўчай і экскурсійнай работы, у якіх былі раскрыты значнасць, правілы і нормы яе арганізацыйнага, матэрыяльнага, кадравага і метадычнага забеспячэння. Прынятыя меры дапамаглі ахапіць больш чым 40 тысяч навучэнцаў работай у 5125 турыстычна-краязнаўчых гуртках, тады як у пачатку 90-х гг. у краязнаўчых гуртках у школах займаліся каля 38 тысяч навучэнцаў. У сістэме адукацыі дзейнічалі 33 цэнтры дзіцяча-юнацкага турызму, 31 дзіцячыя турбазы. У Рэспубліканскім цэнтры турызму і краязнаўства ёсць турысцкая база на 100 месцаў. Па папярэдніх заказах складаецца праграма абслугоўвання, прапануюцца цікавыя экскурсійныя маршруты. У краіне стала традыцыяй штогод у канцы навучальнага года праводзіць “Тыдзень турызму і краязнаўства для дзяцей і моладзі”. Ва ўсіх школах у гэты час адбываюцца турыстычныя спаборніцтвы, конкурсы, краязнаўчыя алімпіяды, выставы, арганізуюцца экскурсіі або паходы, сустрэчы з вядомымі людзьмі горада ці вёскі, адкрываюцца новыя экспазіцыі ў школьных музеях. Турыстычна-краязнаўчая дзейнасць, лічыць С.С.Мітраховіч, “заўсёды стварае аптымістычны настрой, фарміруе станоўчыя эмоцыі ў дачыненні да народных традыцый, культуры, гістарычнага мінулага”. У раёнах вылучаны дзіцяча-юнацкія цэнтры турызму і экскурсій, дзе пад кіраўніцтвам вопытных педагогаў вядзецца турыстычна-экскурсійная і пошукава-даследчая работа.

[144] *Кравец, А.* Экспедыцыя навучэнцаў “Наш край” / А.Кравец // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 6. – С. 63.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пачатку 90-х гг. адбылося прыметнае скарачэнне колькасці музеяў у школах, ПТУ, пазашкольных установах (з 1290 у 1989 г. да каля 900 у 1994 г.). У сярэдзіне 90-х гг. Міністэрства адукацыі прыняло некалькі нарматыўна-рэгламентуючых дакументаў, якія павысілі значэнне музейнай дзейнасці ў навучальных і выхаваўчых установах. Міністэрства адукацыі акцэнтавала ўвагу на іх выхаваўча-педагагічнай ролі. Было прапанавана ствараць музеі вайсковай і працоўнай славы, партызанскай славы; музеі гісторыі школы, вёскі, горада, раёна; музеі этнаграфіі, археалогіі, геаграфіі і інш. Важнае значэнне мела Палажэнне аб музеі ўстановы адукацыі, зацверджанае пастановай Міністэрства адукацыі № 52 ад 4 снежня 2002 г. Зараз у краіне працуюць 1426 музеяў, з якіх 63 музеі народныя (узорныя). Звыш 600 музеяў з'яўляюцца гісторыка-краязнаўчымі, каля 300 – баявой славы, каля 200 – этнаграфічных, некалькі дзесяткаў – літаратурных. Сярод вядомых школьных музеяў можна адзначыць краязнаўчыя музеі Лоскай базавай школы Валожынскага раёна Мінскай вобласці (кіраўнік М.І. Вайцюлевіч), гісторыка-краязнаўчы музей Радуньскай СШ Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці (кіраўнік І.І.Фясенка), Заронаўскай базавай школы Віцебскага раёна (кіраўнік Л.К.Нікіціна).

## Глава 3. Дзяржаўнае краязнаўства

На сучасным этапе мясцовыя ўлады аказваюць значную падтрымку развіццю розных формаў краязнаўчага руху і часта самі ініцыіруюць вельмі цікавыя і карысныя краязнаўчыя праекты. Так, на працягу трох месяцаў у канцы 2007 – пачатку 2008 г. па ініцыятыве Вілейскага райвыканкама ішло інтэрнет-галасаванне "Сем цудаў Міншчыны", у якім прынялі ўдзел звыш 300 000 чалавек. Па яго выніках прыгажэйшыя помнікі Мінскага рэгіёну: Будслаўскі касцёл, Уваскрасенскі сабор у Барысаве і іншыя – стануць аб'ектам спецыяльна распрацаванага турыстычнага маршруту пад той жа назвай. Шматлікія фестывалі, конкурсы і святы, якія праходзяць у многіх рэгіёнах Беларусі пры падтрымцы мясцовых улад, раскрываюць багацці традыцыйнай народнай культуры і мастацтва, садзейнічаюць іх збераржэнню і засваенню падрастаючым пакаленнем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распрацоўваючы рэгіянальныя праграмы, органы мясцовага кіравання ў іх кантэксце вырашаюць шматлікія пытанні захавання і папулярызацыі гістарычна-культурнай спадчыны, прыродных рэсурсаў, вопыту эканамічнай дзейнасці, патрыятычнага выхавання насельніцтва і інш. Афіцыйныя сайты многіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных органаў кіравання змяшчаюць каштоўную краязнаўчую інфармацыю, якая бесперапынна папаўняецца і ўдасканальваецца. Яшчэ больш высокі ўзровень адміністрацыйнай падтрымкі перад краязнаўчым рухам адкрываецца ў сувязі з рэалізацыяй рэгіянальных інавацыйных праграм. Навуковае і інфармацыйнае іх забеспячэнне – поле для плённага супрацоўніцтва з мясцовым кіраўніцтвам.

Краязнаўцы, са свайго боку, уносяць прапановы для супрацоўніцтва, ставяць пытанні, вырашэнне якіх патрабуе ўдзелу мясцовых улад.

### *3.1. Развіццё краязнаўчай дзейнасці навуковых устаноў*

Структурныя падраздзяленні Нацыянальнай акадэміі навук РБ аказваюць падтрымку сучаснаму краязнаўчаму руху. На базе НАН зарэгістравана заходнепалескае навуковае краязнаўчае таварыства “Загароддзе”, вучоныя акадэміі ўдзельнічаюць у краязнаўчых канферэнцыях у рэгіёнах, а інстытуты – у іх арганізацыі. Правядзенне акадэміяй шматлікіх рэгіёназнаўчых даследаванняў аказвае станоўчы ўплыў і на актывізацыю навуковай работы мясцовых краязнаўстваў.

Прыметны інтарэс да краязнаўчай дзейнасці праявіў Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Францыска Скарыны, створаны ў 1991 г. у сувязі са святкаваннем 500-годдзя з дня нараджэння вялікага беларускага патрыёта і першадрукара. Ініцыятар адкрыцця гэтай унікальнай установы – выдатны вучоны і краязнавец А.І.Мальдзіс. Цэнтр быў размешчаны ў доме, дзе ў 20-я гг. працаваў Інбелкульт. У Скарынаўскім цэнтры вяліся навуковыя даследаванні па гісторыі, краязнаўстве, беларусазнаўстве. Цэнтр стварыў банк даных у выглядзе выразак артыкулаў аб развіцці краязнаўства ў розных мясцінах Беларусі, арганізаваў дзесяткі навуковых канферэнцый, на якіх знайшла месца і краязнаўчая тэматыка. У шматлікіх выданнях, асабліва ў зборніках “Беларусіка = Albaruthenica”, апублікаваны краязнаўчыя матэрыялы вялікай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навуковай каштоўнасці. Гіпатэтычна гэта ўстанова магла б прэтэндаваць на кіруючую ролю ў сучасным грамадскім краязнаўчым руху, але такая роля самім цэнтрам не разглядалася. На жаль, гэта ўстанова цяпер страціла свой статус.

Важную ролю ў інфармацыйна-дакументальным забеспячэнні краязнаўства, у правядзенні краязнаўчых даследаванняў і папулярызацыі ведаў выконваюць музеі і архівы. Гэтыя ўстановы, асабліва музеі, развіваюцца як галоўныя цэнтры навуковай краязнаўчай дзейнасці ў рэгіёнах. Абласныя краязнаўчыя музеі распрацоўваюць шматлікія навуковыя тэмы, папаўняюць калекцыі і экспазіцыі, папулярызуюць краязнаўчыя веды. Узрасла іх роля ў арганізацыі краязнаўчага руху ў рэгіёнах. Абласныя музеі выступаюць арганізатарамі краязнаўчых канферэнцый, выдаюць краязнаўчыя зборнікі, супрацоўнічаюць з іншымі суб’ектамі краязнаўства. Так, у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі шырока прадстаўлена гісторыя і прырода краю, мастацтва. Каштоўнымі экспанатамі з’яўляюцца гравюра “Гродна 1586 г.”, вырабы гродзенскіх рамеснікаў XVII–XVIII стст., рэчы, звязаныя з нацыянальна-вызваленчымі паўстаннямі, партрэты выдатных землякоў і інш. З 1990 г. музей выдае “Краязнаўчыя запіскі”.

Колькасць краязнаўчых музеяў бесперапынна павялічваецца, узбагачаюцца іх калекцыі, пашыраюцца формы дзейнасці. Краязнаўчыя музеі ствараюцца не толькі ў гарадах, але і ў сельскіх населеных пунктах. Так, у 1997 г. пачалася дзейнасць Валожынскага раённага краязнаўчага музея. Цікавейшы Германавіцкі музей мастацтва і этнаграфіі імя Я.Драздовіча з 1992 г. працуе ў Шаркаўшчынскім раёне Віцебскай вобласці. А ў вёсцы Ракаў Валожынскага раёна былі створаны тры краязнаўчыя музеі (Музей політэхнічнай культуры Ракаўшчыны, заснаваны доктарам філалагічных навук, прафесарам В.П.Рагойшам; арт-музей, прысвечаны мастацтву ракаўскай керамікі, заснаваны мастаком Ф.Янушкевічам і школьны музей гістарычна-этнаграфічнага профілю), праводзяцца Міжнародныя Ракаўскія чытанні.

Большасць краязнаўчых музеяў вядуць навукова-даследчую, навукова-экспазіцыйную, выставачную, навукова-асветніцкую і выдавецкую дзейнасць. Важнай з’явай у дзейнасці краязнаўчых музеяў стала яе дэідэалагізацыя. У



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

многіх музеях аднавіліся экспазіцыі, зараз яны больш поўна і аб'ектыўна адлюстроўваюць гістарычнае мінулае краю.

Пад кіраўніцтвам Камітэта па архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (Белкамархіў) працуе сетка архіваў, якую складаюць 6 рэспубліканскіх, 6 абласных, 16 занальных архіваў, 3 абласных архівы грамадскіх аб'яднанняў, раённыя, гарадскія і ведамасныя архівы. У архівах змяшчаецца велізарная колькасць дакументаў, з дапамогай якіх можна вывучаць падзеі мінулага, сямейную гісторыю, гісторыю арганізацый і ўстаноў. У 2000 г. была створана Археаграфічная камісія Белкамархіва. Археаграфічная камісія садзейнічае ўвядзенню ў навуковае абарачэнне каштоўных архіўных дакументаў, публікацыі гістарычных першакрыніц, праводзіць навуковыя канферэнцыі. Так, Віцебскае аддзяленне Археаграфічнай камісіі правяло навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя 150-годдзю з дня нараджэння А.П.Сапунова і 90-годдзю Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. Умацаванне архіўнай службы ў краіне, павышэнне ўвагі да выкарыстання архіўных збораў у грамадскіх мэтах спрыялі публікацыі дакументаў, значных для краязнаўчых даследаванняў. Пачалося выданне зборнікаў актавых дакументаў, прысвечаных рэгіёнам: "Аграрные преобразования в Вилейской области" (2003), "Аграрные преобразования в Молодечненской области. 1944–1953" (2003), "Гродненская губерния в законодательных актах Российской империи (1801–1913) (2004) і інш. У дзяржаўным архіве Гомельскай вобласці па сумесным праекце з Гомельскім дзяржаўным універсітэтам рыхтуецца зборнік дакументаў і матэрыялаў, прысвечаных малым дыяспарам Гомельшчыны ў 20–30-я гг. XX ст. Такія выданні пашыраюць кола дакладных крыніц, неабходных даследчыкам краю.

Дакументы для ўзнаўлення радаводаў ураджэнцаў Гродзеншчыны і беларускіх зямель Віленшчыны часоў Расійскай імперыі захоўваюцца пераважна ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне; ураджэнцаў былых Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай, а таксама часткова Гродзенскай губерняў – у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ). Гэты кірунак гістарычна-краязнаўчых даследаванняў быў не запатрабаваным у савецкі час. Упершыню ў 90-я гг. архіўныя ўстановы пачалі выданне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэгіянальных гербоўнікаў беларускай шляхты, надзвычай каштоўных крыніц для вывучэння сямейна-радавой і саслоўнай гісторыі (“Малы гербоўнік Наваградскай шляхты”, “Малы гербоўнік Халопеніцкай шляхты”і інш.)

Адным з буйнейшых сучасных праектаў захавання і пашырэння даступнасці архіўных матэрыялаў стаў праект “Нясвіж – культурны цэнтр Еўропы і нацыянальны помнік”, з якім Беларусь увайшла ў міжнародную праграму ЮНЕСКА “Памяць свету”. У межах праекта ствараецца электронны банк даных, у які будуць уключаны ўсе дакументы з архіва Радзівілаў. У Беларусі захоўваецца звыш 28 тысяч дакументаў з былога нясвіжскага збору, столькі ж захоўваецца ў Польшчы, каштоўныя рукапісы засталіся ў Літве, Расіі і Украіне. Усе гэтыя краіны аб’ядналіся для стварэння віртуальнага нясвіжскага архіва. Гэты праект дапаможа ўвесці ў навуковы ўжытак каштоўныя дакументы аб Нясвіжы і многіх іншых мясцінах Беларусі і замежжа.

### *3.2. Развіццё краязнаўства ва універсітэтах*

Рэгіянальныя універсітэты на сучасным этапе з’яўляюцца буйнейшымі цэнтрамі навуковых краязнаўчых даследаванняў, якія ажыццяўляюцца сіламі выкладчыкаў і студэнтаў. Тут вядуцца даследаванні актуальнай тэматыкі, чытаюцца курсы краязнаўчага характару, рыхтуецца навуковая і метадычная літаратура, прысвечаная краязнаўчай дзейнасці, выпускаюцца манаграфіі, зборнікі і вучэбныя выданні аб рэгіёне, праводзяцца навуковыя канферэнцыі, створаны музеі ВНУ. Вялікая даследчая і арганізацыйная праца па краязнаўстве працягваецца ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы. Гістарычны факультэт, кафедра гісторыі Беларусі ўдзельнічалі ў арганізацыі і правядзенні Міжнароднай навуковай канферэнцыі “60-летие образования Гродненской области” (2004) і інш.

У Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С.Пушкіна адкрыта кафедра методыкі выкладання беларускай літаратуры і краязнаўства, уведзены шэраг дысцыплін краязнаўства (“Літаратурнае краязнаўства”, “Лінгвістычнае краязнаўства”, “Літаратура Берасцейшчыны”, “Польскамоўная літаратура Берасцейшчыны” і іншыя), распрацаваны спецыялізаваныя праграмы практыкі, падрыхтаваны вучэбна-метадычныя ма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрыялы і дапаможнікі. У Брэсцкім, Віцебскім і Магілёўскім дзяржаўных універсітэтах выкладаюцца курсы "Геаграфія вобласці". Значны ўклад у навукова-метадычнае забеспячэнне краязнаўства ўносіць калектыў БДУ. Напрыклад, выйшла новае выданне вучэбнага дапаможніка Я.М. Мяшэчкі "Географическое краеведение" (2002). У Магілёўскім дзяржаўным універсітэце харчавання для студэнтаў усіх спецыялізацый дзённай і завочнай формаў навучання ўведзена дысцыпліна "Гістарычная і культурная спадчына горада Магілёва".

Праблемам выкладання краязнаўства і яго выхаваўчага патэнцыялу прысвячаюцца рэспубліканскія і міжнародныя навуковыя канферэнцыі, якія праводзяцца ва універсітэтах: Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы, Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М.Танка, Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С.Пушкіна, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М.Машэрава і інш. Так, у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С.Пушкіна адбылася канферэнцыя па тэме "Краеведение в учебно-воспитательном процессе школ и вузов" (2003), рэспубліканская канферэнцыя "Краязнаўства як адзін з кірункаў вучэбна-выхаваўчай работы ў школе і ВНУ" таксама прайшла ў Брэсце (2008).

У шэрагу універсітэтаў плённа працуюць навуковыя студэнцкія краязнаўчыя гурткі. Працягвае працу гістарычна-краязнаўчы гурток у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце. Зараз у ім каля 40 членаў. Многія гурткоўцы дасягнулі значных навуковых і педагагічных поспехаў: прафесарам стаў У.М.Міхнюк, кандыдатамі гістарычных навук Л.І. Коўкель і В.А. Белазаровіч. Гурток адкрыў шлях у навуку звыш 100 яго членам. Сярод шматлікіх тэм даследаванняў у другой палове 90-х гг. узрасла цікавасць да вывучэння праблем эканомікі, адукацыі і культуры, дзейнасці канфесій, стану сям'і і сямейных традыцый, пошуку сваіх гістарычных каранёў і інш.

Члены гісторыка-краязнаўчага таварыства "Этна" БДУ культуры і мастацтваў здзяйсняюць шматлікія вандроўкі па гістарычных мясцінах, дбаюць аб належным стане помнікаў і памятных мясцін у Мінску, праводзяць народныя святы. Студэнты ініцыявалі праект кансервацыі Крэўскага замка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучасны перыяд рэгіянальныя універсітэты для сярэдніх школ абласцей распрацоўваюць вучэбныя праграмы, падручнікі і іншыя матэрыялы ў дапамогу вывучэнню роднага краю. Так, выкладчыкі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна для выкладання ў 8-м класе курса па выбары "Літаратура роднага краю" падрыхтавалі праграму (В.Я.Ляшук) і падручнік (В.Я.Ляшук, Г.М.Снітко, М.І.Яніцкі).

Развіваецца краязнаўства і ў сістэме прафесійна-тэхнічнага навучання, ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі (тэхнікумах, каледжах). Шырока распаўсюджаны ў гэтых установах музеі, якія раскрываюць гісторыю іх стварэння і развіцця, звесткі пра выпускнікоў і выкладчыкаў. Створаны саветы музеяў з удзелам навучэнцаў. Працуюць краязнаўчыя гурткі, творчыя калектывы, якія прысвяцілі сваю дзейнасць захаванню і папулярызацыі традыцыйнай рэгіянальнай культуры і мастацтва. Так, заснаваны ў 1999 г. гісторыка-краязнаўчы музей Слуцкага прафесійна-тэхнічнага каледжа, дзякуючы руплівай працы выкладчыкаў і навучэнцаў, пераўтварыўся ў цэнтр захавання культурных здабыткаў краю і цікавай асветніцкай дзейнасці. Яго наведалі звыш 20 тыс. чалавек. У шасці залах музея прадстаўлены народныя промыслы і побыт случчан, гісторыя ваенных дзеянняў на тэрыторыі краю, нумізматыка, гісторыя мясцовай прафесійна-тэхнічнай адукацыі[145].

Адным з важнейшых вынікаў дзейнасці дзяржаўных устаноў і іх супрацоўнікаў у галіне краязнаўства з'яўляюцца шматлікія публікацыі: артыкулы, карты, манаграфіі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі і інш. Сярод іх вылучаюцца краязнаўчыя зборнікі, якія належаць да буйных выдавецкіх формаў і адметныя навуковай навізной: "Гарадзенскія запісы" Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы; "Магілёўшчына", які выдаюць абласны краязнаўчы музей, абласная бібліятэка імя У.І.Леніна і дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова і інш.

[145]Летапісы, паясы, героі // Краязнаўчая газета. – 2008. – студзень (№ 2). – С.7.



РЕПОЗИТОРИЙ БрГУ имени А.С. Пушкина

## Глава 4. Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства

Сучасны этап характарызуецца сапраўдным уздымам бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. Упершыню бібліятэкі пачалі распрацоўваць мэтавыя праграмы краязнаўчай дзейнасці. Ініцыятарам іх была Гомельская абласная бібліятэка. У выніку рэалізацыі праграмы "Жывая памяць Гомельшчыны" з'явіліся краязнаўчыя БД, прысвечаныя знакамітым землякам і гісторыка-культурным помнікам ("Спадчына Гомельшчыны", уведзена ў 1998 г.), і іншыя новыя элементы краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў і формы папулярызацыі краязнаўчых ведаў. У далейшым пачалі рэалізавацца мэтавыя праграмы іншых абласных, раённых і гарадскіх бібліятэк. Выкананне праграм прыносіць плённыя вынікі. Значна ўзбагаціліся краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы, як традыцыйныя, так і ўпершыню створаныя электронныя. Бесперапынна павялічваюцца БД "Краязнаўства", якія пачалі фарміравацца ў першай палове 90-х гг. XX ст. Напрыклад, у БД "Краязнаўства" Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай АБ адлюстравана звыш 30 тыс. дакументаў[146]. Бібліяграфічныя БД па краязнаўстве шэрага бібліятэк, як элементы электронных краязнаўчых каталогаў, зараз даступныя праз сайты. Праз сайты даступныя паўнатэкставыя, фактаграфічныя і камбінаваныя БД: "Край мой – Магілёўшчына" (www. Mlib.basnet.by/kray/) Магілёўскай АБ, "Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць" (http: // lib. vitebsk.net/") Віцебскай АБ і інш. АУНБ і ЦБС пастаянна ўзбагачаюць арсенал формаў і метадаў папулярызацыі краязнаўчых ведаў.

Абласныя універсальныя бібліятэкі і ЦБС разгарнулі навукова-даследчую работу па краязнаўстве. Адным з яе кірункаў з'яўляюцца даследаванні, скіраваныя на вывучэнне інфармацыйных краязнаўчых рэсурсаў, інфармацыйных патрэбнасцей па краязнаўстве і іншых тэмах, абмежаваных галіновай спецыфікай. Так, Віцебская АБ правяла даследаванне "Адпаведнасць фонду краязнаўчых дакументаў запытам карыстальнікаў".

Асобным кірункам стала правядзенне даследаванняў па іншых галінах і тэмах краязнаўства, абумоўленае ўсё большым уключэннем бібліятэк у сістэму арганізацый, што

[146] Даныя на жнівень – верасень 2007 г.сабраны студэнтамі-завочнікамі БДУ культуры і мастацтваў.

здзяйсняюць навуковыя даследаванні, а таксама даступнасцю для бібліятэкараў метадалагічнага арсенала краязнаўства. Вялікую даследчую працу правялі публічныя бібліятэкі па падрыхтоўцы летапісаў вёсак. Многія бібліятэкі вядуць этнаграфічныя даследаванні, пашыраюць удзел у зборы матэрыялаў і вывучэнні сямейна-родавай гісторыі. Напрыклад, Любанская ЦБС збірае і сістэматызуе матэрыялы мясцовай традыцыйнай культуры і па гісторыі краязнаўства ў раёне. Апрацаваныя вынікі цэнтральная бібліятэка публікуе ў выглядзе тэматычных зборнікаў, якія з’яўляюцца каштоўнымі крыніцамі краязнаўчага вывучэння Любаншчыны. Жодзінская ГЦБ падрыхтавала і правяла свята частотных прозвішчаў карэнных жыхароў горада. Яго падрыхтоўцы папярэднічалі вялікая пошукавая работа, супрацоўніцтва з архівамі.

Аб тэндэнцыі ўмацавання пазіцый бібліятэк не толькі як інфармацыйных і культурных цэнтраў краязнаўчага руху, але і даследчых установ сведчыць выкарыстанне імі такой формы навуковай работы, як навукова-практычныя канферэнцыі па краязнаўстве. На папярэдніх гістарычных этапах бібліятэкі не праводзілі такіх навуковых форумаў. На канферэнцыях аналізуюцца дасягненні па фарміраванні фондаў краязнаўчых дакументаў, удасканаленні краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату, дзейнасці па папулярызацыі здабыткаў рэгіянальнай культурнай спадчыны і эканамічнага развіцця, выпрацоўваюцца перспектыўныя кірункі бібліятэчна-інфармацыйнага краязнаўства. Так, у рэкамендацыях навукова-практычнай канферэнцыі «Бібліятэка і рэгіянальная праграма “Памяць Міншчыны”» (Мінск, 3–4 снежня 1996 г.) акцэнтавана ўвага на ўзмацненні ролі бібліятэк у адраджэнні краязнаўчага руху, іх узаемадзеянні ў краязнаўчай рабоце са школамі, музеямі, клубамі, грамадскімі арганізацыямі, мясцовым друкам і іншымі арганізацыямі. Бібліятэкам вобласці было прапанавала актыўна ўдзельнічаць у краязнаўчых даследаваннях: збіраць, сістэматызаваць і папулярызаваць мясцовы фальклор, традыцыі, звычаі, вывучаць творчасць пісьменнікаў-землякоў, засяродзіцца на літаратурным і гістарычным краязнаўстве.

Вялікую ўвагу надавалі бібліятэкі і іншыя арганізацыі, вучоныя падрыхтоўцы краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адметнасцю гэтага перыяду было пашырэнне жанрава-тыпалагічнага складу краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, з’яўленне электронных паказальнікаў, календароў знамянальных і памятных дат, далейшае павелічэнне несамастойных бібліяграфічных матэрыялаў. Упершыню краязнаўчая інфармацыйна-бібліяграфічная прадукцыя стала даступнай для ўдаленых карыстальнікаў праз сайты бібліятэк.

Усведамляючы сваё месца ў рэгіянальным краязнаўчым руху, а таксама ролю ў сістэме інфармацыйных і сацыяльна-культурных цэнтраў рэгіёнаў, абласныя і публічныя масавыя бібліятэкі вызначылі кірункі падрыхтоўкі краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў для дасягнення сацыяльна значных мэт. Найбольш мэтанакіравана і актыўна фарміруе сістэму краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна. Гэта бібліятэка выпусціла дзесяткі назваў розных па змесце і жанрава-тыпалагічных асаблівасцях дапаможнікаў, якія прадстаўляюць шырокую панараму апублікаваных вынікаў даследаванняў вобласці, з’яўляюцца надзейным інфармацыйным падмуркам краязнаўчай работы. Некаторыя звенні сістэмы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў паспяхова развівае Віцебская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна.

Абласныя бібліятэкі і многія ЦБС працягваюць бібліяграфічнае інфармаванне аб новай літаратуры ў паказальніках тыпу “Новая літаратура аб … вобласці (раёне, горадзе)”, але яшчэ не вырашылі задачу адлюстравання замежных выданняў, у чым зацікаўлены даследчыкі. Абласныя бібліятэкі і ЦБС працягваюць выпуск краязнаўчых календароў знамянальных і памятных дат. Некаторыя з іх носяць фактаграфічны характар (без спісаў літаратуры), як календары Гродзенскай АБ. Інавацыйнасць гэтых календароў заключаецца ў падрабязным адлюстраванні падзей і фактаў, але пажадана, каб фактаграфічная і бібліяграфічная інфармацыя выкарыстоўвалася для характарыстыкі дат і прыцягнення ўвагі спажыўцоў да крыніц іх дакументнага адлюстравання. Так, напрыклад, складаюцца “Календары знамянальных і памятных дат па Магілёўскай вобласці” Магілёўскай абласной бібліятэкі.

Выйшаў шэраг рэтраспектыўных, галіновых, тэматычных і персанальных бібліяграфічных дапаможнікаў. Зрэдку скла-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даліся універсальныя рэтраспектыўныя краязнаўчыя дапаможнікі, як, напрыклад, «Указатель исторических материалов из “Могилевских губернских ведомостей” (1838–1898)» і “Сводный каталог литературы о Могилевской губернии” Магілёўскай АБ. “Сводный каталог литературы о Могилевской губернии” – першае ў беларускай краязнаўчай бібліяграфіі выданне, у якім пададзены дакументы аб гістарычнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы, выдадзеныя ў перыяд яе існавання. Дакументы выяўлены па фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Прэзідэнцкай бібліятэкі, ЦБ НАН Беларусі, ФБ БДУ, Магілёўскай АБ і іншых крыніцах.

Сярод іншых відаў бібліяграфічных дапаможнікаў заметная ўвага надаецца персанальным і біябібліяграфічным. Выдадзены дапаможнікі, якія адлюстроўваюць персаналіі рэгіёну за ўвесь гістарычны перыяд, дапаможнікі, у якіх склад персаналій абмежаваны гістарычным перыядам, падзеяй, галіной творчай, прафесійнай і навуковай дзейнасці, родам заняткаў. Да лепшых належаць біябібліяграфічны слоўнік Светлагорскай ЦГБ “Земляки: История Светлогорска в лицах”; паказальнікі Віцебскай АБ “Гісторыя славутых родаў Віцебшчыны”, “Освобождение Витебщины: путь мужества и славы”; шматлікія паказальнікі Магілёўскай АБ (“Дзеячы архітэктуры і выяўленчага мастацтва Магілёўшчыны” і інш.). Многія з іх вызначаюцца высокай якасцю, умелым выкарыстаннем метадычных навацый.

Выключнае значэнне ў разглядаемы перыяд набылі несамастойныя бібліяграфічныя матэрыялы, змешчаныя ў манаграфіях краязнаўчага зместу, гісторыка-дакументальных хроніках гарадоў і раёнаў Беларусі “Памяць”, выданнях гістарычных дакументаў і матэрыялаў (“Хроніка Убарцкага Палесся” А.І.Атнагулава і інш.), зборніках навуковых канферэнцый, вучэбнай літаратуры па рэгіёназнаўчых курсах для ВНУ, краязнаўчых перыядычных выданнях, часопісах нацыянальна-культурных таварыстваў і інш. Паток гэтых выданняў значны, тэматыка публікацый разнастайная. Несамастойныя бібліяграфічныя матэрыялы адлюстроўваюць карпатліва выяўленыя публікацыі, у тым ліку замежныя, неапублікаваныя дакументы, без якіх нельга наладзіць інфармацыйнае забеспячэнне рэгіянальных даследаванняў, асабліва па вузкіх пытаннях і новых тэмах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пытанні і заданні

1. Як уплываюць сучасныя грамадскія ўмовы на стан і развіццё краязнаўчага руху? Што спрыяла ўздыму грамадскага краязнаўства?

2. Ахарактарызуйце арганізацыю грамадскага краязнаўства. Ці дзейнічае Беларускае краязнаўчае таварыства?

3. Якое перыядычнае выданне з'яўляецца цэнтральным сярод краязнаўчых перыядычных органаў Беларусі?

4. Назавіце буйнейшых сучасных краязнаўцаў.

5. Ахарактарызуйце арганізацыю школьнага краязнаўства і формы краязнаўчай дзейнасці школьнікаў.

6. Якія новыя формы краязнаўчай дзейнасці з'явіліся на сучасным этапе?

7. Ахарактарызуйце асноўныя кірункі і дасягненні бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства.

## Тэст

I. Дапоўніце сказы

*Заданне 1.* У 1992 г. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь была зацверджана Усебеларуская турыстычна-краязнаўчая экспедыцыя ______________________________

*Заданне 2.* У абласных аб'яднаннях па арганізацыі пазашкольнай працы функцыянуюць _______________________

*Заданне 3.* "Краязнаўчая газета" выпускаецца з ________ г.

*Заданне 4.* Галоўным рэдактарам "Краязнаўчай газеты" з'яўляецца (адказ даць па ўзоры: В.Скалабан) _____________

*Заданне 5.* Газеты "Лідская зямля" ("Ziemia Lidzka"), "Голас з-над Нёмана" ("Głos znad Niemna") былі ўтвораны як органы рэгіянальных аддзяленняў ________________________

*Заданне 6.* Найбольш мэтанакіравана і актыўна фарміруе сістэму краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў________ ___________________________________абласная бібліятэка.

II. Адзначце правільны (ыя) адказ (ы)

*Заданне 7.* Устаноўчыя з'езды і канферэнцыі з мэтай адраджэння БКТ адбыліся ў:

а) 1996 г.,

б) 2003 г.,

в) 2005 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заданне 8.* У Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Францішка Скарыны вёўся:

а) банк даных па краязнаўстве,

б) краязнаўчы каталог,

в) фонд краязнаўчых дакументаў аб г.Полацку.

*Заданне 9.* Прафесар В.П.Рагойша стварыў у в.Ракаў Валожынскага раёна:

а) музей політэхнічнай культуры Ракаўшчыны,

б) арт-музей ракаўскай керамікі,

в) гістарычна-этнаграфічны музей.

III. Суаднясіце

*Заданне 10.* Профіль грамадскіх таварыстваў і кірункі іх дзейнасці

| | |
|---|---|
| 1. Краязнаўчыя арганізацыі пры ўстановах | а) Даследаванне пэўнай тэрыторыі і папулярызацыя ведаў аб ёй |
| 2. Вузкапрафіляваныя краязнаўчыя арганізацыі | б) Даследаванні, прысвечаныя ўстановам і іх супрацоўнікам |
| 3.Нацыянальна-культурныя таварыствы | в) Актуальная для рэгіёну тэматыка даследаванняў |
| 4. Краязнаўчыя навуковыя і навукова-асветныя таварыствы | г) Даследаванне мінулага этнасу на пэўнай тэрыторыі, папулярызацыя гістарычна-культурных здабыткаў |

*Заданне 11.* Назвы краязнаўчых арганізацый з іх профілем

| | |
|---|---|
| 1.”Загароддзе” | а) Устанаўленне імён воінаў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны |
| 2. Ваенна-гістарычны цэнтр у Смаргоні | б) Выдавецкая дзейнасць, культурна-асветніцкая работа, вывучэнне гісторыі этнічнай супольнасці ў краі |
| 3. Таварыства польскай культуры Лідскай зямлі | в) Даследаванне Заходняга Палесся |
| 4. Пошукавы клуб Магілёўскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту | г) Падзеі Першай сусветнай вайны |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

IV. Ці згодны Вы са сцвярджэннем? (Так/Не)

*Заданне 12.* У пачатку 90-х гг. колькасць вучняў, якія займаліся краязнаўчай работай у школах, скарацілася.

*Заданне 13.* Рэспубліканскі цэнтр турызму і краязнаўства сумесна з Беларускім добраахвотным таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры і БФК праводзяць рэспубліканскія конкурсы на лепшы праект краязнаўчага маршруту "Мой край", лепшы музей, пакой, лепшую экспазіцыю прыродазнаўчага профілю.

*Заданне 14.* У Беларусі не вядзецца выданне зборнікаў актавых дакументаў, прысвечаных рэгіёнам.

V. Што аб'ядноўвае

*Заданне 15.* "Моя Родина — СССР", "Наш край", "Жыву ў Беларусі і тым ганаруся" – гэта ___________________________

VI. Гістарычныя партрэты. Пазнайце імя краязнаўца

*Заданне 16.* Дырэктар Рэспубліканскага цэнтра турызму і краязнаўства лічыць, што турыстычна-краязнаўчая дзейнасць "заўсёды ставарае аптымістычны настрой, фарміруе станоўчыя эмоцыі ў дачыненні да народных традыцый, культуры, гістарычнага мінулага".

*Заданне 17.* Мастак, стваральнік музея ракаўскай керамікі.

*Заданне 18.* Вядомы віцебскі краязнавец, журналіст, зараз супрацоўнік Віцебскай АБ, аўтар кнігі аб А.П.Сапунове, кіраўнік "Віцебскага краязнаўчага фонду імя А.П.Сапунова" ___________________________________________________________

*Заданне 19.* Ураджэнец Заходнепалескага рэгіёну, старшыня навукова-краязнаўчага таварыства "Загароддзе" __________
___________________________________________________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

1. *Алексеев, Л.В.* Археология и краеведение Беларуси, XVI в. – 30-е годы XX в. / Л.В. Алексеев. – Мн.: Бел. навука, 1996. – 206 с.

2. *Амелькович, Л.Г.* Деятельность Центрального Бюро краеведения Белоруссии (1923–1933) / Л.Г.Амельковіч / Минск. гос. пед. ин-т им. М.Горького // Вопросы библиотековедения и библиографоведения. – Мн., 1975. – С. 59–77.

3. *Дзянісаў, А.У.* Развіццё краязнаўчага руху ў БССР у 1920 – 1930-я гг. / А.У.Дзянісаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 4. – С. 24–32.

4. *Каханоўскі, Г.А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – 119 с.

5. *Краязнаўства* // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн.: БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 257–260.

6. *Краязнаўчы* рух // Памяць. Мінск: гіст.-дакум. хроніка. Кн.3. – Мн.: БЕЛТА, 2004. – С. 205–208.

7. *Кузьмініч, Т.В.* Бібліяграфічная праца навуковага таварыства па вывучэнні Беларусі ў кантэксце інфармацыйнай дзейнасці ў рэспубліцы (другая палова 20 – пачатак 30-х гг. XX ст.) / Т.В.Кузьмініч // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2006. – Вып. 8. – С. 204–228.

8. *Лісаў, А.* Краязнавец Мікалай Каспяровіч / А.Лісаў, А.Падліпскі / Віцеб. краязн. фонд імя А.Сапунова. – Віцебск: Віцеб. абл. друкарня, 2000. – 48 с.

9. *Лявончыкаў, В.Е.* Беларуская бібліяграфія. Агульны курс: падручнік / В.Е.Лявончыкаў. – Мн.: Вышэйш. шк., 1991. – С. 78–82, 97–99, 134–135, 157–158, 219–221.

10. *Мешечко, Е.Н.* Географическое краеведение: учеб. пособие / Е.Н.Мешечко. – Мн.: Экоперспектива, 2002. – С. 3–34.

11. *Развитие* исторического краеведения // Историческое краеведение Белоруссии: учеб. пособие. – Мн.: Изд-во БГУ, 1980. – С. 5–44.

12. *Падліпскі, А.М.* Летапісец Віцебшчыны: А.П.Сапуноў / А.М.Падліпскі. – Мн.: Полымя, 1993. – 92 с.

13. *Півавар, М.В.* Гістарычнае краязнаўства ў Беларусі ў другой палове XX стагоддзя / М.В.Півавар // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 3. – С. 46–52.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*14. Прадзеіна, А.В.* Абуджаць гістарычную рамантыку / А.В.Прадзеіна // Беларуская мінуўшчына. – 1998. – № 1. – С. 30–32.

*15. Прадзеіна, А.В.* Тэрміналагічныя паблемы краязнаўчай бібліяграфіі Беларусі / А.В.Прадзеіна // Бібліяграфія ў інфармацыйным грамадстве: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. “Бібліятэка ў сучаснай інфармацыйнай прасторы”, Мінск, 23–24 кастр. 1997 г. / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; склад. А.В.Мураўёва. – Мн., 1999. – С. 44–53.

*16. Цітовіч, І.У.* Заканадаўчыя аспекты краязнаўчага руху Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / І.У.Цітовіч // Весці БДПУ. Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2005. – № 1. – С. 3–10.

*17. Шацкая, А.Н.* Государственная политика поддержки краеведческого движения в Республике Беларусь – 1991–2003 гг. / А.Н.Шацкая // Краеведение в учебно-воспитательном процессе школ и вузов: сб. материалов респ. науч.-практ. конф., посвящ. 85-летию со дня рождения Ф.В.Зеньковича, 16–17 окт. 2003. – Брест: БрГУ, 2003. – С. 21–25.

*18. Шумейко, М.* Белорусские архивы и краеведение в 1920-е годы / М.Шумейко // Архівы і справаводства. – 2003. – № 4. – С. 87–95.

*Дадатковая*

*1. Валахановіч, А.І.* Графы фон Гутэн Чапскія на Беларусі / А.І.Валахановіч. – Мн.: БелНДІДАС, 2003. – 84 с.

*2. Витебщина* архивная: история, фонды, персоналии (сер. XIX–XX в.) – Мн.: БелНИИДАД; Витебск, 2002. – 213 с.

*3. Грабянчук, І.* Краязнаўчы рух і стварэнне першых публічных музеяў у Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX ст.) / І.Грабянчук // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 4. – С. 38–45.

*4. Гужалоўскі, А.* Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А.Гужалоўскі. – Мн.: НАРБ, 2002. – 164 с.

*5. Дзянісаў, А.У.* Краязнаўчы рух у БССР у 30-я гг. XX ст. / А.У.Дзянісаў // Труды Белорусского государственного технологического университета. Сер. 5. Политология, философия, история, филология. – 2008. – Вып. 16. – С. 194–197.

*6. Дзянісаў, А.У.* Палітыка ўладаў у дачыненні да добраахвотных краязнаўчых арганізацый Беларусі ў 1920–1923 гг. / А.У.Дзянісаў // Труды Белорусского государственного техно-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

логического университета. Сер. 5. Политология, философия, история, филология. – 2008. – Вып. 16. – С. 190–193.

7. *Раманаў, Е.Р.* З гісторыка-археалагічнай спадчыны: выбраныя творы / Е.Р.Раманаў; пад навук. рэд. І.А.Марзалюка. – Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2006. – 240 с.

8. *Кравец, А.* Экспедыцыя навучэнцаў “Наш край” / А.Кравец // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 6. – С. 61–64.

9. *Кузьмич, А.С.* Краеведческое движение в Гомеле в 20-е годы XX в. / А.С.Кузьмич, А.В.Кузьмич // Краеведческие записки: к 80-летию Гомел. обл. краевед. музея. – Гомель: Гомел. обл. краевед. музей, 2000. – С. 196–203.

10. *Локотко, А.И.* Историко-культурные регионы Беларуси: [пособие для студентов отд-ния “Культур. наследие и междунар. туризм” фак. искусств] / А.И.Локотко. – Мн.: ЕГУ, 2002. – 226 с.: ил.

11. *Лыч, Л.М.* Краязнаўства – крыніца ведаў і нацыянальнага сталення / Л.М.Лыч. – Мн.: Бел. фонд культуры, 2004. – 49 с.

12. *Ляшук, В.Я.* Літаратурная Берасцейшчына: краязнаўчыя нарысы, партрэты, артыкулы / В.Я.Ляшук, Г.М.Снітко. – Мн.: Литература и искусство, 2008. – 318 с.

13. *Малаш, Ю.* Язэп Драздовіч – вандроўнік, мастак, гісторык / Ю.Малаш // Беларускі гістарычны часопіс. – 1999. – № 2. – С. 78–82.

14. *Мальдзіс, А.* Скарынаўскі цэнтр і краязнаўства / А.Мальдзіс // Падарожнік. – 1997. – № 1 (укладка паміж с. 10–11).

15. *Півавар, М.В.* Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI – 1944 г.: даведнік / М.В.Півавар. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2006. – 176 с.: фат.

16. *Саітава, В.І.* Краязнаўчая бібліяграфічная дзейнасць бібліятэк Заходняй Беларусі / В.І.Саітава // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2006. – Вып. 8. – С. 228–236.

17. *Саітава, В.І.* Краязнаўчая работа ў Лідзе (20–30-я гг.) / В.І.Саітава // Бібліятэчны свет. – 1999. – № 3. – С. 22–23.

16. *Саитова, В.И.* Журнал “Ateneum Wileńskie” / В.И.Саитова // Библиография. – 1999. – № 5. – С. 82–91.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*17. Саламевіч, Я.* Руплівец: [аб Г.А.Каханоўскім] / Я.Саламевіч // ЛіМ. – 1996. – 19 студз. (№3). – С. 12.

*18. Цітовіч, І.У.* Аматарскае краязнаўства 1921–1939 гг. і яго месца ў нацыянальна-культурным жыцці заходнебеларускага насельніцтва / І.У.Цітовіч // Философия. Культура. Общество: сб. тр. молодых ученых и аспирантов / РИВШ. – Мн., 2004. – Ч. 1. – С.155 – 163.

*19. Цітовіч, І.У.* Заходнебеларускі школьны краязнаўчы рух у міжваенны перыяд / І.У.Цітовіч // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2003. – № 5. – С. 55–62.

*20. Цітовіч, І.У.* Даследаванне Заходняй Беларусі дзяржаўнымі краязнаўчымі арганізацыямі ІІ Рэчы Паспалітай / І.У.Цітовіч // VI межвуз. конф. молодых ученых, Брест, 14 мая 2004 г. / Брест. гос. ун-т им. А.С.Пушкина; под общ. ред. А.А.Горбацкого. – Брест, 2004. – С. 148–150.

*21. Цітоў, А.* Кароткі летапіс пра летапісца: А.Гваньіні / А.Цітоў // Мастацтва. – 1993. – № 8. – С. 64–65.

*22. Шорац, Л.Ф.* Школьнае гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 20–30-я гады ХХ ст. / Л.Ф.Шорац // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 2005. – № 4. – С. 36–39.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**Саітава** Валянціна Іванаўна

**ГІСТОРЫЯ КРАЯЗНАЎСТВА БЕЛАРУСІ**

*Вучэбны дапаможнік*

Рэдактар І.В.Смяян
Камп'ютэрная вёрстка Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2009 г. Фармат $60\times84^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 11,8. Ул.- выд. арк. 9,9.
Тыраж экз. Заказ

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў
220007, Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 2.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
220007, г.Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ